**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Установа адукацыі**
**"Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт**
**імя Францыска Скарыны"**

**В. А. Адзіночанка**

# РЭЛІГІЯЗНАЎСТВА

Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі

**2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае**

**Гомель**
**ГДУ імя Ф. Скарыны**
**2012**

УДК 2 (075.8)
ББК 86.2 я 73
А 299

**Рэцэнзенты:**
кандыдат філасофскіх навук П. І. Касцюковіч;
кандыдат філасофскіх навук В. У. Старасценка;
кандыдат філалагічных навук Д. В. Дзятко

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Адзіночанка, В. А.**
А 299 Рэлігіязнаўства : вучэбны дапаможнік / В. А. Адзіночанка; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – 2-е выд., перапрац. і дапоўн. – 204 с.
ISBN 978-985-439-630-9

У вучэбным дапаможніку дадзена азначэнне рэлігіі, вылучана яе структура і функцыі. Разгледжаны сусветныя рэлігіі: іх узнікненне, гісторыя, веравучэнне, культ, а таксама месца ў сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі. Апісана беларускае язычніцтва. Дадзены аналіз феномена нетрадыцыйных рэлігій.

У новым выданні перапрацаваны ўсе раздзелы, удакладнены азначэнні, асобныя тэарэтычныя палажэнні.

Адрасуецца студэнтам устаноў вышэйшай адукацыі.

**УДК 2 (075.8)**
**ББК 86.2 я 73**

**ISBN 978-985-439-630-9**
© Адзіночанка В. А., 2001
© Выдавецтва “Універсітэцкае”, 2001
© Адзіночанка В. А., 2012, са змяненнямі
© УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», 2012

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

# ЗМЕСТ


Прадмова. Рэлігіязнаўства, яго прадмет і метады ……………..... 5

**Тэма 1. Агульная характарыстыка рэлігіі** ……………………. 9

1.1. Азначэнне рэлігіі …………………………………………..... 9

1.2. Структура рэлігіі …………………………………………….. 11

1.3. Функцыі рэлігіі ……………………………………………..... 17

1.4. Тыпы рэлігіі …………………………………………………. 21

**Тэма 2. Традыцыйныя рэлігіі** ………………………………... 25

2.1. Рэлігія ў першабытным грамадстве ……………………….. 25

2.1.1. Праблема ўзнікнення рэлігіі …………………………..... 25

2.1.2. Элементарныя формы рэлігійнага жыцця ………….... 27

2.2. Язычніцтва на Беларусі ……………………………………... 34

2.2.1. Азначэнне язычніцтва. Тыпы язычніцтва на Беларусі . 34

2.2.2. Звышнатуральныя істоты беларускага язычніцтва … 38

2.2.3. Беларускія язычніцкія святы ………………………… 44

**Тэма 3. Нацыянальныя рэлігіі** ………………………………. 47

3.1. Рэлігіі Індыі ………………………………………………….. 47

3.1.1. Ведызм і брахманізм ………………………………….. 47

3.1.2. Джайнізм ……………………………………………… 50

3.1.3. Індуізм ………………………………………………… 53

3.1.4. Сікхізм ………………………………………………… 57

3.2. Рэлігіі Кітая ………………………………………………….. 59

3.2.1. Канфуцыянства ……………………………………….. 60

3.2.2. Даасізм ………………………………………………… 62

3.3. Рэлігіі Японіі. Сінтаізм ……………………………………… 64

3.4. Рэлігіі яўрэяў. Іўдаізм ……………………………………….. 68

**Тэма 4. Сусветныя рэлігіі** …………………………………….. 75

4.1. Будызм ……………………………………………………….... 75

4.1.1. Узнікненне будызму ………………………………….. 75

4.1.2. Этыка будызму ……………………………………….. 77

4.1.3. Кірункі ў будызме …………………………………….. 79

4.2. Хрысціянства, яго ўзнікненне і фарміраванне …………….. 87

4.2.1. Узнікненне хрысціянства …………………………….. 87

4.2.2. Структура Бібліі ………………………………………. 92

4.2.3. Веравучэнне і культ хрысціянства ………………….... 94

4.2.4. Ператварэнне хрысціянства ў дзяржаўную рэлігію Рымскай імперыі і раздзяленне царквы …………………….. 99


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4.3. Праваслаўе ………………………………………………….. 102
4.3.1. Агульная характарыстыка праваслаўя ……………… 102
4.3.2. Хрысціянізацыя Русі ………………………………. 105
4.3.3. Стараверства ……………………………………….. 108
4.3.4. Асаблівасці праваслаўнага веравучэння і культу …... 111
4.3.5. Структура праваслаўнай царквы на Беларусі ………. 114
4.4. Каталіцтва ……………………………………………... 117
4.4.1. Агульная характарыстыка каталіцтва ……………. 117
4.4.2. Асаблівасці веравучэння і культу каталіцтва ………. 119
4.4.3. Структура каталіцкай царквы ………………………. 122
4.4.4. Уніяцтва на Беларусі ………………………………. 124
4.5. Пратэстанцтва ………………………………………… 128
4.5.1. Узнікненне пратэстанцтва …………………………. 128
4.5.2. Веравучэнне і культ пратэстанцтва ………………. 133
4.5.3. Неапратэстанцкія цэрквы …………………………. 138
4.6. Іслам …………………………………………………… 146
4.6.1. Узнікненне ісламу …………………………………. 147
4.6.2. Веравучэнне і культ ісламу ……………………….. 151
4.6.3. Кірункі ў ісламе ……………………………………. 158
**Тэма 5 Нетрадыцыйныя рэлігіі** …………………………… 162
5.1. Азначэнне, прычыны ўзнікнення і тыпы нетрадыцыйных рэлігій……………………………………………………….. 162
5.2. Нетрадыцыйныя рэлігійныя арганізацыі на Беларусі …… 164
**Тэма 6 Рэлігія ў сучасным свеце** ………………………….. 175
6.1. Сучасная рэлігійная сітуацыя ў свеце …………………….. 175
6.2. Рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі …………………. 181
6.3. Беларускае заканадаўства аб свабодзе сумлення ………… 184
Літаратура ……………………………………………………….. 192
Дадатак А. Слоўнік рэлігіязнаўчых тэрмінаў …………………. 196
Дадатак Б. Колькасць прыхільнікаў рэлігій у свеце …………….. 199
Дадатак В. Колькасць рэлігійных суполак у Рэспубліцы Беларусь на 1 студзеня 2012 г. ……………………………………………. 200

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ПРАДМОВА
# РЭЛІГІЯЗНАЎСТВА, ЯГО ПРАДМЕТ І МЕТАДЫ

Вылучаюцца тры асноўныя падыходы да аналізу рэлігіі: тэалагічны, філасофскі і навуковы.

Пры тэалагічным падыходзе рэлігія разглядаецца як бы «знутры», з пункту погляду палажэнняў таго ці іншага веравучэння. Пры гэтым ісціннасць апошніх не ставіцца пад сумненне, яны з'яўляюцца перадумовай аналізу. Таму такі падыход зводзіцца, як правіла, да апалагетыкі палажэнняў сваёй рэлігіі і крытыкі іншых. Апошняя можа быць як вельмі стрыманай, калі проста паказваюцца адрозненні сваіх поглядаў ад іншых, так і даволі агрэсіўнай, калі ўсе іншыя рэлігіі тлумачацца як праява зла.

Філасофскія падыходы да аналізу рэлігіі могуць быць самымі рознымі, што тлумачыцца разнастайнасцю поглядаў даследчыкаў. Пры гэтым вылучаюцца дзве крайнія пазіцыі: рэлігійная і атэістычная. Падыход рэлігійнай філасофіі вельмі блізкі да тэалагічнага, адрозненне выяўляецца ў тым, што тэолагі разглядаюць палажэнні сваёй рэлігіі як дадзенасць, рэлігійныя ж філосафы выводзяць іх з агульнай карціны свету, чалавека, яго існавання і г. д. З пазіцыі атэістычнай філасофіі адбываецца паслядоўнае адмаўленне рэлігіі. Трэба падкрэсліць непазбежны суб'ектывізм філасофскага падыходу – як правіла, тут мы маем справу не з апісаннем вераванняў і абрадаў, а з іх інтэрпрэтацыяй тым ці іншым мысліцелем.

Навуковы падыход да аналізу рэлігіі сфарміраваўся ў канцы 19 ст. Пры навуковым падыходзе даследчыкі імкнуцца да аб'ектыўнай характарыстыкі рэлігіі і іх выказванні грунтуюцца на папярэднім вывучэнні эмпірычнага матэрыялу, таму магчыма і патрэбна параўноўваць трактоўкі рэлігіі розных даследчыкаў з пункту погляду іх адпаведнасці рэальнаму стану рэчаў.

Трэба адзначыць, што гэтыя тры падыходы ўзаемазвязаны. Зараз тэолагі і філосафы ў сваіх характарыстыках рэлігіі імкнуцца абаперціся на навуковыя даследаванні, кожны даследчык рэлігіі выкарыстоўвае пры яе аналізе тыя ці іншыя філасофскія палажэнні, і яго высновы будуць залежаць ад таго, ці з'яўляецца ён чалавекам веруючым і да якой рэлігіі належыць.

Рэлігіязнаўства грунтуецца на навуковым падыходзе да аналізу рэлігіі. Для яго характэрна разнастайнаць сродкаў і метадаў, а таксама шматдысцыплінарнасць. Рэлігіязнаўства – гэта сукупнасць навуковых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дысцыплін (гісторыя рэлігіі, фенаменалогія рэлігіі, сацыялогія рэлігіі, псіхалогія рэлігіі, параўнальна-гістарычныя даследаванні і інш.), кожная з якіх разглядае рэлігію ў адным з яе аспектаў.

Пры выкладанні рэлігіязнаўства як вучэбнай дысцыпліны разглядаюцца два асноўныя блокі пытанняў.

Першы – гэта аналіз сутнасці рэлігіі, яе месца ў грамадстве і жыцці канкрэтнага чалавека, узаемадзеяння з іншымі галінамі культуры (мастацтвам, мараллю, філасофіяй, палітыкай і г. д.), прычын узнікнення і захавання, характару крытыкі рэлігіі ў розных культурах і г. д.

Другі блок уключае аналіз узнікнення і развіцця канкрэтных рэлігій, структуры іх веравучэння, культу, маралі і арганізацыі, а таксама месца і ролі ў той ці іншай культуры.

У вучэбным дапаможніку разглядаюцца два блокі пытанняў, аднак асноўная ўвага надаецца другому. Сутнасць рэлігіі тлумачыцца праз аналіз канкрэтных рэлігійных напрамкаў: іх узнікнення, гісторыі развіцця, спецыфікі веравучэння і культу, месца ў грамадстве. Таксама, на наш погляд, пры выкладанні рэлігіязнаўства неабходна сказаць і аб крытыцы рэлігіі ў гісторыі культуры. Гэтаму прысвечана апошняя лекцыя курса.

Аўтар вучэбнага дапаможніка імкнуўся расказаць аб спецыфіцы таго ці іншага рэлігійнага напрамку, каб у чытачоў сфарміраваліся хаця б агульныя ўяўленні пра яго: як дадзены напрамак узнік і развіваўся, што сцвярджаецца ў яго веравучэнні. Не ставілася мэта выпрацаваць у чытачоў адмоўнае або станоўчае стаўленне да той ці іншай рэлігіі, таму аўтар стараўся ўстрымлівацца ад ацэначных меркаванняў.

Трэба падкрэсліць, што, згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у дзяржаўных навучальных установах забаронена як атэістычная, так і рэлігійная прапаганда. Таму ў вучэбным дапаможніку даецца толькі інфармацыя аб рэлігіі, рабіць альбо не рабіць з яе светапоглядныя высновы – справа саміх чытачоў.

Неабходнасць вывучэння студэнтамі курса рэлігіязнаўства абумоўлена наступнымі прычынамі:

1) універсітэцкая адукацыя прадугледжвае атрыманне шырокіх (універсальных) ведаў. А гэта патрабуе дасягнення высокага культурнага ўзроўню. І веды аб рэлігіі – частка агульнай культуры чалавека. Тыя веды, якія студэнты атрымліваюць на занятках па рэлігіязнаўстве, патрэбны не самі па сабе, а для далейшай працоўнай дзейнасці. Студэнтам, якія пасля заканчэння ўніверсітэта пойдуць працаваць у вытворчасць, прыйдзецца сутыкацца з вернікамі. Некаторыя з веравызнанняў маюць спецыфічныя правілы, догмы ў арганізацыі працоўнай дзейнасці. Напрыклад, адвентысты сёмага дня

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не могуць працаваць у суботу, для хрысціян непажадана працаваць у нядзелю. Усё гэта трэба ўлічваць, каб пазбегнуць канфліктных сітуацый на працы.

Выпускнікі педагагічных спецыяльнасцей пойдуць у школы. Веды па рэлігіі будуць неабходныя ім, каб працаваць з дзецьмі з сем'яў вернікаў, а таксама для выкладання вучэбнага матэрыялу па літаратуры, гісторыі, грамадазнаўчых дысцыплінах. Бо рэлігія – гэта неад'емная частка гісторыі культуры і грамадства, і без яе ведання будуць незразумелымі шматлікія падзеі і творы. Пры выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (фізікі, астраноміі, біялогіі) настаўніку трэба ведаць асноўныя палажэнні рэлігійнай карціны свету, каб суадносіць яе з навуковай;

2) у апошнія гады адбываюцца істотныя змены грамадскай сітуацыі ў нашай краіне. Вельмі важнай часткай гэтых змен з'яўляюцца працэсы, характэрныя для рэлігійнага жыцця. Пасля доўгага перыяду афіцыйнай атэістычнай палітыкі рэлігійныя арганізацыі ў нашай краіне атрымалі магчымасць для нармальнага развіцця. Людзі не баяцца казаць аб сваіх рэлігійных перакананнях, расце колькасць рэлігійных суполак, фарміруюцца арганізацыйныя структуры канфесій. Вывучэнне рэлігіязнаўства дазваляе зразумець месца рэлігіі ў нашым грамадстве, прынцыпы ўзаемаадносін паміж рэлігійнымі арганізацыямі і дзяржавай;

3) маральныя нормы, якімі карыстаюцца беларусы, шмат у чым запазычаны з хрысціянства. Сучасны чалавек можа быць няверуючым і не наведваць царкву, але ім ужо засвоены схемы паводзін, узятыя з Бібліі. Такім чынам, вывучэнне рэлігіязнаўства дазволіць зразумець спецыфіку прынцыпаў нашых паводзін, а таксама суаднесці іх з прынцыпамі паводзін у іншых культурах.

4) у штодзённым жыцці студэнты час ад часу сутыкаюцца з вернікамі. Напрыклад, сябры рэлігійнай арганізацыі "Сведкі Іеговы" вядуць актыўную місіянерскую дзейнасць: прапаведуюць на вуліцах, ходзяць па кватэрах. Паводзяць яны сябе вельмі настойліва. Як правіла, студэнты не ведаюць, што рабіць, калі да іх звяртаюцца: або з ветлівасці слухаюць, або праяўляюць агрэсію. Веданне спецыфікі той ці іншай рэлігійнай арганізацыі і метадаў яе дзейнасці дазволіць паводзіць сябе больш упэўнена;

5) зараз, калі ў нашым грамадстве паступова распаўсюджваюцца самыя розныя грамадскія і рэлігійныя погляды, актуальным робіцца выхаванне ў студэнтаў талерантнасці. Сам гэты тэрмін перакладаецца з лацінскай мовы як *цярпенне*. Аднак пры ажыццяўленні прынцыпу талерантнасці націск трэба рабіць не толькі на цярпімасць да іншых поглядаў, але і на павагу да іх. Пад талерантнасцю мы будзем разумець

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прынцып і механізм існавання ў грамадстве людзей з рознымі поглядамі і спосабамі паводзін. Асабліва неабходна талерантнасць у рэлігійнай сферы, бо Беларусь – шматканфесійная краіна. Зараз у ёй налічваецца 25 зарэгістраваных рэлігійных кірункаў. Узаемапавага і імкненне пазбегнуць канфліктаў паміж імі з’яўляюцца неабходнымі ўмовамі далейшага развіцця нашай краіны.

Трэба адзначыць, што ў вучэбным дапаможніку разглядаюцца не ўсе рэлігіі, якія існавалі альбо існуюць зараз у свеце. Справа ў тым, што рэлігія – вельмі складаны і разнастайны феномен культуры, існуе вельмі шмат рэлігійных напрамкаў. Адсюль – непазбежная, на наш погляд, спрошчанасць і скарочанасць іх разгляду ў вучэбным дапаможніку. Тыя чытачы, якія жадаюць атрымаць больш поўную і глыбокую інфармацыю па праблемах рэлігіязнаўства, могуць звярнуцца да спіса літаратуры, змешчанага ў канцы кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 1
# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РЭЛІГІІ

1.1. Азначэнне рэлігіі.
1.2. Структура рэлігіі.
1.3. Функцыі рэлігіі.
1.4. Тыпы рэлігіі.

## 1.1. Азначэнне рэлігіі

Зараз вядома каля 400 самых разнастайных азначэнняў рэлігіі. Умоўна іх можна падзяліць на тры групы ў адпаведнасці з трыма вылучанымі намі ў прадмове асноўнымі падыходамі да аналізу рэлігіі: тэалагічныя, філасофскія і навуковыя.

У азначэннях рэлігіі, якія даюцца з пункту погляду тэалогіі, яна тлумачыцца як узаемадзеянне чалавека са звышнатуральным, пры гэтым зыходзяць з рэальнай наяўнасці апошняга. Азначэнні, якія належаць да гэтай групы, у асноўным падобныя паміж сабой. Мы прывядзем тыя з іх, якія належаць вядомым тэолагам XX ст. Згодна з А. Менем, рэлігія – гэта “сіла, якая звязвае светы, мост паміж створаным светам і Духам Боскім”, адпаведна Р. Гвардзіні – гэта “канкрэтныя ўзаемаадносіны канкрэтнага чалавека і жывога Бога”, па К. Ранеру – экзістэнцыяльная сувязь чалавека з жывым Богам, згодна з Э. Жыльсанам – асабовае стаўленне чалавека да трансцэндэнтнага, рэальнага і асабовага Абсалюта (Бога).

Для філасофскіх азначэнняў рэлігіі характэрна надзвычайная разнастайнасць. Кожны філосаф тлумачыў рэлігію з пункта погляду сваёй сістэмы, і таму зразумець сэнс гэтых тлумачэнняў можна, як правіла, толькі пасля знаёмства з агульнафіласофскімі поглядамі таго ці іншага мысліцеля. Згодна з Гегелем, рэлігія – гэта “абсалютная свядомасць суб’ектыўнага духу”; паводле І. Канта – гэта “сукупнасць маральных абавязкаў, успрынятых як загады Бога”; Л. Феербах вызначаў яе як “апрадмечванне і праекцыю чалавечых (уласцівых чалавечаму роду) якасцяў у нейкі пазасвет”; Ф. Энгельс – як “фантастычнае адлюстраванне ў галовах людзей тых знешніх сіл, якія пануюць над імі ў іх штодзённым жыцці, – адлюстраванне, у якім зямныя сілы прымаюць форму пазазямных”; адпаведна А. Конту – гэта “культ чалавецтва”; па А. Бергсону – “вынік унутраных узрушэнняў і плод парыву любові, які накіраваны на ўсю рэчаіснасць”; З. Фрэйд бачыў у рэлігіі “калектыўны неўроз, які мае пачатак у бездапаможнасці чалавека перад знешнімі сіламі прыроды і ўнутранымі інстынктамі”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У навуковых азначэннях рэлігія тлумачыцца як адна з формаў чалавечай дзейнасці. Пры гэтым даследчыкі імкнуцца не столькі прапанаваць сваю канцэпцыю рэлігіі, што характэрна для філасофскіх азначэнняў, колькі даць яе аб'ектыўную характарыстыку. Як правіла, навуковыя азначэнні рэлігіі з'уляюцца абагульненнем папярэдніх даследаванняў канкрэтных вераванняў і культаў. Мы прывядзем азначэнні рэлігіі, дадзеныя некаторымі  найбольш вядомымі яе даследчыкамі. Згодна з Э. Дзюркгеймам, рэлігія – гэта "цэласная сістэма вераванняў і абрадаў, якія тычацца свяшчэнных рэчаў, гэта значыць, рэчаў асаблівых, забароненых, гэта сістэма такіх вераванняў і абрадаў, якія аб'ядноўваюць у адзіную маральную суполку, што называюць царквой, усіх тых, хто прызнае гэтыя вераванні і абрады", адпаведна Э. Тэйлару – "вера ў духоўныя істоты", Дж. Фрэзер вызначыў рэлігію як "уміласціўленне сіл, якія стаяць вышэй за чалавека, сіл, якія, як лічыцца, накіроўваюць і кантралююць ход прыродных з'яў і чалавечага жыцця".

Такая разнастайнасць трактовак абумоўлена дзвюма асноўнымі прычынамі. Па-першае, гэта розніца ў метадалагічных установках, якімі карысталіся даследчыкі. Кожны з іх разглядаў рэлігію са свайго пункта погляду – адсюль і розныя азначэнні. Па-другое, сама рэлігія з'яўляецца вельмі складаным феноменам. Вядома, што рэлігіі наогул няма, ёсць канкрэтныя рэлігіі. Больш таго, само паняцце "рэлігія" сфарміравалася ў межах еўрапейскай культуры і ў сучасным сваім значэнні яно тычыцца перш за ўсё хрысціянства. Тое, што мы называем рэлігіяй, у Кітаі называецца "чыао", што значыць "навука", у Індыі "дхарма" –"вучэнне", у арабаў "дзін" – "абавязак" і г. д.

Сам тэрмін "рэлігія" даследчыкі звычайна выводзяць ад лацінскага дзеяслова "religare" – "звязваць, яднаць". Ад яго паходзіць назоўнік "religio" – "святыня, набожнасць". Старажытныя рымляне абазначалі гэтым словам усё тое, што было звязана з шанаваннем багоў. Найбольш распаўсюджанае ў хрысціянстве тлумачэнне этымалогіі слова "рэлігія" даў вядомы багаслоў IV–V стст. Аўрэлій Аўгусцін. Ён разглядаў яе як "узнаўленне страчанай сувязі". Трэба падкрэсліць спецыфічна хрысціянскі характар гэтага тлумачэння: лічыцца, што калісьці існавала непасрэдная сувязь чалавека з Богам, потым з-за грахоў людзей яна была разарвана, і ў рэлігійным акце чалавек спрабуе ўзнавіць гэтую сувязь. Але, напрыклад, у будызме такога паняцця страчанай сувязі няма; больш таго, у некаторых яго кірунках нават адмаўляецца рэальнае існаванне звышнатуральных істот, і таму зыходзячы з гэтага, чалавеку няма з кім узнаўляць сувязь. Спачатку рэлігіяй еўрапейцы называлі толькі хрысціянства, а для абазначэння іншых тыпаў вераванняў ужываўся тэрмін "язычніцтва".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У далейшым паняцце "рэлігія" было ў палемічных мэтах пашырана і на нехрысціянскія вераванні, іх тлумачылі як "несапраўдныя" рэлігіі і гэтым адрознівалі ад хрысціянства. Толькі ў XIX ст. ў сувязі з геаграфічнымі адкрыццямі і знаёмствам еўрапейцаў з іншымі культурамі паняцце "рэлігія" стала ўжывацца ў яго сучасным сэнсе: для абазначэння адной з галін духоўнага жыцця разам з мараллю, навукай, філасофіяй, мастацтвам і г. д. У гэты ж час пачынае разгортвацца палеміка вакол пытання "Што такое рэлігія?", якая працягваецца па сённяшні дзень, аб чым сведчыць разнастайнасць прыведзеных азначэнняў. Аднак у большасці іх можна вылучыць наступныя агульныя рысы рэлігіі: па-першае, яна характарызуецца як адна з формаў чалавечай дзейнасці і, па-другое, спецыфіка апошняй у тым, што яна грунтуецца на веры ў нейкія надпрыродныя, вышэйшыя сілы і з'яўляецца яе вынікам. Зыходзячы з гэтага, дадзім азначэнне рэлігіі. Трэба падкрэсліць, што яно з'яўляецца адным з магчымых. Могуць існаваць і іншыя.

***Рэлігія*** *– гэта грамадска аформлены тып светаўспрымання і светаадчування, а таксама адпаведныя паводзіны і спецыфічныя дзеянні, якія грунтуюцца на веры ў звышнатуральнае.*

## 1.2. Структура рэлігіі

Мы будзем разглядаць структуру рэлігіі, зыходзячы з яе азначэння. Як вынікае з яго, асновай рэлігіі, яе падмуркам, з'яўляецца вера ў звышнатуральнае. Перш за ўсё скажам, што такое звышнатуральнае. Звычайна пад ім маецца на ўвазе ўсё тое, што знаходзіцца па-за межамі прыроды (па-лацінску "прырода" – "natura") у самым шырокім яе разуменні. Таму, напрыклад, разважанні накшталт "царкоўнікі сцвярджаюць, што Бог на небе, а нашы касманаўты паляцелі і ніякага Бога там не знайшлі – значыць Бога няма", што прыводзіліся ў папулярнай навуковай літаратуры на пачатку 60-х гг., сведчылі аб неразуменні характару рэлігійных палажэнняў і былі раскрытыкаваны самімі савецкімі філосафамі-атэістамі. Бо ніколі хрысціянства (тут, безумоўна, крытыкавалася менавіта яно) не сцвярджала, што Бог – гэта нейкі стары з белай барадой, які сядзіць за хмарамі, і вакол яго анёлы лётаюць. Бог, згодна з хрысціянствам, – гэта звышнатуральная Асоба, якая знаходзіцца па-за межамі Сонечнай сістэмы, па-за межамі Сусвету, па-за межамі ўсяго прыроднага. І колькі б мы ні ляцелі ўверх, да Бога не даляцім, альбо колькі б ні капалі ўніз – да пекла не дакапаемся. Гэта сімвалічна кажуць, што Бог на небе, а пекла пад зямлёй.

Таму пры дапамозе дадзеных прыродазнаўчых навук нельга непасрэдна ні абвергнуць, ні пацвердзіць палажэнні рэлігіі, бо яна

гаворыць аб звышнатуральных аб'ектах і з'явах, якія ўспрымаюцца пераважна праз веру.

***Рэлігійная вера*** – гэта адкрытасць чалавека звышнатуральнаму, упэўненасць у яго рэальным існаванні і магчымасці кантакту з ім. Трэба падкрэсліць, што па сваёй сутнасці яна з'яўляецца не інтэлектуальным, але экзістэнцыяльным, жыццёвым, феноменам. Вернік не проста ўпэўнены, што ёсць нешта звышнатуральнае (напрыклад, хрысціянін упэўнены, што ёсць Бог), але ўсё ягонае жыццё накіравана на гэтае звышнатуральнае, адбываецца ў адпаведнасці з ім. Таму для верніка звышнатуральнае з'яўляецца святым – тым, што мае для яго найвялікшую каштоўнасць і на што ён абапіраецца ў сваіх паводзінах.

На падставе веры ў чалавека фарміруюцца розныя ўяўленні і ідэі аб звышнатуральным, а таксама пачуцці ў дачыненні да яго. Усё гэта складае ***рэлігійную свядомасць,*** якая мае дзве формы: суб'ектыўную і аб'ектыўную.

***Суб'ектыўная рэлігійная свядомасць альбо рэлігійная псіхалогія –*** сукупнасць уяўленняў і пачуццяў, якімі карыстаюцца вернікі ў сваім штодзённым жыцці. Ступень яе складанасці і сістэматызаванасці залежыць ад рэлігійнай культуры людзей. Гэтая ступень можа быць як вельмі высокай, напрыклад, у кіраўнікоў царквы і рэлігійных мысліцеляў, так і вельмі нізкай, напрыклад, у непісьменных людзей або дзяцей. Але, неабходна падкрэсліць, што складанасць і распрацаванасць рэлігійнай псіхалогіі не абавязкова з'яўляецца паказчыкам глыбіні веры. Вера можа быць глыбокай у вельмі простых людзей і наадварот.

У дачыненні да звышнатуральнага людзі могуць мець самыя розныя пачуцці: глыбокай пашаны; жаху; уласнай нечысціні перад тварам святыні; адчуванне прысутнасці сілы або асобы, якая адначасова любіць чалавека і судзіць яго; адчуванне адкінутасці або, наадварот, прызначанасці да выратавання; аблягчэння, звязанага з адчуваннем божага ўсёдаравання; адчуванне наяўнасці ў свеце нябачнага парадку або сілы, дзякуючы якой жыццё любога чалавека атрымлівае каштоўнасць і сэнс; пачуццё адзінства з вышэйшым і пераадоленне эгацэнтрычнага "Я" і г. д. Такім чынам, рэлігійныя пачуцці могуць прыводзіць да самых розных спосабаў паводзін людзей.

***Аб'ектыўная рэлігійная свядомасць або веравучэнне*** – гэта сістэма палажэнняў, пры дапамозе якой перадаецца змест дадзенай рэлігіі. У найбольш распаўсюджаных зараз рэлігіях, такіх як, напрыклад, хрысціянства і іслам, асноўнай крыніцай веравучэння з'яўляюцца свяшчэнныя кнігі (Біблія, Каран). На іх падставе фарміруецца сістэма дагматаў – богаадкрытах, а таму абсалютных

ісцін, прынящце якіх абавязкова для кожнага верніка. Для распрацоўкі веравучэння існуюць спецыяльна падрыхтаваныя людзі. У хрысціянстве яны называюцца багасловамі альбо тэолагамі (ад грэч. *theor* – бог, *logos* – слова, вучэнне). Трэба адзначыць, што тэолаг выказваецца не ад свайго імя, а ад імя рэлігійнай арганізацыі і можа быць пазбаўлены гэтага права ў выпадку разыходжання яго поглядаў з афіцыйнымі. Найбольш знакамітымі хрысціянскімі тэолагамі з'яўляюцца: Васіль Вялікі, Аўрэлій Аўгусцін, Фама Аквінскі, Марцін Лютэр, Павел Фларэнскі, Карл Барт, Жак Марытэн і інш.

Вернік упэўнены не толькі ў тым, што ёсць звышнатуральнае, але таксама і ў тым, што з ім можна ўступіць у кантакт. На гэтай падставе фарміруецца ***рэлігійны культ*** – сукупнасць сімвалічных дзеянняў, пры дапамозе якіх вернікі ўступаюць у кантакт са звышнатуральным. Культавае дзеянне з'яўляецца адказам чалавека на тое, што ён успрымае як звышнатуральнае. Формы гэтага адказу могуць быць самымі разнастайнымі: абрады, рытуалы, ахвярапрынашэнні, малітвы, танцы, медытацыя, рэлігійная музыка і спевы, пасты і г. д.

Трэба адзначыць, што любое культавае дзеянне з'яўляецца праявай канкрэтнага веравання і мае рэлігійны сэнс толькі ў сувязі з ім. Так, напрыклад, у антычнай Грэцыі багі ўяўляліся, звычайна, у выглядзе чалавекападобных істот, і лічылася, што ім патрэбны ахвяры. Узаемадзеянне з багамі ажыццяўлялася па прынцыпе "я – табе, ты – мне": лічылася, што, калі багам прыносіліся ахвяры, яны абавязаны былі выканаць просьбы людзей, калі ж гэтага не адбывалася – ім больш нічога не давалі. Таму асноўнай формай узаемадзеяння з багамі ў антычнасці было ахвярапрынашэнне. У хрысціянстве ж ёсць адзіны ўсемагутны Бог, якому ад чалавека не патрэбны ніякія матэрыяльныя падарункі і якога можна толькі прасіць. Адсюль адной з асноўных формаў узаемадзеяння з Богам у хрысціянстве з'яўляецца малітва.

Калі чалавек робіць дзеянні, якія па знешнім выглядзе нагадваюць культавыя, але веры ў яго няма – гэта не будзе мець рэлігійнага сэнсу. Напрыклад, у хрысціян перад Пасхай ёсць Вялікі Пост, у ходзе якога нельга ўжываць некаторыя віды ежы. Для вернікаў гэта мае сэнс духоўнага і фізічнага ачышчэння і падрыхтоўкі да свята ўваскрашэння Хрыста. Вучоныя паказалі, што абмежаванне ў ежы ў гэты перыяд (Вялікі Пост адбываецца ўвесну) карысна для здароўя – арганізм вызваляецца ад назапашаных за зіму шлакаў, і чалавек потым менш хварэе. Але калі чалавек не есць шмат, каб умацаваць сваё здароўе або захаваць фігуру, – гэта ўжо мае не рэлігійны, а чыста дыетычны сэнс.

Большасць культавых дзеянняў можа адбывацца як індывідуальна (калі іх выконвае адзін чалавек), так і калектыўна (калі ўдзельнічае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

некалькі людзей). Так, напрыклад, маліцца можна і сам-насам дома, і ў храме ў час набажэнства.

У працэсе культавых дзеянняў выкарыстоўваюцца разнастайныя рэчы: крыжы, іконы, спецыяльнае адзенне, будынкі, музычныя інструменты і г. д. Мэтай гэтага з’яўляецца мабілізацыя і адпаведнае афармленне рэлігійных пачуццяў. Ужо ўваходзячы ў культавы будынак, чалавек трапляе ў арганізаваную асаблівым чынам духоўную прастору, дзе яго ўвага канцэнтруецца на акрэсленых рэчах і дзеяннях. Сама будова храма, яго асвятленне і ўнутранае ўпрыгожанне ўздзейнічаюць на чалавека, выклікаючы ў яго адпаведныя эмоцыі. Напрыклад, каласальнасць старажытнаегіпецкіх храмаў унушала чалавеку пачуццё яго мізэрнасці перад багамі, накіраванасць уверх гатычных сабораў павінна была ўзняць душу да Усявышняга, прастата мячэцяў дапамагала сканцэнтравацца ў малітве. Пачуцці вернікаў умацоўваюцца пад уздзеяннем музыкі, урачыстасці і незвычайнасці аддзення святчэннаслужыцеляў, багацця, або, наадварот, падкрэсленай прастаты культавых рэчаў.

Як правіла, у большасці рэлігій у выніку культавых дзеянняў умацоўваецца псіхіка іх удзельнікаў. Адбываецца трансфармацыя адмоўных эмоцый у станоўчыя: знікае стан падаўленасці, непакою, незадаволенасці, унутранага дыскамфорту, і на змену ім прыходзяць пачуцці палёгкі, задаволенасці, спакою, радасці, прыліў сіл.

На падставе веры фарміруецца ***рэлігійная мараль*** – *сукупнасць правіл паводзін, якія прадпісваюцца дадзенай рэлігіяй і якіх прытрымліваюцца яе прыхільнікі.* Гэтыя правілы паводзін могуць быць самымі рознымі і непадобнымі паміж сабой. Для большасці людзей характэрна ўспрыманне тых маральных нормаў, якіх прытрымліваюцца яны самі, як відавочных і агульначалавечых. Але гэта не так. Напрыклад, разуменне маральных нормаў, якімі карыстаюцца еўрапейцы (“не забі”, “не блудзі”, “не крадзь”) узята з хрысціянства і для культур з іншымі рэлігіямі не ўласцівы. З пункта погляду хрысціянства любое забойства, незалежна ад таго, апраўдана яно юрыдычна ці не, з’яўляецца злом. У ісламе ж ёсць паняцце “газават” – свяшчэнная вайна, якая вядзецца з мэтай абароны веры, і ўсе, хто ў ёй загінулі, у адпаведнасці з гэтым вераваннем, адразу накіроўваюцца ў рай. Забойства “няверных” у такой вайне – угодная Алаху справа. У антычнай Грэцыі ў самую пару яе класічнага росквіту прыносіліся чалавечыя ахвяры багам. (Хаця трэба адзначыць, што грэкі рабілі гэта ў выключных выпадках.) Існавалі рэлігіі, дзе масавыя чалавечыя ахвярапрынашэнні былі неабходнай часткай рытуалу. Найбольш вядомыя з іх – рэлігіі ацтэкаў і мая, а таксама культ фінікійскага бога

Ваала, якому ў ахвяру прыносіліся немаўляты. Манагамнасць шлюбу ў Еўропе і асуджэнне ў прынцыпе дашлюбных і пазашлюбных палавых адносін шмат у чым грунтуецца на біблейскім “не блудзі”. У большасці іншых рэлігій такога патрабавання няма, і таму мужчына меў столькі жонак альбо наложніц, колькі ён мог сабе дазволіць.

Культавыя дзеянні і маральныя паводзіны вернікаў адбываюцца ў канкрэтных грамадскіх умовах і з’яўляюцца сацыяльна аформленымі. На гэтай падставе ўзнікае ***рэлігійная арганізацыя*** – сукупнасць людзей, аб’яднаных адзіным веравучэннем і культам.

Вылучаюцца наступныя чатыры асноўныя тыпы рэлігійных арганізацый: этнічнае рэлігійнае аб’яднанне, царква, секта, харызматычны культ.

***Этнічнае рэлігійнае аб’яднанне*** – такая рэлігійная арганізацыя, межы якой супадаюць з межамі таго ці іншага этнасу (роду, племені, народа). Як правіла, існуе на стадыі першабытна-абшчыннага і раннекласавага грамадства. Не з’яўляецца самастойнай**,** выконвае службовыя функцыі ў межах этнічнай або палітычнай супольнасці. Членамі этнічнага рэлігійнага аб’яднання робяцца не па свабоднаму выбару, але ў выніку нараджэння ў дадзеным этнасе. Стаўленне да іншых рэлігій ажыццяўляецца па наступным прынцыпе: кожны народ мае права і, нават, абавязаны шанаваць менавіта сваіх багоў, але наша рэлігія – самая правільная. Таму ў дачыненні да іншаверцаў дапускаюцца варожыя дзеянні. У форме этнічнага рэлігійнага аб’яднання існуюць усе рода-племянныя і нацыянальныя рэлігіі.

***Царква*** (ад грэч. *kiriake* – божы дом) – наднацыянальная рэлігійная арганізацыя, якая цесна звязана з тым народам або дзяржавай, у межах якіх яна існуе, але адрознівае сябе ад іх і імкнецца ажыццявіць свае ўласныя мэты. Пабудавана царква як цэнтралізаваная іерархічная сістэма. Складаецца са свяшчэннаслужыцеляў, якія маюць прафесійную падрыхтоўку, і вернікаў. Звычайна, мае вялікую колькасць паслядоўнікаў. Прыналежнасць да царквы вызначаецца зараз свабодным выбарам. Раней, напрыклад, у царскай Расіі ці сярэдневяковай Еўропе, чалавек не меў права такога выбару і звычайна рабіўся членам царквы проста таму, што яго бацькі належалі да дадзенай рэлігійнай традыцыі. Для царквы характэрна місіянерская дзейнасць па распаўсюджванні свайго веравучэння. Стаўленне да іншых рэлігій зараз цярпімае: кожны чалавек мае права на свабоду сумлення і ацэньваецца перш за ўсё па сваіх учынках. Трэба падкрэсліць, што само паняцце “царква” сфарміравалася на прыкладзе рэлігійнай арганізацыі хрысціян, але яно таксама ўжываецца і ў дачыненні некаторых іншых рэлігій.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Секта*** (ад лац. *sekta* – школа, кірунак) – рэлігійная арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку аддзялення ад іншай рэлігійнай арганізацыі (царквы або секты) па прычыне нязгоды з некаторымі палажэннямі яе веравучэння або сацыяльнай пазіцыяй.

Секты могуць узнікаць толькі ў межах той рэлігіі, дзе ёсць дакладна зафіксаванае веравучэнне, абавязковае для ўсіх яе прыхільнікаў (напрыклад, у хрысціянстве ці ісламе). У тых жа рэлігіях, дзе такой фіксацыі веравучэння няма, адсутнічае падстава для ўзнікнення сект.

Як правіла, секта ўяўляе сабой самастойную суполку вернікаў, якая не падпарадкоўваецца вышэйшаму органу або асобе, як гэта назіраецца ў царкве. Унутры секты адсутнічае фармальная розніца паміж яе кіраўнікамі і простымі вернікамі, падкрэсліваецца роўнасць усіх членаў.

У штодзённым словаўжыванні ў паняцце “секта” ўкладаецца негатыўны сэнс, і таму яно можа ўспрымацца як абраза. Самі члены гэтага тыпу рэлігійных арганізацый называюць іх не сектамі, а цэрквамі. У навуковым словаўжыванні “секта” – гэта проста тэрмін для абазначэння акрэсленага тыпу рэлігійнай арганізацыі, ніякага негатыўнага сэнсу ў яго не ўкладваецца. Раней сектамі называліся рэлігійныя арганізацыі пратэстанцкага напрамку: баптысты, пяцідзесятнікі, адвентысты і інш. Зараз многія даследчыкі і рэлігійныя дзеячы імкнуцца слова “секта” не ўжываць, каб не выклікаць напружанасці і непаразумення сярод вернікаў.

***Харызматычны культ*** – рэлігійная арганізацыя, што ўзнікла як аб’яднанне прыхільнікаў канкрэтнага чалавека, якому прыпісваецца валоданне асаблівым звышнатуральным дарам (харызмай). Гэты чалавек з’яўляецца заснавальнікам і кіраўніком харызматычнага культу, ён можа абвясціць сябе або паўнамоцным прадстаўніком нейкай эвышнатуральнай істоты ці сілы (Бога, Сатаны, Касмічнага Розуму і г. д.), або, нават, самім Богам. Таму яго аўтарытэт сярод прыхільнікаў велізарны, на яго не распаўсюджваюцца агульнапрынятыя маральныя нормы, і можа быць так, што ён гэтым карыстаецца ў сваіх інтарэсах.

Націск у харызматычных культах робіцца не на рацыянальных, а на пазарацыянальных элементах, рэлігійная практыка ў асноўным зводзіцца да шанавання (культу) кіраўніка-заснавальніка шляхам выканання яго загадаў. Таму сярод прыхільнікаў харызматычнага культу пануе жалезная дысцыпліна, і вельмі часта яны адкрыта эксплуатуюцца. Таксама характэрным з’яўляецца продаж чалавекам, які зрабіўся членам харызматычнага культу, усёй сваёй (а часам і не сваёй)

маёмасці і ахвяраванне грошай на патрэбы арганізацыі. Заканадаўствам многіх краін дзейнасць харызматычных культаў абмежавана альбо забаронена.

Прыкладамі харызматычных культаў, якія існуюць зараз на Беларусі, з'яўляюцца Вялікае Белае Брацтва, Царква Вісарыёна (Царква Апошняга Запавету), Царква Муна (Асацыяцыя Святога Духа за аб'яднанне сусветнага хрысціянства).

Трэба адзначыць, што ў розных рэлігіях кожны з вышэйназваных структурных кампанентаў адыгрывае розную ролю. Напрыклад, у праваслаўі і каталіцтве ўсе гэтыя часткі прысутнічаюць у развітым выглядзе: ёсць распрацаванае веравучэнне, багаты і разнастайны культ, моцная і дакладна іерархізаваная рэлігійная арганізацыя. Вялікі націск робіцца на паглыбленні веры і яе рэалізацыі ў штодзённым жыцці. Але існуюць рэлігіі, дзе аднаму з гэтых кампанентаў надаецца значна менш увагі, чым іншым. Напрыклад, у першабытных рэлігіях веравучэнне было вельмі нераспрацаваным, і рэлігія ў асноўным зводзілася да культу – чалавек не столькі разважаў аб звышнатуральным, колькі ўзаемадзейнічаў з ім. У антычнай Грэцыі і Рыме ніхто не патрабаваў ад чалавека, каб ён верыў ва ўсе тыя міфы аб багах, якія існавалі. Галоўнае, каб ён удзельнічаў у агульнагарадскіх ахвярапрынашэннях, дэманструючы тым самым лаяльнасць да апекуноў дзяржавы. У іншых рэлігійных напрамках, такіх як, напрыклад, неапратэстанцкія цэрквы баптыстаў, пяцідзесятнікаў, адвентыстаў, культу надаецца вельмі мала ўвагі, асноўны націск робіцца на веру і мараль.

## 1.3. Функцыі рэлігіі

***Функцыя рэлігіі*** – гэта тая роля, якую яна выконвае ў грамадстве. Любая рэлігія аказвае ўплыў на свядомасць і паводзіны людзей і з'яўляецца адной з важных частак грамадскага жыцця. Калі даследуюць функцыі рэлігіі, шукаюць адказы на пытанні: "Якім чынам рэлігія дзейнічае?", "Які характар і накіраванасць яе ўздзеяння на індывіда і грамадства ў цэлым?", "Што яна дае канкрэтнаму чалавеку альбо супольнасці?".

Асноўнымі функцыямі рэлігіі з'яўляюцца**:** светапоглядная сэнсаўтваральная, інтэграцыйная і рэгуляцыйная.

***Светапоглядная функцыя*** – гэта асэнсаванне і тлумачэнне свету. Кожная рэлігія тым ці іншым чынам дае адказы на пытанні: адкуль свет узнік, якія тэндэнцыі яго развіцця, і куды ён урэшце рэшт прыйдзе. Напрыклад, згодна з хрысціянствам, свет створаны Богам,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

потым, у выніку першароднага граху, адпаў ад яго, і зараз ідзе працэс узнаўлення першапачатковага адзінства, які завершыцца Апошнім Судом і канцом свету. Згодна з будызмам, ёсць незлічоная колькасць светаў, якія ўзнікаюць, праходзяць розныя перыяды свайго развіцця, а потым знікаюць. Наш свет – адзін з іх.

Вядома, што зараз асноўную светапоглядную функцыю выконвае навука: менавіта яна дае адказы на пытанні аб узнікненні, пабудове і тэндэнцыях развіцця свету. У розныя перыяды гісторыі суадносіны паміж рэлігійнай і навуковай карцінай свету мяняліся. Напрыклад, у сярэдневяковай Еўропе рэлігія шмат у чым падмяняла навуку, імкнучыся даць усеагульную карціну свету. У перыяд Адраджэння пачынаецца разыходжанне паміж навуковым і рэлігійным светапоглядам, якое ў Новы час ператвараецца ў адкрытую варожасць з абодвух бакоў. Асаблівай вастрыні канфлікт дасягнуў у XIX ст., калі існавала агульнараспаўсюджанае меркаванне, што рэлігійны і навуковы светапогляд несумяшчальныя паміж сабою. Але ў XX ст. сітуацыя істотна змянілася. З аднаго боку, рэлігія перастала прэтэндаваць на валоданне карцінай свету, якая б ахоплівала ўсе яго праявы, прызнавала самастойную каштоўнасць навуковага светапогляду і свае памылкі ў канфлікце з навукай. З другога – большасць сучасных вучоных не ставіцца варожа да рэлігіі, і многія з іх з'яўляюцца вернікамі. З абодвух бакоў робяцца крокі да ўзаемапавагі. Распаўсюджаным зараз з'яўляецца погляд, што навуковы і рэлігійны светапогляд знаходзяцца ў стане не супярэчання, але патэнцыяльнага ўзаемадапаўнення. Падкрэсліваецца, што рэлігія асэнсоўвае і тлумачыць не столькі свет сам па сабе, як гэта робіць навука, колькі яго дачыненне да чалавека, шукае сэнс падзей. Такім чынам, светапоглядная функцыя рэлігіі цесна звязана з сэнсаўтваральнай.

***Сэнсаўтваральная функцыя*** – наданне сэнсу чалавечаму жыццю, падтрымка чалавека ў цяжкасцях і знаходжанне шляхоў выхаду з іх. Жыццё чалавека, у адрозненне ад існавання жывёлы, не можа быць апісана толькі як працэс рэалізацыі біялагічных інстынктаў харчавання і працягвання роду. Кожны чалавек, незалежна ад яго культурнай прыналежнасці, жыве дзеля чагосьці. Калі адсутнічае мэта, жыццё губляе свой сэнс, і чалавек не можа нармальна будаваць паводзіны. Звычайна людзі задумваюцца аб сэнсе свайго жыцця ў яго пераломныя моманты: у юнацтве, пры выбары прафесіі, падчас жыццёвых няўдач, канфліктаў, у старасці. Але само жыццё патрабуе свайго сэнсу: кожны чалавек прыйшоў у гэты свет без сваёй згоды (бацькі не пытаюцца ў сваіх будучых дзяцей, нараджаць іх ці не), і яго існаванне не будзе вечным – як вядома, людзі паміраюць. Таму перад кожным

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

чалавекам яўна або няяўна непазбежна ўзнікаюць пытанні: “Навошта я з’явіўся ў гэты свет? Якая мэта майго тут знаходжання? Што я павінен рабіць, каб ажыццявіць гэтую мэту?”.

Адказ на гэтыя пытанні можа давацца ў межах розных галін культуры: штодзённага жыцця, філасофіі, навукі, мастацтва і г. д. Такім чынам, кожная з іх па-свойму выконвае сэнсастваральную функцыю. Спецыфіка рэлігіі заключаецца ў тым, што яна тлумачыць сэнс чалавечага жыцця, абапіраючыся на палажэнне аб наяўнасці звышнатуральнага – таго, што выходзіць за межы прыроды і мае для вернікаў найбольшую каштоўнасць. Для рэлігіі характэрна імкненне надаць сэнс любой праяве чалавечага жыцця. Нават такія з’явы, як хваробы, пакуты, смерць не бессэнсоўныя для вернікаў, а ў некаторых рэлігіях маюць і пазітыўнае значэнне. Менавіта ў гэтым – адна з асноўных прычын прыцягальнасці рэлігійнага светаўспрымання, бо чалавек не можа існаваць у бессэнсоўным асяроддзі і імкнецца знайсці тлумачэнне любой падзеі, асабліва ў крызісныя моманты жыцця.

Рэлігія надае сэнс дзейнасці не толькі асобнага чалавека, але і цэлых грамадскіх аб’яднанняў. Напрыклад, рухі сацыяльнага пратэсту ў мінулым звычайна змяшчалі ў сабе моцны рэлігійны кампанент і сваю мэту бачылі ў аднаўленні вышэйшай справядлівасці, якая была парушана пануючымі класамі.

***Інтэграцыйная функцыя*** – аб’яднанне сваіх прыхільнікаў і ператварэнне іх у аднадумцаў у палітычных, маральных, эканамічных і іншых пытаннях. Можна назваць вельмі шмат прыкладаў інтэграцыйнай функцыі рэлігіі. Так, каталіцтва доўгі час аб’ядноўвала Заходнюю Еўропу, праваслаўе – рускія землі, на падставе ісламу адбылося ў VII стагоддзі аб’яднанне арабскіх плямёнаў.

Рэлігійнае адзінства з’яўляецца надзвычай моцным фактарам аб’яднання. Людзі, якія шануюць адных і тых жа багоў і, адпаведна, прытрымліваюцца адных і тых жа каштоўнасцей, утвараюць цэласную сацыяльную групу, вельмі ўстойлівую ў адносінах да знешніх неспрыяльных умоў. Спробы разбурыць такую групу, як правіла, прыводзяць да яе яшчэ большай інтэграцыі і ўзмацнення. Шмат прыкладаў таму дае гісторыя розных сект, якія доўгі час існавалі ва ўмовах жорсткіх праследаванняў, але захавалі адзінства і адданасць сваім поглядам.

Даволі часта рэлігійнае адзінства з’яўляецца адной з падстаў, на якіх фарміруецца дзяржаўная супольнасць. Так ва ўмовах феадальнай раздробленасці на Русі і варожых узаемаадносін паміж княствамі адсутнічала пачуццё этнічнага адзінства, людзі лічылі сябе разанцамі, уладзімірцамі, наўгародцамі і г. д. Аб’ядноўвала іх адчуванне агульнасці “рускай” веры – праваслаўя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вельмі яскравым прыкладам у гэтай сувязі з’яўляецца гісторыя яўрэйскага народа, які амаль дзевятнаццаць стагоддзяў жыў у выгнанні сярод іншых народаў, якія даволі часта ставіліся да яго варожа. Аднак, дзякуючы перш за ўсё сваёй рэлігіі, яўрэі захавалі нацыянальнае і культурнае адзінства.

Кожная рэлігія не толькі аб’ядноўвае сваіх прыхільнікаў, але таксама раз’ядноўвае іх з прыхільнікамі іншых рэлігій. Гэта можа адбывацца як у вельмі мяккай, калі вернікі проста адрозніваюць свае погляды ад іншых, але ставяцца да іх талерантна, так і ў вельмі жорсткай форме, калі “сапраўднай” абвяшчаецца толькі ўласная рэлігія, а ўсе тыя, хто з ёй хаця б у нечым нязгодны, успрымаюцца як ворагі. Рэлігійная нецярпімасць парадзіла ў гісторыі вельмі шмат крывавых канфліктаў.

Трэба адзначыць, што ў гісторыі нашай краіны рэлігія адыграла хутчэй дэзынтэграцыйную, чым інтэграцыйную ролю. Тэрыторыя Беларусі знаходзілася на перакрыжаванні інтарэсаў дзвюх дзяржаў: праваслаўнай Расіі і каталіцкай Польшчы, якія імкнуліся выкарыстаць рэлігію ў сваіх палітычных мэтах. Таму раней, як правіла, прыняцце беларусамі праваслаўя схіляла іх у бок Расіі, а каталіцтва – у бок Польшчы. На тэрыторыі Беларусі амаль заўсёды існавала шмат рэлігійных напрамкаў, прычым ні адзін з іх не з’яўляўся пануючым, як гэта было ў нашых суседзяў на ўсходзе і захадзе. Гэта садзейнічала рэлігійнай талерантнасці беларусаў, але таксама не дало ім магчымасці аб’яднацца на падставе агульнанацыянальнай рэлігіі. Зараз у нашай краіне існуюць тэндэнцыі беларусізацыі як у каталіцтве, так і ў праваслаўі.

***Рэгуляцыйная функцыя*** – стварэнне нормаў паводзін, якімі абавязаны карыстацца вернікі ў сваім штодзённым жыцці. У кожнай рэлігіі рэгулюючай функцыі надаецца вельмі вялікае значэнне. Нормы паводзін, якія прадпісваюцца, разглядаюцца як выкананне чалавекам сваіх абавязкаў перад звышнатуральным. У адных рэлігіях даюцца ўказанні, як сябе паводзіць у кожнай магчымай сітуацыі, для іх характэрна наяўнасць мноства правіл, якія павінны дэталёва рэгуляваць паводзіны чалавека. У другіх прыводзяцца толькі агульныя прынцыпы паводзін, і кожны чалавек павінен самастойна ўжываць іх ў канкрэтнай сітуацыі.

Раней рэлігія рэгулявала амаль усе сферы чалавечай жыццядзейнасці непасрэдна. Нормы права грунтаваліся на рэлігійных прынцыпах. Зараз у еўрапейскіх краінах рэлігія выконвае сваю рэгулюючую функцыю ў асноўнам праз мараль, але таксама ў асобных выпадках аказвае ўплыў і на прыняцце прававых нормаў. Так, напрыклад, у Польшчы прыняты закон “Аб абароне жыцця”, згодна з якім аборты

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дазваляецца рабіць толькі ў абмежаваных выпадках (калі зачацце адбылося ў выніку згвалтавання, калі вядома, што народзіцца хворае дзіця і калі нараджэнне дзіцяці пагражае жыццю маці). Як абгрунтаванне на карысць прыняцця і існавання гэтага закону прыводзіцца хрысціянскі прынцып “не забі”. Таксама шмат у якіх краінах Усходу нормы права непасрэдна грунтуюцца на прынцыпах ісламу.

## 1.4. Тыпы рэлігіі

Адной з асноўных задач рэлігіязнаўства з’яўляецца сістэматызацыя рэлігій, як тых, што існавалі ў гісторыі, так і тых, якія ёсць зараз. Для рашэння гэтай задачы неабходна вызначыць крытэрыі сістэматызацыі, зыходзячы з якіх, магчыма было параўноўваць паміж сабой розныя рэлігіі.

Такіх крытэрыяў існуе шмат, і таму ёсць шмат класіфікацый рэлігіі. Мы прывядзем некаторыя з іх.

Кожная рэлігія можа быць разгледжана з пункта погляду колькасці тых звышнатуральных істот, якія ў ёй шануюцца. Па гэтым крытэрыі рэлігіі падзяляюцца на дзве вялікія групы: політэістычныя і манатэістычныя.

***Політэістычныя*** (ад грэч. *poly* – шмат, *theos* – бог) – *гэта такія рэлігіі, у якіх ёсць шмат звышнатуральных істот (не абавязкова багоў, гэта могуць быць духі або дэманы). Асноўныя рэлігіі, якія існавалі альбо зараз існуюць у свеце, з’яўляюцца політэістычнымі.*

Найбольш вядомы прыклад такой рэлігіі – гэта рэлігія антычнай Грэцыі, дзе шанаваліся багі: Зеўс, Пасейдон, Аід, Гера, Афіна, Артэміда, Апалон і г. д. Політэістычнай таксама была тая рэлігія, якая існавала на нашых землях да прыняцця хрысціянства і ў якой шанавалі Перуна, Ярылу, Жыжаля, Зюзю і іншых багоў. Ёсць рэлігіі, у якіх звышнатуральных істот вельмі шмат. Напрыклад, у індуізме толькі багоў налічваецца 3,5 тыс. І наогул неверагодная колькасць звышнатуральных істот існуе ў сінтаізме (нацыянальная рэлігія японцаў) – 330 млн.

Як правіла, у політэістычных рэлігіях звышнатуральныя істоты знаходзяцца паміж сабой у адносінах падпарадкавання і ўтвараюць іерархічную сістэму. Так, у старажытнагрэчаскай рэлігіі вярхоўным богам з’яўляўся Зеўс – “Айцец багоў і людзей”, які даволі тыранічна кіраваў іншымі багамі. Сферай яго непасрэднага валадарства было неба. Браты Зеўса Аід і Пасейдон валодалі адпаведна царствам памёрлых і воднай стыхіяй з іх шматлікімі звышнатуральнымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

істотамі (Кербер, Танат, Гіпнос, Трытон, Нерэй, Пратэй, эрыніі, нерэіды і г. д.). Астатнія алімпійскія багі мелі сваю канкрэтную сферу дзейнасці: Афіна апекавала навуку, Апалон – мастацтва, Гефест – рамяство, Гермес – гандаль і г. д. Багам падпарадкоўваліся ніжэйшыя звышнатуральныя істоты: німфы, музы, сілены і інш.

***Монатэістычныя*** (ад грэч. *mono* – адзін, *theos* – бог) – *гэта такія рэлігіі, у якіх ёсць толькі адзіны Бог, які лічыцца стваральнікам і кіраўніком усяго. Такіх рэлігій толькі тры: іўдаізм, хрысціянства, іслам.*

Трэба падкрэсліць, што сутнасць монатэізму не ў тым, што згодна з ім, ёсць толькі адзін Бог, але ў тым, што Ён менавіта адзіны і займае зусім асаблівае месца адносна Сусвету, людзей і іншых звышнатуральных істот. (Таму само слова Бог з’яўляецца імем уласным і пішацца з вялікай літары.)

Ва ўсіх трох монатэістычных рэлігіях побач з Богам ёсць іншыя звышнатуральныя істоты, але яны не з’яўляюцца самастойнымі, а створаны Богам, ці непасрэдна выконваюць Яго волю, або ў адпаведнасці з планам Бога і па Яго дапушчэнню перашкаджаюць Яму.

Толькі ў межах монатэістычных рэлігій можа існаваць праблема стаўлення да звышнатуральных істот, якія шануюцца прыхільнікамі іншых вераванняў. Калі багоў шмат, як у політэізме, і кожны з іх кіруе сваім участкам рэчаіснасці, дык багі іншых рэлігій успрымаюцца без асаблівых праблем – як уладары іншых звышнатуральных абласцей. Але ў монатэізме ёсць толькі адзіны Бог, і толькі Яго трэба шанаваць. Адпаведна ўзнікае пытанне: як ставіцца да іншых багоў і да іх прыхільнікаў? Раней у монатэістычных рэлігіях лічылася, што ўсе астатнія багі – гэта дэманы, а тыя, хто іх шануе, – заблудныя. Зараз пазіцыя зрабілася больш талерантнай. У прынцыпе прызнаецца, што могуць быць розныя шляхі выратавання, і трэба з павагай ставіцца да іншых рэлігійных поглядаў. Безумоўна, за выключэннем тых выпадкаў, калі апошнія з’яўляюцца адкрыта антычалавечымі альбо антымаральнымі.

У залежнасці ад этнічнай прыналежнасці прыхільнікаў рэлігіі падзяляюцца на рода-племянныя, нацыянальныя і сусветныя.

***Рода-племянныя*** – гэта рэлігіі аднаго роду або племені. Да іх адносяцца ўсе першабытныя рэлігіі. Яны з’яўляюцца політэістычнымі. Часцей звышнатуральныя якасці прыпісваюцца тым сілам прыроды, ад якіх залежыць жыццё дадзенага роду ці племені. Напрыклад, калі племя жыло на беразе возера і лавіла рыбу – шанаваўся дух возера, калі займалася земляробствам – у выглядзе звышнатуральных істот шанаваліся тыя прыродныя аб’екты і працэсы, ад якіх залежаў будучы ўраджай.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

***Нацыянальныя*** – гэта рэлігіі якога-небудзь народа. Такіх рэлігій даволі многа. Напрыклад, іўдаізм – рэлігія яўрэяў, індуізм – рэлігія індыйцаў, сінтаізм – рэлігія японцаў і г. д.

Як правіла, гэта політэістычныя рэлігіі, адзіным выключэннем з’яўляецца іўдаізм. У нацыянальных рэлігіях, як і ў рода-племянных, звышнатуральныя якасці прыпісваюцца тым прыродным з’явам, ад якіх залежыць жыццё дадзенага народа.

У нацыянальных рэлігіях звычайна назіраецца жорсткая сувязь паміж этнічнай і рэлігійнай прыналежнасцю. Асабліва яскрава гэта бачна ў іўдаізме, дзе атаясамліваюцца паняцці “яўрэй” і “іўдзей”. Пераход яўрэя ў іншую рэлігію разглядаецца як здрада свайму народу, неяўрэй, які прыняў іўдаізм, робіцца яўрэем.

***Сусветныя*** – гэта рэлігіі, прыналежнасць да якіх не звязана з нацыянальнай прыналежнасцю, больш таго, такая сувязь адмаўляецца і падкрэсліваецца, што дадзенае веравучэнне адрасавана ўсім людзям. Сусветных рэлігій толькі тры: будызм, хрысціянства і іслам.

Трэба адзначыць, што паняцце “сусветная рэлігія” азначае не “самая шматколькасная”, але “адрасаваная ўсім людзям, незалежна ад іх нацыянальнасці”. Калі хрысціянства і іслам сапраўды з’яўляюцца найбольш вялікімі ў свеце рэлігіямі, дык прыхільнікаў будызму прыкладна амаль у тры разы менш, чым індуізму, хаця апошні – не сусветная, а нацыянальная рэлігія.

У залежнасці ад спосабу ўзнікнення рэлігіі падзяляюцца на натуральныя і рэлігіі адкрыцця.

***Натуральныя*** – гэта рэлігіі, якія ўзніклі з патрэб штодзённага чалавечага жыцця. У іх звышнатуральныя якасці прыпісваюцца тым прыродным з’явам, ад якіх залежаць вынікі чалавечай дзейнасці: зямлі, сонцу, ветру, дажджу і г. д. Чалавек просіць гэтыя сілы аб дапамозе і спрабуе ўздзейнічаць на іх шляхам заклінанняў і ахвяр. Натуральная рэлігійнасць стыхійна ўзнікае і зараз са штодзённых патрэб сучасных людзей. Напрыклад, студэнтка, якая дрэнна падрыхтавалася да экзамену, у сваіх думках звяртаецца да нейкіх “вышэйшых сілаў”, якія звычайна ўяўляюцца ёй у выглядзе Бога, каб яны дапамаглі выцягнуць “шчаслівы” білет. Часцей натуральная рэлігійнасць узнікае ў чалавека тады, калі перад ім паўстаюць сур’ёзныя праблемы. Адчуваючы сваю няздольнасць вырашыць іх, ён звяртаецца за дапамогай да звышнатуральнага.

***Рэлігіі адкрыцця*** – гэта рэлігіі, у якіх ёсць заснавальнік, прытым тое вучэнне, якое ён прапаведуе, разглядаецца не як вынік чалавечых разважанняў, а як звышнатуральнае адкрыццё. Прыкладамі дадзенага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тыпу рэлігіі з’яўляюцца будызм (заснавальнік Буда), хрысціянства (Хрыстос), іслам (Мухамед).

Як правіла, рэлігіі адкрыцця з’яўляюцца монатэістычнымі. У іх шануецца адзіны Бог, які ўсё стварыў і ўсім кіруе. Сваёй галоўнай мэтай гэтыя рэлігіі лічаць не вырашэнне тых ці іншых праблем штодзённага жыцця (забеспячэнне багацця, здароўя, добрага ўраджаю, перамогі ў вайне і г. д.), але выратаванне самога чалавека шляхам яго пераўтварэння ў адпаведнасці з дадзенымі Богам запаведзямі. Таму вельмі вялікую ролю ў рэлігіях адкрыцця адыгрывае мараль, і гэтым яны істотна адрозніваюцца ад натуральных рэлігій, дзе асноўная ўвага надаецца культавым дзеянням.

Трэба адзначыць, што ўмоўнай з’яўляецца любая класіфікацыя, у тым ліку і прыведзеныя вышэй. У вучэбным дапаможніку яны выкарыстоўваюцца з мэтай выяўлення спецыфікі той ці іншай рэлігіі як феномена культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 2
# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РЭЛІГІІ

## 2.1. Рэлігія ў першабытным грамадстве

2.1.1. Праблема ўзнікнення рэлігіі.
2.1.2. Элементарныя формы рэлігійнага жыцця.

### 2.1.1. Праблема ўзнікнення рэлігіі

Праблема ўзнікнення рэлігіі з'яўляецца вельмі складанай, бо пры яе даследаванні неабходна звяртацца да самага ранняга перыяду ў гісторыі чалавецтва, звесткі аб якім маюць фрагментарны і гіпатэтычны характар. Таму паміж даследчыкамі няма адзінства ў адказах на пытанне, як узнікла рэлігія. Больш таго, у сучасным рэлігіязнаўстве прызнаецца, што ні адзін з існуючых адказаў не з'яўляецца дастаткова абгрунтаваным і можа разглядацца толькі як адна з верагодных гіпотэз.

Падыходы да вырашэння пытання аб узнікненні рэлігіі могуць ажыццяўляцца як з рэлігійных, так і з нерэлігійных пазіцый. У першым выпадку пытанне вырашаецца значна прасцей, чым у другім. Для вернікаў рэлігія мае звышнатуральнае паходжанне, і менавіта да гэтага ў канчатковым выніку зводзіцца адказ на пытанне аб яе ўзнікненні. У большасці рэлігій лічыцца, што гэта багі ўстанавілі сувязь паміж сабой і людзьмі і навучылі людзей шанаваць сябе. Канкрэтныя формы гэтай сувязі і шанавання залежаць ад спецыфікі той ці іншай рэлігіі. Напрыклад, з пункта погляду хрысціянства, рэлігія дадзена людзям Богам дзеля іх выратавання.

Зараз большасць хрысціянскіх багасловаў зыходзіць з таго, што рэлігія развівалася ў гісторыі – адны яе формы змяняліся іншымі, і самое хрысціянства ўзнікла на акрэсленым этапе гістарычнага развіцця. Адны багасловы кіруюцца так званай тэорыяй "прамонатэізму", згодна з якой спачатку ў людзей была вера ў адзінага Бога, рэшткі чаго можна зараз заўважыць у вельмі розных, нават самых прымітыўных, рэлігіях. Гэтая вера паступова развівалася і атрымала сваё канчатковае ўвасабленне ў хрысціянстве. Трэба адзначыць, што палажэнне аб існаванні прамонатэістычнага этапу ў развіцці рэлігіі хаця і пацвярджаецца некаторымі этнаграфічнымі даследаваннямі, але з'яўляецца вельмі слаба абгрунтаваным.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Другія хрысціянскія багасловы проста зыходзяць з прынцыпу, што людзі ўспрымалі Бога ў адпаведнасці са сваім культурным і разумовым узроўнем. Таму рэлігія ў сваім развіцці прайшла праз стадыі першабытных культаў, політэізму, монатэізму і атрымала завяршэнне ў хрысціянстве.

Калі ж пытанне аб узнікненні рэлігіі вырашаецца з нерэлігійных пазіцый, то на яго даюцца самыя разнастайныя адказы. Прычым, трэба адзначыць, што не заўсёды яны з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі. Значная частка з іх – чыста разумовыя канструкцыі, напрыклад, канцэпцыя аб тым, што рэлігія ўзнікла ў выніку падману.

Мы разгледзім толькі тыя канцэпцыі ўзнікнення рэлігіі, якія адпавядаюць навуковым крытэрыям і абапіраюцца на этнаграфічныя і археалагічныя даследаванні.

Большасць вучоных лічыць, што рэлігія ўзнікла прыкладна 40 тыс. гадоў таму назад у выніку так званай "палеалітычнай рэвалюцыі", калі фарміруецца чалавек сучаснага тыпу (*homo sapiens*), а таксама ўзнікае культура як спецыфічна чалавечы спосаб жыццядзейнасці. Археалагічныя даследаванні сведчаць, што ў гэты перыяд ужо існавала практыка пахаванняў, пры якіх выконваліся пэўныя абрады: целы памёрлых пакрываліся чырвонай фарбай, арыентаваліся адносна бакоў свету, побач з імі клалі зброю і прадметы дамашняга побыту. Былі знойдзены наскальныя малюнкі людзей, апранутых у скуры звяроў, а таксама напалову звяроў, напалову людзей. На падставе гэтых знаходак даследчыкі зрабілі выснову аб наяўнасці рэлігіі ў перыяд верхняга палеаліту.

Такім чынам, вядома, калі ўзнікла рэлігія. Але існуе пытанне наконт таго, чаму і як гэта адбылося. Адказ на пытанне, чаму ўзнікла рэлігія, большасць сучасных даследчыкаў звязвае з пераходам ад малпы да чалавека і з'ўленнем культуры як спецыфічнага спосабу чалавечай жыццядзейнасці. Жывёлы карыстаюцца наборам інстыктыўных рэакцый, у іх псіхіцы запісана асноўная праграма будучых паводзін. У чалавека такой праграмы няма, і ён сам выпрацоўвае спосабы сваіх дзеянняў, зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі. Для гэтага яму трэба асэнсаваць навакольны свет, з'арыентавацца ў ім. Культура ўзнікае як вынік дзейнаснай прыроды чалавека. Спецыфіка рэлігіі ў тым, што яна асэнсоўвае свет з пункта погляду яго фундаментальных прычын і мэт і тым самым дае чалавеку асноўныя арыенціры для дзейнасці. У залежнасці ад крытычнага або станоўчага падыходу да аналізу рэлігіі гэтыя арыенціры могуць разглядацца як ілюзорныя, і тым самым – шкодныя для чалавека, або як адпавядаючыя чалавечай сутнасці і неабходныя для нармальнага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адказы на пытанне, як узнікла рэлігія, зводзяцца да пошуку яе першаэлемента, гэта значыць, той формы рэлігіі, якая ўзнікла спачатку і складае аснову ўсіх рэлігій. Зараз вядомы чатыры асноўныя адказы на гэтае пытанне, і, адпаведна, называюцца чатыры элементарныя формы рэлігійнага жыцця.

### 2.1.2. Элементарныя формы рэлігійнага жыцця

***Татэмізм*** *– вера ў звышнатуральную роднасць паміж этнічнай групай людзей і якой-небудзь жывёлай, раслінай ці (значна радзей) іншым аб'ектам прыроды.* Канцэпцыя татэмізму як элементарнай формы рэлігійнага жыцця была распрацавана французскім сацыёлагам Э. Дзюркгеймам у працы "Элементарныя формы рэлігійнага жыцця. Татэмісцкія сістэмы Аўстраліі" (1912). Сам тэрмін "татэмізм" запазычаны з мовы паўночнаамерыканскага племені аджыбве і азначае "яго род". Асноўнай адзнакай гэтай формы рэлігійнага жыцця з'яўляецца тое, што татэм лічыцца пачынальнікам і апекуном дадзенага этнасу, а таксама кроўным родзічам для ўсіх яго членаў. Татэм выконваў функцыю сімвала, які аддзяляў дадзеную групу людзей ад іншых. Татэмісцкія ўяўленні адыгралі вялікую ролю ў фарміраванні рода-племяннога грамадства. На іх падставе адбываецца падзел усіх людзей на сваіх і чужых. Толькі на суродзічаў распаўсюджваюцца нормы і звычаі, выпрацаваныя звышнатуральнымі продкамі, астатнія людзі знаходзяцца па-за іх межамі. Таму менавіта з татэмізмам звязаны вызначаныя абмежаванні ў дзейнасці і зносінах. Указваецца, што можна рабіць, а чаго рабіць нельга, з кім можна кантактаваць, а з кім – не. Напрыклад, існаваў звычай, згодна з якім мужчыны і жанчыны адной татэмнай групы не маглі паміж сабой уступаць у шлюб. Такім чынам, на падставе татэмізму фарміруецца сістэма забаронаў – табу. Яны маглі тычыцца ўжывання ў ежу мяса якой-небудзь жывёлы (як правіла, татэма), кантактаў з замужняй жанчынай, працы ў акрэсленыя дні тыдня і г. д.

У працэсе ажыццяўлення татэмісцкай абраднасці, на думку Дзюркгейма, адбывалася сацыялізацыя індывіда, засваенне ім звычаяў і традыцый свайго этнасу, асноўнымі з якіх з'яўляліся недатыкальнасць жыцця суродзічаў, недаступнасць прынятых у дадзеным родзе абрадаў для прадстаўнікоў іншых татэмаў, правілы палавой рэгламентацыі, парадак перадачы татэма па мужчынскай альбо жаночай лініі.

***Анімізм*** *(ад лац. anima – душа, animus – дух) – вера ў існаванне ў прадметаў і працэсаў звышнатуральных двайнікоў: духаў у прыродзе*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*і душы ў чалавека.* Сам тэрмін быў уведзены англійскім этнографам Э. Тэйларам у працы "Першабытная культура" (1871). Ён сцвярджаў, што анімізм з'яўляецца першапачатковай элементарнай формай рэлігіі, з якой у працэсе гістарычнага развіцця ўзніклі ўсе астатнія вераванні і абрады. У далейшым гэтае палажэнне было раскрытыкавана. Даследаванні паказалі, што многія вераванні не ўяўляюць звышнатуральныя сілы ў выглядзе душы. Таму анімізм зараз разглядаецца як адна з элементарных формаў рэлігійнага жыцця.

Некаторыя гісторыкі рэлігіі лічаць, што пачаткі анімістычных уяўленняў узніклі вельмі даўно, верагодна, яшчэ да ўзнікнення радавых калектываў і фарміравання татэмізму. Аднак як сістэма дастаткова асэнсаваных і ўстойлівых поглядаў анімізм сфарміраваўся паралельна з татэмізмам.

Найбольш ранняй формай анімізму лічыцца вера ў духаў, якія для першабытнага чалавека з'яўляліся ўвасабленнем сілы, кіруючай той ці іншай прыроднай з'явай. Анімістычныя ўяўленні ўзніклі ў выніку прыпісвання раслінам і нежывым прадметам прыроды чалавечых якасцей. Прычым, яны, як правіла, прыпісваліся тым прыродным з'явам, ад якіх залежала жыццядзейнасць чалавека і само яго існаванне, таму ён спрабаваў наладзіць з імі своеасаблівы дыялог.

Трэба адзначыць, што перадумовы анімістычнага светапогляду захаваліся да гэтага часу і адлюстроўваюцца ў штодзённай і (асабліва) паэтычнай мовах. Напрыклад, мы кажам, што завіруха злуецца, сонца ласкавае, луг упрыгожыўся кветкамі, і тым самым прыпісваем гэтым з'явам чыста чалавечыя якасці. У першабытнага ж чалавека імкненне разглядаць наваколле па аналогіі з сабой было больш моцным.

Напрыклад, племя жыло на беразе возера, лавіла рыбу, і ад гэтага залежала яго існаванне. Возера магло "даць" або "не даць" рыбы, і трэба было неяк паўплываць на яго, каб атрымаць добры ўлоў: звярнуцца з просьбай, правесці абрад, прынесці ахвяру і г. д.

Такім чынам, анімістычныя ўяўленні ўзнікаюць са штодзённай жыццядзейнасці людзей, пераважна працоўнай. Матэрыялам жа для іх фарміравання паслужылі такія аптычныя і акустычныя з'явы, як цені, эха, адлюстраванні ў вадзе і г. д. У ходзе іх успрымання і асэнсавання першабытны чалавек зрабіў выснову, што ў свеце побач з бачнымі прадметамі ёсць яшчэ шэраг з'яў, якія маюць якасць быць няўлоўнымі ў сваёй цялеснасці. На гэтай падставе сфарміраваліся ўяўленні аб духах. Трэба адзначыць, што для першабытнага чалавека духі не былі чымсьці звышнатуральным, бо ён наогул не адрозніваў натуральнага ад звышнатуральнага, яны належалі да таго ж заканамернага ва ўяўленні першабытных людзей парадку прыроды, як і іншыя

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

прадметы і з'явы. Характэрнай іх адзнакай лічылася тое, што яны могуць быць няўлоўнымі і прымаць выгляд іншых прадметаў: дрэў, камянёў і г. д. У ходзе гістарычнага развіцця духі робяцца ўсё больш антрапаморфнымі, набываюць чалавечыя рысы і якасці.

Больш позняй і вышэйшай формай анімізму лічыцца вера ў адносна самастойнае існаванне душы, уяўленне аб якой сфарміравалася ў выніку ўвасаблення жыццёвых працэсаў чалавечага арганізма, такіх, як сон, непрытомнасць, крывацёкі, дыханне. Перад першабытнымі людзьмі паўставалі пытанні: што забяспечвае жыццядзейнасць чалавека, чаму чалавек з'яўляецца жывым, і што адбываецца, калі ён памірае. Значыць, у целе чалавека ёсць нешта, што робіць яго жывым. Гэтае "нешта" спачатку трактавалася чыста матэрыяльна і атаясамлівалася з крывёю. Заўважылі, што калі чалавек або жывёла губляюць шмат крыві, то паміраюць, таму ў многіх рэлігіях забаронена ўжываць у ежу кроў жывёл, каб не праглынуць разам з ёй іх душу. Душу таксама атаясамлівалі з дыханнем. Бачылі, што мёртвы чалавек адрозніваецца ад жывога перш за ўсё тым, што не дыхае. Многія народы лічылі, што душа пакідае цела паміраючага чалавека разам з яго апошнім выдыхам. На атаясамліванне душы і дыхання ўказвае нават сугучнасць гэтых слоў. Душа уяўлялася большасцю народаў у выглядзе нейкай паветранай матэрыяльнай субстанцыі, накшталт дыму альбо пару.

Вельмі істотны ўплыў на фарміраванне ўяўленняў першабытных людзей аб душы аказалі назіранні за працэсам сну. Сон знешне вельмі падобны на смерць: чалавек не рухаецца, нічога не чуе, яго дыханне робіцца павольным, а калі яго раптоўна разбудзіць, нейкі час прыходзіць у сябе. Апроч таго, людзі ў снах, не рухаючыся з месца, пераносяцца на сотні кіламетраў, перажываюць мінулыя, а часам і зусім незвычайныя, падзеі, сустракаюцца са знаёмымі, з памерлымі і г. д. Вельмі натуральна прыйсці да высновы, што ў чалавека ёсць нейкі двайнік, які пакідае яго цела ў час сну і ўдзельнічае ва ўсіх тых падзеях, што чалавек сніць. Такім двайніком лічылася душа, менавіта яна, па ўяўленнях першабытных людзей, забяспечвала ўсе жыццёвыя працэсы. Таму чалавека нельга было раптоўна будзіць, каб душа паспела вярнуцца са сваіх падарожжаў. Калі яна канчаткова адлятае ад цела – надыходзіць смерць. Але і тут выкарыстоўваліся аналогіі са сном. Лічылася, што пасля смерці душа не знікае, а накіроўваецца ў нейкае іншае месца і вядзе там далейшае існаванне. На гэтай падставе склаліся ўяўленні аб замагільным свеце. Існаванне там спачатку лічылася аднолькавым для ўсіх людзей, незалежна ад іх папярэдніх маральных учынкаў, і трактавалася па-рознаму: як шчаслівае і бесклапотнае, як сумнае і нуднае, або як поўная аналогія жыцця ў гэтым свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Чалавека рыхтавалі да замагільнага існавання. Ужо ў самых ранніх пахаваннях, якія адносяцца да перыяду палеаліту, археолагі знаходзяць зброю, прадметы пабыту, упрыгожванні. Усё гэта павінна было служыць памерлым на тым свеце. У далейшым на падставе прымітыўных першабытных уяўленняў аб лёсе душы чалавека пасля смерці фарміраваліся складаныя пахавальныя культы, як, напрыклад, у Старажытным Егіпце.

Вельмі часта душы памерлых продкаў ператвараліся ў духаў і ўспрымаліся як апекуны сваіх нашчадкаў. Да іх звярталіся з просьбамі, прасілі аб парадзе. Ім прыпісваліся звышнатуральныя якасці: яны лічыліся магутнымі, мудрымі заснавальнікамі роду і творцамі правіл гаспадарчай дзейнасці і маральных паводзін. Таму апошнія асвячаліся аўтарытэтам продкаў.

Уяўленне аб тым, што душы памерлых працягваюць сваё існаванне ў форме духаў і могуць аказваць уплыў на лёс жывых, з'яўляецца элементам, які аб'ядноўвае анімізм і татэмізм. Толькі ў першым продак уяўляўся не ў выглядзе расліны ці жывёлы, а як дух памерлага. Але ў абедзвюх гэтых формах элементарнага рэлігійнага жыцця неабходна было распрацаваць спосабы ўзаемадзеяння са звышнатуральнымі продкамі, каб дабіцца іх дапамогі і апякунства. Гэта з'явілася адной з падстаў фарміравання магіі.

***Магія*** (ад грэч. *mageia* – вядзьмарства, чараўніцтва) – прыпісванне звышнатуральнага значэння чалавечым дзеянням. Першае даследаванне магіі з навуковых пазіцый было дадзена англійскім этнографам Дж. Дж. Фрэзерам у працы "Залатая галіна" (1890 г.). Ён лічыў, што магія і рэлігія з'яўляюцца супрацьлеглымі культурнымі феноменамі. Магія, на думку Дж. Дж. Фрэзера, папярэднічае рэлігіі і ўзнікае як вынік спроб першабытнага чалавека знайсці рацыянальныя сродкі для тлумачэння свету і арыентацыі ў ім. Дж. Дж. Фрэзер разглядаў магію як элементарную форму мыслення, прымітыўную навуку. Рэлігія ўзнікае тады, калі магія сябе зжывае. У рэлігіі, і гэтым, на думку Дж. Дж. Фрэзера, яна адрозніваецца ад магіі, чалавек ужо шануе звышнатуральныя сілы і падпарадкоўваецца ім. У магіі ён гэтага не рабіў, цалкам спадзяючыся на вынікі сваіх уласных дзеянняў.

У далейшым пункт погляду Дж. Дж. Фрэзера быў раскрытыкаваны. Указвалася, што, як і любая форма рэлігіі, магія абапіраецца на веру ў звышнатуральнае. Для тых, хто робіць магічныя дзеянні, эфектыўнасць апошніх звязана не з імі самімі як матэрыяльнымі маніпуляцыямі, а з верай у іх звышнатуральнае ўздзеянне. Як правіла, магічныя ўяўленні і дзеянні ўзнікаюць тады, калі чалавек не ўпэўнены ў сваіх уласных сілах, сутыкаючыся з праблемамі, вырашэнне якіх залежыць не столькі ад яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самога, колькі ад мноства зменлівых фактараў. Таму магія ўжывалася ў найбольш адказныя моманты чалавечай жыццядзейнасці: пры паляванні на буйнога звера, на сяўбе, у ваенных дзеяннях, для лячэння хваробы і г. д.

Магія займала вельмі важнае месца ў жыцці першабытных людзей і пранізвала ўсе яго сферы. Існуе шмат яе класіфікацый у залежнасці ад розных крытэрыяў.

Так, па мэтах, на дасягненне якіх яна была накіравана, магія падзяляецца на шкодную і спрыяльную.

Шкодная (чорная) магія накіравана на прычыненне іншаму чалавеку або групе людзей якога-небудзь зла: хваробы, смерці, неўраджаю, падзяжу скаціны і г. д.

Спрыяльная (белая) магія накіравана на забеспячэнне поспеху ў якім-небудзь відзе чалавечай жыццядзейнасці: вайне, паляванні, каханні і г. д., або стварэнне спрыяльных умоў жыцця: здароўя, дабрабыту, добрага надвор'я і г. д.

У залежнасці ад спосабаў уздзеяння магія падзяляецца на кантактную, ініцыяльную, парцыяльную, імітатыўную, катартычную, апатрапеічную і вербальную.

Пры кантактнай магіі адбываецца непасрэднае судакрананне паміж аб'ектам уздзеяння і носьбітам звышнатуральнай сілы. Гэта можа быць нашэнне амулетаў, дакрананне да вызначаных прадметаў ці людзей, амавенне з магічнымі мэтамі і г. д.

Пры ініцыяльнай магіі чалавек пачынае той працэс, якога ён дабіваецца, як быццам бы скранае справу з месца, праяўляе ініцыятыву. Напрыклад, верылі, што калі выстраліць з лука ў бок паселішча варожага племені, гэта прывядзе да таго, што яго мужчыны будуць паміраць ад стрэл.

Пры парцыяльнай магіі ўздзеянне накіроўвалася не на сам аб'ект, а на яго частку. Напрыклад, для ўплыву на чалавека выкарыстоўваліся яго валасы, абрэзкі пазногцяў, пот і г. д.

Пры імітатыўнай магіі адбывалася імітацыя пажаданых працэсаў, або ўздзеянне накіроўвалася не на сам аб'ект, а на яго намесніка. Напрыклад, перад выхадам на паляванне мужчыны імітавалі, як яны будуць забіваць звера. Пры гэтым у якасці намесніка апошняга магло выступаць яго чучала.

Пры катартычнай магіі пажаданая мэта дасягаецца праз рытуальнае ачышчэнне чалавека. Напрыклад, пасля нараджэння дзіцяці жанчына лічылася нячыстай. З мэтай ачышчэння яе абмывалі ў вадзе, абкурвалі дымам і г. д.

Пры апатрапеічнай магіі мэта дасягалася праз выгнанне злых сіл, альбо ўстрыманне ад вызначаных дзеянняў. Напрыклад, перад

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паляваннем ці вайной мужчыны ўстрымліваліся ад палавых кантактаў, каб не страціць сваю моц.

Пры вербальнай магіі мэта дасягалася праз уздзеянне словам. Сюды адносяцца замовы, заклінанні і праклёны.

У залежнасці ад сферы ўздзеяння вылучаюць вытворчую, ваенную, лячэбную, любоўную, метэаралагічную і г. д. магію.

Вытворчая магія накіравана на забеспячэнне поспеху ў якой-небудзь галіне працоўнай дзейнасці: паляванні, земляробстве, будаўніцтве і г. д.

Ваенная магія накіравана на забеспячэнне перамогі ў ваенных дзеяннях. Мае дваісты характар: а) спрыяльны – магічныя абрады ажыццяўляюцца з мэтай дапамагчы сваім воінам, а таксама надаць ім смеласць, моц, спрытнасць і г. д.; б) шкодны – мэта магічных дзеянняў – прынесці шкоду ворагам, а таксама аслабіць іх баявыя якасці.

Лячэбная магія накіравана на вылечванне розных хвароб альбо іх прадухіленне. Да гэтага віду таксама адносяцца абрады, якія павінны забяспечыць паспяховыя роды ў жанчыны.

Любоўная (эратычная) магія накіравана на сферу кахання. Як правіла, яе мэта – выклікаць прыхільнасць у прадстаўніка супрацьлеглага полу, але таксама яна можа быць накіравана на знішчэнне сімпатыі да выканаўцы абрада або да саперніка (саперніцы), забеспячэнне ўдалага палавога акту, прадухіленне ці спрыянне цяжарнасці, стварэнне моцнай сям'і і г. д.

Метэаралагічная магія накіравана на змену надвор'я. Можа быць як спрыяльнай – забеспячэнне добрых прыродных умоў для сваёй дзейнасці, так і шкоднай – стварэнне дрэнных умоў для ворагаў.

***Фетышызм*** *(ад партуг. feitico – амулет, вядзьмарства) – прыпісванне звышнатуральных якасцей матэрыяльным прадметам.* Тэрмін быў уведзены ў навуковае словаўжыванне ў пачатку XVIII стагоддзя галандскім падарожнікам В. Босманам.

У якасці фетышаў могуць выступаць самыя розныя прадметы, як створаныя чалавекам, так і прыродныя. Прычынай узнікнення фетышызму, як і астатніх формаў элементарнага рэлігійнага жыцця, з'яўляецца тое, што першабытны чалевек не аддзяляў сябе ад навакolля і прыпісваў рэчам і з'явам чалавечыя якасці.

З аб'ектаў прыроды звычайна фетышамі рабіліся тыя, якія мелі незвычайную форму і таму аказвалі ўплыў на ўражанне людзей. Гэта мог быць дуб, абпалены маланкай, камень, які нагадвае чалавека альбо звера і г. д. Таксама ў якасці фетышаў маглі ўспрымацца прадметы, якія адыгралі нейкую ролю ў чалавечым жыцці: дрэва, што дапамагло схавацца ад ворагаў, крыніца, якая давала племені ваду і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Звышнатуральныя якасці маглі прыпісвацца агню, вадзе, зямлі і іншым прыродным аб'ектам і з'явам. У гэтым выпадку яны ператвараліся ў фетышы.

Найчасцей ролю фетышаў выконвалі чалавечыя вырабы. У залежнасці ад свайго звышнатуральнага прызначэння яны падзяляюцца на амулеты, талісманы і ідалы.

Амулеты – прадметы, якія павінны былі засцерагчы чалавека ад розных няшчасцяў: сурокаў, хваробы, смерці, падману і г. д. Як правіла, у якасці амулетаў выкарыстоўваліся прадметы невялікіх памераў, якія чалавек мог пастаянна мець пры сабе: адпаведным чынам апрацаваныя каменьчыкі, часткі раслін або жывёл, розныя ўпрыгожанні. Функцыю амулета магла выконваць татуіроўка.

Талісманы – прадметы, якія павінны былі забяспечыць здароўе і дабрабыт чалавека, а таксама поспех у розных відах дзейнасці. У якасці талісманаў выкарыстоўваліся тыя ж вырабы, што і ў якасці амулетаў.

Ідал – прадмет, якому нададзена форма чалавека або жывёлы і які можа выконваць просьбы і пажаданні. У адрозненне ад амулетаў і талісманаў, якія ажыццяўлялі свае звышнатуральныя функцыі аўтаматычна, проста пры іх ужыванні, ідалаў трэба было прасіць і, адпаведна, дзякаваць ім за выкананне просьбы.

Матэрыяльным прадметам маглі прыпісвацца не толькі станоўчыя, але і адмоўныя звышнатуральныя якасці. Апошнімі, паводле ўяўленняў, валодаў труп чалавека. Таму яго трэба было хаваць і ачышчацца пасля кантактавання з ім.

Неабходна падкрэсліць адрозненне паміж разгледжанымі вышэй элементарнымі формамі рэлігійнага жыцця і тымі абрадамі і рытуаламі, якія выконваюцца ў рэлігіях, узнікшых на больш позніх этапах гістарычнага развіцця, такіх, як іўдаізм, будызм, хрысціянства, іслам і іншых. У гэтых рэлігіях адбываецца звяртанне да звышнатуральнага, падпарадкаванне і служэнне яму. Таму абрады і рытуалы, а таксама рэчы, якія пры гэтым выкарыстоўваюцца, маюць тут, строга кажучы, чыста сімвалічны сэнс. Усе яны ўказваюць на звышнатуральнае, якое знаходзіцца "па-за" імі. Напрыклад, калі хрысціяне шануюць крыжы і іконы, гэта зусім не значыць, што звышнатуральныя якасці прыпісваюцца дадзеным кавалкам металу альбо дрэва: усе гэтыя прадметы – толькі знакі прысутнасці Бога. Ці калі мусульманін становіцца на калені, кланяецца і просіць аб нечым Алаха, гэта не значыць, што ён звязвае выкананне сваёй просьбы непасрэдна з тымі рухамі, якія робіць. Мусульманін звяртаецца да Алаха, дэманструе Яму пакорлівасць, і толькі ад Яго залежыць выкананне просьбы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Першабытны ж чалавек не адрозніваў натуральнага ад звышнатуральнага, і тое, і другое з’яўлялася часткай яго непасрэднага жыццёвага асяроддзя. Таму ў фетышызме звышнатуральныя якасці прыпісваліся самому матэрыяльнаму прадмету, магічныя дзеянні самі па сабе, толькі пры іх выкананні, павінны былі забяспечыць патрэбны вынік, душа ў анімізме звязвалася з крывёй і дыханнем, а татэм успрымаўся як рэальны продак кожнага члена роду.

Зараз элементарная формы рэлігійнага жыцця захаваліся ў народаў, якія знаходзяцца на першабытна-абшчыннай ступені развіцця, як другасныя і ўстарэлыя элементы ў некаторых рэлігійных напрамках, а таксама ў якасці забабонаў штодзённага жыцця.

## 2.2. Язычніцтва на Беларусі

2.2.1. Азначэнне язычніцтва. Тыпы язычніцтва на Беларусі.
2.2.2. Звышнатуральныя істоты беларускага язычніцтва.
2.2.3. Беларускія язычніцкія святы.

### 2.2.1. Азначэнне язычніцтва. Тыпы язычніцтва на Беларусі

Сам тэрмін “язычніцтва” ўзяты з Бібліі. Так у іўдаізме і хрысціянстве называлі папярэднія ім політэістычныя рэлігіі.

Яўрэі, якія вызнавалі іўдаізм, лічылі сябе богаабраным народам, а прыхільнікаў іншых рэлігій называлі проста “народы”, па-старажытнаяўрэйску “гоім”. Такім чынам яўрэі падкрэслівалі сваё адрозненне ад іншых: ёсць богаабраны народ і ёсць проста народы.

Гэты ж падыход быў запазычаны раннім хрысціянствам. Хрысціяне, незалежна ад нацыянальнасці, лічылі сябе Народам Божым, а прыхільнікаў іншых рэлігій называлі “народы”, па-старажытнаславянску “языцы”. Адсюль пайшоў тэрмін “язычніцтва”. Яго сінонімам у беларускай мове з’яўляецца слова “паганства”. Яно паходзіць ад лацінскага “*paganus*” – “жыхар вёскі”. Справа ў тым, што ў Рымскай імперыі хрысціянства спачатку распаўсюджвалася ў гарадах, а навокал, у вёсках, шанавалі старых рымскіх багоў. Логіка разважанняў была такая: мы, гараджане, – хрысціяне, а ў вёсках жывуць прыхільнікі іншай рэлігіі. Таму іх называлі “*pagani*” – “вяскоўцы”.

Трэба звярнуць увагу на тое, што спачатку тэрмін “язычніцтва” меў ацэначны характар: ёсць сапраўдная рэлігія (для іўдзеяў гэта іўдаізм, для хрысціян – хрысціянства), і ёсць усе астатнія –язычніцтва. У навуцы такі падыход, безумоўна, непрымальны. Таму назва тэмы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“Язычніцтва на Беларусі” мае ўмоўны характар і служыць для абазначэння ўсіх тых вераванняў і звычаяў, якія існавалі на нашых землях да прыняцця хрысціянства, а ў форме элементаў народнай культуры і забабонаў захаваліся і да нашага часу.

Язычніцтва аказала вельмі вялікі ўплыў на беларускую культуру. Хрысціянства на нашых землях канчаткова ўсталявалася даволі позна, прыкладна ў сярэдзіне XIII ст., а да гэтага нашы продкі прытрымліваліся язычніцкіх вераванняў і звычаяў.

Нават пасля перамогі хрысціянства язычніцтва не знікла і на працягу стагоддзяў з’яўлялася неад’емнай часткай штодзённага жыцця беларусаў. Зараз існуе вялікі пласт самабытнай беларускай язычніцкай культуры, у які ўваходзяць святы, звычаі, вусная народная творчасць, прадметы побыту, культавыя рэчы і г. д.

Язычніцтва – гэта тыпова натуральная рэлігія. На Беларусі яно ўзнікла з патрэб штодзённага сялянскага жыцця. Звышнатуральныя якасці нашыя продкі прыпісвалі тым прадметам і з’явам прыроды, ад якіх залежалі вынікі іх гаспадарчай дзейнасці, або якія адыгрывалі значную ролю ў іх побыце: сонцу, зямлі, агню, раслінам. Звычаі беларусаў былі накіраваны на ўстанаўленне кантактаў са сваім жыццёвым асяроддзем з мэтай забяспечыць поспех у працы і дабрабыт. Напрыклад, у працэсе земляробчай дзейнасці адбывалася прыпісванне звышнатуральных якасцей зямлі. Бачылі, што зямля родзіць, гэта разглядалася па аналогіі з тым, як нараджае жанчына. Таму на зямлю пераносіліся жаночыя якасці. Каб яна добра нараджала, існавалі шматлікія абрады. Напрыклад, жанчына клалася ў баразну, заціскала паміж кален бохан хлеба і сімулявала роды з мэтай падштурхнуць зямлю, каб яна дала добры ўраджай.

У беларускім язычніцтве, як і ва ўсякім іншым, можна вылучыць фетышысцкія, анімістычныя, магічныя і татэмістычныя вераванні і абрады. Іх вельмі шмат, таму мы разгледзім толькі некаторыя.

Фетышызм. Звышнатуральныя якасці нашы продкі прыпісвалі ў асноўным не сваім вырабам, а прыродным з’явам і аб’ектам. Так, агонь лічыўся апекуном дома і асновай дабрабыту сям’і. Яго стараліся не пазычаць, нават суседзям, каб з хаты не сышоў дабрабыт. Нельга было пляваць у агонь, бо ён мог пакараць за непавагу, і ў чалавека ўзнікала хвароба – вогнік: твар рабіўся чырвоным, як ад апёку. Ваду беларусы лічылі ачышчальнай і лячэбнай сілай. Перад святамі нашыя продкі абавязкова мыліся, прычым гэта было не проста змыванне бруду, а менавіта ачышчэнне, як цялеснае, так і духоўнае. Існавалі святыя крыніцы, да якіх чалавек мог прыйсці, расказаць пра свой дрэнны ўчынак, і вада гэты грэх змывала. Забаранялася пляваць у ваду. Пры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дапамозе вады лячылі: над ёй казалі замову і давалі выпіць хвораму. Зямля лічылася ўсеагульнай маці-карміцелькай. Нельга было лаяцца мацернымі словамі, бо гэта крыўджанне маці-зямлі, і яна можа перастаць радзіць. Думалі, што зямля не прымае вялікіх грэшнікаў і выкідвае іх на паверхню. Перад вялікімі няшчасцямі яна стогне, папярэджваючы тым самым людзей. Камяні, паводле ўяўленняў нашых продкаў, маглі лячыць хворых і выконваць самыя розныя просьбы: шыць вопратку і абутак, забяспечваць поспех у каханні, добрае надвор'е. Камяням прыносіліся ахвяры. Яны таксама былі абавязковай часткай язычніцкіх капішчаў. Бяроза шанавалася як дзявочы сімвал у час вясенняга свята Сёмуха (у хрысціянстве – Пяцідзесятніца). Дзяўчаты ішлі ў лес, дзе звязвалі верхавіны дзвюх невялікіх бярозак і ўтваралі такім чынам своеасаблівыя вароты, праз якія папарна праходзілі, спяваючы магічна-рытуальныя песні аб будучым добрым ураджаі. Завіванне бярозы павінна было садзейнічаць будучаму шлюбу дзяўчат. Лічылася, што бяроза спрыяе росту збожжа і агародніны, таму на Сёмуху ссякалі бярозкі і ўтыкалі іх у зямлю каля хат, а таксама кідалі ў збожжа. Дуб лічыўся сімвалам мудрасці, развагі, сілы, розуму. Звязваўся з культам Перуна. Капішча гэтага бога абавязкова рабілі альбо ў свяшчэннай дуброве, альбо пад магутным дубам. Вогнішча, якое тут знаходзілася, было з дубовых дроваў. Да нашых дзён на Палессі захавалася павер'е, што калі грыміць першы гром (гром і маланка – увасабленні Перуна), трэба пацерціся спіной аб дуб – тады ўсе хваробы як рукой здыме. Найболыш вядомай з раслін-фетышаў у ўсходніх славян, безумоўна, з'яўляецца папараць-кветка. Згодна з павер'ямі, цвіце яна раз у год, на Купалле. Гарыць чырвоным альбо белым святлом. Той, хто ёй авалодае, атрымае звышнатуральныя якасці: ён можа знаходзіць скарбы, яго сіла ўсіх адолее, ён будзе разумець мову звяроў, птушак і дрэў, знішчыць нагаворы чараўнікоў. З жывёл асабліва шанаваўся вуж. Лічылася, што ён садзейнічае ўрадлівасці зямлі і дабрабыту ў сям'і. У вужы бачылі пасланца добрых багоў і звярталіся да яго з просьбамі аб дажджы, ураджаі, шчасці. Выявамі галоў вужакі беларусы ўпрыгожвалі стрэхі і вокны сваіх хат, каб засцерагчыся ад усяго дрэннага: маланкі, ліхіх людзей, хвароб, пераляку.

Анімізм. Беларусы ўяўлялі душу ў выглядзе тонкай матэрыяльнай субстанцыі, накшталт дыму альбо пару, якая ў час сну пакідае цела чалавека праз рот і падарожнічае – сустракаецца з душамі іншых людзей, з душамі памерлых. Па гэтай прычыне чалавек бачыць сны. Падарожжа душы ўяўлялася па-рознаму: або яна праз нейкую стужку захоўвае сувязь з целам, або падарожнічае аўтаномна. Чалавека нельга было раптоўна будзіць, каб душа паспела вярнуцца ў цела. Калі

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

чалавек цяжка паміраў, думалі, што гэта душа не бачыць, куды ёй пайсці, і таму адчынялі вокны, дзверы і, нават, вымалі дошку са столі. Калі цяжка паміраў чараўнік, лічылася, што гэта чэрці цягнуць ягоную душу ў пекла, а яна супраціўляецца.

Душа таксама ўяўлялася ў выглядзе нейкай дробнай жывёлы, якая знаходзіцца ўнізе горла: яшчаркі, птушкі, пчалы. Калі пры памінанні нябожчыка з'яўлялася адна з гэтых жывёл, лічылі, што прыляцела душа чалавека.

Як і ў большасці народаў, смерць ва ўяўленні беларусаў – гэта вынік развітання душы з целам. Духі памерлых продкаў называліся дзядамі і лічыліся апекунамі сваіх нашчадкаў. Асноўныя звесткі пра ўяўленні беларусаў аб дзядах мы атрымліваем з абрадаў іх шанавання, якія звязаны са святам Дзяды.

Магія. Усё жыццё беларусаў было насычана рознымі магічнымі абрадамі і звычаямі, якія суправаджалі іх ад нараджэння да смерці. Напрыклад, каб выклікаць у цяжарнай жанчыны роды, яе муж клаўся каля парога, а жанчына пераступала праз яго. Існавала павер'е, што калі народзіцца дзіця і пупавіну яму перарэзаць на кніжцы, дык яно будзе вельмі разумным. Калі чалавек паміраў, на вокны ў хаце ставілі чыстую ваду, каб яго душа магла памыцца. Пры пахаванні і на памінках нельга было, каб што-небудзь рабілі родзічы памерлага, а толькі чужыя людзі. Лічылася, што тады чалавеку будзе лягчэй пакідаць гэты свет, бо ён бачыць, што ўсе, нават чужыя, яму спрыяюць.

Асабліва ў беларусаў была распаўсюджана земляробчая, лячэбная, любоўная і засцерагальная (апатрапеічная) магія. Земляробчымі абрадамі было насычана ўсё жыццё беларусаў, асабліва святы. Мэтай іх было забеспячэнне добрага ўраджаю. Напрылад, на Вялікдзень моладзь гушкалася на арэлях. Лічылася, што гэта садзейнічае росту пасеваў.

Амаль у кожнай вёсцы жыла знахарка ці знахар. Лячылі яны пры дапамозе сродкаў народнай медыцыны, але таксама выкарыстоўвалі магію. Напрыклад, чалавека клалі на парог і хадзілі па ім, каб выціснуць хваробу. Калі дзіця крычала па начах, яго трэба было пакалыхаць каля агню, каб адляцелі тыя звышнатуральныя істоты, якія яго мучаюць. Асноўную ролю ў лячэбнай магіі беларусаў адыгрывалі замовы. Іх было вельмі шмат – супраць кожнай хваробы існавала некалькі замоў. Казаліся яны звычайна на ваду, якую потым давалі выпіць хвораму.

Любоўную магію ў асноўным практыкавала моладзь. Лічылася, што калі з'есці той хлеб, які зліпся ў печцы з другім боханам, то хутка ўступіш у шлюб. Калі дзяўчына хутка сядзе на тое месца, дзе сядзела маладая, то сама неўзабаве пойдзе замуж. Калі жанчына ішла да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шлюбу і не хацела, каб у яе былі дзеці, то клала за пазуху зачынены замок. Лічылася па аналогіі, што калі замок зачынены – яна таксама зачыненая, і не будзе мець дзяцей.

Засцерагальная магія ў асноўным ужывалася супраць ведзьмаў і ведзьмакоў. Лічылася, што яны адбіраюць малако ў кароў і сала ў свіней, насылаюць хваробы, робяць іншыя шкоды. Каб засцерагчыся ад усяго гэтага, ставілі ў хлеў асінавае дрэўца, пасвечаную ў царкве свечку, вешалі перад уваходам забітую сароку, абсыпалі скаціну пасвечаным макам. Ужываліся таксама шматлікія замовы супраць варожых сіл.

Татэмізм. Існавалі ўяўленні аб тым, што людзі могуць ператварацца ў розных жывёл, пераважна ў ваўкоў. Але таксама былі паданні аб пераўтварэнні ў іншых жывёл, напрыклад, у мядзведзяў і буслоў. Мядзведзь на Беларусі называўся “бацюхнам”, “продкам”, “апекуном”, бусел – “братом”, воўк – “царыкам”. Лічылася, што бусел – гэта анёл ці чалавек, які быў Богам ператвораны ў птушку за сваю цікаўнасць: яму даручылі торбу з рознымі га́дамі, якую ён павінен быў выкінуць, а ён не стрымаўся, захацеў паглядзець, што там, развязаў торбу і ўсіх выпусціў. Таму, ператвораны ў птушку, ён павінен гэтых гадаў лавіць. На Беларусі існавала свята “Камаедзіца” ў гонар прабуджэння мядзведзя ад зімовай спячкі, ўдзельнікі якога пераапраналіся ў мядзьведзя. Таксама жывёлам прыпісваліся звышнатуральныя якасці. Напрыклад, лічылася, што калі мядзведзь пройдзе каля зачараванай хаты, то ніякія чары больш не будуць дзейнічаць, калі ён зойдзе ў вёску, то можа адвесці любое няшчасце і г. д. У час навальніцы станавіліся пад дрэва з гняздом бусла, бо лічылася, што ў яго ніколі не ўдарыць маланка. Бусел разумеўся як апякун і распарадчык ураджаем і дабрабытам, істота, якая прыносіць дзяцей. Ён суадносіўся з продкамі і замагільным светам. Існавалі ўяўленні пра змея як міфічнага продка, па некаторых паданнях зямныя жанчыны нараджалі ад змеяў дзяцей. Даследчыкі лічаць, што аб уяўленнях аб змяі як татэмнай жывёле сведчаць змеегаловыя браслеты ў дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў.

### 2.2.2. Звышнатуральныя істоты беларускага язычніцтва

Усё наваколле для беларусаў было заселена шматлікімі звышнатуральнымі істотамі. Умоўна іх можна падзяліць на дзве групы: ніжэйшыя звышнатуральныя істоты, альбо дэманы, і багі.

Паняцце “дэман” паходзіць ад грэчаскага “*daimon*” і служыць для абазначэння істоты, увасабляючай звышнатуральную сілу, якая дзейнічае нечакана. У язычніцтве яно не мае такой адмоўнай афарбоўкі, якая характэрна для хрысціянства, дзе пад дэманамі разумеюцца духі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зла. У беларускай міфалогіі дэманы – гэта ўвасабленне якасцей таго ці іншага месца або з’явы. Усе яны дахрысціянскага паходжання, але вельмі часта ў народным уяўленні іх узнікненне звязвалася з сюжэтам Старога Запавету аб анёлах, якія здрадзілі Богу. Адзін старэйшы анёл так узганарыўся, што вырашыў сесці побач з Богам. Аднак Бог яго піхнуў, і ён паляцеў дагары нагамі на зямлю, а разам з ім – усе астатнія здрадзіўшыя Богу анёлы. Пакуль яны ляцелі – ператварыліся ў нячысцікаў. У залежнасці ад таго, у якое месца яны ўпалі, склаліся іх характары. У беларускай міфалогіі ёсць добрыя і злыя нячысцікі. Чым больш небяспечным было тое ці іншае месца або з’ява, тым больш небяспечным лічыўся нячысцік, які іх увасабляў.

У хаце, згодна з уяўленнямі нашых продкаў, жыў Хатнік (Дамавік, Дамавы гаспадар). Па паходжанні гэта нячысцік, але ад доўгага жыцця побач з людзьмі ён страціў свае дрэнныя рысы. Жыве Хатнік у печы ці пад печчу, таму яго часта называлі Падпечнікам. Устае ён рана і палохае пеўня, штурхаючы яго. Той з перапугу крычыць і лопае крыллем, чым будзіць гаспадароў на працу. Хатнік любіць, калі ў сям’і жывуць дружна, тады ён дапамагае ў гаспадарцы. Калі ж у доме ідуць сваркі, Хатнік злуецца і робіць розныя шкоды: б’е посуд, хавае рэчы і г. д. Ноччу можа навальвацца зачыншчыку сямейных нязгод на грудзі і душыць яго. Хатнік звычайна мае выгляд старэнькага дзеда з сівой барадой і доўгімі валасамі. Апрануты ён у белую кашулю, падвязаную лыкам. Лічылася, што Хатнік тварам падобны на гаспадара той хаты, дзе ён жыве.

Хлеўнік – гэта нячысцік, які, згодна з павер’ямі, жыве ў хляве. Некаторыя даследчыкі лічаць яго мадыфікацыяй Хатніка, але ад апошняга Хлеўнік адрозніваецца сваёй шкоднасцю. Ён псуе скаціну: па начах ездзіць на конях і каровах, ад чаго яны слабеюць, худзеюць і могуць памерці. Існавала некалькі спосабаў, пазбаўлення ад Хлеўніка. Найбольш просты – паставіць у хлеў казла або казу. Хлеўнік не любіць гэтых жывёл і адразу сыходзіць. Самым лепшым сродкам для выгнання Хлеўніка лічыліся замовы. Думалі, што Хлеўнік нябачны. Толькі зрэдку ён узнікае ў выглядзе скручанага, зморшчанага, худога чалавека: нібы шкілет хлопчыка памясцілі ў скуру дарослага.

Злыдні – нячысцікі, якія лічыліся ўвасабленнем няшчасцяў сялянскай гаспадаркі. Дзе пасяляліся злыдні, туды прыходзіла беднасць. Уяўляліся яны ў выглядзе нябачных старцаў або чалавекападобных малых, гарбатых, скручаных стварэнняў у вялікіх ботах і шапках. Звычайна злыдні жывуць пад печчу, адтуль робяць нападзенне на гаспадарку і ўтвараюць розныя шкоды: крадуць яйкі ў курэй, псуюць цеста, падліваюць ваду ў малако. Яны не даюць чалавеку выбрацца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з беднасці, але таксама можа наклікаць на гаспадарку злыдняў, той хто вельмі хоча разбагацець і працуе праз меру.

Вадзянік – нячысцік, які, па ўяўленнях, жыве ў вадзе. Плавае ён надзвычай хутка на вялікім соме або пры дапамозе перапонак паміж пальцамі ног. Час ад часу Вадзянік вылазіць на бераг, але знаходзіцца там можа толькі некалькі хвілін, каб не засохнуць. Калі апошняе раптам здарыцца – набывае выгляд карча, пакрытага цінай і водарасцямі. Калі нехта закіне такі корч назад у ваду – Вадзянік ажывае і аддзяквае свайму выратавальніку: заганяе яму рыбу ў сеткі, не дае патапіцца. Апісваецца Вадзянік як вельмі стары, гарбаты, невысокага росту, усё цела яго пакрыта водарасцямі. Твар у Вадзяніка расплывісты, надзвычай невыразны, цела непрапарцыянальнае. Нягледзячы на тое, што ён увесь час знаходзіцца ў вадзе, Вадзянік – надзвычай брудная, смярдзючая і агідная істота.

Русалкі – гэта шкодныя істоты, у якіх, па павер’ях,ператвараюцца жанчыны-тапельніцы, а таксама дзеці жаночага полу, якія памерлі нехрышчонымі. Уяўляюцца ў выглядзе голых дзяўчат з распушчанымі зялёнымі валасамі. Маюць пяшчотныя блакітныя вочы. У халодную пару года русалкі жывуць у вадзе, але ў Русальны тыдзень (першы пасля Сёмухі) выходзяць на бераг і пасяляюцца на галінах дрэў. Так яны жывуць да восені. Лічыцца, што русалкі прываблiваюць да сябе людзей, асабліва маладых мужчын, а потым абступаюць іх, казычуць і з песнямі ды рогатам цягнуць у ваду. Каб выратавацца ад русалак, трэба хаця б адну з іх укалоць іголкай – тады ўсе яны з віскам кідаюцца ў ваду. Баяцца яны таксама цыбулі, часнаку, палыну. Аднак лепш за ўсё пазбягаць у Русальны тыдзень мясцін каля вады.

Лесавік – нячысцік, які жыве ў лесе, гаспадар лесу і звяроў. Уяўляўся ў выглядзе магутнага мужчыны, ростам з самыя вялікія дрэвы. Калі Лесавік сустракаў чалавека, імкнуўся яго або забіць, або доўга кружыў па лесе, а потым злосна рагатаў. Лічылася, што Лесавіка можна падмануць, калі пры ўваходзе ў лес няправільна назваць кірунак свайго шляху ці апрануць навыварат аддзенне, абуць левы лапаць на правую нагу, а правы – на левую, павярнуць шапку брылём назад, прачытаць тры разы нядзельную малітву.

Балотнік, Багнік, Аржавень – нячысцікі, якія, згодна з павер’ямі, жывуць, адпаведна, у балоце, багне, аржавенні. Уяўляюцца ў выглядзе агідных чалавекападобных істот. Балотнік – страшэнны таўстун, зусім без вачэй, увесь у тоўстым слоі гразі, да якой прыліп розны бруд, расліны і вадзяныя насякомыя. Багнік па выглядзе нагадвае Балотніка, але яшчэ больш брудны. Аржавень – брудна-руды, з надзвычайна тоўстым жыватом і тонкімі, як сцяблiны хвашча, нагамі. Гэтыя нячысцікі вельмі

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

шкодныя для чалавека і хатняй жывёлы. Звычайна прываблiваюць iх прыгожымі вобразамі і гукамі, а калі ахвяра завязне ў багне, заблытаецца ў карчах ды лазняку, хапаюць яе за ногі і паволі цягнуць да сябе.

Ваўкалак – чалавек, які, паводле павер'яў, ператварыўся сам або быў ператвораны кім-небудзь у нейкую жывёлу, часцей у ваўка. Лічылася, што ў ваўкалакаў не ўся скура пакрыта поўсцю, а толькі месцамі, так, што дзе-небудзь відаць чалавечае цела. Падзяляюцца яны на ваўкалакаў-чараўнікоў і зачараваных ваўкалакаў, няшчасных ахвяр чыйгосьці чараўніцтва. Першыя, ператварыўшыся ў ваўкоў, засвойваюць усе ўласцівасці звяроў-драпежнікаў, нападаюць не столькі на жывёлу, колькі на людзей, аднак, не ядуць іх, а толькі высмоктваюць мозг, думаючы тым амаладзіць сябе. Зачараваныя ваўкалакі зусім іншыя. Лічылася, што яны ручныя, выюць вельмі жаласліва ў бок сваіх вёсак, бо не страцілі чалавечых пачуццяў і свядомасці. Ніколі не нападаюць на чалавека і хатнюю жывелу.

Крывасмокі (вупыры) – істоты, якія, згодна з уяўленнямі, смокчуць кроў чалавека і жывёл. Лічылася, што ў іх ператвараюцца пасля смерці людзі, якія пры жыцці зналіся з нячыстай сілай. Па начах яны прыходзяць да сваіх былых ворагаў, а часам – родзічаў і сяброў, прыпадаюць губамі да іх грудзей і высмоктваюць кроў. Рысы твару ў вупыра тыя ж, што і пры жыцці, але губы ад смактання крыві распухаюць, а язык робіцца вострым, каб прабіваць скуру. Найбольш радыкальны спосаб пазбавіцца ад вупыра – гэта раскапаць ягоную магілу, адсекчы галаву і пакласці яе паміж ног, а цела прыбіць да зямлі асінавым колам.

Ліхаманка альбо Трасца лічылася ўвасабленнем хваробы. Яна мае ад сямі да дзевяноста дзевяці постацяў, якія падзяляюцца на асеннія і вясеннія. Першых уяўлялі ў выглядзе маладых прыгожых дзяўчат, другіх – у выглядзе агідных старых баб. Зімой Ліхаманка жыве пад зямлёй, выходзіць увесну на паверхню і бадзяецца, пакуль не трапіць на чалавека, які спіць на вясеннім сонейку. Ліхаманка можа папярэдзіць аб пагрозе хваробы: калі ж чалавек не паслухаецца, яна альбо плюне на яго, альбо пацалуе, і такім чынам пасяляецца ў арганізме. Ліхаманка таксама можа трапіць у чалавека праз рот у выглядзе парушынкі альбо мухі.

Чорт лічыўся цалкам варожай чалавеку звышнатуральнай істотай. Вобраз чорта дахрысціянскага паходжання, але хрысціянства аказала вялікае ўздзеянне на ўяўленні аб яго вобліку. Лічыцца, што чорт здольны ператварацца ў розных жывёл (кошку, сабаку, свінню, казла) альбо людзей (вандроўніка, дзіця, каваля, млынара), але ўласны яго выгляд наступны: гэта антрапаморфная істота, пакрытая чорнай поўсцю, на галаве два рогі, ззаду хвост, на нагах і руках вострыя кіпцюры,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у чарцей мужчынскага полу ёсць рэдкая барада, як у казла. Чэрці могуць жыць сем'ямі, па іншых павер'ях – спакушаюць жанчын, ад чаго нараджаюцца крывасмокі.

Чорт робіць людзям розную шкоду: уводзіць у падман, насылае дрэннае надвор'е, хваробу. Асабліва небяспечны ён у "нячыстых" месцах (ля балота, на перакрыжаванні дарог, у млынах) і ў вызначаны час сутак (ад поўначы да першых пеўняў, радзей – апоўдні) або года (на Каляды і Купалле). У гэтыя перыяды магчымы зносіны з нячыстай сілай, таму чараўнікі заклікалі чарцей у замовах.

Люцыпар альбо Анчыпар – згодна з павер'ямі, кіраўнік чарцей, увасабленне ўсяго зла. Крыніцай народных уяўленняў аб Люцыпары паслужыў хрысціянскі Люцыфер, але яму былі нададзены натуралістычныя рысы. Уяўляўся Люцыпар у выглядзе гігантскага чорта з надзвычайна злым тварам. Важыць ён столькі ж, колькі ўсе астатнія нячысцікі разам узятыя. Мае бачныя адзнакі сваёй годнасці: жалезную карону, якая прыбіта да чэрапа цвікамі, вілы ў магутнай лапе. Пры кожным выдыху Люцыпар выпускае з ноздраў доўгія пукі вогненных промняў, якія ўсё паляць на далёкай адлегласці.

Да другой групы звышнатуральных істот беларускага язычніцтва належаць багі. Само слова "бог" агульнае для ўсіх славянскіх моў і азначае "шчасце", "багацце". Адсюль, напрыклад, "баг-аты" (даслоўна "той, хто мае бога, гэта значыць – шчасце, удачу"), "у-богі" "у" – прэфікс, які азначае страту чагосьці), "з-божжа" ("са шчасцем, удачай"). Такім чынам, згодна з этымалогіяй, "бог" – гэта той, хто дае чалавеку ўдачу, клапоціцца аб ім.

У адрозненне ад большасці вышэйпералічаных ніжэйшых звышнатуральных істот, знаходжанне і ўлада якіх абмежаваны вызначаным месцам, улада багоў не мае прасторавай лакалізацыі, яны могуць дзейнічаць паўсюль.

Мы разгледзім толькі некаторых язычніцкіх багоў, культ якіх быў найбольш распаўсюджаны на Беларусі.

Пярун – бог грому і маланкі, даравальнік дажджу, апякун княжацкай дружыны. Уяўляўся ў выглядзе высачэннага волата з доўгай барадой, чорнымі валасамі, лукам (вясёлкай) і стрэламі (маланкамі). Маланкамі ён страляе ў чарцей, якія бягуць ад яго на зямлю і звычайна хаваюцца пад дрэвамі, але і там іх дастаюць стрэлы Перуна. Лічылася, што ў час навальніцы не трэба хавацца пад дрэва, а трэба маліцца і хрысціцца, каб адагнаць ад сябе чорта і не быць разам з ім забітым маланкаю. Таксама ўяўлялі, што Пярун трымае ў руках два вялікія жоравы, трэ іх і б'е адзін аб адзін – адсюль гром і маланкі. Асколкі ад жораваў, якія ўпалі на зямлю – гэта "перуновыя стрэлы".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так сяляне называлі рэштки старажытных крэмневых прылад працы, якія знаходзілі на палях.

Велес – бог дабрабыту, апякун хатняй жывёлы і паэтычнай творчасці, ахоўнік багацця. Імя Велеса звязвалася з золатам, Перуна – са зброяй. У Кіеве ў часы князя Ўладзіміра Пярун, бог княжацкай дружыны, стаяў на ўзгорку, Велес, апякун простага люду – на Падоллі. Уяўляўся Велес у выглядзе магутнага велікана з доўгімі валасамі і барадой. Лічылася, што ён надзяляе людзей талентамі, добрым слыхам і голасам, вялікім ростам. Па народных павер’ях, Велес навучыў людзей жывёлагадоўлі. Яго таксама лічылі апекуном вешчуноў і народных спевакоў. У “Слове пра паход Ігаравы” вешчы Баян названы “Велесавым унукам”.

Ярыла – бог сонца, вясенняй урадлівасці, пачуццёвага кахання, апякун земляробства. Уяўляўся ў выглядзе прыгожага маладога хлопца, які ў белым адзенні, з вянком на галаве і каласамі ў руках вясновым досвіткам ездзіць па палях на белым кані і аплодняе ніву. Ярыла лічыўся богам усякай урадлівасці, у тым ліку і жаночай, таму маладзіца, якая жадала мець дзіця, імкнулася пабачыць Ярылу.

У гонар Ярылы існавала свята – Ярылаў дзень (зараз гэта свята святога Ягорыя (Юрыя), які ў хрысціянстве замяніў Ярылу). Лічылася, што ў гэты дзень (6 мая) Ярыла адчыняе вароты неба і на белым кані выязджае на зямлю. З яго з’яўленнем пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты дзень упершыню выпускалі скаціну ў поле. Свята Ярылы суправаджалася карагодамі, песнямі, вячэрай. Самая прыгожая дзяўчына з вёскі прадстаўляла Ярылу. Яе саджалі на белага каня і вадзілі па палях. Пры гэтым спявалі песні ў гонар Ярылы, якія павінны былі забяспечыць добры ўраджай і нараджэнне здаровых дзяцей.

Жыжаль (Жыжа, Жыж) – бог агню. Жыве пад зямлёй, ходзіць там, выпускаючы з сябе полымя. У спакойным стане Жыжаль ідзе паціху, і ад яго полымя саграваецца зямля. Калі ж раззлуецца – перасоўваецца хутка, і полымя вырываецца на паверхню, выклікаючы пажары. Воблік Жыжаля неантрапаморфны, уяўляўся ён у выглядзе агню.

У беларускім язычніцтве ёсць таксама багі, дзеянні якіх звязаны з канкрэтнай парой года.

Зюзя – бог зімы і холаду. Яго імя паходзіць ад дзеяслова “зюзець” – “мерзнуць, калець ад марозу”. Уяўляўся ён у выглядзе невысокага, тоўстага, лысага дзеда з доўгай белай барадой, які ў расхрыстаным белым кажусе з непакрытай галавой і босы ходзіць па снезе і лютай сцюжай наганяе страх на ўсё жывое. Лічылася, што калі ад маразоў трашчаць дрэвы і бярвенні ў хаце, дык гэта Зюзя б’е па іх даўбнёй. Каб паменшыліся маразы, трэба было пералічыць імёны ўсіх лысых дзядоў у вёсцы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ляля (Лёля, Лада) – багіня вясны, кахання, дзявочага хараства. Уяўлялася ў выглядзе маладой прыгожай дзяўчыны, якая ранняй вясной ходзіць па праталінах і абуджае зямлю ад зімовага сну. Дзе яна ступіць, там зелянее трава, распускаюцца кветкі. У гонар Лялі існавала дзявочае свята – Ляльнік (5 мая), якое з’яўлялася заклікканнем вясны. Дзяўчаты збіраліся на лузе ці на агародзе, выбіралі паміж сабой “Лялю”, апраналі яе ў белую сарочку, упрыгожвалі зеленню, садзілі на ўзвышша і вадзілі вакол яе карагоды, спяваючы песні, у якіх славілі Лялю.

Цёця – багіня лета, а таксама звязаных з ім урадлівасці і дабрабыту. Уяўлялася ў выглядзе прыгожай мажнай жанчыны з жытнім вянком на галаве. У руках Цёця трымала хлеб, садавіну і гародніну, якімі яна адорвала кожнага, хто ёй сустрэнецца. Цёця лічылася сімвалам дабрабыту і шчодрасці. У галодную пару казалі: “Голад не Цёця, пададпрэ – лыка з’ясі”.

Жыцень – бажаство восені, апякун асенніх палявых работ. Уяўляўся ў выглядзе нізкага хударлявага старога з незадаволеным тварам, ускудлачанымі валасамі і трыма вачамі (трэцяе на патыліцы). Лічылася, што Жыцень садзейнічае росту і пасляванню збожжа і гародніны, а таксама назірае, ці добра вядзецца гаспадарка. Калі знойдзе на полі шмат каласоў, пакінутых жнеямі, збірае іх, звязвае ў снапы і пераносіць на поле таго гаспадара, у якога ўбрана чыста. У выніку на наступны год у нядбайнага гаспадара будзе меншы, а ў стараннага – большы ўраджай. Часам Жыцень у выглядзе жабрака з торбай ходзіць па дарогах і пагражае пальцам кожнаму сустрэчнаму. Гэта з’яўлялася знакам будучага вялікага неўраджаю. Ёсць прымаўка: “Жыцень з торбай – голад на двор”.

## 2.2.3. Беларускія язычніцкія святы

Беларускія язычніцкія святы з’яўляліся арганічнай часткай сялянскага жыцця. Іх характар звязаны са своеасаблівым успрыманнем часу, якое вельмі істотна адрозніваецца ад нашага. Мы ўяўляем час у выглядзе лініі, для нас ён цячэ ад мінулага праз сучаснасць да будучага. Для беларускага ж селяніна рух часу быў кругападобным і супадаў з гадавым земляробчым цыклам: перыядамі сяўбы, жніва, падрыхтоўкі да палявых работ. Пачатак кожнага перыяду года азначаў для селяніна неабходнасць пераходу да новага віду дзейнасці. Звычайна адзін гадавы перыяд ад другога аддзяляўся святамі. Яны мелі для нашых продкаў магічны сэнс. Лічылася, што гэта пераломныя дні, у якія парушаецца звычайны парадак рэчаў і вызначаецца характар будучага перыяду. У святы былі забаронены адны віды дзейнасці і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадпісаны іншыя – каб забяспечыць добры час. На святы гадалі і выконвалі розныя магічныя абрады.

Каляды – свята ў гонар пачатку новага года. Звязвалася яно з перыядам зімняга сонцазвароту, калі дзень пачынае паступова павялічвацца. Адзначаліся Каляды з 6 с 19 студзеня і складваліся з трох асобных свят: “Галоднай” (6–7 студзеня), “Шчодрай” (13–14 студзеня) і “Вадзяной” (18–19 студзеня) куцці. Куццёй называлася рытуальная каша з тоўчаных ячменных круп альбо пшаніцы. Яна варылася да кожнага з гэтых свят і ставілася на покуці (адсюль яе назва).

Каляды ва ўяўленнях беларусаў – гэта пераломны перыяд у часе, калі пачынаецца новы земляробчы цыкл, “новы час”, і можна пры дапамозе магіі паўплываць на яго характар, а таксама даведацца аб будучым. Увесь перыяд калядных свят у беларусаў быў насычаны рознымі абрадамі, прызначанымі ў асноўным забяспечыць добры ўраджай і матэрыяльны дабрабыт наогул. Так, на першую, ”галодную” або “посную”, куццю імкнуліся не хадзіць у госці, каб жывёла не разбягалася і не прападала. На другую, “шчодрую”, куццю ставілі на стол як мага больш страў, бо лічылася, што чым больш багатым будзе святочны стол, тым багацейшым будзе ў надыходзячым годзе жыццё. Найбольш вядомым земляробчым абрадам на Каляды з’яўляецца шчадраванне. Маладыя хлопцы і дзяўчаты хадзілі па хатах, славілі гаспадара з гаспадыняй і спявалі песні, а таксама выконвалі абрады, прызначаныя забяспечыць дабрабыт у хаце і добры ўраджай. За гэта гаспадары іх адорвалі.

Вельмі распаўсюджанымі на Каляды былі гаданні. Гадалі аб будучым ураджаі, а  дзяўчаты гадалі аб нарачоным.

Вялікдзень – язычніцкае свята ў гонар абуджэння прыроды і надыходу “вялікіх дзён” веснавых палявых работ. Пасля прыняцця хрысціянства стала супадаць па часе з Пасхай. Адзначаецца (у залежнасці ад месячнага календара) у адну з нядзель у перыяд з 4 красавіка па 8 мая.

У гэтым свяце пераплецены хрысціянскія і язычніцкія абрады. Ішлі ў царкву на Ўсяночную, але пасля яе кожны гаспадар імкнуўся як мага хутчэй прыбегчы дадому – хто будзе першым, той раней за ўсіх скончыць сяўбу, і ў таго будуць самыя хуткія коні. Рытуальнай ежы – пасцы і чырвоным яйкам – прыпісваліся магічныя якасці. Скарынкі ад пасхі сушылі, таўклі і клалі ў гарэлку – лічылася, што гэта засцерагае ад ведзьмакоў. Чырвоныя яйкі качалі па зямлі, каб надаць ёй жыватворчую сілу і забяспечыць добры ўраджай. Шкарлупкі ад яек затыкалі ў шчыліны як сродак супраць тараканаў. Маці гладзіла велікодным яйкам па тварах сваіх дзяцей, каб яны былі румянымі і чырванашчокімі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На другі і трэці дзень пасля Вялікадня па хатах хадзілі валачобнікі, якія славілі гаспадароў і спявалі песні, прызначаныя забяспечыць дабрабыт і добры ўраджай. У адказ гаспадары дзякавалі валачобнікам і давалі ім дарунак – валачобнае (булкі, сыр, фарбаваныя яйкі, каўбасы).

Купалле – свята ў гонар сонца і росквіту ўсіх жыццёвых сіл прыроды. Прымеркавана да летняга сонцастаяння і адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Лічылася, што на Купалле зямля надае раслінам асаблівую жыватворную сілу. Таму з ранку 6 ліпеня жанчыны і дзяўчаты збіралі зёлкі. Частку з іх пакідалі ў хаце на лекі, а некаторыя ўтыкалі ў сцены будынкаў для засцярогі ад злых сіл. Верылі, што дрэвы ў купальскую ноч могуць размаўляць паміж сабой і пераходзіць з месца на месца. На Купалле шукалі знакамітую папараць-кветку.

Шанаванне агню было звязана з купальскім вогнішчам, якое звычайна разводзілася на беразе возера альбо ракі. Яно надзялялася ачышчальнай і жыватворчай сілай. Праз яго скакалі, каб засцерагчыся ад хвароб. Лічылася, што калі хлопец з дзяўчынай, узяўшыся за рукі, пераскочаць праз купальскае вогнішча, дык абавязкова пажэняцца.

У купальскую ноч дзяўчаты гадалі на вянках, каб даведацца аб будучым замужжы. Раніцай 7 ліпеня моладзь купалася. Гэтаму надаваўся ачышчальны сэнс.

Купалле лічылася часам разгулу змрочных сіл: у гэтую ноч ведзьмы і ведзьмары імкнуцца зрабіць людзям розную шкоду. Па гэтай прычыне на Купалле звярталіся да засцерагальнай магіі: кідалі ў жыта галавешкі з агнём як сродак супраць нячыстай сілы, утыкалі ў будынкі купальскія зёлкі, праганялі праз купальскае вогнішча статак.

Дзяды – свята, звязанае з ушанаваннем памёрлых продкаў. На працягу года Дзяды святкаваліся некалькі разоў: перад масленым тыднем, пасля Пасхі (Радаўніца), перад Троіцай (траецкія Дзяды), перад святам Пятра і Паўла (пятроўскія Дзяды) і восенню другога лістапада (вялікія Дзяды, Асяніны). Зараз на Беларусі ў асноўным святкуюць толькі Радаўніцу, але раней найбольшае значэнне надавалася вялікім Дзядам.

У гэты дзень, другога лістапада, з ранку прыбіралася хата, гатаваліся ежа і пітво. Увечары каля святочнага стала збіралася ўся сям'я. Гаспадар пасля малітвы пайменна звяртаўся да ўсіх памерлых продкаў, запрашаючы іх на вячэру. Для дзядоў ставілася асобная міска, куды клалася патроху ад кожнай са страў. У час вячэры імкнуліся гаварыць толькі аб дзядах, іх добрых учынках і парадах. Пасля вячэры ўсе разам уставалі і развітваліся з дзядамі. Ежу, якая знаходзілася ў "дзядоўскай місцы", звычайна зранку аддавалі жабракам, бо лічылася, што так яна трапіць да памерлых продкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 3
# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РЭЛІГІІ

Нацыянальныя рэлігіі – гэта рэлігіі таго ці іншага народа. Чалавек робіцца паслядоўнікам гэтых рэлігій ужо ў сілу свайго нараджэння. У нацыянальных рэлігіях існуе моцная сувязь паміж нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасцю: лічыцца, што ўсе члены народа з'яўляюцца адначасова і прыхільнікамі "яго рэлігіі". Адмаўленне ад гэтай рэлігіі фактычна азначае разрыў са сваім народам. Нацыянальныя рэлігіі зараз існуюць у шэрагу краін, прыхільнікі ўспрымаюць іх перш за ўсё як неад'емную частку нацыянальнай культуры.

## 3.1. Рэлігіі Індыі

3.1.1. Ведызм і брахманізм.
3.1.2. Джайнізм.
3.1.3. Індуізм.
3.1.4. Сікхізм.

Індыя дае прыклад багатай і складанай рэлігійнай традыцыі, якая налічвае амаль 4 тысячагоддзі. Трэба адзначыць, што індыйская культура вельмі своеасаблівая і істотна адрозніваецца ад еўрапейскай. Сутнасная яе характарыстака – містыцызм і сузіральнасць. Асноўнымі нацыянальнымі рэлігіямі сучаснай Індыі з'яўляюцца індуізм, джайнізм і сікхізм. Але каб зразумець іх спецыфіку, як і спецыфіку духоўнай культуры Індыі ў цэлым, трэба разгледзець тыя рэлігіі, якія існавалі ў старажытнай Індыі, а менавіта, ведызм і брахманізм.

### 3.1.1. Ведызм і брахманізм

<u>Ведызм</u>, альбо рэлігія Вед, узнік у другой палове II тысячагоддзя да н. э. у выніку ўзаемадзеяння вераванняў і абрадаў мясцовых плямён і рэлігіі арыяў, якія ў сярэдзіне II тыс. да н. э. заваявалі Індыю. Сваю назву ён атрымаў ад чатырох зборнікаў рэлігійных гімнаў і заклінанняў – Ведаў (Рыгведа, Самаведа, Яджурведа, Атхарваведа). У ведызме налічвалася 3399 багоў, у якіх увасабляліся сілы прыроды. Устойлівай іерархіі, а таксама дакладнага раздзялення функцый паміж багамі спачатку не існавала. Найбольш часта ў Ведах узгадваюцца: Індра – бог буры, Сур'я – бог сонца, Агні – бог агню і інш. Узаемадзеянне з багамі адбывалася шляхам ахвяпрапрынашэнняў раслін і жывёл, якія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ажыццяўлялі жрацы ад імя ўсяго грамадства. Найбольш каштоўнай ахвярай лічыўся чалавек, далей ішлі конь, бык, баран, казёл. Ахвяры кідаліся ў агонь, лічылася, што разам з дымам яны ўзносяцца на неба, дзе знаходзяцца багі. У перыяд ведызму храмаў яшчэ не існавала. Для ахвярапрынашэнняў будаваліся капішчы.

У VIII ст. да н. э. на грунце ведызму ў Індыі ўзнікае брахманізм. У гэты перыяд індыйскае грамадства канчаткова падзяляецца на чатыры класы людзей – варны (слова “варна” азначае “колер”. Справа ў тым, што заваёўнікі – арыі і мясцовае насельніцтва належалі да розных рас: першыя – да еўрапеоіднай, другія – да негроіднай). Існавала варна брахманаў (вучоныя, жрацы, настаўнікі) кшатрыяў (воіны, правіцелі, знаць), вайш’яў (земляробы, рамеснікі, гандляры) і шудр (рабоў і слуг). Былі таксама людзі, якія знаходзіліся па-за межамі варн – недатыкальныя. Яны выконвалі самую брудную работу, і адзін толькі дотык да іх мог апаганіць. Варны былі замкнутымі ўтварэннямі. Забараняліся шлюбы і сумеснае прыняцце ежы паміж прадстаўнікамі розных варн, кантактаваць можна было толькі ў межах сваёй варны. Годнасць чалавека цалкам вызначалася яго варнавай прыналежнасцю, унутраны свет альбо асабістыя якасці не ўлічваліся. У далейшым варны падзяляліся на больш дробныя ўтварэнні – касты (ад парт. – род, від, парода). Зараз у Індыі каля трох тысяч каст.

Варна брахманаў займала ў старажытнаіндыйскім грамадстве вядучыя пазіцыі. Толькі брахманы маглі ажыццяўляць ахвярапрынашэнні, служылі дарадцамі ў цароў, тлумачылі Веды, валодалі манаполіяй у галіне адукацыі. Менавіта ад назвы гэтай варны, а таксама ад каментарыяў да Вед, якія называліся Брахманы, пайшоў тэрмін “брахманізм”.

У гэты перыяд значна ўскладняюцца рытуалы, пачынаецца будаўніцтва храмаў, у якіх адбывалася богаслужэнне. Ахвярапрынашэнні жывёл і раслін паступова замяняюцца больш сімвалічнымі формамі шанавання багоў: вешаннем на іх выявы гірляндаў з кветак, курэннем духмяных рэчываў, запальваннем свяцільнікаў і ўзліваннем вады. Гэтыя дзеянні часта суправаджаліся танцамі, музыкай, спяваннем эпічных паэм.

У веравучэнні адбываецца паслядоўнае ўзвядзенне шматлікасці з’яў бачнага свету да нейкай адзінай сутнасці, а таксама ўпарадкаванне касмагоніі і тэалогіі. У пантэоне на першы план выходзіць бог Праджрапаці, які ў Ведах займаў другараднае месца. Ён робіцца галоўным богам і айцом усіх багоў, першаасновай усяго існага, стваральнікам Сусвету і захавальнікам яго.

У брахманізме канчаткова фарміруюцца палажэнні, якія акажуць істотны ўплыў не толькі на рэлігіі Індыі, але і на індыйскую культуру ў цэлым.

У аснове веравучэння брахманізму ляжыць уяўленне аб дхарме (ад санскр. "трымаць") – безасабовым усеагульным і вечным парадку, які ўтрымлівае і захоўвае Сусвет як адзінае цэлае. Усё падпарадкоўваецца дхарме: багі, прырода, людзі. Дзякуючы ёй устанаўліваецца месца кожнай з'явы, кожнай часткі Сусвета ў цэлым.

У ведызме вучэнне аб дхарме мела касмалагічны характар – яна разумелася як парадак Сусвету. У брахманізме гэтае вучэнне набывае этычнае гучанне. Дхарма разумеецца як абавязак чалавека і саслоўя, да якога апошні належыць. А паколькі ў кожнага саслоўя і чалавека сваё прызначэнне і абавязак, то гэты абавязак рэалізуецца ў розных, нават супрацьлеглых адзін аднаму, учынках: што для аднаго з'яўляецца добрым, тое для іншага – грэх. Напрыклад, кшатрыі павінны ваяваць, брахманы – вучыць, шудры – падпарадкоўвацца.

Важнае месца ў брахманізме займае вучэнне аб перасяленні душ (сансара). Згодна з ім пасля смерці душа чалавека не знікае, але перасяляецца ў іншую істоту альбо прадмет. Такім чынам, душа з'яўляецца бессмяротнай, існуе кругазварот яе перараджэнняў, які падпарадкоўваецца закону кармы. Пад кармай разумеецца агульная сукупнасць учынкаў кожнай жывой істоты і іх вынікаў, якія вызначаюць характар яе новага нараджэння і існавання. Добрая карма (калі, пераважаюць станоўчыя ўчынкі) гарантуе ўдалае далейшае перараджэнне: у новым жыцці чалавек будзе брахманам альбо князем. Сярэдняя карма (калі колькасць добрых і злых учынкаў аднолькавая) дае магчымасць адрадзіцца прыкладна ў той жа якасці. Кепская карма (пераважаюць злыя ўчынкі) прыводзіць да таго, што чалавек адраджаецца ў больш нізкай варне альбо нават жывёлай. Лічылася, што за крадзёж зерня чалавек рабіўся пацуком, малака – варонай, мёду – камаром. За свае дрэнныя ўчынкі чалавек у будучым жыцці мог перацярпець тыя ж пакуты, якія ён прычыняў іншым людзям. Напрыклад, калі ён крыўдзіў сваю жонку, то мог стаць жанчынай, у якой будзе вельмі злы муж; калі кагосьці забіў – можа быць сам забіты і г. д.

Лічылася, што ёсць людзі, якія не падпарадкаваны закону кармы. Гэта тыя нешматлікія, хто адмовіўся ад мірскога жыцця і зрабіўся аскетам-пустэльнікам. Аскетычны рух набывае ў перыяд брахманізму шырокае распаўсюджванне. Менавіта ў асяроддзі аскетаў у VII–VI стст. да н. э. былі сфарміраваны Упанішады – філасофскія тэксты, палажэнні якіх аказалі вялізны ўплыў на далейшае духоўнае

жыццё Індыі. Сам тэрмін “упа-ні-шад” азначае “сядзець каля”, гэта значыць, быць каля ног настаўніка і ўважліва слухаць яго словы. Лічылася, што вучэнне Упанішад з’яўляецца тайным і даступным толькі абраным.

Ва Упанішадах бог-стваральнік Праджапаці трасфарміруецца ў Брахмана – вышэйшую абсалютную рэчаіснасць, ілюзорным адлюстраваннем якой з’яўляецца наш бачны свет. Мэтай рэлігійнага жыцця лічылася зліццё індывідуальнай душы, якая называлася Атман, з Брахманам. Дасягаецца гэта праз аскетычную практыку, а таксама праз асэнсаванне ілюзорнасці бачнага свету і дасягненне мокшы (“збаўлення”, “вызвалення”), якая азначае выхад з кола перараджэнняў, пазбаўленне ад усякай зменлівасці.

Філасофскія сістэмы брахманізму стварылі ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. трывалую падставу для з’яўлення шырокага кола людзей, якія шукалі выратавання і збаўлення (мокшы) у аддаленні ад людзей, адмаўленні ад усяго матэрыяльнага і канцэтрацыі ўвагі і намаганняў на вызваленні ўнутранага духоўнага “Я”. Сярод іх было шмат выхадцаў з небрахманскіх слаёў насельніцтва, але сам факт паходжання рабіў гэтых людзей як бы непаўнавартаснымі паслядоўнікамі таго ці іншага вучэння, бо ўсе вышэйшыя веды былі сканцэнтраваны ў руках брахманаў. Вынікам гэтага з’явілася імкненне выпрацаваць новае вучэнне, альтэрнатыўнае мудрасці брахманаў, прызначанай толькі для нямногіх, што прывяло да ўзнікнення ў Індыі такіх рэлігій, як джайнізм і будызм.

### 3.1.2. Джайнізм

Гэта рэлігія Індыі, узнікненне якой адносіцца да VI ст. да н. э. Колькасць прыхільнікаў зараз складае прыкладна 5 млн чалавек.

Заснавальнікам джайнізму быў выхадзец з сям’і кшатрыяў Вардхамана, які з’яўляецца гістарычнай асобай. Спачатку ён вёў звычайнае жыццё. Ва ўзросце 30 гадоў заняўся духоўнымі пошукамі, праз дванаццаць гадоў “дасягнуў вышэйшых ведаў” і стаў вядомы пад імем Джына (Пераможца) альбо Махавіра (вялікі герой). Яго лічаць апошнім з 24 ціртханкараў (“тых, хто знайшоў брод” – гэта значыць, тых, хто здолеў выйсці з кола сансары і тым самым дасягнуць абсалютнага выратавання).

Джайнізм з’явіўся як вынік саперніцтва паміж брахманамі і кшатрыямі за духоўнае кіраўніцтва ў грамадстве. Менавіта ў касце кшатрыяў з’явілася незадаволенасць панаваннем варны брахманаў, якія прысвоілі сабе выключнае права прадпісваць формы паводзін усім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

астатнім варнам, права рэгуляваць духоўнае жыццё краіны. Адчуваючы сябе абыдзенымі, кшатрыі пачалі праяўляць усё большую цікавасць да праблем пабудовы свету, сэнсу і мэты жыцця чалавека.

Ад брахманізму джайнізм успрыняў канцэпцыю сансары, кармы і мокшы. Ён з’яўляецца політэістычнай рэлігіяй, у джайнізме прызнаецца існаванне шматлікіх багоў і сцвярджаецца, што свет не з’яўляецца боскім тварэннем, ён вечны і незнішчальны. Яму ўласцівы пастаянныя цыклы развіцця, з перыядамі ўзнікнення, росту і заняпаду. Багі не валодаюць якой-небудзь рэальнай уладай над прыродай і людзьмі. Самі яны адрозніваюцца толькі вельмі доўгім жыццём, але таксама, як і людзі, падпарадкаваны сансары і карме.

У джайнізме няма супрацьпастаўлення матэрыяльнага і духоўнага. Адно з яго асноўных паняццяў – джыва (душа). Яна ўласціва людзям, жывёлам, раслінам, камяням. Лічыцца, што джыва ёсць ва ўсім. З гэтага вучэння ў джайнізме ўзнікае прынцып ахімсы – непрычыненне зла жывому ў любой форме. Джайны – не проста вегетарыянцы, яны нават не ўжываюць у ежу плады, дзе шмат сямян, бо апошнія – носьбіты новага жыцця.

Джыве супрацьстаіць аджыва (нежывое, неадушаўлённае, матэрыяльны пачатак). Згодна з вучэннем джайнізму увесь свет складаецца з джывы і аджывы. Праз карму душа аб’ядноўваецца з матэрыяй і праяўляецца ў форме жывых істот: раслін, жывёл, чалавека, боставаў. Прычым, у гэтым шэрагу чалавек – ключавое звяно, бо толькі ён можа спыніць дзейнасць закона кармы і дасягнуць вызвалення.

Тытул “джына” ў гэтай рэлігіі, ад якога яна і атрымала сваю назву, прысвойваецца тым настаўнікам веры, якія здолелі перамагчы свае слабасці, страсці, дрэнныя ўчынкі, зямныя прывязанасці і дасягнуць вызвалення ад сансары.

Шлях вызвалення ўключае, паводле вучэння джайнізму, “тры скарбы”. Першы – гэта “дасканалы погляд” – здольнасць бачыць свет такім, якім ён прадстаўлены ў вучэнні Джыны, поўная перакананасць у ісціннасці вучэння, сапраўдная вера ў кожнае слова дактрыны. Адэпт павінен адкінуць усе сумненні і накіраваць сваю свядомасць на выкананне палажэнняў веравучэння, яшчэ да таго, як ён іх асэнсаваў, зыходзячы з таго, што “так трэба”. Другі – “дасканалае пазнанне” – спасціжэнне сапраўднай сутнасці душы і навакольнага свету, пераадоленне няведання, якое з’яўляецца асноўнай прычынай “зямных страсцей і жаданняў”, вывучэнне джайнісцкай карціны свету, а таксама тэорый аб джыве, карме, ціртханткарах і г. д. Лічыцца, што неабходнай умовай гэтага з’яўляецца адмаўленне ад канцэнтрацыі свядомасці на сваім “Я”. Трэцяе – “дасканалыя паводзіны” – прадугледжваецца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выкананне пяці асноўных абавязкаў: не рабіць шкоды жывому (ахімса), не красці (асцья), не блудзіць (брахмачар'я), не прагнуць чужога (апарыгракха), быць шчырым і стрыманым у размовах (сацья). Строгасць гэтых зарокаў прывяла да таго, што ў першапачатковым джайнізме лічылася, што дасягнуць вызвалення могуць толькі манахі-пустэльнікі, якія цалкам парвалі сувязь са звычайным жыццём. Пасля склад суполкі джайнаў пачаў павялічвацца за кошт тых міран, якія спачувалі аскетам і падтрымлівалі іх матэрыяльна, а таксама жрацоў, якія кіравалі міранамі.

Сярод джайнісцкіх аскетаў ёсць дзве асноўныя групоўкі: дзігамбараў ("апранутыя ў паветра") і шветамбараў ("апранутыя ў белае"). Першыя прапаведуюць крайні аскетызм. Яны адмовіліся ад адзення наогул, адкуль і пайшла іх назва. Ежу яны прымаюць адзін раз у дзень, праз дзень і нават радзей. Лічаць, што жанчына не можа дасягнуць прасвятлення, бо ў яе для гэтага няма сіл. Шветамбары не падзяляюць такія крайнія погляды. Яны носяць белае адзенне. Жанчыны ў іх таксама "маюць права на нірвану". Паступова склаўся вобраз джайна – аголены, з марлевай павязкай, якая закрывае рот і з невялікай мяцёлкай, якой ён мяце дарогу перад сабой, – каб раптам не праглынуць альбо не раздавіць якую-небудзь жывую істоту. Ноччу манах не можа разводзіць вогнішча, як бы ні было холадна, бо ў агні могуць загінуць матылі. І наогул, яму забаронена хадзіць альбо штонебудзь рабіць ноччу, таму што ў цемры ён можа выпадкова зрабіць шкоду якойсьці жывой істоце.

Джайны, што не разарвалі са светам, жывуць суполкамі, у якіх вядуць строга аскетычны лад жыцця. Пастаянна займаюцца самаўдасканальваннем пад жорсткім самакантролем, упэўненыя ў тым, што гэта дапаможа ім дасягнуць стану мокшы. Сябры суполкі прытрымліваюцца строгай манагаміі, самі суполкі эндагамныя – шлюбы ажыццяўляюцца толькі ў іх межах. Сацыяльны склад суполкі джайнаў вызначаецца вучэннем гэтай рэлігіі, таму сярод іх няма сялян, праца якіх звязана з нанясеннем шкоды жывому. Джайны спрадвеку жылі ў гарадах, іх заняткамі былі рамяство, гандаль, ліхвярства. Сумленнасць джайнаў, дакладнасць іх працы, дазвалялі ім займаць такія сацыяльныя пазіцыі, як зборшчыкі падаткаў і г. д. Усё гэта прывяло да ўзнікнення фінансавага капіталу джайнаў, не маленькага і вельмі ўплывовага сацыяльна. Зараз джайны займаюць вядучыя пазіцыі ў фінансава-эканамічным жыцці Індыі. Заможныя джайны таксама вядуць вельмі сціплае асабістае жыццё, і таму яны трацяць свае грошы на падтрымку мастацтва і навукі, выданне кніг, у першую чаргу – джайнісцкіх, на дапамогу студэнтам, будаўніцтва храмаў, школ, прытулкаў для бедных і г. д.

### 3.1.3. Індуізм

Індуізм – трэцяя па колькасці паслядоўнікаў рэлігія ў свеце пасля хрысціянства і ісламу. Зараз яго вызнаюць больш 1 млрд. чалавек, з якіх больш 950 млн жывуць у Індыі і Непале. Таксама індуізм распаўсюджаны ў Бангладэш, Шры-Ланцы, Пакістане, Інданезіі, Малайзіі, Сінгапуры. Шмат прыхільнікаў гэтай рэлігіі жывуць у Велікабрытаніі, Канадзе і ЗША.

Індуізм узнік як вынік трансфармацыі брахманізму ва ўмовах распаўсюджвання джайнізму і будызму. Імкнучыся ўтрымаць свае пазіцыі, брахманы прыстасоўваліся да новых умоў, уключаючы ў свае вераванні палажэнні, якія раней былі для іх чужымі. Вучэнні ведызму і брахманізму былі пераапрацаваны пад уздзеяннем як даарыйскіх уяўленняў, так і джайнізму і будызму. Такім чынам, у канцы I тысячагоддзя да н. э. склаўся комплекс разнародных рэлігійных уяўленняў, якія не ўступалі ў яўную супярэчнасць з Ведамі, але больш адпавядалі новым умовам жыцця. Так паступова ўтварылася тая сукупнасць вераванняў і абрадаў, якую пазней сталі называць індуізмам. У пачатку нашай эры індуізм і будызм развіваліся ў Індыі паралельна, і іх палеміка была галоўным рухавіком гэтага развіцця. У IV–VI стст. н. э. індуізм зрабіўся пануючай рэлігіяй у краіне, выйграўшы саперніцтва ў будызму і джайнізму. Будызм быў амаль цалкам выціснуты за межы краіны. Што тычыцца джайнізму, то ён з-за сваёй патрабавальнасці – рэлігія нешматлікіх, прыкладна 0,5 % насельніцтва Індыі.

Сама назва “індуізм” узнікла прыкладна ў пачатку XIII ст. н. э. у сувязі з імкненнем мусульманскіх заваёўнікаў вызначыць розніцу паміж верай індыйцаў і ісламам. “Індуізм” – персідскі эквівалент слова “індыец”. Самі прыхільнікі называюць сваю рэлігію “санатана дхарма” – “вечны закон” альбо “вечнае вучэнне”, падкрэсліваючы пазазямное паходжанне іх вераванняў, узнікшых ў выніку боскіх адкрыццяў.

У індуізме існуе вялікая колькасць свяшчэнных тэкстаў, якія ствараліся на працягу тысячагоддзяў. Найбольшым аўтарытэтам карыстаюцца Веды і Упанішады. Да іншых тэкстаў адносяцца Пураны (“старажытныя паданні”) – тэксты, якія ўтрымліваюць уласна індуісцкую міфалогію, і старажытнаіндыйскія паэмы “Махабхарата” і “Рамаяна”.

У індуізма няма заснавальніка і няма прарока. Таксама няма духоўнай іерархіі і абавязковага набору палажэнняў веравучэння. Значэнне надаецца хутчэй вобразу жыцця, а не вобразу думак. Індуізм – аснова традыцыйнага спосабу жыцця большасці індыйцаў. Зараз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у Індыі не ўсе, хто нарадзіўся індусам, вызнаюць індуізм, але лічыцца, што яны індусы, таму, што нарадзіліся індусамі.

Даць азначэнне індуізму вельмі цяжка па прычыне вялікай разнастайнасці тых традыцый і вераванняў, якія ў яго ўваходзяць. Насельніцтва Індыі – неаднанароднае. Па-першае, кожны індыец належыць да той ці іншай касты, якая ажыццяўляе абрады ў адпаведнасці са сваім палажэннем у грамадстве. Па-другое, Індыя – шматнацыянальная краіна. Зараз у ёй налічваецца больш за 500 народнасцяў і плямёнаў. Апроч таго, кожная мясцовасць мае сваю мову, традыцыі і, адпаведна, рэлігійныя вераванні і абрады.

Як правіла, тэрмінам "індуізм" абазначаюць сукупнасць рэлігійных кірункаў, якія грунтуюцца на Ведах. Але гэта не абавязкова – некаторыя кірункі, якія адносяцца да індуізму, не прызнаюць свяшчэнны характар Вед, але прызнаюць тых жа багоў, якія ўзгадваюцца ў Ведах, і прытрымліваюцца асноўных маральных прынцыпаў, што і іншыя кірункі ў індуізме. Такім чынам, індуізм можна больш правільна абазначыць не як адзіную рэлігію, а як сукупнасць рэлігій і традыцый. У індуізме адсутнічае адзіная сістэма вераванняў і агульная дактрына. Няма ў ім таксама цэнтралізаванага органа кіравання. Нягледзячы на гэта, індуізм мае сваю ўласную спецыфіку, якая вылучае яго сярод іншых рэлігій.

Да агульных палажэнняў індуізму адносяцца:

– прызнанне існавання Брахмана як Абсалюта, які арганізуе сусвет;

– прызнанне Атмана – часціцы Брахмана, якая заключана ў плоцкую абалонку індывіда;

– вучэнне аб сансары і карме. Спыненне дзейнасці кармы, выхад з сансары і дасягненне мокшы – канчатковая мэта жыцця індуса. Дасягнуць гэтай мэты магчыма рознымі спосабамі. У індуізме кожны можа выбіраць свой шлях да Бога, які яму бліжэй, і ні адзін з гэтых шляхоў не будзе лічыцца лепшым альбо горшым за астатнія. Філосаф можа аддавацца глыбокім разважанням, брахман – рэлігійным спрэчкам, аскет – практыкам жорсткага абмежавання сваіх цялесных патрэб, просты чалавек – паўтараць мантру (малітву-заклінанне). Усе гэтыя спосабы ў роўнай ступені прымальныя ў індуізме.

Індуізм грунтуецца на веры ў непарыўнасць касмічнага і індывідуальнага быцця. Ёсць тры асноўныя шляхі, якія вядуць да вызвалення:

– шлях дзеянняў – выкананне абавязку, ажыццяўленне рытуалаў, шанаванне продкаў. Яго аснова – следаванне сваёй дхарме. Трэба бескарысліва выконваць свой абавязак, з поўным унутранным адрачэннем і не разважаючы аб выніках сваіх дзеянняў;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– шлях ведаў – пошук ісціны, спасціжэнне адзінства Атмана і Брахмана. На гэтым шляху трэба развіваць інтэлект і звышпачуццёвую інтуіцыю, разважаць над свяшчэннымі тэкстамі, спасцігаць вышэйшую мудрасць, якая ў іх заключаная;

– шлях адданасці – любоў да багоў, вернасць ім. Гарачая любоў і паслядоўная адданасць ачышчаюць сэрца і накіроўваюць думкі да вышэйшых ведаў. Усякае дзеянне той, хто ідзе гэтым шляхам, робіць дзеля свайго боства і ўспрымае любое дзеянне як ахвяру, якую прыносіць.

Можна сказаць, што індуізм папулярызаваў брахманізм, надаў яму міфалагічную форму і стварыў новы пантэон, у якім ведысцкія багі выціснуты на перыферыю. На першы план выйшлі тры багі: Брахма, Вішну і Шыва. Кожны з іх увасабляе адну з касмічных сіл: Брахма – стваральнік свету, Вішну – яго захавальнік, Шыва – разбуральнік у канцы кожнага з касмічных цыклаў. Усе тры багі часта ўяўляліся разам: яны альбо стаялі побач, альбо іх целы быццам бы выраслалі адно з другога.

Брахма – бог стваральнік. Ён усходзіць да брахманісцкага Брахмана-Абсалюта і з’яўляецца больш зразумелай для простых людзей яго мадыфікацыяй. Стварэнне ім свету разумеецца як трансфармацыя першапачатковага Адзінства Вышэйшай рэчаіснасці і Вечнасці ў шматлікасць і часовасць усяго, што адбываецца. Яго паходжанне ад абстрактнага Брахмана аказала ўплыў і на стаўленне да яго з боку асноўнай колькасці простых вернікаў. З пункта погляду індуізму, гэта – “далёкі” бог, не прыстасаваны да патрэб штодзённага жыцця. Ва ўсёй Індыі яму прысвечаны толькі два храмы. Выявы Брахмы сустракаюцца ў храмах іншых багоў, але яго самастойнага культу практычна не існуе. У асноўным шануюцца Вішну і Шыва, таму індуізм распадаецца на два асноўныя кірункі: вішнуізм і шываізм.

Вішну – цэнтральны бог індуісцкай трыады. Як бог – захавальнік свету, Вішна мае мяккі і міралюбівы характар, ён блізкі да людзей. З культам Вішну звязана канцэпцыя аватараў (“нісходжанняў”), якая заключаецца ў вучэнні аб перыядычным з’яўленні Вішну ў свеце ў розных абліччах, каб дапамагчы людзям. Такіх аватар дзесяць. Найбольш вядомымі з іх з’яўляюцца восьмая і дзевятая – гэта, адпаведна, Крышна і Буда. Апошняя, дзесятая аватара Вішну – Калка (Вершнік на Белым Кані) – прыйдзе ў канцы нашага свету і ўстановіць залаты век.

У шываізме ўсе тры функцыі багоў (стварэнне свету, яго захаванне і далейшае разбурэнне) прыпісваюцца аднаму Шыве. Ён шануецца і як стваральнік, і як захавальнік, і як разбуральнік. З аб’яднання гэтых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

супрацьлеглых функцый узнікае супярэчлівы вобраз Шывы, яго шматаблічча. Шыва часта ўяўляецца ў позе ёга, які знаходзіцца ў стане глыбокай медытацыі. Ён сядзіць на скуры тыгра на адной з вяршынь Гімалаеў і сілай сваёй думкі падтрымлівае існаванне сусвету. У цэнтры лба ў яго знаходзіцца трэцяе вока, якое дазваляе Шыве ўбачыць тое, што звычайна схавана.

Але Шыва – таксама агрэсіўны і дэманічны бог, які валодае надзвычайнай энергіяй. Выражэннем апошняй з'яўляецца вобраз Шывы, які танцуе. Танец Шывы ў розных формах сімвалізуе ўсе тры віды яго дзейнасці: стварэнне свету, захаванне яго з дапамогай моцнага рытму і разбурэнне.

Паводле шываізму, ўся сіла і моц Шывы знаходзяцца не столькі ў ім самім, колькі ў яго духоўнай энергіі шакці. Шакці звязана ў Шыве з яго мужчынскай жыццестварáльнай патэнцыяй. Лічылася, што ў момант аб'яднання Шывы з яго жаночай палавінай гэтая энергія шматразова ўзмацняецца. Звычайна Шыва шануецца ў выглядзе лінгама, які сімвалізуе мужчынскі палавы орган. Каменны слуп лінгама ў храмах заўсёды спалучаецца с аснаваннем у выглядзе кальца, якое сімвалізуе жаночы пачатак, ёні.

З цягам часу паняцце шакці стала разумецца не столькі як духоўная сіла і мужчынская патэнцыя самога Шывы, колькі як яго жаночы пачатак, увасоблены ў жонках Шывы, найбольш вядомымі з якіх з'яўляюцца Дурга і Калі.

Апроч вышэйназваных, у індуізме існуе незлічоная колькасць іншых багоў. Індыйскае паданне сцвярджае, што іх роўна 3 333 333, але гэта ўмоўная лічба. У кожнай мясцовасці маюцца свае галоўныя і другарадныя багі. Увесь іх пантэон немагчыма не толькі апісаць, але і нават пералічыць: ён неабсяжны. Акрамя багоў у яго ўваходзяць паўбогі, святыя, апекуны радоў, каст, сем'яў, дэманы, духі, прывіды.

Таксама для індуізму характэрна шанаванне жывёл, напрыклад, каровы, кобры, бычка, малпы. Гэта звязана, па-першае, з верай у перараджэнне і, па-другое, з прыпісваннем гэтым жывёлам звышнатуральных якасцей.

Зараз індуізм ахоплівае 87 % насельніцтва Індыі. Усе моманты жыцця большасці індыйцаў – нараджэнне, сталенне, уступленне ў шлюб, смерць – звязаны з індуісцкімі абрадамі. Важным элементам рэлігійнага жыцця з'яўляецца паломніцтва да храмаў, а таксама да свяшчэнных рэк Інда і Ганга.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### 3.1.4. Сікхізм

Сікхізм – самая маладая нацыянальная рэлігія Індыі. Яе назва паходзіць ад санскрытскага “шыш’я” – вучань. Узнік у XV ст. у Пенджабе – рэгіёне на паўночным захадзе Індыі. Сікхізм – рэлігія не Індыі ў цэлым, у асноўным пенджабцаў. Колькасць яго паслядоўнікаў – прыкладана 2 % насельніцтва краіны. Гэта больш, чым колькасць паслядоўнікаў джайнізму, але, у адрозненне ад апошняга, сікхізм распаўсюджаны больш у сельскай мясцовасці. У гарадах гэта рэлігія дробных і сярэдніх прадпрымальнікаў, гандляроў, рамеснікаў і г. д.

Сікхізм узнік як вынік сінтэзу элементаў індуізму і ісламу. У XII ст. пачалося заваяванне Індыі мусульманамі. У паўночнай частцы краіны стварыўся спачатку Дэлійскі султанат (у пачатку XIII ст.), а потым (у пачатку XVI ст.) – імперыя Вялікіх Маголаў. Дзяржаўнай рэлігіяй у гэтых краінах стаў іслам, які ўступіў ва ўзаемадзеянне з індуізмам.

Кіруючыя вярхі імперыі Вялікіх Маголаў складаліся з паслядоўнікаў суфізму – містычнага руху ў ісламе, які прапаведваў бязмежную любоў да Алаха, роўнасць усіх людзей перад богам і аўтарытэт духоўных настаўнікаў. Простае ж насельніцтва прытрымлівалася бхакцізму – кірунку ў індуізме, што прапаведваў экстатычную любоў да бога, у якой усе роўныя. Сікхізм узнік як своеасаблівае аб’яднанне суфізму і бхакцізму.

Яго заснавальнікам быў гуру Нанак (1469–1538 гг.). Ён прапанаваў новае веравучэнне, цэнтрам якога стаў адзіны Бог, які не мае ніякага аблічча, фіксаванага імя, не валодае ніякімі якасцямі, але прабывае ўсюды і ва ўсім. З суфізму Нанак запазычыў ідэю аб тым, што Бог – гэта дабро і любоў і што трэба імкнуцца да зліцця з бажаством пад кіраўніцтвам настаўніка-гуру. Менавіта такім гуру для яго паслядоўнікаў і зрабіўся Нанак. Сікхі (сам гэты тэрмін перакладаецца як “вучні”, г. зн. паслядоўнікі гуру Нанака) перш за ўсё падкрэслівалі роўнасць людзей перад Богам. У сікхізме адмаўляецца такая важная кампанента індыйскага грамадства, як падзел на касты. Выступаючы супраць каст і рытуалізму брахманаў, супраць аскетызму, за шырокі ўдзел мужчын і жанчын у актыўным жыцці, Нанак ў якасьці сімвала адзінства вернікаў ўвёў практыку сумеснага прымання ежы прадстаўнікамі розных каст у храмах, якія для мясцовага насельніцтва зрабіліся своеасаблівымі грамадскімі цэнтрамі, падобна мусульманскім мячэцям.

Мэтай жыцця ў сікхізме абвяшчалася зліццё з Богам пасля ланцуга перараджэнняў, пры якім боская і чалавечая сутнасць робяцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адзіным цэлым. Шлях дасягнення гэтага – любоў да Бога, але не за межамі звычайнага жыцця (праз манаства, аскетызм і г. д.), а менавіта ў ім: праз дом, сям'ю, дабрасумленную працоўную дзейнасць, напоўненыя любоўю да Бога. Такім чынам, сікхізм прапанаваў людзям новую сістэму каштоўнасцей – актыўнае жыццё, упартую працу, узаемадапамогу, прынцып роўнасці ўсіх людзей. Веравучэнне сікхізму зафіксавана ў кнізе "Адзі Грантх" ("Спрадвечная кніга"). Яна лічыцца свяшчэннай, і яе першы асобнік знаходзіцца ў горадзе Амрытсар, у знакамітым Залатым Храме – асноўным месцы паломніцтва сікхаў.

Пропаведзь гуру Нанака і яго пераемнікаў (усяго сікхі прызнаюць дзесяць настаўнікаў-гуру, якія паслядоўна змянялі адзін аднаго), трапіла на падрыхтаваную глебу і выклікала энтузіязм сярод насельніцтва Пенджаба. Узнікла рэлігійная арганізацыя сікхаў, уплыў якой хутка ўзрастаў, тым больш, што спачатку магольскія імператары яе падтрымлівалі. Сікхі ўтварылі вялізную суполку, сябры якой падпарадкоўваліся асаблівым правілам і нават знешне адрозніваліся ад мусульман і індусаў.

З другой паловы XVI ст. узмацнілася супрацьстаянне пенджабскага сялянства, большую частку якога складалі сікхі, і мусульманскіх уладароў Індыі. На мяжы XVII–XVIII стст. у Пенджабе адбылося антымусульманскае паўстанне пад сцягам сікхізму. Тады ж дзесяты гуру, Гавінд Сінгх, унёс шэраг змен у вучэнне сікхізму і арганізацыю суполкі. Было абвешчана, што вышэйшая духоўная ўлада пераходзіць ад гуру да суполкі найбольш адданых веры, гатовых загінуць за яе ў любую хвіліну – хальсе ("ордэну чыстых"). Тады ж было прынята рашэнне перарваць лінію жывых гуру, з гэтага часу іх ролю стаў выконваць містычны саюз свяшчэннай кнігі "Адзі Грантх" і хальсы. Рашэнні сходу сікхаў у прысутнасці "Адзі Грантх" былі абвешчаны аналагічнымі рашэнню гуру. З гэтага часу да імені сікха сталі дадаваць воінскі тытул "сінгх" (леў), а да імені жанчыны – "каур" (львіца). Такім чынам, быў узаконены ваенізаваны характар суполкі сікхаў.

Тады ж быў выпрацаваны і асаблівы кодэкс паводзін сікхаў. Галоўнымі атрыбутамі сікхаў, якія і зараз вызначаюць іх знешні воблік, з'яўляюцца так званыя "пяць К". Яны абавязаны не стрыгчы валасы, вусы і бараду (кеш), валасы пад цюрбанам трэба абавязкова замацоўваць грэбнем (кангха), пры сабе трэба заўсёды мець меч альбо кінжал (кірпан), на правым запясці абавязкова павінен быць стальны ці жалезны браслет (кара), усе сікхі павінны насіць кароткія скураныя шаравары (качха). Апроч таго, сікхі не павінны курыць, ужываць алкаголь і наркотыкі. Узмацненне сікхаў,ператварэнне іх у моцную і ваяўнічую рэлігійна-палітычную супольнасць прывяло да іх жорсткіх ганенняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На працягу ўсёй гісторыі свайго існавання прыхільнікі сікхізму змагаліся за незалежнасць Пенджаба – спачатку з маголамі, потым з афганцамі і англічанамі, а пачынаючы з другой паловы XX ст., з цэнтральным урадам Індыі. У 1966 г. дзякуючы іх намаганням быў створаны штат Пенджаб. З гэтага часу сікхі сталі змагацца за стварэнне незалежнай сікскай дзяржавы Халістан. Зараз праблема стварэння незалежнага сікскай дзяржавы ў Індыі не самая актуальная. На першы план выйшла праблема ўзаемаадносін паміж індусамі і мусульманамі.

Сікхізм – адна з самых маладых рэлігій свету. На працягу стагоддзяў яна аказвала ўплыў на палітычныя працэсы не толькі ў Пенджабе, але і ва ўсёй Індыі. Зараз гэты ўплыў працягвае ўзмацняцца.

## 3.2. Рэлігіі Кітая

3.2.1. Канфуцыянства.
3.2.2. Даасізм.

Кітай уяўляе сабой старажытную і своеасаблівую культуру. Вельмі вялікую ролю ў ёй іграла сацыяльная этыка і адміністратыўная практыка, і мала надавалася ўвагі метафізічным разважанням і індывідуалістычным пошукам выратавання. Рэлігіі Кітая вучаць годна жыць менавіта ў гэтым свеце.

Тыя рэлігіі, якія існуюць у Кітаі зараз, грунтуюцца на старажытных уяўленнях. Згодна за старажытнакітайскай касмагоніяй, спачатку існавала толькі адзіная ўніверсальная субстанцыя. У нейкі момант яна падзялілася на два пачаткі: янь – цёплае і светлае і інь – мутнае і халоднае. Янь, як больш лёгкае, паднялося наверх і стварыла неба, а інь, як больш цяжкае, апусцілася ўніз і парадзіла зямлю.

Гэтыя два пачаткі прызваны забяспечыць і падтрымліваць гарманічную раўнавагу ў свеце. З іх узаемадзеяння ўзніклі ўсе рэчы. Кожнай рэчы ўласціва двуадзінства, заснаванае на адноснай раўнавазе супрацьлеглых пачаткаў: мужчынскага і жаночага, лёгкага і цяжкага, светлага і цёмнага, актыўнага і пасіўнага, цвёрдага і мяккага і г. д. Мера, у якой у той ці іншай рэчы прысутнічаюць інь і янь, вызначае яе якасці, а змена меры вядзе да змены якасцей і самой рэчы.

Старажытныя кітайцы таксама верылі ў існаванне Вярхоўнай Вышэйшай сілы, якая называлася Небам альбо Шан-дзі (Вярхоўным Уладаром). Лічылася, што Неба стаіць не толькі над людзьмі, але і над багамі і духамі. Свет насялялі шматлікія боствы і духі, з якімі трэба было ўладкоўваць свае ўзаемаадносіны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У VI–V стст. да н. э. старыя веды і ўяўленні, якія раней успрымаліся як закон, перасталі адпавядаць новым умовам жыцця. У Кітаі наступіў смутны час – перыяд Ваюючых царстваў. Пахіснуліся самыя ўмовы жыцця. Здавалася, што звыклыя запаведзі ўжо не дапамагаюць, што мінулая карціна свету дрэнна спалучаецца з наяўнай рэчаіснасцю. У людзей стварылася адчуванне, што багі іх пакінулі. Як адказ на патрэбу ў новым рэлігійным светапоглядзе ўзніклі даасізм і канфуцыянства.

### 3.2.1. Канфуцыянства

Канфуцыянства – этыка-палітычнае вучэнне, заснаванне якога прыпісваецца вялікаму кітайскаму мысліцелю Канфуцыю (у кітайскай транскрыпцыі Кун-цзы), які жыў у 551–479 гг. да н. э. Яно лічыцца канцэнтраваным выражэннем кітайскага нацыянальнага светапогляду і важным ідэйным рэгулятарам, які доўгі час вызначаў жыццё краіны.

Трэба адзначыць, што рэлігіі кітайцаў здаюцца вельмі непадобнымі на астатнія рэлігіі. Асабліва гэта тычыцца канфуцыянства, якое наогул вельмі мала ўвагі надзяляе разважанням пра Бога. Таму часта яго нават не лічаць рэлігіяй. Сам Канфуцый не вучыў веры ў звышнатуральнае. Наадварот, ён казаў: “Мы не ведаем, што такое жыццё, як жа можам ведаць, што такое смерць. Не ведаем, як служыць людзям, як жа можам служыць боствам”. “Шануй боствы і духаў, але аддаляйся ад іх”.

Змест вучэння Канфуцыя вызначыўся патрэбамі яго часу. Канфуцый жыў у перыяд моцных сацыяльных і палітычных хваляванняў у гісторыі Кітая, якія прывялі да падзення заканадаўства і росту злачыннасці.

У адказ на гэта Канфуцый фармулюе палажэнне, якое робіцца стрыжнем яго вучэння, – аб неабходнасці пастаяннага ўдасканальвання чалавека, грамадства, дзяржавы. Адзіная першасутнасць для Канфуцыя – Неба: “Пачатак жыцця пакладзены Небам, а падтрымлівае яго чалавек”. Неба – вышэйшая сіла. Кітай – гэта Паднябесная, цэнтр Сусвету, які ўвасабляе ў сабе абсалютны парадак і дасканаласць.

Каб выйсці з крызісу, лічыў Канфуцый, трэба ўзнавіць мінулы парадак, які падаваўся ў ідэалізаваным выглядзе. Сцвярджалася, што раней правіцелі былі мудрымі і здольнымі, чыноўнікі былі бескарыслівымі і адданымі законам, а народ жыў у міры і дабрабыце. Для пераадолення маральнай і палітычнай дэзарыентацыі ў сучасным яму Кітаі Канфуцый стварае сваю тэорыю “выпраўлення імёнаў”: “Калі імёны няправільныя, то словы не маюць падставы. Калі словы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не маюць падстаў, то справы не могуць ажыццяўляцца”. Галоўны прынцып сацыяльнай думкі Канфуцыя – дакладнае размеркаванне роляў і функцый у грамадстве. Трэба, каб усё стала на сваі месцы: “Няхай бацька будзе бацькам, сын – сынам, імператар – імператарам, чыноўнік – чыноўнікам”.

У аснове канфуцыянства ляжыць ідэя гармоніі прынцыпаў асабістага маральнага ўдасканальвання і дзейнасці, накіраванай на ўпарадкаванне дзяржавы, у імя стварэння ідэальнага грамадства, адпавядаючага старажытным узорам. Прадугледжвалася, што маральнае ўдасканальванне чалавека з’яўляецца перадумовай паспяховай дзяржаўнай дзейнасці, якая, у сваю чаргу, з’яўляецца мэтай маральнага развіцця асобы. Адсюль вынікае панэтызм канфуцыянства, якое лічыла мараль і маральныя нормы адзінай крыніцай дзяржавы і права.

Ідэальнае грамадства, па Канфуцыю, гэта перш за ўсё грамадства ідэальных людзей. Ідэальная асоба – гэта высакародны муж (цзюньцзы), і яго высакароднасць вызначаецца не паходжаннем, а строгім і паслядоўным выкананнем нормаў маралі. Высакароднаму мужу павінны быць уласцівы дзве якасці: гуманнасць (жэнь) і пачуццё абавязку (і). Гуманнасць трактавалася Канфуцыем надзвычай шырока, сцвярджалася, што ў яе ўваходзяць сціпласць, справядлівасць, стрыманасць, бескарыслівасць, любоў да людзей і г. д. Пачуццё абавязку разумеецца як накіраванасць на выкананне ўказаных прадпісанняў, заснаваных на веданні таго, як трэба паступаць пры любых абставінах. Яно абумоўлена веданнем і вышэйшымі прынцыпамі, а не разлікам. Па словах Канфуцыя, высакародны думае аб абавязку, нізкі – аб карысці. Таму ў паняцце “і” ўключалася імкненне да ведаў, абавязак вучыцца і спасцігаць мудрасць мінулых часоў. Адукацыя разглядалася ў канфуцыянстве як галоўны спосаб спасціжэння ісціны. Канфуцый распрацаваў і шэраг іншых паняццяў, уключаючы вернасць і шчырасць (чжэнь), прыстойнасць і выкананне абрадаў (лі).

Галоўным рэгулятарам жыцця грамадства Канфуцый лічыў строгае і безумоўнае падпарадкаванне старэйшым. Культу продкаў, які існаваў у Кітаі, канфуцыянства надае вялікае значэнне. Шанаванне старэйшых у Кітаі разглядаецца як адзін з галоўных абавязкаў. Яно абапіраецца на прынцып сяо – вучэнне аб сыноўняй пачцівасці, якое выключае любую форму непавагі да старэйшых. Гэты прынцып быў перанесены на ўсе сферы жыцця грамадства, лічылася, што дзяржава – гэта вялікая сям’я, сям’я – гэта маленькая дзяржава. Імператар ажыццяўляе прынцып сяо ў дачыненні да свайго бацькі – Неба, а ўсё насельніцтва Кітая – у дачыненні да імператара.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вялікае значэнне надавалася чыноўнікам. Фарміраванне іх складу ажыццяўлялася праз сістэму экзаменаў, да якіх мог быць дапушчаны любы чалавек (за выключэннем дзяцей прастытутак, акцёраў альбо цырульнікаў). На экзамене трэба было прадэманстраваць веданне канфуцыянскай класікі. Гэтая сістэма праіснавала ў Кітаі да 1906 г., калі яна была заменена еўрапейскай адукацыйнай сістэмай.

Трэба адзначыць, што рэгулярнае абнаўленне слоя чыноўнікаў за кошт сістэмы экзаменаў, прывяло да таго, што краінай кіравалі сапраўды адукаваныя (у межах канфуцыянства), мэтанакіраваныя і ведаючыя правілы паводзін людзі. А тое, што канфуцыянства было кансерватыўнай ідэалогіяй, прыводзіла, з аднаго боку, да стабільнасці краіны, з другога – да запаволенасці яе развіцця.

На працягу двух з паловай тысяч гадоў канфуцыянства фарміравала свядомасць і пачуцці кітайцаў, іх паводзіны, і ў гэтым сэнсе яно аказала велізарны ўплыў на кітайскую культуру.

### 3.2.2. Даасізм

Заснавальнікам даасізму лічыцца Лао-цзы (гэтае імя перакладаецца як “Стары мудрэц” альбо “Старое немаўля”), які, па паданні, жыў на мяжы VI–V стст. да н. э. Ужо ў старажытнасці ён лічыўся напалову міфічнай фігурай. Згодна з адной з легендаў, ён прабыў ва ўтробе сваёй маці 81 год і нарадзіўся ўжо мудрым старым, за што і атрымаў сваё прозвішча.

Сутнасць свайго вучэння Лао-цзы выклаў у кнізе “Дао дэ цзын” (“Кніга аб Дао і Дэ”), якую ён, па паданні, пакінуў перад тым, як назаўсёды сысці з Кітая на Захад. У ёй адлюстравана мадэль свету, дзе над усімі багамі, у тым ліку і над Нябесным Уладыкам, пануе Дао – безасабовы закон, які кіруе сусветам. Дао ёсць пачатак усіх рэчаў, крыніца, з якой узнікае Сусвет, і ўсё тое, што яго складае. Дао адно, яно не мае супрацьлегласцей і, у адрозненне ад усіх рэчаў, пастаяннае, вечнае і нязменнае.

Апроч таго, Дао ўсім кіруе. Яно прыводзіць рэчы ў гармонію, усяму адводзіць сваё месца. Закон Дао ажыццяўляецца нябачным і неадчувальным чынам, і ўсё адбываецца як быццам бы само па сабе, кіруючыся дабратворнай сілай на карысць усяго – Дэ.

Усеагульны закон Дао ўтрымлівае і этычныя нормы, неабходныя для ажыццяўлення гармоніі. Асноўныя сярод іх: не ганарыся сваімі заслугамі, не прыніжай слабога, жыві ў міры і згодзе з іншымі, не прагні багацця і раскошы, будзь задаволены малым і г. д. Больш грунтоўныя правілы паводзін: не супрацьдзейнічай Дао, не разбурай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

парадак, які створаны звыш, але прытрымлівайся яго, і ўсё выправіцца само па сабе. Такім чынам, мараль даасізму грунтуецца на прынцыпе: прытрымлівайся натуральнага ходу рэчаў – і будзеш шчаслівы і здаровы, як фізічна, так і духоўна.

Аднак чалавек можа сыходзіць з гэтага шляху, парушаючы тым самым першапачатковую прастату натуральнасці як свайго быцця, так і Сусвету. Праяўляецца гэта ў схільнасці да шматведання і ў стварэнні складаных сацыяльных інстытутаў. Таму "Дао дэ цзын" заклікае вяртацца да першапачатковай прыроды, спрашчэння і натуральнасці. Гэты заклік выражаны перш за ўсё ў паняцці "нядзеяння" (у вэй). Ён не зводзіцца да бяздзейнасці і пасіўнасці. Пад у вэй разумеецца адмаўленне ад парушэння ўласнай прыроды і прыроды Сусвету, устрыманне ад неадпаведнай сутнасці рэчаў, эгаістычнай дзейнасці, і, наогул, адмаўленне ад суб'ектыўнасці і ўключэнне ва ўсеагульнасць быцця.

Важнае значэнне ў даасізме надавалася дасягненню неўміручасці. Вылучаліся два шляхі да гэтага: удасканальванне духа і ўдасканальванне цела. Першы заключаўся ў занятках медытацыяй, сузіраннем Дао і дасягненнем адзінства з ім. Другі зводзіўся да сукупнасці спецыяльных гімнастычных і дыхальных прыёмаў, да спецыяльнай практыкі для падтрымання энергетычнага баланса арганізма і да заняткаў алхіміяй. Менавіта апошняя і лічылася вышэйшым шляхам да атрымання неўміручасці.

Алхімія падзялялася даосамі на два тыпы: знешнюю і ўнутраную. З іх толькі першая з'яўлялася ўласна алхіміяй. Яна прадугледжвала стварэнне ў рэторце як бы мадэлі сусвету, дзе пад уздзеяннем агню ўзнікае элексір неўміручасці. Галоўнае адрозненне кітайскай алхіміі ад еўрапейскай заключаецца ў яе пачатковай сувязі з медыцынай, нават золата тут выкарыстоўвалася для дасягнення неўміручасці. Разам з тым, у склад даоскіх элексіраў вельмі часта ўваходзілі разныя ядавітыя рэчывы (ртуць, мыш'як, свінец і інш.), у выніку чаго шмат тых, хто іх прымаў з мэтай дасягнуць неўміручасці (у тым ліку і некалькі імператараў), памерлі заўчаснай смерцю.

У Х ст. знешняя алхімія прыйшла ў заняпад, і ёй на змену прыйшла ўнутраная алхімія. Яна толькі называлася алхіміяй, і была не чым іншым, як комплексам складаных псіхафізічных практыкаванняў, накіраваных на трансфармацыю свядомасці верніка і змену яго як псіхічнага, так і фізіялагічнага стану.

Паслядоўнікі ўнутранай алхіміі сыходзілі з падабенства мікракосма (цела чалавека) і макракосма (сусвету). Таму няма сэнсу ствараць мадэль сусвету ў нейкай рэторце, само чалавечае цела з'яўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

такой мадэллю, і магчыма стварэнне новага неўміручага цела з кампанентаў уласнага. Асаблівая ўвага ў практыцы ўнутранай алхіміі надавалася кіраванню энергіямі цела, якія цякуць праз цялесныя каналы і накапліваюцца ў асаблівых цэнтрах цела, якія размяшчаюцца на галаве, у вобласці сонечнага спляцення і ніжэй пупа. Кіраванне энергіямі ажыццяўляецца праз дыхальныя практыкаванні, канцэнтрацыі свядомасці і візуалізацыі. Большасць з гэтых практыкаванняў і зараз вельмі папулярныя ў Кітаі пад назвай цы гун (праца з энергіямі). Трэба адзначыць, што, як знешняя, так і ўнутраная алхімія склала аснову кітайскай традыцыйнай медыцыны.

Даасізм з'яўляецца жывой рэлігіяй Кітая і ў нашы дні. У 1957 г. ў Кітаі была створана Усекітайская Асацыяцыя даасізму. Яна была ліквідавана падчас "культурнай рэвалюцыі" 1966–1976 гг., але ўзнавіла сваю дзейнасць у 1980 г. Цэнтрам Асацыяцыі з'яўляецца манастыр Байюньгуань у Пекіне. Асацыяцыя выдае свой часопіс, вядзе прапаведніцкую і даследчую працу.

Зараз у Кітаі рэлігійны даасізм паступова знікае і ператвараецца ў асаблівую нацыянальную традыцыю. Кітаец можа быць будыстам і пры гэтым прымаць удзел у даоскіх містычных рытуалах, звяртацца да варажбітаў і лекараў-даосаў.

У нашы дні распаўсюджаны таксама даасізм на Захадзе. Ён прадстаўлены ў выглядзе разнастайных і часта не звязаных паміж сабой школ здаровага вобраза жыцця, дыеталогіі, гімнастыкі ушу, якія называюць сябе даоскімі. У яго цэнтры – не рэлігійныя аспекты даасізму, а спосабы аздараўлення, творчага разняволення свядомасці, працы над уласнай псіхікай.

## 3.3. Рэлігіі Японіі. Сінтаізм

Сінтаізм (сінта) – нацыянальная рэлігія японцаў. Сам тэрмін "сінта" перакладаецца як "шлях багоў", аднак гэтая назва мае кітайскае паходжанне. Самі японцы называюць сваю рэлігію "камінаміці". Сфарміраваўся ў VI–VII стст.  на падставе анімістычных вераванняў старажытных японцаў. Таксама яго крыніцамі з'яўляюцца культ продкаў, магія, татэмізм і фетышызм.

Сінтаізм грунтуецца на абагаўленні і шанаванні прыродных з'яў. Лічыцца, што шмат у якіх рэчаў ёсць свая духоўная сутнасць – камі. Камі можа існаваць у матэрыяльным аб'екце (дрэве, камяні) святым месцы альбо з'яве прыроды. Матэрыяльны аб'ект (асабліва гэта тычыцца камянёў) атрымаў у сінтаізме назву "сінтай" – цела бога.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Некаторыя камі з’яўляюцца духамі мясцовасцей альбо вызначаных прыродных аб’ектаў (напрыклад, гары), другія ўвасабляюць глабальныя прыродныя з’явы (навальніцу, буру). Шануюцца камі – апекуны сямей і радоў, а таксама духі памерлых продкаў. Таксама існуюць камі, у якіх увасоблены добрыя якасці чалавека. Зараз у Японіі асабліва шануюцца камі, якія спрыяюць акрэсленаму віду чалавечай дзейнасці альбо дапамагаюць у нейкія моманты жыцця. Ёсць камі, якія дапамагаюць у кар’еры, здачы экзаменаў, захоўваюць ад рабаўніцтва, катастрофаў, пажараў і г. д. Камі нябачна прысутнічаюць усюды і паўсюль і ўдзельнічаюць ва ўсім, што адбываецца. Наогул, у сінтаізме велізарная колькасць камі, па некаторых звестках – восем мільёнаў.

Вярхоўным бажаством з’яўляецца багіня Сонца Аматэрасу. Лічыцца, што яна паклала пачатак імператарскай дынастыі: праўнук Аматэрасу Нінігі сышоў з неба і зрабіўся першым японскім імператарам.

Галоўнымі свяшчэннымі кнігамі сінтаізму з’яўляюцца “Кадзікі” (“Запіскі аб справах старажытнасці”, 712 г.) і “Ніхонгі” (“Японскія хронікі”, 720 г.). Яны ўяўляюць сабой сукупнасць міфаў, а таксама, як працяг апошніх, хронікі праўлення першых японскіх імператараў.

У XVII–XVIII стст. у сінтаізме склалася вучэнне какутай («цела дзяржавы»). Згодна з ім, камі жывуць ва ўсіх японцах і дзейнічаюць праз іх. Імператар – жывое ўвасабленне багіні Аматэрасу і павінен шанавацца разам з багамі. Японія – дзяржава-сям’я, у якой падданых адрознівае сыноўская пачцівасць да імператара, а імператара – бацькоўская любоў да падданых. Дзякуючы гэтаму японская нацыя з’яўляецца абранай, пераўзыходзіць усе астатнія па сіле духу і мае нейкае вышэйшае прызначэнне. У другой палове XIX ст. імператар быў афіцыйна абвешчаны жывым богам на зямлі, а сінта атрымала статус абавязковай дзяржаўнай рэлігіі. Яе першасвятаром таксама быў імператар. Было ўведзена абавязковае выкладанне сінтаізму ва ўсіх навучальных установах краіны. Распаўсюджваўся рытуал шанавання імператара. Уводзіліся новыя афіцыйныя святы, такія, як напрыклад, Дзень нараджэння імператара, Дзень уступлення імператара на прастол і г. д. З нагоды гэтых святаў ва ўсіх школах выконваўся абрад шанавання партрэтаў імператара і імператрыцы, які суправаджаўся спяваннем нацыянальнага гімну.

Дзяржаўны сінтаізм праіснаваў да 1945 г. Пасля паражэння Японіі ў вайне і яе акупацыі амерыканскімі войскамі адной з першых дырэктыў амерыканскіх уладаў стала “дырэктыва аб сінтаізме”, у якой была забаронена любая падтрымка сінтаізму дзяржавай і яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прапаганда дзяржаўнымі служачымі. Імператар перастаў быць жывым богам і першасвятаром, застаўшыся толькі сімвалам японскага народа. Палажэнне аб аддзяленні рэлігіі ад дзяржавы было замацавана ў Канстытуцыі Японіі, прынятай у 1947 г. Сінтаізм зрабіўся адной з рэлігій, распаўсюджаных ў Японіі.

Трэба падкрэсліць, што сінтаізм – нацыянальная рэлігія, яго вызнаюць толькі японцы. Ён узнік у працэсе аб'яднання вераванняў, распаўсюджаных у розных рэгіёнах Японіі вакол культаў цэнтральнай правінцыі Ямата, якія былі звязаны з боствамі – продкамі імператара. Складванне сінтаізму ў адзіную агульнадзяржаўную рэлігію адбывалася пад моцным уплывам будызму, які пранік ў Японію ў VI–VII стст. Паколькі будызм быў вельмі папулярны ў японскай арыстакратыі, было зроблена ўсё, каб пазбегнуць міжрэлігійных канфліктаў. Спачатку камі былі абвешчаны апекунамі будызму, пасля некаторыя з іх пачалі асацыявацца з будысцкімі святымі. У выніку склалася ўяўленне, што камі, як і людзі, могуць мець патрэбу ў выратаванні, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з будысцкімі канонамі.

У ідэйным сэнсе ўплыў будызму праявіўся ў тым, што ў сінта з'явілася канцэпцыя дасягнення гарманічных узаемаадносін з камі праз ачышчэнне ад усяго таго непатрэбнага, што перашкаджае чалавеку ўспрымаць навакольны свет такім, які ён ёсць на самой справе. Сэрца чалавека, які ачысціўся, падобна люстэрку, яно ўспрымае свет ва ўсіх яго праявах і робіцца сэрцам камі. Тады чалавек жыве ў гармоніі са светам і багамі, а краіна квітнее. Галоўным духоўным прынцыпам сінта з'яўляецца жыццё ў згодзе з наваколлем. Лічыцца, што свет – адзіная сістэма, дзе камі, людзі і душы памерлых жывуць побач.

Камі з'яўляюцца неўміручымі і ўключаны ў кругазварот нараджэння і смерці, праз які ўсё ў свеце пастаянна абнаўляецца. У сінта не існуе паняцця выратавання, замест гэтага кожны сам вызначае сваё месца ў свеце сваімі пачуццямі і ўчынкамі. Дабро і зло ў сінтаізме атаясамліваюцца з такімі паняццямі, як "чыстае" і "нячыстае". Калі чалавек "забрудзіўся", гэта значыць, зрабіў нешта непадабаючае, ён павінен зрабіць абрад ачышчэння. Грахом у сінта лічыцца парушэнне сусветнага парадку, за гэта пасля смерці чалавек адправіцца ў Краіну Змроку і там будзе весці цягаснае існаванне ў атачэнні злых духаў. Смерць разглядаецца як непазбежнае затуханне жыццёвых сіл, якія потым будуць зноў адроджаныя. Для паслядоўнікаў сінта ўсе асноўныя падзеі адбываюцца ў гэтым свеце, які разглядаецца як найлепшы з усіх магчымых.

У нашыя часы сінтаізм, звычайна, мае пераважна храмавы характар. Храмы ў гонар розных камі пачалі будавацца з самога з'яўлення

сінтаізму. У пачатку XX ст. іх было каля 200 000, аднак потым іх колькасць пачала скарачацца, і зараз у Японіі налічваецца каля 8000 сінтаісцкіх храмаў. Некаторыя з іх з'яўляюцца рэлігійнымі цэнтрамі агульнанацыянальнага ўзроўню, але большасць – невялічкія мясцовыя храмы.

Кожны храм прысвечаны нейкаму прыроднаму феномену, гістарычнай падзеі, якая важная для дадзенай суполкі, і г. д. Пры храме маецца святар, які адпраўляе абрады. Робіць ён гэта ў большасці храмаў, так бы мовіць "па сумяшчальніцтву", бо займаецца яшчэ нейкай дзейнасцю. Толькі ў найбольш вялікіх храмах можа быць некалькі святароў, а таксама пастаянных служкаў. У маленькіх храмах усю працу па падтрыманні памяшкання ў належных умовах і правядзенні храмавых святаў і набажэнстваў выконваюць самі прыхаджане.

Сінтаісцкія свяцілішчы маюць агульныя рысы. Першае, што кідаецца ў вочы наведвальніку, – гэта вялікія сімвалічныя вароты (торыі), з двух вертыкальных і двух папярэчных слупоў, якія абазначаюць уваход у свяцілішча. Яны лічацца варотамі ў месца, якое належыць камі, дзе багі могуць праяўляцца і з імі можна зносіцца. Перад уваходам у храм, а таксама ў іншых месцах, дзе, як лічыцца, могуць з'яўляцца камі, вывешваюцца сімэнава – тоўстыя жгуты з рысавай саломы. Звычайна храмавы комплекс складаецца з некалькіх пабудоў, якія знаходзяцца ў прыгожай мясцовасці і ўпісаны ў прыродны ландшафт. Галоўны будынак прызначаны для бажаства. У ім знаходзіцца алтар, дзе захоўваецца сінтай – "цела камі" – прадмет, у які, як лічыцца, усяляецца дух камі. Сінтаем могуць быць самыя розныя прадметы: драўляная шыльдачка з імем бажаства, камень, галіна дрэва. Яго не дэманструюць веруючым, ён заўсёды схаваны. Паколькі лічыцца, што душа камі невычарпальная, адначасовая яе прысутнасць у сінтаях розных храмаў не лічыцца нечым дзіўным альбо нелагічным. Унутры храма выяў багоў няма, але могуць быць выявы жывёл, якія асацыююцца з тым ці іншым бажаством. Калі храм прысвечаны бажаству той мясцовасці, дзе ён знаходзіцца, то спецыяльнага будынка для камі можа наогул не быць, бо лічыцца, што камі прысутнічае ў той мясцовасці, дзе пабудаваны храм.

Аснову сінтаісцкага культу складае шанаванне камі, якому прысвечаны храм. Для гэтага выконваюцца рытуалы, мэта якіх – усталяваць і падтрымаць сувязі паміж вернікамі і бажаством. Большасць сінтаісцкіх абрадаў маюць індывідуальны характар, напрыклад, калі чалавек наведвае свяцілішча, каб звярнуцца з якой-небудзь просьбай – аб бяспечным падарожжы, паспяховым экзамене, удалай эканамічнай справе, альбо проста таму, што ён праходзіў побач. Як правіла, ён

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не ўваходзіць у храм, а ўсе абрады выконвае на знешнім дворыку перад храмам. Робіць амавенне, кідае манету ў скрыню для ахвяраванняў, дзёргае за вяроўку, да якой зверху прывязаны званочак, двойчы пляскае ў далоні, кланяецца і кажа кароткую малітву, зноў пляскае ў далоні і сыходзіць. Гук званочка і плясканне ў далоні павінны прыцягнуць увагу камі да прысутнасці веруючага.

Сямейныя ўрачыстасці, асабліва вяселлі, таксама прадугледжваюць наведванне свяцілішча. Часта прыносяць нованароджаных дзяцей, каб памаліцца аб іх здароўі.

Святы ў сінтаізме адбываюцца вельмі маляўніча, могуць суправаджацца рознымі шэсцямі, феерверкамі, спартыўнымі спаборніцтвамі. Японцы масава прымаюць удзел у святах.

Шмат японцаў прытрымліваюцца адразу некалькіх рэлігій: вяселлі звычайна адбываюцца па сінтаісцкіх абрадах, а пахаванні – па будысцкіх, хаця вяселлі па будысцкіх і нерэлігійных абрадах таксама распаўсюджаны.

Ад прыхільнікаў сінта не патрабуецца штодзённых малітваў і частых наведванняў храма. Дастаткова ўдзелу ў асноўных храмавых святах і выканання традыцыйных абрадаў, звязаных з асноўнымі падзеямі ў жыцці чалавека. Таму самі японцы вельмі часта ўспрымаюць сінта як сукупнасць нацыянальных звычаяў і традыцый. Нішто не перашкаджае сінтаісту вызнаваць любую іншую рэлігію або лічыць сябе атэістам. Але выкананне абрадаў сінта неаддзельна ад штодзённага жыцця японцаў, проста большасць абрадаў не разглядаецца як праява рэлігійнасці. Абрады ўспрымаюцца прагматычна – як сацыяльныя абавязкі. Такое палажэнне параджае парадаксальную сітуацыю: з аднога боку, амаль усё штодзённае жыццё Японіі пранізана сінтаізмам, з другога – толькі некаторыя з японцаў лічаць сябе сінтаістамі.

## 3.4. Рэлігіі яўрэяў. Іўдаізм

Іўдаізм – нацыянальная рэлігія яўрэяў. Колькасць яго прыхільнікаў складае зараз 14 млн чалавек. Большасць іх жыве ў Ізраілі і ЗША.

Іўдаізм з'яўляецца самай старажытнай монатэістычнай рэлігіяй. Яго фарміраванне пачынаецца з XIII ст. да н. э., калі качавыя яўрэйскія плямёны заваёўваюць тэрыторыю Палесціны (Ханаан). Да гэтага яўрэі былі політэістамі, іх вераванні і абрады прынцыпова не адрозніваліся ад тых, якіх прытрымліваліся іншыя народы гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэгіёна. Сярод яўрэяў былі шырока распаўсюджаны фетышызм, анімізм і магія. Аднак і пасля XIII ст. да н. э. яўрэі не адразу становяцца паслядоўнымі монатэістамі, існуюць шматлікія выпадкі адступлення ад культу адзінага Бога і шанавання багоў тых народаў, сярод якіх яўрэі жылі. Канчаткова монатэізм усталёўваецца сярод яўрэяў у VI ст. да н. э.

Тэрмін "іўдаізм" паходзіць ад назвы самага шматколькаснага з дванаццаці яўрэйскіх плямён – племені Іуды, якое ў XI ст. да н. э. зрабілася пануючым.

Даследчыкі вылучаюць у гісторыі іўдаізму тры асноўныя этапы: біблейскі, талмудычна-рабіністычны і рэфармісцкі.

Біблейскі этап ахоплівае час з XIII ст. да н. э. па 70 г. н. э. У гэты перыяд яўрэі мелі сваю дзяржаву на тэрыторыі Палесціны. Асноўную ролю ў іх рэлігійным і палітычным жыцці адыгрывае першая частка Бібліі, якую іўдзеі называюць Танах (Запавет). Ён складаецца з 39 кніг і трох частак: "Закон" (Тора), "Прарокі" (Набіім) і "Пісанні" (Кетубім). Напісаны Танах быў у XIII–II стст. да н. э. на тэрыторыі Палесціны і Вавілона на старажытнаяўрэйскай мове.

Анову Танаха складае палажэнне аб тым, што ёсць адзіны Бог Яхвэ, які ўсё стварыў, абраў яўрэяў і заключыў з імі запавет, згодна з якім яўрэі абавязаны шанаваць Яхвэ як адзінага Бога і выконваць Яго запаведзі, а Яхвэ будзе падтрымліваць яўрэяў.

Матывы богаабранасці адыгралі вельмі значную ролю ў гісторыі яўрэйскага народа. Упэўненасць у сваёй выключнасці і нязменнай падтрымцы Бога дазволіла яўрэям вытрымаць сур'ёзныя і шматлікія выпрабаванні. Палітычны лёс яўрэяў быў вельмі цяжкім. Тэрыторыя Палесціны знаходзілася на перакрыжаванні інтарэсаў магутных дзяржаў, і яе ўвесь час заваёўвалі.

У 322 г. да н. э. Палесціна была заваявана войскамі А. Македонскага, а ў 66 г. да н. э. трапіла пад уладу Рыма. Узмацніўся працэс рассялення яўрэяў па-за межы Палесціны, які атрымаў назву дыяспары. Многія яўрэі, асабліва з вышэйшых слаёў, сталі прымаць грэчаскія звычаі.

Усё гэта прывяло да крызісу ў іўдаізме. У ім вылучыліся тры партыі альбо школы: садукеі, фарызеі і ясеі.

Садукеі (ад імя Цадока, заснавальніка жрэцкай дынастыі) належалі да вышэйшага жрэцтва Іерусалімскага храма, знаці і багатага купецтва. Яны выступалі за строгае выкананне рэлігійнай традыцыі, а таксама абаранялі інтарэсы вышэйшых слаёў грамадства. Асноўнай іх мэтай было стварэнне магутнай яўрэйскай дзяржавы.

Фарызеі ("аддзеленыя") былі звязаны з сінагогамі, дзе яны займаліся тлумачэннем Торы і навучаннем вернікаў. Яны імкнуліся да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

большага дэмакратызму ў рэлігійным жыцці, клапаціліся аб дабрабыце простага народа і выступалі за больш гібкае ўспрыманне традыцыі. Аднак асноўны націск яны рабілі на неабходнасці захавання вернасці духу Торы і імкнуліся паслядоўна і дэталёва яе выконваць. Па гэтай прычыне ў далейшым слова "фарызей" стала абазначаць чалавека, які дэманструе паказную набажнасць.

Ясеі ("сыны святла") уяўлялі сабой нешта накшталт манаскай суполкі, члены якой вялі аскетычнае жыццё і не прызнавалі знешняй абраднасці. Яны верылі ў замагільнае існаванне, дзе праведнікі атрымаюць узнагароду. У ясеяў існаваў культ нейкага "Настаўніка справядлівасці", які быў пакараны за веру.

Ва ўмовах рымскага прыгнёту і палітычнага заняпаду сярод іўдзеяў узмацняюцца настроі чакання Месіі, якія існавалі ўжо на працягу некалькіх стагоддзяў. Верылі, што Яхвэ карае яўрэяў за іх адступленне ад запавету, але Ён застаецца нязменным у сваёй міласці да абранага Ім народа. Яхвэ пашле яўрэям Месію ("Памазанніка"), які вызваліць іх ад чужаземнага прыгнёту і дасць ім новы запавет. На працягу некалькіх стагоддзяў іўдзеі марылі аб "Дні Гасподнім", калі Бог праз Месію выратуе свой народ. Аднак яны па-рознаму ўяўлялі сабе вызваліцеля, які павінен быў прыйсці. Прарокі, якія прадказалі з'яўленне Месіі, пісалі аб ім як аб духоўным вызваліцелі і сцвярджалі, што ён не толькі дасць яўрэям новы запавет, які будзе запісаны ў іх сэрцах, але добраахвотна прыме пакуты за грахі людзей. Большасць жа іўдзеяў уяўляла Месію як палітычнага вызваліцеля, які ўзначаліць паўстанне супраць іншаземцаў, пасля чаго яўрэі будуць панаваць над сваімі ворагамі, жыць у шчасці і багацці. Само слова "месія" (па-старажытнаяўрэйску "машыах") перакладаецца як "памазаннік". Чакалася, што ён будзе з роду цара Давіда. У старажытных яўрэяў цароў памазвалі на царства – лілі ім на галаву асаблівы алей як знак царскай годнасці. Адны іўдзеі ўяўлялі Месію як духоўнага цара, другія – як палітычнага.

У I ст. н. э. на грунце іўдаізму ўзнікла хрысціянства. Было абвешчана, што тым Месіяй, якога іўдзеі чакаюць ужо некалькі стагоддзяў, з'яўляецца Ісус Хрыстос. Асноўная частка іўдзеяў не прыняла Хрыста ў якасці Месіі і стала праследаваць хрысціян як шкодную секту. Галоўныя надзеі яўрэяў былі звязаны з палітычным вызваленнем ад рымскага прыгнёту. Былі ўзняты два паўстанні (у 66–73 гг. і 132–135 гг.), якія пацярпелі паражэнне. У 70 г. рымляне разбурылі Іерусалімскі храм, а ў 133 г. – сам Іерусалім.

Талмудычна-рабіністычны этап доўжыўся з 70 г. па першую палову XIX ст. У іўдаізме гэтага перыяду ў рэлігійнай форме знайшло сваё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адлюстраванне жыццё яўрэяў ва ўмовах дыяспары. Вялікая колькасць яўрэяў жыла за межамі Палесціны і раней, але разбурэнне Іерусаліма і храма паклала канец існаванню старажытнаяўрэйскай дзяржавы, а разам з ёй і старажытнаму іўдаізму. У дыяспары канчаткова фарміруецца новая рэлігійная арганізацыя іўдзеяў – сінагога. Яна выконвала ролю рэлігійнага і грамадскага цэнтра. Кіруючая роля ў сінагогах належала рабінам (ад. яўр. *раббі* – настаўнік). Гэта былі адукаваныя людзі, якія займаліся навучаннем, чытаннем і тлумачэннем Танаха, асабліва першай яго часткі – Торы, а таксама вырашэннем жыццёвых праблем яўрэяў на падставе палажэнняў апошняй.

Ва ўмовах страты дзяржавы і жыцця сярод іншых народаў яўрэі захавалі веру ў сваю богаабранасць і кожны свой крок імкнуліся суадносіць з тым рэлігійным законам, які даў ім Бог. Па гэтай прычыне ўзнікла патрэба ў дэталёвых каментарыях да Торы, каб ужыць яе нормы ў канкрэтных выпадках жыцця. Першыя такія каментарыі з’явіліся яшчэ ў IV ст. да н. э. Спачатку яны перадаваліся вусна, а потым пачалі запісвацца і атрымалі назву Мішна (“Паўтарэнне”). Крыху пазней быў створаны каментарый да Мішна – Гемара (“Поўнае тлумачэнне”). Аб’яднаныя Мішна і Гемара атрымалі назву Талмуд (“Вучэнне”). Існуе дзве яго рэдакцыі: палесцінская (III ст. н. э.) і вавілонская (V ст. н. э.) Талмуд уяўляе сабой велізарны зборнік рэлігійна-юрыдычных правіл, а таксама жыццёвай мудрасці яўрэяў. У ім даецца надзвычай даталёвая рэгламентацыя паводзін. Ён становіцца асновай заканадаўства і маралі іўдзеяў.

<u>Сучасны этап</u> у гісторыі іўдаізму пачаўся з першай паловы XIX ст. У гэты перыяд узнікае праблема прыстасавання яўрэяў да дасягненняў еўрапейскай культуры Новага часу. У залежнасці ад вырашэння гэтай праблемы іўдаізм падзяліўся на тры асноўныя напрамкі: артадаксальны, рэфарматарскі і кансерватыўны.

Артадаксальны іўдаізм разглядае сябе як адзіна правільны. Сваёй асноўнай мэтай ён лічыць захаванне традыцый іўдаізму ва ўмовах сучаснага жыцця. У артадаксальным іўдаізме да вернікаў прад’яўляюцца строгія патрабаванні культавага характару. Яны павінны штодзённа вывучаць Тору і строга выконваць усе правілы, зафіксаваныя ў Талмудзе.

Рэфарматарскі іўдаізм зыходзіць з таго, што неабходна ўлічваць патрабаванні часу. Акцэнт у ім робіцца не на абрадах, а на маральных нормах паводзін. Абвяшчаецца, што закон павінен выконвацца не таму, што так загадаў Бог, а таму, што гэта мае сэнс у сучасным рэлігійным жыцці. У рэфарматарскім іўдаізме рабінамі могуць быць жанчыны.

Кансерватыўны іўдаізм узнік як рэакцыя на змярцвеласць традыцыі, з аднаго боку, і бяздумныя асімілятарскія тэндэнцыі, з другога.

Ён выступае за вернасць традыцыі, але, калі гэта неабходна, з папраўкамі. Кансерватыўны іўдаізм па сваёй накіраванасці знаходзіцца паміж артадаксальным і рэфарматарскім. Ён выступае за змены, але з улікам гістарычнага вопыту яўрэяў.

Зараз артадаксальны іўдаізм з’яўляецца пануючай рэлігіяй у Ізраілі. Ён не мае афіцыйнага статусу дзяржаўнай рэлігіі, але карыстаецца надзвычай моцнай падтрымкай урада і аказвае істотны ўплыў на грамадскае жыццё ў краіне. Усе пытанні сямейнага і спадчыннага права вырашаюцца ў адпаведнасці з нормамі Танаха і Талмуда. Не зарэгістраваны ў сінагозе шлюб не прызнаецца законным. Рабіны знаходзяцца на дзяржаўнай службе і займаюцца афармленнем актаў грамадзянскага стану, выкладаюць іўдаізм у школах, вядуць выхаваўчую работу ў войску. Каардынуе і накіроўвае дзейнасць рабінаў у Ізраілі Вярхоўны Рабінскі Савет.

У іўдаізме няма афіцыйна зацверджанага веравучэння, аднак сутнасць веры праяўляецца ў “Шэма” (старажытнаяўр. – слухай) – гэта назва трох вершаў Бібліі, якія складаюць асноўную малітву іўдаізму: “Слухай Ізраіль: Гасподзь, Бог наш, Гасподзь адзіны ёсць і любі Госпада, Бога твайго, усім сэрцам тваім, і ўсёй душою тваёю, і ўсімі сіламі тваімі, і няхай будуць словы гэтыя, якія Я запаветую табе сёння, у сэрцы тваім” (Друг., 6, 4–6). Набожны іўдзей павінен любіць Бога ўсёй сваёю сутнасцю, і гэта любоў знаходзіць праяўленне ў выкананні Яго запаведзяў.

Даследчыкі вылучаюць наступныя палажэнні веравучэння іўдаізму.

1. <u>Ёсць адзіны Бог Яхвэ.</u> Толькі Яхвэ з’яўляецца сапраўдным Богам, і толькі Яго трэба слухацца. Шанаванне іншых багоў лічыцца ў іўдаізме цяжкім грахом. Яхвэ не мае ніякага знешняга выгляду, Яго імя перакладаецца “Той, Хто сапраўды ёсць”. Ён усё стварыў і ўсім кіруе.

2. <u>Яўрэі з’яўляюцца богаабраным народам.</u> Яхвэ абраў яўрэяў сярод іншых народаў як сродак свайго праяўлення ў гісторыі. Нявернасць яўрэяў Яхвэ прыводзіць да пакарання з Яго боку. Аднак і ў гэтым выпадку яўрэі застаюцца богаабраным народам, і Яхвэ заўсёды гатовы ім даравць.

3. <u>Павінен прыйсці Месія, каб судзіць жывых і памерлых і прывесці яўрэяў у Зямлю Абетаваную.</u> Іўдзеі вераць, што з прыходам Месіі будзе знішчана ўсё зло на зямлі і ўстановіцца роўнасць і справядлівасць. Знікнуць хваробы і войны, узрасце ўрадлівасць зямлі, людзі будуць жыць да тысячы гадоў.

4. <u>Танах і Талмуд з’яўляюцца свяшчэннымі кнігамі.</u> Кожны іўдзей павінен іх вывучаць і выконваць іх запаведзь. Асабліва шануецца

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРЫНЫ

першая частка Танаха – Тора, якая згодна з веравучэннем іўдаізму была дадзена яўрэям Яхвэ праз Маісея. Талмуд мае меншы рэлігійны аўтарытэт, аднак ён дае правілы паводзін у дачыненні да канкрэтнай сітуацыі, і таму ў сваім штодзённым жыцці іўдзей часцей звяртаецца да Талмуда.

5. Душа з’яўляецца неўміручай і пасля смерці чалавека трапляе ў замагільны свет. У старажытным іўдаізме гэтае палажэнне адсутнічала. Даследчыкі лічаць, што яно было запазычана іўдзеямі з іншых рэлігій.

Асноўная ўвага ў іўдаізме надаецца не веравучэнню, а культу. Іўдзеі лічаць, што іх вера праяўляецца ў іх дзеяннях. Існуе 365 забаронаў і 248 прадпісанняў, якія рэгулююць усё жыццё прававернага іўдзея. Маліцца ён павінен тройчы ў дзень: раніцай, апоўдні і ўвечары, дома альбо ў сінагозе. Пры малітве мужчыны пакрываюць галаву капелюшом альбо спецыяльнай шапачкай (яна называецца ярмолкай альбо кіпай). Для малітвы ў сінагозе трэба не менш дзесяці мужчын. У артадаксальным іўдаізме мужчыны і жанчыны моляцца асобна.

Вялікае значэнне ў іўдаізме надаецца абраду абразання, якое робіцца хлопчыкам на восьмы дзень жыцця, а таксама цырымоніям бар-міцва і бат-міцва, якімі асвячаюцца паўналецце хлопчыкаў і дзяўчынак. Робяцца яны адпаведна ў 13 і 12 гадоў.

Галоўным святам у іўдаізме з’яўляецца шабат (субота). Ён прысвечаны адпачынку Бога пасля стварэння Ім свету, а таксама вызваленню яўрэяў з егіпецкага палону. Пачынаецца шабат у пятніцу пасля заходу сонца. Іўдзеі ў гэты дзень наведваюць сінагогу і ладзяць святочную вячэру. У шабат нельга рабіць ніякай працы, у тым ліку гатаваць ежу, уключаць электрапрыборы, вадзіць аўтамабіль, карыстацца грамадскім транспартам.

Іншымі святамі з’яўляецца: Рош Гашона (Новы год) – у гонар стварэння Богам свету; Ём-Кіпур (Судны дзень) – дзень пакаяння ў грахах і посце; Сукот – узгадваецца дапамога Бога яўрэям, калі яны 40 гадоў падарожнічалі па пустыні; Песах (Праходжанне) – у гонар вызвалення яўрэяў з егіпецкага рабства і другія.

У іўдаізме ёсць ежавыя забароны. Уся ежа падзяляецца на кашэрную (правільную, чыстую) і некашэрную. Напрыклад, забаронена есці свініну, малюскаў, ракападобных, а дазволена – бараніну, ялавічыну, кураціну. Нельга ўжываць у ежу кроў, таму жывёлы павінны быць забіты спецыяльным спосабам, а мяса іх вымочваецца ў халоднай вадзе. Мясныя і малочныя прадукты нельга ўжываць разам. Традыцыйна выхаваная яўрэйская хатняя гаспадыня мае два наборы посуду: адзін – для малочнай, другі – для мясной ежы. У дадатак яна можа

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

карыстацца дзвюма мыйкамі для посуду і двума наборамі рушнікоў. З гэтай жа прычыны ў кашэрных гатэлях маюцца дзве кухні.

Іўдаізм на Беларусі з'яўляецца прышлай рэлігіяй. Масавае перасяленне яўрэяў на тэрыторыю Беларусі адбылося ў другой палове XIV ст. з Германіі. Як і ў іншых краінах дыяспары, яўрэі на нашых землях не асіміляваліся з мясцовым насельніцтвам і жылі адасоблена. XX ст. з'явілася часам жорсткіх выпрабаванняў для іўдаізму на Беларусі. Моцны ўдар па яму нанесла антырэлігійная палітыка Савецкай улады і генацыд яўрэяў у гады фашысцкай акупацыі. З канца 80-х гг. у сувязі са зменай палітычнай сітуацыі ў нашай краіне адбываецца адраджэнне рэлігійнага жыцця, якое закранула і іўдаізм. Зараз на Беларусі зарэгістравана тры рэлігійныя аб'яднанні іўдзеяў: Беларускае іўдзейскае рэлігійнае аб'яднанне, Аб'яднанне іўдзейскіх рэлігійных суполак Рэспублікі Беларусь і Аб'яднанне суполак прагрэсіўнага іўдаізму Рэспублікі Беларусь. Дзейнічаюць духоўнае вучылішча ў Мінску, нядзельныя школы пры сінагогах, яўрэйскія дзіцячыя садкі і класы ў сярэдніх школах.

На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 35 суполак артадаксальнага і 17 прагрэсіўнага (рэфарміраванага) іўдаізму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 4
# СУСВЕТНЫЯ РЭЛІГІІ

## 4.1. Будызм

4.1.1. Узнікненне будызму.
4.1.2. Этыка будызму.
4.1.3. Кірункі ў будызме.

### 4.1.1. Узнікненне будызму

Будызм – самая старажытная сусветная рэлігія. Узнік у VI ст. да н. э. у Паўночнай Індыі. Зараз колькасць яго прыхільнікаў складае 324 млн чалавек. Будызм распаўсюджаны ў такіх краінах, як, Кітай, Японія, В'етнам, Лаос, Тайланд, Камбоджы, Шры-Ланка, М'янма, Карэя, Манголія, Непал. У Індыі зараз будыстаў вельмі мала – менш чым 0,5 % насельніцтва.

Будызм узнік як лагічны працяг і своеасаблівае адмаўленне папярэдніх яму рэлігій Старажытнай Індыі – ведызму і брахманізму. У ім абвяшчаецца прынцыповая роўнасць паміж людзьмі, гэта значыць, адмаўляецца варнавая сістэма, якая з'яўляецца адной з падстаў брахманізму. Таксама быў абвешчаны індывідуальны шлях выратавання, вынікам чаго з'явіўся непасрэдны ўдзел кожнага будыста ў рэлігійным жыцці. Заснавальнік будызму Сіддхартха Гаўтама Шак'ямуні (Буда) выйшаў з асяроддзя кшатрыяў.

Большасць даследчыкаў зараз лічыць, што заснавальнік будызму з'яўляецца рэальнай гістарычнай асобай. Існуе некалькі варыянтаў ягонай біяграфіі, у якіх пераплецены рэальныя і міфалагічныя элементы.

Вядома, што ён нарадзіўся ў 564 г. да н. э. у Паўночнай Індыі ў сям'і цара Шудхаданы, правіцеля племені шак'яў, і царыцы Маі. Пры нараджэнні яго назвалі Сідхартха Гаўтама (Сідхартха – асабістае імя, – азначае "той, хто дасягнуў мэты"; Гаўтама – радавое імя, у гонар яго знакамітага продка, настаўніка брахманізму). У далейшым яго таксама сталі зваць Шак'ямуні – "мудрэц з племені шак'яў". Прынц жыў у раскошы, не ведаючы турбот. Ва ўзросце 16 гадоў ён ажаніўся на прынцэсе, якую звалі Гопа. Апроч яе ў яго быў цэлы гарэм прыгожых танцоўшчыц, і, здавалася б, малады прынц павінен быць задаволены жыццём. Аднак свайго адзінага сына ён называе Рахула, што значыць "ланцуг", такім чынам, пасярод усёй раскошы Сідхартха

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адчуваў сябе як у ланцугах. Духоўны крызіс абвастрыўся пасля таго, як малады прынц адкрыў для сябе той факт, што жыццё людзей зусім не складаецца з адных прыемнасцяў, але поўнае пакут і няшчасцяў. Гэтае адкрыццё аказала на Сідхартху вельмі глыбокае ўражанне, і ён задумаўся аб сэнсе жыцця.

Індыйская культура таго часу ўжо выпрацавала акрэсленыя адказы на гэтае пытанне. Лічылася, што спакой можна атрымаць праз аскетычны вобраз жыцця і самаўмярцвенне плоці. Сідхартха ўцякае з палаца і шэсць гадоў займаецца аскетычнай практыкай. Ён вельмі схуднеў, яго твар пачарнеў і зрабіўся страшным, скура зморшчылася, а валасы выпалі. Аднак Сідхартха не знаходзіць адказы на тыя пытанні, якія яго мучылі. Па гэтай прычыне ён адмаўляецца ад аскетызму і каля горада Урувела ў свяшчэнным гаі аддаецца глыбокай медытацыі. У выніку на яго сышло “прасвятленне”, і ён зрабіўся Будай (“Прасветленным”). Потым ён пачаў прапаведаваць, у яго з’явіліся вучні, з якімі ён 40 гадоў хадзіў па Індыі, расказваючы аб шляху выратавання ад пакут. Памёр Буда ў 483 г. да н. э. ва ўзросце 80 гадоў у мястэчку Кушынагара. Згодна з індыйскімі звычаямі, яго цела было спалена, а попел падзелены паміж васьмю паслядоўнікамі. У далейшым гэтыя часткі попелу былі захаваны, і над імі пабудавалі піраміды (ступы), якія з’яўляюцца месцам паломніцтва будыстаў. Паводле падання, адзін з вучняў Буды выхапіў з пахавальнага вогнішча зуб свайго настаўніка. Зараз гэты зуб з’яўляецца галоўнай рэліквіяй будызму, знаходзіцца ён на Шры-Ланцы ў горадзе Кандзі, у гонар яго пабудаваны спецыяльны храм Зуба Буды і штогод праводзяцца ўрачыстасці.

Такія нешматлікія факты з рэальнай біяграфіі заснавальніка будызму. Міфалагічная ж біяграфія Буды мае прыкладна наступны выгляд.

На працягу многіх кальп (I кальпа – 8 640 000 000 год) Буда пераараджаўся на зямлі ў выглядзе розных жывых істот – 83 разы святым, 58 разоў царом, 24 разы манахам, 18 разоў малпай, 13 разоў купцом, 12 разоў курыцай, 8 разоў гусем, 6 разоў сланом, а таксама рыбай, пацуком, цесляром, кавалём, жабай, зайцам і г. д. Усяго такіх перараджэнняў было 550. Паколькі свет за гэты час апынуўся ў цемры невуцтва, багі вырашылі, што яму трэба нарадзіцца чалавекам, дасягнуць пры жыцці прасвятлення, зрабіцца Будай і пачаць прапаведаваць сваё вучэнне, паказаўшы тым самым чалавецтву шлях да выратавання. Буда сам выбраў месца і час свайго нараджэння, а таксама сваіх будучых бацькоў. Згодна з паданнем, яго маці Мая ўбачыла сон: быццам бы ёй у правы бок (па іншай версіі – ва ўлонне) увайшло

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бажаство ў выглядзе белага слана. Праз належны тэрмін яна нарадзіла сына, які выйшаў у яе з правага бока, зрабіў сем крокаў і абвясціў кліч Буды, пачуўшы які, багі паспяшаліся яго ўшанаваць. Пры нараджэнні Буды яго бацькам было прадказана, што ён зробіцца альбо вялікім царом, альбо заснавальнікам новага вучэння, прычым апошняе адбудзецца, калі ён пабачыць пакуты свету. Бацька хацеў, каб яго сын стаў царом, і таму забяспечыў яму бестурботнае жыццё. Але аднойчы малады царэвіч паехаў на прагулку, і адбыліся чатыры знакамітыя сустрэчы: ён убачыў хворага, старога, памерлага і манаха-аскета. Пад уражаннем першых трох сустрэч Сідхартха прыйшоў да высновы, што ўсё жыццё чалавека поўнае зла і пакут, а чацвёртая паказала яму магчымы шлях выратавання. Ён уцякае з палаца і спрабуе знайсці ісціну праз аскетызм, але потым адмаўляецца ад яго. Сідхартха сядае пад свяшчэннае дрэва, уваходзіць у стан глыбокай медытацыі, вырашыўшы не падымацца, пакуль не дасягне ісціны. Ён сядзеў так 49 дзён, яго спакушаў дэман Мара, але нарэшце дасягнуў прасвятлення і зрабіўся Будай. Потым ён стварае манаскую суполку, прапаведуе сваё вучэнне і ва ўзросце 80 гадоў адыходзіць у нірвану.

### 4.1.2. Этыка будызму

Этыка з’яўляецца асновай веравучэння будызму. Асноўнай сваёй задачай Буда лічыў не тлумачэнне свету, а ўказанне людзям шляху выратавання. Таму, калі яму задавалі пытанні, як узнік свет, куды ён ідзе, як пабудаваны, Буда маўчаў. У будызме гэта называецца “Вялікае маўчанне Буды”. Ён прыводзіў прыклад: калі чалавек, паранены атручанай стралой, будзе высвятляць, хто яго параніў, мужчына гэта ці жанчына, да якой варны належыць і г. д., дык памрэ раней, чым знойдзе адказы на ўсе гэтыя пытанні, – трэба хутчэй выцягнуць стралу і лячыць рану. Так і ў жыцці – людзі цікавяцца рознымі метафізічнымі пытаннямі аб сутнасці рэчаў, іх пабудове і г. д., не знаходзяць на іх адказы і паміраюць у турботах. Таму ўсё ў будызме падпарадкавана справе вызвалення чалавека ад пакут. Буда казаў, што ён прапаведуе не ўсё сваё вучэнне, а толькі тую частку, якая непасрэдна карысна для жыцця, – тое, што ён ведае, і тое, чаму вучыць, суадносяцца прыкладна таксама ж, як колькасць лістоў у лесе і колькасць лістоў, узятых у руку.

У сваіх пропаведзях Буда прытрымліваўся так званага “сярэдзіннага шляху”. Ён прыйшоў да высновы, што абедзве крайнасці – і жыццё, поўнае пачуццёвых задавальненняў, і аскетычная практыка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

добраахвотных пакут – аднолькава несапраўдныя. Першая – гэта "жыццё нізкае, не высакароднае, супрацьлеглае духу, ганебнае, мізэрнае"; другая – "жыццё змрочнае, ганебнае, мізэрнае". Правільны шлях ляжыць пасярэдзіне. Гэта шлях паглыблення ў сябе дзеля пазнання ісціны, ён вядзе да супакою і прасвятлення духу.

Этыка будызму грунтуецца на чатырох высакародных ісцінах, якія адкрыліся Сідхартху Гаўтаме над свяшчэнным дрэвам Бодхі.

Першая ісціна – усё жыццё ёсць зло і пакуты. Нараджэнне – гэта пакуты, смерць – гэта пакуты, хвароба – гэта пакуты, неспакой, няшчасце, боль, расчараванне і адчай – гэта пакуты, немагчымасць атрымаць пажаданае – гэта пакуты і г. д. Пакуты Буда разумеў перш за ўсё як хваляванні, мітусню, неспакой.

Другая ісціна – прычынай пакут з'яўляюцца жаданні. Ад брахманізму будызм запазычыў вучэнне аб коле перараджэнняў (сансары), згодна з якім, чалавек пасля смерці перараджаецца ў іншую жывую істоту ў адпаведнасці з сукупнасцю сваіх добрых і дрэнных учынкаў (кармай). Выснова, якую зрабіў з гатага вучэння брахманізм, даволі простая: калі ў чалавека цяжкае жыццё – гэта пакаранне за тое зло, якое ён зрабіў у мінулым; трэба паводзіць сябе добра – і будучае жыццё будзе лепшым. Для будызму такая логіка непрымальная, бо ў ім любое жыццё лічыцца злом і пакутамі. Прычынай жа пакут з'яўляюцца жаданні, як добрыя, так і дрэнныя, бо гэта менавіта яны прыводзяць да ўчынкаў і новых перараджэнняў.

Трэцяя ісціна – каб пазбавіцца ад пакут, трэба пазбавіцца ад жаданняў. Сукупнасць добрых і дрэнных жаданняў чалавека з'яўляецца падставай для яго далейшых перараджэнняў. Калі знікаюць жаданні, працэс перараджэнняў спыняецца.

Чацвёртая ісціна – каб пазбавіцца ад жаданняў, трэба ісці па "высакароднаму васьмярычнаму шляху", які ўказаў Буда. Называецца ён так таму, што складаецца з васьмі наступных крокаў:

1) праведныя погляды, гэта значыць, погляды, заснаваныя на "высакародных ісцінах";

2) праведнае імкненне – рашучасць выканаць гэтыя ісціны ў сваім жыцці;

3) праведная мова – добразычлівая, шчырая мова, пазбаўленая грубасці, ілжы, нагавораў;

4) праведныя паводзіны – паводзіны, падпарадкаваныя наступным пяці прынцыпам: а) захаванне вернасці ў шлюбе; б) адмаўленне ад забойства ўсякай жывой істоты; в) адмаўленне ад крадзяжу; г) адмаўленне ад хлусні; д) адмаўленне ад ужывання наркатычных сродкаў, у тым ліку алкаголю;

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРЫНЫ

5) праведнае жыццё – гэта жыццё на сумленна здабытыя сродкі. Спосаб зарабляць сабе на жыццё не павінен прыносіць шкоды іншым людзям;

6) праведнае намаганне – пераадоленне ўсяго, што прывязвае да сябе свядомасць;

7) праведная ўвага – пастаянная сканцэнтраванасць свядомасці на тым, што ўдалося ўжо дасягнуць на шляху пазбаўлення ад прыхільнасцей;

8) праведная медытацыя – стан поўнай адлучанасці ад свету і пазбаўлення якіх-небудзь жаданняў.

Канчатковай мэтай васьмярычнага шляху з’яўляецца дасягненне нірваны. Згодна з будыйскай традыцыяй, што такое нірвана, рацыянальна растлумачыць немагчыма. Звычайна над ёй разумеецца адсутнасць павуціння жаданняў, якое звязвае адно жыццё з другім. Само слова “нірвана” перакладаецца з санскрыту як “затуханне”, “згасанне”. Падобна таму, як полымя згасае, калі канчаецца паліва, спыняецца кола перараджэнняў, калі знікаюць жаданні. “Мудрыя – вучыў Буда, затухаюць як лампады”. Такім чынам, нірвана – гэта ўнутраны стан чалавека, які характарызуецца поўнай адсутнасцю жаданняў, свабодай, раўнавагай, адлучанасцю ад праблем жыцця, абсалютным спакоем.

Сэнс нірваны ў тым, што яна ставіць чалавека па той бок неабходнасці, і таму яна тоесная свабодзе. Аднак гэта негатыўная свабода, свабода ад жаданняў, пачуццяў, прыхільнасцяў. Этыка будызму мае песімістычны характар: усё жыццё – гэта зло і пакуты і, каб пазбавіцца ад пакут, трэба, фактычна, пазбавіцца ад жыцця. Але не шляхам самазабойства, бо гэта толькі пагоршыць карму і прывядзе да новага больш дрэннага існавання, а шляхам адмаўлення ад усяго, што прывязвае да гэтага свету, яго хваляванняў, радасцяў і пакут, каб дасягнуць абсалютнага спакою ў нірване.

### 4.1.3. Кірункі ў будызме

Этычныя і сацыяльныя палажэнні пропаведзі Буды аб роўнасці ўсіх людзей незалежна ад іх каставай прыналежнасці, цярпімасці, павазе да жыцця, неабходнасці сумленных паводзін з’явіліся прыцягальнымі для шырокіх колаў індыйскага грамадства. Што тычыцца практычнай рэалізацыі гэтых палажэнняў (васьмярычнага шляху дасягнення нірваны), то яна спачатку ажыццяўлялася толькі праз манаства. Чалавек, які ўступаў у манаскую суполку будыстаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адмаўляўся ад усякай маёмасці, галіў галаву, пераапранаўся ў простае адзенне жоўтага колеру, які лічыўся колерам ніжэйшых, “нячыстых” каст. Манахі вялі лад жыцця вандроўных аскетаў, жылі міласцінай, есці маглі адзін раз у суткі, толькі ў першай палове дня, прычым ежа павінна была быць вегетарыянскай. На перыяд дажджоў манахі збіраліся невялікімі суполкамі (сангхамі) у якім-небудзь адасобленым месцы. Так узніклі манастыры, якія паступова ператварыліся ў цэнтры будызму і, па сутнасці, адзіную форму яго арганізацыі. Спачатку існавалі толькі мужчынскія манастыры, потым з’явіліся і жаночыя.

Аднак не ўсе тыя, хто прыняў пропаведзь Буды, маглі прысвяціць сябе манаству, таму паступова сфарміраваўся інстытут свецкіх прыхільнікаў будызму. Яны павінны былі прытрымлівацца будыйскай маралі і падтрымліваць манахаў матэрыяльна.

У выніку распаўсюджвання будызму сярод міран, а таксама разыходжанняў па пытанні магчымасці дасягнення для іх нірваны, на мяжы I–II стст. н. э. будызм падзяліўся на два напрамкі: хінаяну і махаяну.

Хінаяна (малая калясніца, малы шлях) лічыць, што нірваны чалавек дасягае індывідуальна і дзякуючы выключна асабістым намаганням. Дасягнуць яе могуць толькі манахі, мэта ж міранаў – паляпшэнне сваёй кармы і дапамога сангсе. Рэлігійным ідэалам з’яўляецца архат (санскр. “дастойны”) – чалавек, які цалкам выконваў манаскія абеты і дасягнуў нірваны. Своеасаблівасцю хінаяны з’яўляецца тое, што ў ёй не прызнаецца рэальнае існаванне багоў, таму яе часам называюць атэістычнай рэлігіяй. Месца бога займае закон кармы, у адпаведнасці з якім кожны атрымлівае тое, што ён заслужыў сваімі мінулымі дзеяннямі. Буда ў хінаяне таксама не лічыцца богам, гэта звычайны чалавек, настаўнік мудрасці, які знайшоў шлях да выратавання і ўказаў яго людзям. Таму ўсе малітвы і іншыя формы культу маюць сэнс толькі як мемарыяльныя акты, мэта якіх – шанаванне памяці настаўніка і ўспаміны аб ім як аб прыкладзе для прыхільнікаў. Хінаяну таксама называюць паўднёвым будызмам. Яна распаўсюджана ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, такіх, як Шры-Ланка, Бірма, Тайланд, Лаос, Камбоджа, часткова ў Індыі, Бангладэш, В’етнаме, Малайзіі, Непале.

Махаяна (вялікая калясніца, вялікі шлях) сцвярджае, што нірваны могуць дасягнуць усе людзі, якія кіруюцца вучэннем Буды, а не толькі манахі. Лічыцца, што існуе бясконцая колькасць буд. Кожны з іх, у тым ліку і Сідхартха Гаўтама Шак’ямуні, з’яўляецца ўвасабленнем адвечнага звышнатуральнага сусветнага прынцыпу. Асаблівае месца ў махаяне займае канцэпцыя бодхісатвы (санскр. “істота, якая імкнецца да прасвятлення”). Гэта людзі, якія дасягнулі нірваны, але не разарвалі



РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

цалкам сувязь са светам, бо ў іх засталося адно жаданне: садзейнічаць выратаванню іншых жывых істот. Бодхісатвам пры-пісваюцца звышнатуральныя якасці, лічылася, што жывуць яны не толькі на зямлі, але і ў іншых светах, колькасць якіх бясконцая. Галоўнымі якасцямі бодхісатвы з'яўляецца прамудрасць, г. зн. здольнасць спасцігаць сапраўдную рэчаіснасць, а таксама вялікае спачуванне, якое праяўляецца ў здольнасці выратоўваць розныя тылы жывых істот. Спачатку бодхісатвам называўся любы вернік, які імкнуўся да выканання такой альтруістычнай місіі. Пазней гэта слова стала ўжывацца ў дачыненні пераважна да вялікіх святых, надзеленых звышнатуральнай сілай, якія па моцы пераўзыходзяць багоў ведызму. У далейшым яны зрабіліся папулярнымі аб'ектамі шанавання і надзей для мільёнаў вернікаў. Культ бодхісатваў з'яўляецца настолькі важным для махаяны, што яе часта нават называюць бодхісатваянай – калясніцай бодхісатваў.

Дзякуючы таму, што ў махаяне лічыцца магчымым дасягненне нірваны не толькі для манахаў, але і для ўсіх вернікаў, яна ахапіла значна больш шырокае кола людзей, чым хінаяна. У працэсе распаўсюджвання за межамі Індыі махаяна праявіла выключную гібкасць у прыстасаванні да новых умоў, характару іншых культур і цывілізацый, што і дазволіла будызму зрабіцца сусветнай рэлігіяй.

Махаяну таксама называюць паўночным будызмам, яна распаўсюджана ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Азіі, такіх, як Кітай, Манголія, Карэя, Японія.

Доўгі час у навуцы існавала меркаванне, што хінаяна амаль дакладна перадае вучэнне ранняга будызму, а махаяна з'яўляецца вынікам больш позняга развіцця. Аднак сучасныя даследаванні паказалі, што, з аднаго боку, абодва гэтыя вучэнні адрозніваюцца ад першапачатковага будызму і сфарміраваліся ў выніку яго доўгай эвалюцыі, а з другога, што яны развіваюць тыя тэндэнцыі, якія існавалі ўжо ў раннім будызме. Трэба адзначыць, што самі назвы "хінаяна" і "махаяна" ўзніклі ў выніку палемікі паміж гэтымі кірункамі. Прыхільнікі хінаяны называлі свой кірунак тхеравадай ("вучэннем старцаў") і прэтэндавалі на перадачу аўтэнтычнага першапачатковага будызму. Хінаянай жа гэты напрамак назвалі прыхільнікі махаяны: ёсць малая калясніца, якая выратоўвае нямногіх, і ёсць вялікая калясніца, на якой могуць выратавацца ўсе.

У другой палове I тысячагоддзя н. э. у межах махаяны фарміруецца новы кірунак, які атрымаў назву ваджраяна (алмазная калясніца). Узнікла яна ў Індыі і потым распаўсюдзілася ў Непал, Тыбет, Кітай, Японію. Вядома пра ваджраяну мала, бо яна з'яўляецца тайным вучэннем,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прызначаным для нямногіх. Нірвана тут дасягаецца пры дапамозе магічных абрадаў. Пры гэтым выкарыстоўваюцца наступныя сродкі:

– мантра – малітва-заклінанне, якая паўтараецца без перапынку.

Лічыцца, што яе сіла выходзіць далёка за межы Сусвету і забяспечвае яго дабратворную энергетыку. Мантру можна напісаць на паперы і пакласці ў спецыяльную "малітоўную калясніцу" (апошняя ўяўляе сабой цыліндр на восі), якую потым круцяць. Лічыцца, што колькі разоў павярнулася "малітоўная калясніца", столькі разоў сказана мантра;

– мудра – сімвалічны жэст. У ваджраяне маецца цэлы набор спецыяльных рухаў, праз якія выяўляецца імкненне асобы зліцца з Абсалютам. Апроч таго, у ваджраяне прысутнічае моцны эратычны элемент. Лічыцца, што ў час узаемадзеяння паміж мужчынам і жанчынай вызваляецца дабратворная энергія Сусвету. Трэба адзначыць, што гэтае ўзаемадзеянне зводзіцца, як правіла, да сумесных фізічных практыкаванняў і толькі на вышэйшым узроўні мае форму сексуальных кантактаў;

– мандала – "кола медытацыі". Уяўляла сабой круг, упісаны ў квадрат, які, ў сваю чаргу, таксама ўпісаны ў круг. Мандала ў ваджраяне – гэта мадэль Сусвету. У яе цэнтры знаходзіцца Абсалют, з якім вернік зліваецца ў працэсе сузірання мандалы.

У пантэоне ваджраяны побач з бясконцай колькасцю буд і бодхісатв ёсць яшчэ адзін від звышнатуральных істот – ідамы ("бог, які звязаны абетам"). Асноўнае іх прызначэнне – быць ахоўнікамі людзей. У прынцыпе, ідамам можа зрабіцца любы буда, бодхісатва альбо архат; вернік выбірае яго сваім апекуном, калі пачынае ўзыходжанне па шляху Буды. Ідам – гэта боства мандалы і аб'ект медытацыі, сузіранне і зліццё з ім верніка вядзе да прасвятлення. Ідамы падзяляюцца па поле (мужчынскія і жаночыя), а таксама па эмацыянальным стане (спакойны, гняўлівы і спакойна-гняўлівы), як правіла, яны маюць шмат рук, ног і твараў.

Вельмі папулярнай у міфалогіі ваджраяны з'яўляецца легенда аб краіне Шамбала. Лічыцца, што яна знаходзіцца на поўнач ад Індыі. У ёй не бывае хвароб, неўраджаяў, стыхійных бедстваў. Яе жыхары – моцныя, прыгожыя людзі, якія жывуць да глыбокай старасці. Яны не проста будысты, а пранiклі ў самыя глыбіні патаемных ведаў. Шлях у Шамбалу могуць знайсці толькі тыя, хто авалодаў гэтымі ведамі настолькі ж глыбока, як і яе жыхары, і пераадолеў у сабе пачуццёвую прывязанасць да жыцця. Усе астатнія могуць прайсці побач і не заўважыць яе. У сувязі з уяўленнямі аб тым, што ў Шамбале існуць найлепшыя ўмовы для рэалізацыі будыйскага шляху

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і што адзін толькі прыход у Шамбалу выключае магчымасць далейшых неспрыяльных перараджэнняў, распаўсюджваюцца малітвы аб нараджэнні ў ёй і “даведнікі” аб спосабах яе дасягнення. Змест апошніх паказвае, што шлях да Шамбалы ляжыць не столькі ў знешнім, колькі ва ўнутраным свеце, і зараз сярод адукаваных прыхільнікаў ваджраяны існуе ўяўленне аб Шамбале як аб унутранай рэчаіснасці – асаблівым стане псіхікі, якое дасягаецца ў працэсе самаўдасканальвання.

Будызм аказаў вельмі вялікі ўплыў на культуру Індыі і нават нейкі час з’яўляўся там дзяржаўнай рэлігіяй. Аднак яго складаныя абстрактныя палажэнні аб чатырох высакародных ісцінах былі незразумелымі для большасці насельніцтва, якому патрабавалася простая і наглядная рэлігія. У першым тысячагоддзі н. э. пазіцыі будызму ў Індыі паступова слабеюць, і ён выцясняецца індуізмам. Апошні з’яўляецца арганічным працягам рэлігіі вед і брахманізму. У індуізме існуе каля трох з паловай тысяч багоў, галоўнымі з іх лічацца Брахма – бог-стваральнік, Вішну – бог-ахоўнік і Шыва – бог-разбуральнік. Апроч багоў шануюцца жывёлы (найбольш вядомыя – карова, бык, малпа, слон, змяя), расліны, камяні, мясціны (асабліва рака Ганг). Зараз у Індыі прыкладна 83 % насельніцтва належыць да індуізму.

Развіццё ж будызму як сусветнай рэлігіі адбываецца па-за межамі Індыі. У VII–XIV стст. н. э. у Тыбеце ў выніку сінтэзу махаяны, ваджраяны і мясцовай шаманскай рэлігіі бон сфарміраваўся ламаізм. Сама яго назва паходзіць ад слова “лама” (“вышэйшы”) – настаўнік у глыбінным сэнсе гэтага слова. Ламамі ў Тыбеце называюць манахаў, колькасць іх часам дасягала адной трэці насельніцтва, бо кожная сям’я лічыла сваім абавязкам аддаць аднаго з сыноў у ламы.

У веравучэнні ламаізму, і гэтым ён адрозніваецца ад першапачатковага будызму, важнае месца займае касмалогія (вучэнне аб пабудове свету). Згодна з ёй існуе незлічоная колькасць светаў, адным з якіх з’яўляецца наш. Зямля ўяўляе сабой плоскі дыск, на якім размешчаны чатыры мацерыкі, абмытыя акіянам. У цэнтры дыска знаходзіцца гара Сумеру. Вакол яе круцяцца сонца, месяц і зоркі. На вяршыне гары і над ёй жывуць багі, унізе – злыя духі. Вакол Сумеру, абмытыя акіянам, ляжаць чатыры кантыненты ў выглядзе круга, паўкруга альбо трапецыі, трохвугольніка і квадрата. Зямля ляжыць на слане, слон стаіць на чарапасе, чарапаха плавае ў моры. Калі на зямлі набіраецца шмат грахоў, чарапаха пачынае варушыцца, ад чаго адбываюцца землятрусы. Апошнія, такім чынам, з’яўляюцца сігналам дрэннага становішча і, адпаведна, неабходнасці ўзмацнення культавай дзейнасці.

Пантэон ламаізму надзвычай складаны і шматколькасны. Узначальваюць яго і найбольш шануюцца буды і бодхісатвы. На першым месцы знаходзіцца буда Амітабха, які трактуецца як прадаўжальнік вялікай справы Шак'ямуні, свайго роду творца-апякун цяперашняга перыяду існавання Сусвету, валадар Заходняга раю. Не менш, а ў некаторых выпадках і больш высока, ламаісты шануюць эманацыю Амітабхі бодхісатву міласэрнасці Авалакіцешвару. Сярод іншых буд, якіх у ламаізме тысяча, вылучаецца "спрадвечны буда", г. зн. персаніфікаваная сутнасць усіх буд і бодхісатваў, Адзібуда, а таксама буда будучага часу Майтрэя. Побач з будамі і бодхісатвамі шануюцца шматлікія багі, духі-апекуны той ці іншай мясцовасці альбо прафесіі, святыя.

У ламаізме лічыцца, што дасягненне нірваны праз засваенне чатырох высакародных ісцін і праходжанне васьмярычнага шляху даступна толькі некаторым людзям, тым, хто прысвяціў сваё жыццё пазбаўленню ад перараджэнняў. Для большасці ж галоўнае – дабіцца пад кіраўніцтвам ламы ўдалага перараджэння альбо адрадзіцца ў Заходнім раі буды Амітабхі ці на адным са шматлікіх нябёсаў побач з боствамі і святымі, чыя карма дазваляе ім доўга жыць у іх свеце, застаючыся пры гэтым маладымі і здаровымі. Але пекла, рай і нябёсы – толькі часовае месцазнаходжанне, якое не выключае чалавека з кола сансары: калі вычарпана добрая альбо дрэнная карма, чалавек перараджаецца зноў.

Вельмі вялікае развіццё ў ламаізме атрымаў культ. Існуюць пышныя храмы са шматлікімі выявамі буд, бодхісатваў, багоў, духаў і святых, урачыстыя набажэнствы, цырымоніі і святы з абрадамі, спевамі і танцамі, ужываннем музычных інструментаў, званоў, харугваў, духмяных рэчываў і г. д. Асаблівае значэнне ў ламаісцкім кульце маюць мантры, самая папулярная сярод якіх "Ом мані падме хум". Звычайна яе перакладаюць як "Ом, ты скарб на лотасе", пры гэтым "ом" ("аум") – магічнае слова ўсіх індыйскіх рэлігій. Лічыцца, што праз яго праяўляецца глыбінная сутнасць Сусвету. Кожны склад гэтай мантры мае для ламаістаў сакральны сэнс і з'яўляецца аб'ектам медытацыі, якая вядзе да прасвятлення. Вераць, што само вымаўленне мантры актывізуе дабратворны энергетычны пачатак Сусвету, таму яе трэба казаць як мага часцей. Менавіта гэтым тлумачыцца шырокае распаўсюджанне ў ламаізме малітоўных барабанаў, да іх нават могуць прыладзіць прапелер і паставіць на дах – чым больш разоў пад уздзеяннем ветру яны павернуцца, тым лепш.

Неад'емнай прыналежнасцю жылля ламаіста з'яўляецца сямейны алтар. Гэта невысокая шафка, у якой знаходзяцца невялічкія скульптуры бостваў, іконы, іншыя свяшчэнныя прадметы, а таксама палічка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

перад ёй, на якой стаяць кубачкі для ахвярапрынашэнняў, курыльныя свечкі, кветкі.

На чале ламаісцкай іерархіі знаходзяцца Панчэн-лама (“Настаўнік – вялікія веды”) і Далай-лама (“Лама вялікі, як акіян”). Абодва яны адносяцца да рангу хубілганаў – перараджэнцаў. Вераць, што найбольш вядомыя духоўныя дзеячы ламаізму з’яўляюцца перараджэннем таго ці іншага буды, бодхісатвы альбо святога. Духоўным кіраўніком ламаізму з’яўляецца Панчэн-лама, увасабленне буды Амітабхі і духоўны настаўнік Далай-ламы, але рэальная свецкая ўлада належыць апошняму, хаця ён лічыцца “толькі” ўвасабленнем адной з праяў Амітабхі бодхісатвы Авалакіцешвары. Вельмі цікавая працэдура выбараў новых Панчэн- і Далай-ламы. Калі памірае хто-небудзь з іх, вераць, што Амітабха ці Авалакіцешвара пераселяцца ў хлопчыка, які народзіцца праз дзевяць месяцаў. Такому хлопчыку паказваюць розныя рэчы, у тым ліку рэчы старога Панчэн- альбо Далай-ламы, і калі ён пазнае іх, яго абвяшчаюць новым кіраўніком ламаізму. Цяперашні Далай-лама XIV атрымаў свой тытул у тры гады, а Панчэн-лама XI – у пяць.

Апроч Тыбету ламаізм зараз распаўсюджаны ў Манголіі, Бураціі, Туве і Калмыкіі.

Вельмі вядомым кірункам у махаяне з’яўляецца дзэн-будызм. Згодна з паданнем ён быў прынесены ў Кітай у VI ст. н. э. індыйскім прапаведнікам Бодхідхармай. У XII ст. дзэн-будызм пранік у Японію, дзе і атрымаў найбольшае распаўсюджанне. Зараз у свеце налічваецца прыкладна 10 млн дзэн-будыстаў, 9 з іх жыве ў Японіі.

Само японскае слова “дзэн” (па-кітайску “чань”) з’яўляецца перакладам індыйскага “дх’яна” – “сканцэнтраванасць, медытацыя”. Канчатковай мэтай рэлігійнага жыцця ў дзэн-будызме лічыцца дасягненне прасвятлення (“саторы”) шляхам медытацыі.

Дзэн-будызм лічыць, што Буда знаходзіцца ўнутры кожнага чалавека, які тоесны абсалюту і з’яўляецца ўмяшчальняй неабмежаваных магчымасцей. Такім чынам, медытацыя разумеецца як унутраная сканцэнтраванасць, паглыбленне ва ўласнае “Я”. Адзін з патрыярхаў дзэн-будызму вучыў: “Калі вы не шукаеце Буду ў саміх сабе, а шукаеце звонку, значыць, вы падобныя да аблудных людзей. Калі ўнутры вашай прыроды вы вызваліліся ад вашых прыхільнасцей, то адразу ўбачыце ўласную прыроду, а гэта і ёсць сапраўдны Буда”. Згодна з вучэннем дзэн-будызму, існаванне ў свеце якіх-небудзь прынцыповых апазіцый – гэта фікцыя, якая пароджана “непрасветленай” свядомасцю. У сапраўднасці ж паміж суб’ектам і аб’ектам, нірванай і сансарай, жыццём і смерцю, ведамі і невуцтвам няма ніякай розніцы.

Свядомасць прасветленага чалавека як быццам бы зліваецца з усім светам, пачынае працаваць у яго рытме. Прасвятленне дае чалавеку ўнутранае вызваленне ад улады абставін і абуджае паўнату творчай інтуіцыі. Свядомы кантроль саступае месца несвядомай рэгуляцыі паводзін чалавека, і патрэбны вынік дасягаецца як быццам бы без намаганняў у ходзе ажыццяўлення чалавекам сваёй унутранай сутнасці.

У дзэн-будызме ёсць два асноўныя спосабы медытацыі. Першы – гэта сядзячая медытацыя ў позе лотаса, у ходзе якой чалавек імкнецца паступова пазбаўляцца ад любых думак і вобразаў. Такім спосабам ён спасцігае ў сабе “сутнасць Буды” і дасягае прасвятлення. Другі спосаб – гэта медытацыя над якой-небудзь гісторыяй з жыцця патрыярхаў дзэн, якую настаўнік прапаноўваў свайму вучню ў якасці інтэлектуальнай задачы, якая мае, як правіла, парадаксальны характар. Вырашыць яе рацыянальным спосабам немагчыма. Напрыклад: адзін з патрыярхаў дзэн спытаў сваіх вучняў: “У мяне ёсць нешта, што не мае ні галавы, ні імя, ні назвы, ні пераду, ні заду. Ведае хто-небудзь з вас, што гэта такое?”. Альбо іншае пытанне: “Дзве далоні робяць пляскач. Што такое пляскач адной далонню?”. Гэта задача павінна цалкам авалодаць свядомасцю вучня, выціснуўшы ўсе іншыя думкі, і тады пасля крайняй ментальнай напружанасці адбываецца нечаканы “прарыў” і сэнс пытання робіцца зразумелым. Гэтым спосабам чалавек пазбаўляецца ад усіх агульнапрынятых формаў светаўспрымання і бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць. Дзякуючы гэтаму, чалавек вызваляецца ад прадузятасцей і робіцца свабодным. Напрыклад, дзэн-будыйскія манахі дэманстравалі адсутнасць боязі смерці, непавагу да яе. Яны спаборнічалі паміж сабой, хто больш незвычайна памрэ. Адны паміралі седзячы, другія – знаходзячыся на дрэве, трэція – дагары нагамі і г. д. Ёсць гісторыя пра аднаго вельмі паважанага манаха, які прыйшоў з труной на рынкавую плошчу і абвясціў, што зараз ён пойдзе паміраць да Усходняй брамы. Поўныя глыбокай пашаны людзі пайшлі за ім, каб паглядзець, як гэта адбудзецца, але праз некаторы час манах заявіў: “Сёння яшчэ рана, я памру заўтра каля Паўднёвай брамы”. І вось так тры дні ён дурыў людзям галаву. Усе перасталі яму верыць, і на чацвёрты дзень ужо ніхто не жадаў ісці глядзець на яго-нае скананне. У адзіноце манах выйшаў за горад, лёг у труну і папрасіў выпадковага прахожага закалаціць яе пасля таго, як ён памрэ.

Для таго, каб выціснуць са свядомасці вучня шаблонныя схемы мыслення, пазбавіць яго ад звычкі шукаць ісціну па-за сабой і накіраваць да прамога і непасрэднага сузірання сваёй “сапраўднай прыроды”, настаўнік мог закрычаць на свайго вучня, абразіць яго, піхнуць і нават ударыць. Наогул у дзэн-будызме падкрэсліваецца важнасць актыўнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стаўлення чалавека да свету, рэалізацыі сваёй творчай энергіі. Крайні аскетызм адвяргаецца: чалавечыя жаданні павінны не падаўляцца, а накіроўвацца ў духоўныя сферы. Вялікае значэнне ў дзэн-будыйскіх манастырах надавалася сумеснай фізічнай працы. У манастыры Шоліньсы ў Кітаі склалася своеасаблівая школа воінскага мастацтва.

Дзэн-будызм аказаў вельмі вялікі ўплыў на кітайскую і японскую культуры. Такія яго прынцыпы, як прастата, спантаннасць, гармонія, не толькі зрабіліся неад'емнай часткай традыцыйнага мастацтва, але і зараз шмат у чым вызначаюць стаўленне да жыцця многіх японцаў і кітайцаў. Яскравае адлюстраванне гэта знайшло ў манахромным жывапісе, ікебане, чайнай цырымоніі, каліграфіі, мастацтве разбіўкі садоў, ваенных мастацтвах.

Значны ўплыў дзэн-будызм аказаў на творчасць такіх заходнееўрапейскіх і амерыканскіх дзеячаў культуры XX ст., як Г. Гесэ, Дж. Сэлінджэр, В. Ван-Гог, А. Маціс, А. Швейцэр, К. Юнг, Э. Фром. У 60-я гг. "дзэнскі бум" ахапіў многія амерыканскія ўніверсітэты і паўплываў на рух бітнікаў. Манастыры і цэнтры па вывучэнні дзэн-будызму існуюць зараз і за межамі Японіі і Кітая – у Амерыцы і Заходняй Еўропе.

## 4.2. Хрысціянства, яго ўзнікненне і фарміраванне

4.2.1. Узнікненне хрысціянства.
4.2.2. Структура Бібліі.
4.2.3. Веравучэнне і культ хрысціянства.
4.2.4.Ператварэнне хрысціянства ў дзяржаўную рэлігію Рымскай імперыі і раздзяленне царквы.

### 4.2.1. Узнікненне хрысціянства

Хрысціянства з'яўляецца самай вялікай сусветнай рэлігіяй. Зараз яно налічвае каля двух мільярдаў прыхільнікаў. Такім чынам, звыш адной трэці цяперашняга насельніцтва Зямлі – хрысціяне. Прыхільнікі хрысціянства жывуць амаль ва ўсіх краінах свету. У Еўропе, Амерыцы і Аўстраліі яны складаюць асноўную колькасць жыхароў.

Зараз хрысціянства падзелена на тры асноўныя напрамкі: праваслаўе, каталіцтва і пратэстанцтва. А спачатку, больш за тысячу гадоў пасля свайго ўзнікнення, яно было адзіным, і менавіта ў гэты перыяд сфарміравалася ў якасці сусветнай рэлігіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Узнікла хрысціянства ў І ст. н. э. у Палесціне, якая ў той час з’яўлялася адной з усходніх правінцый Рымскай імперыі, як кірунак у іўдаізме.

Вышэй гаварылася, што іўдаізм у гэты перыяд знаходзіўся ў стане глыбокага крызісу. Важнае месца ў яго веравучэнні займала палажэнне аб богаабранасці яўрэйскага народа. Але яўрэяў увесь час хто-небудзь заваёўваў, і з 66 г. да н. э. яны знаходзіліся пад прыгнётам Рыма. У гэтых умовах узмацніліся  чаканне Месіі, прыход якога быў прадказаны прарокамі.

Хрысціяне верацць, што гэтым Месіяй, якога іўдзеі чакалі ўжо некалькі стагоддзяў, з’яўляецца Ісус Хрыстос. “Ісус” перакладаецца як “Выратавальнік”, гэта было даволі распаўсюджанае ў тыя часы сярод яўрэяў імя, а “Хрыстос” – гэта пераклад на грэчаскую мову старажытнаяўрэйскага “Машыах” (“Памазаннік”).

З моманту ўзнікнення і да нашых дзён вядуцца гарачыя спрэчкі наконт трактоўкі Ісуса Хрыста. Для хрысціян гэта Бог Сын, які сышоў на зямлю і выратаваў людзей. Іўдзеі лічаць, што ён з’яўляецца ілжэмесіяй, і што Месія для яўрэяў яшчэ не прыйшоў, яго ўсё яшчэ чакаюць. У XVIII ст. у навуцы сфарміраваліся дзве асноўныя трактоўкі Ісуса Хрыста: міфалагічная і гістарычная. Першая сцвярджала, што ніякага Хрыста на самой справе не было і яго вобраз – гэта міф, які ўзнік у выніку перапрацоўкі вядомых у тыя часы міфаў аб паміраючых і ўваскрасаючых багах: егіпецкага міфа аб Азірысе, грэчаскага міфа аб Дыянісе і інш. Некаторыя даследчыкі гэтай школы выводзілі вобраз Хрыста нават з татэмістычных вераванняў першабытных народаў. Міфалагічная трактоўка была цесна звязана з атэізмам. Сцвярджаючы, што Ісуса Хрыста не было, яе прадстаўнікі тым самым імкнуліся пазбавіць гістарычных падстаў само хрысціянства, паказаць, што ўсе яго палажэнні – не больш як вынік чалавечай фантазіі. Гістарычная трактоўка разглядае Ісуса Хрыста як рэальную асобу, прапаведніка новай рэлігіі, які сфарміраваў шэраг асноўных хрысціянскіх палажэнняў.

Прыхільнікі кожнай з гэтых трактовак прыводзяць аргументы на сваю карысць. Мы іх не будзем разглядаць, каб не ўскладняць матэрыял. Адзначым толькі, што большасць сучасных даследчыкаў зыходзіць з таго, што Ісус Хрыстос – гэта не міфалагічны вобраз, на самой справе была такая гістарычная асоба, якая заснавала хрысціянства. Мы ў нашых лекцыях таксама будзем прытрымлівацца гэтага погляду.

Хрыціянства ўзнікла ў канкрэтных сацыяльна-гістарычных умовах. У І ст. н. э. Рымская імперыя ўваходзіць у стан глыбокага

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

крызісу, які паступова ахоплівае ўсе сферы грамадскага жыцця. Распаўсюджваюцца настроі няўпэўненасці ў будучым, надыходзячага краху спрадвечных асноў. Узрастаюць разбэшчанасць і цынізм у вышэйшых слаях грамадства і незадаволенасць у нізах.

Старая рымская рэлігія ўжо не адпавядае новым умовам жыцця, таму папулярнымі сярод рымлян робяцца культы ўсходніх багоў: Азірыса, Астарты, Кібелы, Ізіды, Ацiса, Мітры. Узмацняюцца богашукальніцкія тэндэнцыі, прычынай якіх з'яўлялася адчуванне пакінутасці чалавека, яго бяссілля перад непазбежным і разбуральным рокам. Сваё філасофскае адлюстраванне гэтыя настроі знаходзяць у познім стаіцызме. Найбольш вядомы яго прадстаўнік Луцый Аней Сенэка (4 г. да н. э. – 65 г. н. э.) вучыў сваіх паслядоўнікаў быць мудрымі, не імкнуцца да знешніх поспехаў, падпарадкоўвацца лёсу, трывала і мужна пераносіць жыццёвыя выпрабаванні. Сутнасць этыкі стаіцызму перададзена ў наступным выказванні Сенэкі: "Чалавек нешчаслівы роўна настолькі, наколькі ён сабе гэта ўяўляе". Выхад з духоўнай дэзарыентацыі стаіцызм бачыў у дасягненні мудрым чалавекам стану незалежнасці ад турбот свету.

Крызіс рымскага грамадства з'явіўся адной з істотных умоў паспяховага распаўсюджвання ў ім хрысціянства. Яно давала людзям суцяшэнне, новую мараль, а таксама надзею на выратаванне і справядлівасць.

### 4.4.2. Структура біблії

Біблія з'яўляецца асноўнай крыніцай па гісторыі старажытных яўрэяў і першапачатковага хрысціянства. Зараз прызнаецца, што большасць падзей, якія ў ёй апісаны, сапраўды мелі месца. Таму да яе звяртаюцца вучоныя-гісторыкі. Апроч таго, яна – адзін з самых выдатных твораў літаратуры Старажытнага свету, які на працягу многіх стагоддзяў з'яўляецца аб'ектам пільнага філалагічнага аналізу.

Біблія таксама – самая распаўсюджаная на Зямлі кніга. Агульны тыраж яе выданняў складае каля мільярда асобнікаў і мнагакратна пераўзыходзіць тыраж любой іншай кнігі. Біблія перакладзена амаль на семсот моў і дыялектаў, у тым ліку на мову эскімосаў і ўолоф (Сінегал).

Такая папулярнасць Біблії тлумачыцца зусім не яе якасцямі як гістарычнай крыніцы альбо літаратурнага твора. Інакш яна б цікавіла толькі вузкае кола спецыялістаў па старажытнай гісторыі і літаратуры. Біблія – гэта свяшчэнная кніга іўдзеяў і хрысціян, і менавіта дзякуючы хрысціянству, як самай шматколькаснай сусветнай рэлігіі, яна атрымала такое шырокае распаўсюджанне.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Само слова "Біблія" паходзіць са старажытнагрэчаскага "*biblion*" – кніга. "*Biblion*" жа паходзіць, у сваю чаргу, ад назвы фінікійскага горада Біблос, які ў старажытнасці быў цэнтрам гандлю папірусам. Множны лік ад "*biblion*" – "*biblia*" ("*біблія*") – "кнігі". Запазычанае ў лацінскую мову, слова "біблія" стала ўжывацца як назоўнік адзіночнага ліку жаночага роду – "кніга".

Трэба падкрэсліць, што для хрысціян Біблія – не проста кніга, гэта Слова Божае, праз якое Бог па вялікай сваёй міласэрнасці адкрыўся людзям. Яна лічыцца боганатхнёнай – напісанай пад уплывам Духа Святога. Вядома больш сарака аўтараў Бібліі, і большасць з іх прызнаецца гістарычнымі асобамі, але, згодна з хрысціянскім веравучэннем, пісалі яны не па ўласнай ініцыятыве, а па натхненні, якое атрымалі ад Бога. З гэтага вынікае, што сапраўдным аўтарам Бібліі з'яўляецца Бог, людзі толькі перадавалі Ягоную волю. Менавіта гэтым тлумачыцца яе аўтарытэтнасць для хрысціян.

Біблія падзяляецца на дзве няроўныя па аб'ёму часткі: Стары і Новы Запавет. Стары Запавет складае 4/5 усяго тэкста. Ён узнік у XIII–II стст. да н. э. на тэрыторыі Палесціны і Вавілона. Старым Запаветам першую частку Бібліі называюць хрысціяне. Згодна з хрысціянскім веравучэннем, спачатку было заключана пагадненне паміж Богам і людзьмі праз абраны народ – яўрэяў, а потым прыйшоў Ісус Хрыстос, Сын Божы, і заключыў Новы Запавет непасрэдна з кожным чалавекам.

У праваслаўнай Бібліі Стары Запавет складаецца з пяцідзесяці кніг, у каталіцтве – з сарака пяці, у іўдаізме і пратэстанцтве – з трыццаці дзевяці. Тлумачыцца гэта розніца ў колькасці тым, што толькі трыццаць дзевяць кніг дайшлі да нас на старажытнаяўрэйскай мове, астатнія – на старажытнагрэчаскай. Апошнія *(1–3 Ездры, Тавіта, Юдзіф, Прамудрасці Саламона, Прамудрасці Ісуса Сына Сірахава, Баруха, 1–3 Макавейскія)* іўдзеі, а следам за імі і пратэстанты, не прызнаюць наогул і не ўключаюць у свае свяшчэнныя пісанні; праваслаўныя прызнаюць, але лічаць іх не кананічнымі[1], а душакарыснымі (іх чытанне карысна для душы, але іх палажэнні не з'яўляюцца нормамі); а католікі лічаць другакананічнымі (узнікшымі ў другую чаргу). Апроч таго, у праваслаўным Старым Запавеце ёсць некалькі кніг, якія адсутнічаюць у каталіцкім.

Стары Запавет падзяляецца на чатыры часткі.

1. <u>Пяцікніжжа Маісея.</u> У першай кнізе "Быццё" паведамляецца аб стварэнні свету, Адаме і Еве, сусветным патопе, калі выратаваўся толькі Ной са сваёй сям'ёй, далейшым рассяленні людзей па Зямлі.

[1] Ад грэч. konōn – норма, правіла.



РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Далей апавядаецца аб праайцы яўрэяў Аўрааме і яго нашчадках. У другой кнізе "Выхад" гаворка ідзе аб вызваленні яўрэяў з егіпецкага палону, іх саракагадовым вандраванні па пустыні, а таксама аб заключэнні з імі праз Маісея запавету на гары Сінай. Трэцяя кніга "Левіт"[1] мае амаль выключна заканадаўчы характар, і таму ў ёй апавяданне аб падзеях гісторыі яўрэйскага народа перарываецца. Тут змешчаны правілы ахвярапрынашэнняў і цырымоній прызначэння свяшчэннікаў, прадпісанні аб рытуальнай чысціні, богаслужэбны каляндар. У чацвёртай кнізе "Лічбы" зноў апавядаецца аб вандроўніцтве ў пустыні. Перад тым, як адысці ад Сіная, яўрэі робяць перапіс народа (адсюль назва кнігі) і прыносяць багатыя ахвяры Богу. Тут гаворыцца пра спробы яўрэяў заваяваць тэрыторыю Палесціны, якую, згодна з Бібліяй, Бог абяцаў нашчадкам Аўраама. Пятая кніга "Другазаконне" з'яўляецца кодэксам грамадзянскіх і рэлігійных прадпісанняў, дадзеных Богам. Асноўную частку яе зместу займаюць прамовы Маісея, у якіх ён нагадвае яўрэям аб выхадзе з егіпецкага рабства, Сінайскім Запавеце, пачатку заваёў Зямлі Абетаванай. Тут паведамляецца аб смерці і пахаванні Маісея, і таму зараз даследчыкі лічаць, што не ўсё Пяцікніжжа было створана самім Маісеем, бо чалавек не можа апісаць сваю смерць і пахаванне. Шэраг палажэнняў "Другазаконня" паўтараюць Сінайскі Запавет, адсюль назва гэтай кнігі.

2. Гістарычныя кнігі : Кніга Ісуса Навіна, Кніга Суддзяў, 4 кнігі Царстваў, 2 кнігі Параліпаменон (у перакладзе са старажытнаяўрэйскага – "летапіс"), кнігі Ездры і Нееміі *(+ 1–3 Макавейскія)*. Трэба адзначыць, што аўтары гэтых кніг не з'яўляюцца гісторыкамі нават у тагачасным, а, тым больш, у сучасным сэнсе слова. Асноўны змест гістарычных кніг – апісанне ўзаемаадносін яўрэяў з іх Богам, вернасці і (асабліва) нявернасці Запавету. Аўтараў цікавяць не столькі падзеі, колькі ўрокі, якія з іх вынікаюць. Аднак павучальны характар гэтых кніг не пазбаўляе іх гістарычнай каштоўнасці. Тут паведамляецца аб канчатковай заваёве яўрэямі тэрыторыі Палесціны і ўзнікненні дзяржавы, адступленні яўрэяў ад запавету з Яхвэ, вынікам чаго з'явілася падпарадкаванне іншым народам.

3. Прароцкія кнігі. Яны падзяляюцца на дзве часткі: чатыры кнігі так званых "вялікіх пракакаў": Ісаіі, Іраміі, Езэкііля, Даніїла і дванаццаць кніг "малых пракакаў". Пад пракамі ў Бібліі разумеюцца людзі, якія мелі вопыт непасрэднага пазнання Бога і пасланы, каб абвяшчаць людзям Яго волю, нагадваць аб Яго патрабаваннях і вяртаць на шлях Яго любові. У Бібліі ўзгадваецца шмат пракакаў, першым і

[1] Левіты – служкі ў Іерусалімскім храме, якія павінны былі паходзіць з рода Левія, аднаго з дванаццаці сыноў біблейскага патрыярха Якава.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самым вялікім сярод іх лічыцца Маісей. Больш за ўсё звестак да нас дайшло менавіта аб тых шаснаццаці прароках, кнігі якіх увайшлі ў Біблію. Яны дзейнічалі з VIII па II стст. да н. э. і аказалі надзвычай вялікі ўплыў на рэлігійнае развіццё яўрэяў.

4. Пісанні. Яны складаюцца з самых розных па зместу і жанру кніг. Сюды ўваходзяць: Псалтыр – зборнік псалмоў, аўтарам большасці з якіх лічыцца цар Давід, Песня Песняў – зборнік эратычнай лірыкі, дзе ў алегарычнай форме расказваецца аб любові паміж Богам і людзьмі, кнігі Іова, Прытчаў Саламонавых, Эклезіяста, Ісуса сына Сірахава і Прамудрасці Саламона, у якіх разважаецца аб лёсе чалавека і яго ўзаемаадносінах з Богам. (+ *Эстэр, Юдзіф, Плач Іераміі.)*

Хрысціяне, якія лічаць сябе духоўнымі нашчадкамі іўдзеяў, разглядаюць Стары Запавет як падрыхтоўку да Новага, а Новы – як ключ да разумення Старога. Але, безумоўна, галоўнае значэнне для іх мае Новы Запавет.

Ён быў напісаны ў І ст. н. э. на старажытнагрэчаскай мове ў розных месцах Рымскай імперыі: Анціохіі, Афінах, Рыме, востраве Патмас і інш. Трэба адзначыць, што хаця хрысціянства ўзнікла на тэрыторыі Палесціны, але Новы Запавет быў напісаны па-за яе межамі. Мова Новага Запавету – не літаратурная, а гутарковая (так званы “койнэ”).

Новы Запавет складаецца з 27 кніг, якія прызнаюцца кананічнымі пераважнай большасцю хрысціян і наогул не прызнаюцца іўдзеямі. Складаецца з чатырох частак.

1. Чатыры Евангеллі: паводле Матфея, паводле Марка, паводле Лукі і паводле Іана. Само слова “евангелле” ў перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы азначае “радасная вестка”. Па зместу кожнае з іх з’яўляецца апавяданнем аб жыцці і дзеяннях Ісуса Хрыста, але іх сутнасць – у перадачы радаснай весткі аб тым, што прыйшоў Сын Божы, узяў на Сябе грахі, узышоў за іх на крыж і тым самым выратаваў людзей. Такім чынам, евангелісты перадавалі добрую вестку аб тым, што ўсе людзі з’яўляюцца выратаванымі. З чатырох аўтараў Евангелляў Матфей і Іаан з’яўляюцца апосталамі, а Лука і Марк – вучнямі апосталаў. Тры першыя Евангеллі: паводле Матфея, Марка і Лукі, называюцца сінаптычнымі, ад старажытнагрэчаскага “*sinopsis*” – “слупок”. Калі іх тэксты размясціць у выглядзе чатырох паралельных слупкоў, то відавочна супадзенне іх асноўных фрагментаў апісання жыцця Хрыста, хаця ёсць разыходжанні. Напрыклад, у Евангеллі паводле Матфея радавод Ісуса Хрыста налічвае ад цара Давіда 42 пакаленні, а ў Евангеллі паводле Лукі – 56. Ёсць і іншыя разыходжанні. Тлумачыцца гэта тым, што Евангеллі пісаліся ў розны час і ў розных месцах, далёкіх адно ад другога (Евангелле паводле Матфея –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паміж 40-мі і 50-мі гг. у Іерусаліме, паводле Лукі – у Рыме да 70 г., паводле Марка – у Анціохіі ў канцы 60-х гг., паводле Іаана – у Ефесе ў 90-я гг.). І кожнае з іх перадае радасную вестку па-свойму, пры захаванні агульнай асновы.

2. Дзеянні апосталаў. Гэта частка была напісана ў канцы 60-х гг. у Рыме. Аўтарам з'яўляецца Лука, і па свайму зместу яна працягвае трэцяе Евангелле. Тут расказваецца аб першых гадах існавання хрысціянскай царквы (да 63 г.), а таксама аб дзейнасці апосталаў Пятра і, асабліва Паўла.

3. Пасланні апосталаў. Напісаны яны ў самых розных месцах Рымскай імперыі і адрасаваны хрысціянскім суполкам. Усяго ў Новым Запавеце 21 апостальскае пасланне. Вучоныя падзяляюць іх на дзве часткі: сем пасланняў, якія прыпісваюцца апосталам Якаву, Пятру, Іаану і Іудзе называюцца "саборнымі" альбо "акружнымі", паколькі адрасаваны не камусьці канкрэтна, а ўсім хрысціянам, і 14 пасланняў, прыпісаных апосталу Паўлу. Менавіта апошнія з'яўляюцца (пасля Евангелляў) найважнейшай часткай Новага Запавету. Тут выкладзены шэраг палажэнняў, на якіх шмат у чым грунтуецца хрысціянскае веравучэнне. Пасланні Паўла карысталіся аўтарытэтам у многіх хрысціян яшчэ пры жыцці апостала: іх чыталі на малітоўных сходах, перапісвалі і распаўсюджвалі. Сам Павел быў вельмі адукаваным чалавекам, вучыўся ў самых вядомых рабінаў таго часу. Ён не належаў да ліку дванаццаці апосталаў, быў фарызеем, і спачатку прымаў удзел у праследаваннях хрысціян, бо лічыў іх шкоднай сектай. Потым адбываецца раптоўны пераход Паўла ў хрысціянства, і ён становіцца самым актыўным яго прапаведнікам. Паўла называюць "апосталам народаў"[1], бо менавіта ён стаў актыўна распаўсюджваць хрысціянства сярод неіўдзеяў. Пасланні апостала Паўла адрасаваны канкрэтнай хрысціянскай суполцы альбо чалавеку.

4. Апакаліпсіс альбо Адкрыццё Іаана Багаслова. У ім выкладзена хрысціянская эсхаталогія – вучэнне аб канцы свету. Гэта кніга вельмі складаная для разумення і поўная глыбокіх сімвалаў. Па свайму жанру яна ўзыходзіць да прароцкіх кніг Старога Запавету. Асноўны змест кнігі складаюць прароцтвы і адкрыцці, якія былі дадзены Іаану Багаслову Богам: панаванне ў канцы свету на Зямлі Антыхрыста, Другое прышэсце Хрыста, вялікая бітва Армагедон, Апошні Суд і інш. Напісаны Апакаліпсіс у 68–69 гг. на востраве Патмас. Раней яго аўтар атаясамліваўся з Іаанам Евангелістам, зараз гэты пункт погляду адвяргаецца.

[1] Слова "апостал" ужываецца ў хрысціянскай традыцыі ў двух асноўных сэнсах: па-першае, апосталы – гэта 12 вучняў Хрыста, па-другое – людзі, якія звярнулі ў хрысціянства вялікую тэрыторыю. Напрыклад, Кірыл і Міфодый – апосталы славян. Павел з'яўляецца апосталам у другім сэнсе.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

## 4.2.3. Веравучэнне і культ хрысціянства

Веравучэнне і культ хрысціянства ўяўляюць сабой арганічнае цэлае. Аднак веравучэнню, і гэтым хрысціянства адрозніваецца ад язычніцтва, належыць першынство. У язычніцтве галоўная ўвага надавалася метадам наладжвання ўзаемаадносін са звышнатуральным: яго ўміласціўленню альбо падпарадкаванню сваім жаданням, гэта значыць, культу. Уяўленні аб звышнатуральным былі, як правіла, вельмі расплывістымі і, нават, супярэчлівымі. Хрысціянства ж робіць націск менавіта на веравучэнні і разглядае культавыя дзеянні як яго вынік.

Хрысціянскае веравучэнне лічыцца богаадкрытым, гэта значыць, яго палажэнні не з’яўляюцца вынікам інтэлектуальнай дзейнасці людзей, але дадзены Богам. Некаторыя з гэтых палажэнняў немагчыма зразумець рацыянальна, у іх трэба проста верыць.

Веравучэнне хрысціян мае дзве крыніцы: Свяшчэннае Пісанне (Біблія) і Свяшчэннае Паданне (рашэнні сабораў, творы царкоўных пісьменнікаў, традыцыі богаслужэбнай практыкі і г. д.).

У цэнтры хрысціянскага веравучэння знаходзіцца зафіксаваная ў Евангеллях добрая вестка аб тым, што Бог так палюбіў людзей, што паслаў ім свайго Сына, які ўзяў на сябе іх грахі, прыняў пакутніцкую смерць і тым самым выратаваў людзей. Хрысціянамі рабіліся тыя з яўрэяў, а потым прадстаўнікоў іншых народаў Рымскай імперыі, хто прыняў гэтую добрую вестку. У сваю чаргу, асноўнай запаведдзю хрысціянства з’яўляецца любоў да Бога і да людзей: “Ісус сказаў...: “палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёй душою тваёй, і ўсім разуменнем тваім”; гэта ёсць першая і найбольшая запаведзь. Другая ж падобная ёй: “палюбі блізкага твайго як самога сябе”. На гэтых дзвюх запаведзях грунтуюцца Закон і Прарокі” (Мв. 22, 37–40).

Веравучэнне хрысціянства складаецца з дагматаў – палажэнняў, якія лічацца богаадкрытымі і таму абсалютнымі ісцінамі. Аснову хрысціянскага веравучэння складае Сімвал веры. Узнік ён з практыкі хрышчэння. Спачатку хрысціянства прымалі ў асноўным дарослыя людзі, і перад тым, як іх хрысціць, ім задавалі пытанні, каб высветліць, у што яны вераць і ці ведаюць яны палажэнні хрысціянскага веравучэння. Самі гэтыя палажэнні, наконт якіх пыталіся, былі ўзятыя з пасланняў апосталаў, таму першапачатковы Сімвал веры называўся Апостальскім. Яго тэкст у розных хрысціянскіх суполках меў нязначныя адрозненні. У пачатку IV ст. з-за распаўсюджвання ерасяў (адступленняў ад хрысціянскага веравучэння) узнікла патрэба дакладна акрэсліць, у што верыць хрысціянская царква, і стварыць адзіны Сімвал. Гэта было зроблена на двух першых хрысціянскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Усяленскіх саборах (сходах): Нікейскім (325 г.) і Канстанцінопальскім (381 г.), таму гэты Сімвал веры называецца Нікеа-Канстанцінопальскім. Складаецца ён з 12 палажэнняў"[1]:

1. "Веру ў адзінага Бога, Айца Ўсемагутнага, Стваральніка неба і зямлі, усяго бачнага і нябачнага".

2. "І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага Адзінароднага, Які ад Айца народжаны перад усімі вякамі: Святла ад Святла, Бога праўдзівага ад Бога праўдзівага, народжанага, а не створанага, адзінасутнага з Айцом, праз Якога ўсё стала быць".

3. "Нас дзеля людзей, і дзеля нашага збаўлення, сышоўшага з нябес, і ўвасобленага ад Духа Святога і Дзевы Марыі і стаўшага чалавекам".

4. "Укрыжаванага за нас пры Панційскім Пілаце, і цярпеўшага, і пахаванага".

5. "І ўваскросшага на трэці дзень, паводле Пісання".

6. "І ўзышоўшага на нябёсы і сядзячага праваруч Айца".

7. "І паўторна прыйдзе ў хвале судзіць жывых і памерлых, і Яго Царству не будзе канца".

8. "І ў Духа Святога, Госпада жыватворчага, які ад Айца паходзіць[2], Які з Айцом і Сынам супольна прымае шанаванне і хвалу, Які гаварыў праз прарокаў".

9. "У адзіную Святую, Саборную і Апостальскую Царкву".

10. "Вызнаю адзінае хрышчэнне для адпушчэння грахоў".

11. "Чакаю ўваскрашэння памерлых".

12. "І жыцця вечнага ў будучым свеце. Амінь"[3].

Хрысціянскі культ, як і веравучэнне, ствараўся на працягу некалькіх стагоддзяў. Яго аснову складаюць сем галоўных абрадаў – таінстваў. Такую назву яны атрымалі таму, што маюць для вернікаў таямнічы, сакральны сэнс, у іх "пад бачным выглядам праяўляецца нябачная сіла Божая". Усяго іх сем[4].

<u>Хрышчэнне</u> – з чалавека здымаецца першародны грэх, і ён далучаецца да хрысціянскай царквы. Абрад адбываецца ў выглядзе амавення і робіцца святарам. Як правіла, хрысцяць дзяцей, тройчы акунаючы іх у ваду. З хрышчэннем дзіцяці таксама звязана наданне яму імя. Раней гэта было імя святога, якому прысвячаўся дзень, у які дзіця нарадзілася, зараз бацькі самі выбіраюць імя. Калі хрысціцца дарослы, дык з яго здымаецца не толькі першародны грэх, але і ўсе астатнія. Дарослых не акунаюць у ваду, а толькі абліваюць ім галаву.

---

[1] Даюцца ў праваслаўным варыянце.
[2] У гэтым пункце маецца разыходжанне паміж праваслаўнай і каталіцкай царквой, аб якім будзе сказана далей.
[3] У перакладзе са старажытнаяўрэйскай мовы "амінь" – "сапраўды", "няхай будзе так".
[4] У праваслаўнай і каталіцкай царкве.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мірапамазанне – на чалавека спускаецца Дух Святы, каб дапамагчы “захаваць душэўную чысціню ў хрышчэнні, узрастаць і ўмацоўвацца ў жыцці духоўным”.

Споведзь альбо пакаянне – ад імя Ісуса Хрыста святчэннік адпускае чалавеку грахі. Пад апошнімі разумеецца адступленне ад запаведзяў Бога. Трэба ўзгадаць свае грахі, адчуць за іх жаль, мець намер так больш не рабіць і сказаць аб сваіх грахах святчэнніку. Хрысціянская царква называе сем смяротных грахоў (лічыцца, што яны адразаюць чалавека ад Бога як крыніцы жыцця): ганарлівасць, сквапнасць, пралюбадзейства, зайздрасць, празмернасць у ежы і піцці, злоба, лянота. У раннім хрысціянстве пакаянне мела публічны характар. Чалавек казаў аб сваіх грахах усёй суполцы. З VII ст. пачынае пераважаць індывідуальная споведзь святчэнніку. Царква гарантуе тайну споведзі. Парушэнне апошняй з’яўляецца для святчэнніка цяжкім грахом.

Прычашчэнне альбо еўхарыстыя (удзячная ахвяра) – пад выглядам хлеба і віна вернікі прымаюць цела і кроў Ісуса Хрыста. Сэнс гэтага таінства ў далучэнні да выкупляльнай ахвяры Ісуса Хрыста. Згодна з Бібліяй яно было ўстаноўлена самім Хрыстом на Тайнай Вячэры. Хрысціянская царква лічыць, што прычашчэнне мае вельмі вялікае значэнне для жыцця вернікаў. Прычашчацца дарослы чалавек можа толькі пасля споведзі.

Вянчанне – царкоўнае асвячэнне шлюбнага саюзу паміж мужчынам і жанчынай. Лічыцца, што іх аб’ядноўвае сам Бог, і таму разводы разглядаюцца царквой як вельмі непажаданыя: “што Бог злучыў, тое чалавек разлучыць не можа”.

Алеяасвячэнне (намашчэнне хворых) – робіцца над хворымі з мэтай падтрымкі іх у веры, ачышчэння ад грахоў і аблягчэння пакут. У праваслаўнай царкве яно называецца таксама сабораваннем, бо яго павінен рабіць сабор з сямі святчэннікаў, але ў выпадку неабходнасці дазваляецца выконваць яго і аднаму святчэнніку, як, дарэчы, звычайна адбываецца. Таінства заключаецца ў тым, што святчэннік мажа лоб, шчокі, рукі і грудзі хвораму асвечаным алiўкавым алеем з дабаўленнем некаторай колькасці чырвонага віна. Пры гэтым чытаюцца малітвы, у якіх святчэннік просіць Бога паслаць чалавеку выздараўленне.

Святарства – пасвячэнне ў святары. Сэнс яго ў тым, што чалавек атрымлівае дар духоўна кіраваць вернікамі, выконваць таінствы і богаслужэнні. Крыніцай гэтага дару лічыцца Ісус Хрыстос, які з’яўляецца Галавой хрысціянскай царквы і яе першасвятаром. Менавіта ён, згодна з Бібліяй, надзяліў дарам святчэннадзеяння апосталаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і загадаў ім распаўсюджваць хрысціянства. Апосталы, ствараючы царкву, перадавалі свае паўнамоцтвы і дары духавенству, вылучыўшы ў ім тры ступені іерархіі, якія існуюць і зараз: епіскап[1], прэсвітар і дыякан. Епіскап (грэч. *episkopos* – назіральнік, ахоўнік) згодна з веравучэннем хрысціянскай царквы, з'яўляецца непасрэдным пераемнікам апосталаў і валодае ўсёй паўнатой святарства. Ён лічыцца першым і галоўным здзяйсняльнікам богаслужэння, таму яно павінна адбывацца ў яго прысутнасці альбо з ягонага благаслаўлення, інакш не прызнаецца сапраўдным. Толькі епіскап мае права пасвячаць у прэсвітары і дыяканы. Епіскапы могуць займаць розныя месцы ў царкоўнай іерархіі: быць проста епіскапамі, архіепіскапамі, мітрапалітамі, экзархамі, кардыналамі, патрыярхамі, папамі, але ўсе яны роўныя ў сваім святарстве. Прэсвітар (грэч. *presbyteros* – старэйшына) з'яўляецца свяшчэннаслужыцелем сярэдняй ступені іерархіі. Яго звычайна называюць свяшчэннікам. Прэсвітар залежыць ад епіскапа, падпарадкоўваецца яму і ад яго атрымлівае права выконваць царкоўныя службы і таінствы, апроч тых, якія можа выконваць толькі епіскап. Зараз ад прэсвітараў патрабуецца мець адпаведную адукацыю. Як правіла, перад тым, як зрабіцца прэсвітарам, чалавек павінен скончыць семінарыю. Дыякан (грэч. *diakonos* – служка) – свяшчэннаслужыцель ніжэйшай ступені царкоўнай іерархіі. Спачатку дыяканы адказвалі за арганізацыйна-гаспадарчую дзейнасць хрысціянскіх суполак. Дыякан не можа самастойна выконваць таінствы і богаслужэнні, а толькі дапамагае ў гэтым епіскапу і прэсвітару.

Таінства святарства адбываецца на падставе абраду рукапалажэння альбо хіратоніі (грэч. *cheirotonia* – дзеянне моцай рук), у працэсе якога адбываецца ўскладанне рук на галаву чалавека, якога пасвячаюць. Лічыцца, што такім чынам яму перадаецца асаблівы дар Хрыста, неабходны для выканання далейшага служэння. У прэсвітары і дыяканы пасвячае епіскап, у епіскапы, як правіла, – сабор епіскапаў (не менш трох).

Трэба адзначыць, што ў праваслаўнай і каталіцкай царкве епіскапамі, прэсвітарамі і дыяканамі могуць быць толькі мужчыны, у большасці пратэстанцкіх напрамкаў – таксама і жанчыны.

Важнае месца ў хрысціянскім кульце займаюць малітвы – звяртанні вернікаў да Бога з просьбамі, падзякамі альбо хваламі. Яны могуць быць мысленныя (так званая "ціхая малітва") альбо вусныя. Апошнія бываюць агульнымі (калі моляцца некалькі чалавек) і

[1] У каталіцтве – біскуп.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

індывідуальнымі. Агульныя малітвы звычайна кажуцца вернікамі ў час набажэнства ў храме, індывідуальныя – дома. У хрысціянстве ёсць зацверджаныя тэксты малітваў, асноўнай іх крыніцай з'яўляецца Псалтыр і Евангеллі. Галоўная хрысціянская малітва – "Ойча наш". Згодна з Бібліяй, яна была дадзена Хрыстом, таму яе называюць "Малітвай Гасподняй". Чалавек можа звяртацца да Бога і сваімі словамі, асабліва ў індывідуальнай малітве.

Хрысціянскае набажэнства ўяўляе сабой сукупнасць урачыстых культавых абрадаў і дзеянняў (малітваў, паклонаў, запальванняў свечак, спеваў і інш.), мэтай якіх з'яўляюцца зносіны з Богам. Выконваецца набажэнства свяшчэннаслужыцелямі пры актыўным удзеле вернікаў, галоўным чынам у храме.

У праваслаўным і каталіцкім кульце ёсць таксама шанаванне крыжа і ікон. Крыж з'яўляецца сімвалам хрысціянскай веры. Ён стаіць на дахах храмаў, яго носяць на целе вернікаў, ён з'яўляецца часткай адзення свяшчэннаслужыцеляў. Крыж быў прыняты хрысціянскай царквой як сімвал выратавання – менавіта на крыжы, паводле Бібліі, прыняў пакутніцкую смерць за грахі людзей Ісус Хрыстос. Ікона (грэч. *eikon* – выява, вобраз) – гэта жывапісная альбо (радзей) рэльефная выява Троіцы, Ісуса Хрыста, Божай Маці, апосталаў, святых. Трэба падкрэсліць, што іконы маюць у хрысціянстве выключна знакавы характар – моляцца не дошкам, на якіх намаляваны Бог, а самому Богу, іконы служаць для нагадвання вернікам Яго аблічча. Некаторыя іконы называюцца цудатворнымі і асабліва шануюцца, бо лічыцца, што праз іх праявілася сіла божая. Гэта, напрыклад, іконы Маці Божай Вострабрамскай, Казанскай Божай Маці.

Важнае месца ў хрысціянскім кульце займаюць святы, якія прысвечаны найбольш значным з пункта погляду царквы падзеям. Самае вялікае свята – гэта Пасха, у гонар уваскрэсення Ісуса Хрыста. Далей ідзе Нараджэнне (Раство) Хрыстова, Нараджэнне (Раство) Багародзіцы, Тройца альбо Пяцідзесятніца і іншыя. Святы падзяляюцца на нерухомыя, якія святкуюцца ў адны і тыя ж даты месяца, і рухомыя, якія перамяшчаюцца па календары ў залежнасці ад дня святкавання Пасхі.

У каталіцкім і праваслаўным кульце ёсць таксама пасты – перыяды, калі абмежавана ўжыванне ежы з мэтай цялеснага і духоўнага ачышчэння вернікаў. Самы вялікі пост – перад Пасхай (Вялікаднем), ён працягваецца ў праваслаўі 7 тыдняў, у каталіцтве – 40 дзён.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

### 4.2.4. Ператварэнне хрысціянства ў дзяржаўную рэлігію Рымскай імперыі і раздзяленне царквы

Згодна з хрысціянскім веравучэннем, заснавальнікам царквы і яе галавой з'яўляецца Ісус Хрыстос. Царква – "містычнае цела Хрыста". Яна адначасова з'яўляецца і вынікам чалавечай дзейнасці, і таму як любы сацыяльны інстытут мае рысы недасканаласці, але таксама – і звышнатуральным утварэннем, маючым рысы святасці, вечнасці, неразбуральнасці, пасрэднікам паміж Богам і людзьмі, па-за межамі якога няма выратавання.

Хрысціянства называе дакладную дату і месца ўзнікнення царквы – 28 мая 30 г., Іерусалім, калі на пяцідзесяты дзень пасля Пасхі на апосталаў сышоў Святы Дух і яны атрымалі здольнасць прапаведаваць Евангелле па ўсім свеце. Выконваючы дадзеную ім раней Хрыстом запаведзь: "Дык ідзіце, навучыце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа", апосталы пачалі ствараць у розных гарадах Рымскай імперыі хрысціянскія суполкі. Спачатку хрысціянства распаўсюджвалася амаль выключна сярод яўрэяў. Першыя хрысціяне лічылі сябе найбольш паслядоўнымі іўдзеямі, прыняўшымі даўгачаканага Месію. Аднак большасць іўдзеяў успрынялі хрысціянства як шкодную секту і праследавалі яго. З цягам часу і сярод хрысціян з'яўляецца ўсё больш прадстаўнікоў іншых народаў Рымскай імперыі. Як ужо адзначана, першым, хто актыўна стаў прапаведаваць хрысціянства сярод неіўдзеяў, з'яўляецца апостал Павел. Канчаткова хрысціянства аддзялілася ад іўдаізму ў перыяд паўстання 66–73 гг.

Ствараючы хрысціянскія суполкі, апосталы ставілі на іх чале прэсвітараў і епіскапаў. Спачатку функцыі апошніх былі аднолькавымі, але паступова на першы план выходзяць епіскапы, і ўжо з пачатку II ст. менавіта ім належыць кіруючая роля ў хрысціянскай царкве.

У першых хрысціянскіх суполках епіскапы, прэсвітары і дыяканы выбіраліся вернікамі. Дзеля таго, каб гэтая выбарная пасада атрымала аўтарытэт, існаваў абрад рукапалажэння, як перадача асаблівага дару святарства ад Хрыста праз апосталаў першым прэсвітарам і епіскапам, і ад апошніх – далей іх пераемнікам.

Хрысціянства даволі хутка распаўсюджвалася па Рымскай імперыі. Ад першапачатковых суполак аддзяляліся новыя. Такім чынам узнікалі епіскапскія акругі – епархіі, межы якіх супадалі з межамі правінцый Рымскай імперыі. Епіскапы падтрымлівалі сувязь паміж сабой і для вырашэння агульных пытанняў перыядычна збіраліся на лакальныя саборы. Паступова ствараліся царкоўныя акругі, цэнтрам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якіх рабіліся вялікія гарады Рымскай імперыі, дзе існавалі найбольш шматколькасныя хрысціянскія суполкі. Яны сталі называцца мітраполіямі (грэч. *metropolia* – галоўны, мацярынскі горад), а іх епіскапы з IV ст. ва ўсходніх правінцыях Рымскай Імперыі атрымалі тытул мітрапалітаў. З V ст. епіскапы гарадоў, якія былі галоўнымі цэнтрамі хрысціянства, сталі называцца папамі (у Рыме і Александрыі) і патрыярхамі (у Канстанцінопалі, Іерусаліме і Анціохіі).

Паступова ў Рымскай імперыі складваецца адзіная хрысціянская царква. Наладжваюцца сувязі паміж markednymi яе часткамі, для барацьбы з ерасямі склікаюцца Ўсяленскія саборы. Кіраўніком хрысціянскай царквы ў першыя стагоддзі яе існавання прызнаваўся Папа Рымскі. Тлумачылася гэта перш за ўсё тым, што першым епіскапам Рыму (Папай Рымскім) быў, згодна з хрысціянскай традыцыяй, апостал Пётр, якому Хрыстос даручыў кіраўніцтва над усімі хрысціянамі. Лічылася, што кожны Рымскі Папа з'яўляецца пераемнікам улады апостала Пятра.

Спачатку хрысціяне праследаваліся ў Рымскай імперыі за адмаўленне шанаваць афіцыйных багоў. Як гэта ні парадаксальна, але рымскія ўлады абвінавачвалі хрысціян у атэізме, гэта значыць, бязбожнасці. Справа ў тым, што тут сутыкнуліся два розныя тыпы рэлігійнасці. Рымляне ўспрымалі сваіх шматколькасных багоў перш за ўсё як апекуноў таго ці іншага дзеяння, чалавека альбо імперыі ў цэлым. Яны таксама шанавалі багоў заваяваных імі народаў з мэтай дабіцца апякунства апошніх. Але яны патрабавалі, каб шанавалі іх багоў, перш за ўсё – Генія (ад лац. *gens* – род), імператара, які лічыўся яго апекуном і ўвасабленнем унутранай сілы мужчыны. Гэта быў не столькі рэлігійны, колькі палітычны акт. Тым самым чалавек дэманстраваў сваю адданасць імператару. Патрэбна для гэтага было няшмат – спаліць крыху ладану перад статуяй Генія. Аднак хрысціяне адмаўляліся зрабіць нават гэта, бо не маглі шанаваць іншых багоў, і таму ўлады іх праследавалі. Таксама ў першых хрысціян не было таго, у чым рымляне бачылі сутнасць рэлігіі: храмаў, статуй багоў, ахвяр. Хрысціянскае богаслужэнне, спачатку было простым, складалася з малітваў, чытання Новага Запавету, казанняў і прычашчэння. Збіраліся вернікі па нядзелях, тайна, дзе-небудзь на ўскраіне горада. У грамадскай свядомасці аб хрысціянах распаўсюджваліся чуткі як аб святататцах, амаральных людзях, якія выконваюць канібальскія абрады і займаюцца оргіямі.

Першае праследаванне хрысціян адбылося ў 64 г. пры імператары Нероне, які абвінаваціў іх у падпальванні Рыма і падвергнуў жорсткім пакаранням. Праследаванні не былі сістэматычнымі, яны то

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абвастраліся, то знікалі зусім, усё залежала ад палітыкі канкрэтнага імператара. Таму хрысціяне маглі, хаця з цяжкасцямі, існаваць і нават пашыраць сваю колькасць. Рымская імперыя знаходзілася ў крызісе, яе афіцыйная рэлігія страціла сваю духоўную сілу і не магла перашкодзіць распаўсюджванню хрысціянства.

Найбольш жорсткі перыяд ганенняў хрысціянства перажыло пры імператары Дыаклецiяне (284–305 гг.). Але ў 305 г. апошні адрокся ад улады і ў становішчы царквы адбыліся рэзкія перамены. Пераемнік Дыаклецiяна Галерый у 311 г. загадаў адмяніць праследаванні хрысціян. У 313 г. імператары Канстанцін і Ліцыній выдаюць знакаміты Міланскі эдыкт, згодна з якім хрысціянства прызнаецца цярпімай рэлігіяй, хрысціяне атрымліваюць права адкрыта адпраўляць свой культ і валодаць маёмасцю. А ў 381 г. хрысціянства абвяшчаецца дзяржаўнай рэлігіяй Рымскай імперыі .

Аднак сама імперыя набліжалася да свайго канца. Глыбокі ўнутраны крызіс абвастрыўся пад уплывам нашэсцяў варвараў, якія ўвесь час пагражалі Рыму. Па гэтай прычыне імператар Канстанцін у 330 г. перанёс сталіцу на ўсход у заснаваны ім горад Канстанцінопаль, а ў 395 г. імперыя падзялілася на дзве часткі : заходнюю і ўсходнюю.

Гэтыя адміністратыўныя падзелы мелі вялікае значэнне для лёсу хрысціянскай царквы. Імператар, які знаходзіўся ў Канстанцінопалі, усё больш страчваў рэальную палітычную ўладу ў заходняй частцы, якая паступова апынулася пад кіраўніцтвам варвараў. У 476 г. гуны захапілі Рым, і іх правадыр Аларых адаслаў у Канстанцінопаль знакі імператарскай улады: карону і скіпетр. Гэтая падзея лічыцца канцом Рымскай імперыі. Усходняя яе частка, якая атрымала назву Візантыйскай імперыі, праіснавала яшчэ да сярэдзіны XV ст., а на тэрыторыі заходняй часткі паступова складваюцца новыя дзяржавы. У гэтых умовах на захадзе ўсё больш узмацняецца ўлада Рымскага папы, як духоўная, так і свецкая. Ён робіцца цэнтрам, вакол якога канцэнтруецца грамадства, вядзе перамовы з варварамі, ажыццяўляе раздачу хлеба бедным і г. д. Заходняя царква пачынае актыўную дзейнасць па распаўсюджванні хрысціянства сярод варвараў і атрымлівае іх падтрымку. Аднак сувязь папы з усходняй часткай Рымскай імперыі ўсё больш слабее, хаця ён па-ранейшаму лічыцца кіраўніком усёй царквы. На Усходзе паступова ўзвышаецца Канстанцінопальскі патрыярх, які, як епіскап сталіцы, не жадаў падпарадкоўвацца Рымскаму папе. У V ст. ён стаў называць сябе Ўсяленскім патрыярхам, гэта значыць, кіраўніком як усходняй, так і заходняй царквы, што выклікала энергічны пратэст Рыма. Саперніцтва паміж

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Канстанцінопальскім патрыярхам і Рымскім Папам за ўладу цягнулася некалькі стагоддзяў з пераменным поспехам. Усё гэта ўрэшце рэшт прывяло да ўзаемнага адлучэння ад царквы ў 1054 г. Хрысціянская царква падзялілася на дзве часткі: усходнюю – праваслаўную, што значыць "правільную", і заходнюю – каталіцкую, што значыць "сусветную".

Трэба падкрэсліць, што віну за раскол нясе як заходні, так і ўсходні бок. Сапраўднай прычынай яго з'яўляюцца амбіцыі кіраўнікоў царквы. Вынікі расколу былі вельмі сур'ёзнымі: Еўропа падзялілася на дзве часткі, якія вельмі часта ставіліся варожа адна да адной.

У 1965 г. Канстанцінопальскі патрыярх Афінагор І і Рымскі Папа Павел VI узаемна знялі адлучэнне, але ўзнавіць адзінства царквы не ўдалося. Зараз узаемаадносіны паміж праваслаўнай і каталіцкай царквой можна ахарактарызаваць як насцярожаныя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.3. Праваслаўе

4.3.1. Агульная характарыстыка праваслаўя.
4.3.2. Хрысціянізацыя Русі.
4.3.3. Стараверства.
4.3.4. Асаблівасці праваслаўнага веравучэння і культу.
4.3.5. Структура праваслаўнай царквы на Беларусі.

### 4.3.1. Агульная характарыстыка праваслаўя

Праваслаўе – самы малаколькасны з трох асноўных кірункаў у хрысціянстве. Зараз яно налічвае 218 млн прыхільнікаў. Распаўсюджана праваслаўе ў асноўным у Расіі, ва Усходняй Еўропе, на Балканах і на Бліжнім Усходзе. Невялікая колькасць яго прыхільнікаў жыве ў краінах Амерыкі, Афрыкі і Азіі.

Праваслаўе сфарміравалася ва ўмовах Візантыйскай імперыі, для якой былі характэрны запаволенасць тэмпаў развіцця і моцная імператарская ўлада. Гэта абумовіла наступныя асноўныя рысы праваслаўя:

1. <u>Традыцыяналізм і кансерватызм рэлігійна-царкоўнага жыцця.</u> Сам тэрмін "праваслаўе" з'яўляецца не зусім дакладным перакладам грэчаскага слова "артадоксія" (*orthodoxia* – меркаванне, вучэнне, аддание хвалы) і хутчэй павінен быў бы гучаць як "прававерʼе". Самі прыхільнікі гэтага напрамку прадкрэсліваюць у яго назве момант аддавання хвалы, што менавіта яны правільна <u>славяць</u> Бога.

Прыхільнікаў другіх хрысціянскіх напрамкаў яны называюць “іншаслаўнымі” – тымі, хто славіць Бога па-іншаму.

Калі мы гаворым аб традыцыяналізме і кансерватызме праваслаўя, то не ўкладваем у гэта нейкі негатыўны сэнс. Проста адной з асноўных рыс гэтага напрамку, якую падкрэсліваюць як яго прыхільнікі, так і праціўнікі, з’яўляецца імкненне захаваць у некранутым выглядзе веравучэнне і культ першапачатковага хрысціянства. (Наогул артадоксія ў шырокім сэнсе азначае няўхільнае следаванне асновам і традыцыям якога-небудзь вучэння пры пазбяганні нават самых нязначных разыходжанняў з яго ўстаноўкамі. Часцей за ўсё яно ўжываецца ў дачыненні да такіх рэлігійных напрамкаў, якія ў якасці асаблівага абавязку вернікаў прадпісваюць падтрымку чысціні і нязменнасці веравучэння і культу. У гэтым сэнсе можна казаць аб артадаксальным іўдаізме, ісламе і г. д.)

Трэба адзначыць, што паняцці “праваслаўе” і “каталіцтва” ў іх сучасным разуменні маюць умоўны характар. Яны з’явіліся задоўга да раздзялення царквы, у 1054 г. Пасля Першага Ўсяленскага Сабора ў Нікеі (325 г.), на якім хрысціянская царква ў барацьбе з ерассю арыянаў зацвердзіла першую частку Сімвала веры, праваслаўнымі сталі называць тых, хто прытрымліваўся рашэнняў Нікейскага сабора, г. зн., неерэтыкаў, а католікамі – тых, хто належаў да ўсеагульнай “неерэтычнай” царквы. І ў тым, і ў другім выпадку сэнс быў аднолькавы. Зараз католікі таксама настойваюць на правільнасці, “праваслаўнасці” свайго веравучэння і культу, а праваслаўная царква называе сябе яшчэ “грэка-каталіцкай”, гэта значыць, сусветнай.

Праваслаўная царква, у адрозненне ад каталіцкай, адмаўляе магчымасць развіцця Свяшчэннага Падання. Яна лічыць, што Святыя Айцы і першыя сем Усяленскіх Сабораў (апошні з іх адбыўся ў 787 г.) цалкам сфармулявалі хрысціянскае веравучэнне і зараз яго трэба толькі захоўваць. Растлумачыць такі падыход можна тым, што менавіта Візантыйская імперыя, а не Заходняя Еўропа з’яўлялася ў першым тысячагоддзі непасрэдным нашчадкам багатай антычнай культуры. Доўгі час (прыкладна да XIII ст.) культура Візантыі знаходзілася на больш высокім узроўні, візантыйцы ганарліва называлі сябе “ро́меямі” (“рымлянамі”), а на заходнееўрапейцаў глядзелі як на варвараў. Аднак культура Еўропы развівалася, візантыйская ж, дзе быў зроблены націск на захаванні антычнай спадчыны, паступова прыйшла ў заняпад. Гэта мы можам назіраць і ў галіне хрысціянскага багаслоўя. Яно было ў асноўным выпрацавава на ўсходзе Рымскай імперыі. Менавіта там вяліся гарачыя багаслоўскія спрэчкі, узнікалі ерасі, прайшлі ўсе сем Усяленскіх сабораў. Захад не разумеў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тонкасцей той палемікі, якая вялася на Усходзе, а проста прытрымліваўся ісцін веры. У далейшым жа, па меры развіцця еўрапейскай культуры наогул, развівалася і каталіцкае багаслоўе.

2. Адсутнасць адзінства праваслаўнай царквы і яе падпарадкаванасць дзяржаўным уладам. Гэтыя дзве рысы ўзаемазвязаны і шмат у чым абумоўліваюць адна адну. У Візантыйскай імперыі была моцная імператарская ўлада, і там існаваў прынцып, запазычаны яшчэ з язычніцкіх часоў Рымскай імперыі, калі імператар таксама лічыўся і вярхоўным жрацом, кіраўніком у рэлігійных справах. (Тут трэба ўзгадаць спецыфіку дзяржаўнай улады на Усходзе, якая звычайна мела абсалютны і ўсеагульны характар.) У Візантыі патрыярх не проста падпарадкоўваўся імператару, ён ім фактычна прызначаўся, і мог быць зняты. Царква з'яўлялася дзяржаўным інстытутам, кіраваў ёю імператар, і яна служыла інтарэсам дзяржавы. Калі праваслаўе пачало распаўсюджвацца ў іншых краінах, кіраўнікі апошніх не маглі пагадзіцца з тым, што на іх тэрыторыі існуе іншаземная структура, і таму імкнуліся падпарадкаваць праваслаўную царкву сабе, стварыць свой уласны дзяржаўны інстытут, які б адпавядаў іх інтарэсам. Гэты працэс адбываецца і зараз: як толькі ўзнікае новая дзяржава, дзе распаўсюджана праваслаўе, праз некаторы час ствараецца нацыянальная праваслаўная царква. Зараз у свеце налічваецца 15 аўтакефальных[1] праваслаўных цэркваў: Канстанцінопальская (Турцыя), Александрыйская (Егіпет), Анціахійская (Сірыя, Ліван), Іерусалімская (Ізраіль), Руская (большасць краін былога СССР), Грузінская, Сербская (краіны былой Югаславіі), Балгарская, Кіпрская, Эладская (Грэцыя), Румынская, Албанская, Польская, Чэхаславацкая (Чэхія і Славакія), і Амерыканская (ЗША). Кіраўнік аўтакефальнай праваслаўнай царквы называецца па-рознаму. Напрыклад, у Рускай, Сербскай, Грузінскай, Румынскай і Балгарскай цэрквах гэта патрыярх, у Грэчаскай і Кіпрскай – архіепіскап, у Албанскай, Польскай, Чэхаславацкай – мітрапаліт.

Некаторыя аўтакефальныя цэрквы дзейнічаюць таксама на тэрыторыі іншых дзяржаў. Так, напрыклад, Руская праваслаўная царква мае свае структуры ў ЗША, Канадзе, Аргенціне, Германіі, Францыі, Аўстрыі, Бельгіі, Японіі і некаторых іншых краінах.

Кожная аўтакефальная царква, як аб гэтым сведчыць сама яе назва, з'яўляецца цалкам самастойнай. Канстанцінопальскі патрыярх называецца Ўсяленскім патрыярхам, але гэта чыста ганаровы тытул, які не дае права ўмешвацца ў справы іншых цэркваў.

[1] "Самаўзначальваемых" (ад грэч. autos – сам і kephalē – галава).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.3.2. Хрысціянізацыя Русі

Афіцыйнай датай прыняцця хрысціянства на Русі з’яўляецца 988 г., калі па загаду князя Уладзіміра Святаслававіча хрысціліся кіяўляне, але хрысціянства тут з’явілася, прынамсі, на сто гадоў раней. Яшчэ пры дзеду Уладзіміра князю Ігару ў Кіеве была царква св. Іллі, якую наведвала частка княскай дружыны. Пры заключэнні Ігарам дамовы з Візантыяй у 944 г. адны дружыннікі кляліся імем Перуна, а другія – хрысціянскага Бога. Хрысціянкай была і бабка Уладзіміра княгіня Вольга. У 957 г. яна наведала па дзяржаўных справах Канстанцінопаль і прыняла там хрышчэнне. Вядома, што хаця сама Вольга хрысцілася па ўсходнім абрадзе, але народ свой гатова была хрысціць па заходнім. З гэтай мэтай яна звязалася з нямецкім царом Атонам, які паслаў у Кіеў місіянера Адальберта з Магдэбурга, у далейшым епіскапа. Аднак сын Вольгі, князь Святаслаў, быў перакананым язычнікам і вельмі адмоўна ставіўся да хрысціянства, таму місія Адальберта не ўдалася.

Ёсць некалькі легендаў аб прыняцці хрысціянства на Русі. Адна з іх паведамляе, што хрысціянства сюды было прынесена ў І ст. адным з дванаццаці вучняў Ісуса Хрыста апосталам Андрэем, які ехаў з Іерусаліма ў Рым праз Ноўгарад і заначаваў на месцы будучага Кіева. Устаўшы раніцай, ён указаў вучням на ляжачыя вакол халмы, блаславіў гэтае месца і паставіў на ім крыж. Але ніякіх гістарычных крыніц, якія б пацвярджалі гэта, няма.

Другая легенда апавядае аб тым, што князь Уладзімір выбіраў веру сярод тых, якія яму прапаноўваліся. Па адной з версій, ён адмовіў іўдзеям з той прычыны, што ў іх не было сваёй дзяржавы і гэта значыла, што “Бог іх не любіць”, мусульманам – што іх богаслужэнне падалося яму непрыгожым і нават смешным, але, галоўнае – таму што ў іх забаронена піць віно, што багаслоў прыехаў з Візантыі, сказаў прыгожую прамову, якая вельмі спадабалася Уладзіміру, і ён вырашыў прыняць хрысціянства. Безумоўна, тлумачэнні прыняцця хрысціянства на Русі эстэтычнымі або гастранамічнымі густамі Уладзіміра з’яўляюцца досыць наіўнымі. Існавалі значна больш сур’ёзныя прычыны.

Перыяд княжання Уладзіміра (980–1015 гг.) – гэта час узмацнення Старажытнарускай дзяржавы. Уладзімір, як энергічны і дальнабачны палітык, адчуваў неабходнасць стварэння адзінай рэлігіі. У 980 г. ён правёў першую рэлігійную рэформу. Быў створаны агульнадзяржаўны пантэон, куды ўключылі багоў, культ якіх з’яўляўся найбольш распаўсюджаным. Гэта Пярун – бог грому і маланкі, апякун

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

княжацкай улады, дружыны, жрэчаскай і ваеннай моцы, Сварог (Стрыбог) – бог неба, Дажджбог – бог святла, сын Сварога, Мокаш – маці Сварога, багіня ўрадлівасці і дабрабыту, Хорс – Сонца, (у яго гонар Уладзімір узяў сабе прозвішча Чырвонае Сонейка), Семаргл – крылаты сабака, ахоўнік пасеваў, жыццёвага патэнцыялу, пачынанняў княжацкай улады. На ўзгорку ў Кіеве былі пастаўлены ідалы гэтых шасці багоў. Такім чынам Уладзімір імкнуўся зрабіць са сваёй сталіцы рэлігійны цэнтр усходніх славян. Шанаванне ўсіх астатніх багоў, духаў і дэманаў аказалася па-за межамі афіцыйнай рэлігіі. Новы пантэон насаджаўся зверху княжацкай уладай.

Аднак даволі хутка Уладзімір робіць рэзкі паварот у сваёй палітыцы, прымае зусім новую і невядомую для большасці насельніцтва Кіеўскай Русі рэлігію – хрысціянства – і пачынае ўкараняць яго таксама паслядоўна і жорстка. Прычыны такога павароту маюць пераважна палітычны характар. Старая язычніцкая рэлігія адпавядала сялянскім умовам жыцця і не падыходзіла для гарадоў, якія ў гэты час інтэнсіўна развіваюцца як цэнтры рамяства, гандлю і ўлады. Апроч таго, Кіеўская Русь мела шырокія зносіны з іншымі краінамі, пераважна тымі, у якіх ужо было распаўсюджана хрысціянства. Прыняцце апошняга значна аблегчыла б гэтыя зносіны.

Трэба адзначыць, што на рашучасць павароту да хрысціянства пэўны ўплыў аказалі і рысы характару самога князя Уладзіміра. Гісторыкі характарызуюць яго як таленавітага і жорсткага дзяржаўнага дзеяча. Да ўлады ён прыйшоў у выніку забойства свайго брата, кіеўскага князя Яраполка. Перад тым, як прыняць хрысціянства, ён быў паслядоўным язычнікам. Пры ім у 983 г. ў Кіеве ў ахвяру Перуну былі прынесены варажскі купец Фёдар і яго сын Ян. Сам Уладзімір меў 9 жонак, сярод іх – полацкая князёўна Рагнеда, якая была ўзята сілай пасля забойства яе бацькі і братоў. Сучасны Уладзіміру польскі летапісец Цітмар Межыборскі называе яго “блуднікам бязмерным і жорсткім”.

Падставай для прыняцця хрысціянства на Русі паслужылі наступныя падзеі. У 987 г. супраць візантыйскага імператара Васіля паўстаў яго ваеначальнік Фока. Васіль папрасіў Уладзіміра аб дапамозе. Той паставіў умовай жаніцьбу з сястрой імператара Ганнай і абяцаў прыняць хрышчэнне. Уладзімір дапамог імператару, але той не спяшаўся выканаць сваю частку дамовы. Тады Уладзімір ідзе паходам на грэчаскую калонію Корсунь (зараз г. Херсон), прымушае аддаць яму ў жонкі Ганну і прымае там хрышчэнне, а вярнуўшыся ў Кіеў, выдае загад, каб кіяўляне ў вызначаны дзень пайшлі да Дняпра і хрысціліся. “А хто не прыйдзе да ракі, – так было напісана ў загадзе, паводле

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“Аповесці мінулых часоў”, – багаты ці ўбогі, жабрак ці раб, той будзе мне вораг”. Некалькі тысяч кіяўлян зайшлі ў раку і прыехаўшыя з Візантыі свяшчэннікі ахрысцілі іх.

Ідалы язычніцкіх багоў, якія стаялі на ўзгорку ў Кіеве, былі па загаду Уладзіміра пасечаны і спалены, а ідал Перуна крукамі сцягнулі ў Днепр і піхалі шастамі да парогаў, каб ён не вярнуўся.

Пасля Кіева хрысціянства пачалі ўводзіць у іншых гарадах. Не заўсёды гэта адбывалася мірна. Людзі прызвычаіліся да сваіх старых багоў і не хацелі адмаўляцца ад іх. У некаторых месцах даходзіла да крывавых сутыкненняў. Напрыклад, у Ноўгарадзе дзеянні епіскапа Якіма, які знішчаў язычніцкія капішчы, выклікалі ў народзе бунт. З Кіева з войскам прыбыў ваёвода Пуцята, які ўступіў у бойку з наўгародцамі, а дзядзька Уладзіміра пасадскі Дабрыня ў гэты час падпаліў горад. Наўгародцы вымушаны былі здацца і прыняць хрышчэнне. Адсюль пайшла прымаўка: “Пуцята хрысціў Ноўгарад мячом, а Дабрыня агнём”.

Аднак супраціўленне насіла спарадычны характар і выклікалася, як правіла, жорсткасцю дзеянняў па ўвядзенні новай рэлігіі. Там жа, дзе гэтай жорсткасці не было, народ прымаў хрысціянства даволі спакойна. Тлумачыцца гэта асаблівасцю язычніцкага светаўспрымання, якое дапускае існаванне многіх звышнатуральных істот. Хрыстос успрымаўся як княжацкі бог, якога трэба шанаваць, бо гэтага патрабуюць улады, але не адмаўляліся таксама і ад шанавання старых багоў. Рэлігійны феномен, які ўзнік на Русі з увядзеннем хрысціянства, даследчыкі называюць дваяверствам. Сутнасць яго не ў тым, што паралельна існавалі дзве рэлігіі – язычніцкая і хрысціянская, а ў тым, што стварыўся іх сінтэз. Дваяверства існуе ў нас і зараз. Шмат людзей прытрымліваюцца адначасова і хрысціянскіх, і язычніцкіх звычаяў.

Увядзенне хрысціянства на Русі расцягнулася на стагоддзі. Датай хрышчэння Беларусі лічыцца 992 г., калі была заснавана Полацкая епархія пры сыне Уладзіміра і Рагнеды князю Ізяславе, але канчаткова хрысціянства на нашых землях усталявалася толькі ў сярэдзіне XIII ст., хаця і пасля ў рэлігійным светаўспрыманні беларусаў, асабліва сялян, засталіся многія язычніцкія элементы.

Хрысціянства на тэрыторыю Беларусі прыходзіла як з усходу, так і з захаду. У 1013 г. сын Уладзіміра тураўскі князь Святаполк узяў шлюб з дачкой польскага караля Баляслава Харобрага. Разам з ёй у Тураў прыехаў епіскап Рэйнберн, і была заснавана заходная епархія. Гэта не спадабалася Уладзіміру. Ён выклікаў Святаполка з жонкай і Рэйнбернам у Кіеў і пасадзіў іх у земляную турму, дзе епіскап памёр. І хаця Кіеўская Русь падтрымлівала зносіны з Захадам, (вядома,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што Уладзімір перапісваўся з папам), але развіццё хрысціянства тут пайшло па ўсходняму, праваслаўнаму шляху. Даследчыкі тлумачаць гэта тым, што царква ў Візантыі падпарадкоўвалася імператару і служыла інтарэсам дзяржавы, на Захадзе ж папа ўзвышаўся над свецкімі ўладамі. Гэта было вядома Уладзіміру, і ён зрабіў выбар на карысць праваслаўя.

Прыняцце хрысціянства аказала станоўчы ўплыў на развіццё старажытнарускай культуры. Новая рэлігія садзейнічала аб’яднанню ўсходнеславянскіх земляў і ўзмацненню дзяржаўнага адзінства. Само слова “рускі” спачатку на нашых землях абазначала не нацыянальную, а рэлігійную прыналежнасць: рускімі называлі тых, хто прытрымліваўся рэлігіі, якая насаджалася з Кіева, гэта значыць, веры варагаў – “русаў”. Сярод усходніх славян паступова распаўсюджвалася новая мараль. Былі забаронены чалавечыя ахвяры, мнагажонства, блуд, крадзеж нявест, супрацьнатуральныя распусты. На новых прынцыпах будаваліся ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Распаўсюджвалася адукацыя. Сам Уладзімір пасля прыняцця хрысціянства загадаў збіраць дзяцей са знатных сем’яў і вучыць іх, нягледзячы на супраціўленне бацькоў. Сын Уладзіміра Яраслаў Мудры адкрыў у 1025 г. у Ноўгарадзе вучылішча для 300 дзяцей. Пачынаецца дзейнасць хрысціянскіх асветнікаў, найбольш вядомымі з якіх з’яўляюцца Кірыла Тураўскі (1130 – каля 1182 гг.), Ефрасіння Полацкая (1110–1173 гг.), Аўрамій Смаленскі (сяр. XII ст. – да 1224 г.). Будуюцца хрысціянскія храмы, малююцца іконы, спачатку па візантыйскіх узорах, але паступова складваюцца арыгінальныя мясцовыя школы ў архітэктуры, іканапісе. Менавіта з прыняццем хрысціянства ўсходнеславянскія народы ўваходзяць у прастору еўрапейскай культуры.

### 4.3.3. Стараверства

Стараверства ўзнікла ў Расіі ў сярэдзіне XVII ст. у выніку царкоўнага расколу, прычынай для якога паслужыла рэформа, праведзеная патрыярхам Ніканам з мэтай уніфікацыі абрадаў і выпраўлення богаслужэбных кніг.

Неабходнасць царкоўнай рэформы наспела даўно і была выклікана многімі прычынамі. Яшчэ ад часоў феадальнай раздробленасці ў розных мясцовасцях Расіі існавалі адрозненні ў абрадах. З утварэннем адзінай цэнтралізаванай дзяржавы неабходна было зрабіць абрады адзінымі. Апроч таго, пры перапісванні богаслужэбных кніг у іх за доўгі час накапілася шмат памылак і разначытанняў. І калі з XVII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў Расіі пачынае распаўсюджвацца кнігадрукаванне, узнікае патрэба ў адзіным узоры, з якога б адбываўся друк.

Пасля заваявання Канстанцінопаля туркамі (1453 г.) Масква пачынае прэтэндаваць на ролю цэнтра праваслаўя і захавальніцы чысціні хрысціянскай веры. У канцы XVI ст. манахам Пскова-Елізар’еўскага манастыра Філафеем была сфармулявана знакамітая тэорыя “Трэцяга Рыма”: было “два Рымы”, першы з іх (Рымская імперыя) быў разбураны варварамі, другі (Візантыя) – туркамі, і нарэшце, узвысіўся Трэці Рым (Расія), які будзе вечна, “а чацвёртаму не бываць”. Таму Руская праваслаўная царква не магла дапусціць недарэчнасцей у сваіх абрадах і богаслужэбных тэкстах, і ў якасці ўзору, па якому яны выпраўляліся, былі ўзяты візантыйскія абрады і тэксты.

Былі скарочаны царкоўныя службы, адменены зямныя паклоны, слова “Ісус” сталі пісаць з дзвюма “і” ў пачатку, “алілуя” сталі казаць не два, а тры разы, замест двух пальцаў пачалі хрысціцца трыма, разам з васьміканцовым крыжом сталі шанаваць шасці- і чатырохканцовы і г. д.

Рэформа Нікана выклікала рашучае супраціўленне часткі духавенства і вернікаў, якія сталі называцца стараверамі. Прычынай супраціўлення з’явілася своеасаблівасць рэлігійнага светаўспрымання ў рускім праваслаўі. Тут засталіся моцныя язычніцкія элементы, і надзвычай вялікая ўвага надавалася культавай практыцы, якая ўспрымалася як сукупнасць метадаў дагаджэння Богу. І калі пачаліся рэформы ў абрадах, гэта было ўспрынята як змена веры. Апроч таго, значная частка праваслаўнага духавенства ў Расіі была малапісьменнай, вучылася служыць “з голасу” і проста не магла прачытаць новыя богаслужэбныя кнігі. Таму перад ёй паўставала альтэрнатыва: альбо саступіць сваё месца новым свяшчэннікам, альбо неяк супраціўляцца зменам.

Непрыняцце рэформы часткай рускага грамадства было абумоўлена таксама грубасцю яе правядзення, Нікан быў фанатычна веруючым і вельмі ўладалюбівым чалавекам; прыйшоўшы да высновы аб неабходнасці змен у царкве, ён праводзіў іх рашуча і жорстка. Усе старыя абрады былі абвешчаны скажонымі, а іх прыхільнікі – ерэтыкамі. Гэта пакрыўдзіла рускіх, якія ўжо прызвычаіліся да думкі, што яны Трэці Рым. Тым больш, што саміх грэкаў, кнігі і абрады якіх былі ўзяты за ўзор, на Русі даўно падазравалі ў ерасі, лічылася, што захоп туркамі Канстанцінопаля – кара Божая за унію з каталікамі. Трэба сказаць, што ў стараверства адышла найбольш адданая сваім поглядам частка рускага грамадства, якая адчувала несправядлівасць рэформы. Большасць жа пакарылася пад ціскам улад.

Старыя абрады і іх прыхільнікі былі пракляты на Маскоўскім памесным саборы ў 1666–1667 гг. Пачаліся праследаванні старавераў з боку царскіх улад. Руская праваслаўная царква была дзяржаўнай, і непрынянцце рэформы разглядалася як дзяржаўнае злачынства. Старавераў білі батагамі, саджалі ў турмы, палілі. У 1682 г. лідар старавераў пратапоп Авакум быў спалены ў драўляным зрубе разам з двума сваімі паплечнікамі. Знакамітая баярыня Марозава, якая з'яўлялася родзічкай цара, і таму яе баяліся адкрыта прыгаварыць да смерці, была заморана голадам у адным з манастыроў. Ратуючыся ад праследаванняў, стараверы ўцякалі ў Сібір, Паволжа, на Поўнач. Сярод часткі іх распаўсюджваецца думка, што разам з рэформай Нікана ў царкву прыйшоў Антыхрыст, і лепш загінуць, чым трапіць пад яго ўладу. Пачынаюцца калектыўныя самаспальванні старавераў. У 1675–1695 гг. іх было зарэгістравана 37, загінула не менш 20 тыс. чалавек. Самаспальванні старавераў былі ў XVIII ст. і, як асобныя выпадкі, у XIX ст.

Амаль адразу пасля свайго ўзнікнення старавераства падзялілася на два напрамкі: папоўцаў і беспапоўцаў. Першыя мелі святароў і займалі адносна памяркоўныя пазіцыі: маліліся за цара і прызнавалі афіцыйную царкву. Беспапоўцы не мелі святароў, называлі цара Антыхрыстам, а афіцыйную царкву – установай Сатаны. У далейшым папоўства і беспапоўства падзяліліся на дробныя напрамкі: толкі і згоды.

На тэрыторыі Беларусі стараверы з'явіліся ў другой палове XVII ст., у 1685 г. імі быў заснаваны горад Ветка, які неўзабаве ператварыўся ў галоўны цэнтр папоўства. Была ўтворана свая веткаўская згода, якая стаяла на памяркоўных пазіцыях. Веткаўцы асуджалі самаспальванне, прызнавалі іконы, напісаныя іншавернымі майстрамі, не лічылі грахом разам есці з прадстаўнікамі афіцыйнай царквы.

Урад Рэчы Паспалітай стварыў спецыяльную камісію, якая разгледзела веравучэнне веткаўскіх старавераў і прыйшла да высновы, што яны "не належаць да ліку небяспечных для дзяржавы і царквы сектантаў". Кароль Ян Сабескі выдаў грамату аб вольным жыхарстве раскольнікаў у польскіх межах, пры поўнай незалежнасці ад каталіцкага духавенства ў адпраўленні веры і абрадаў.

Ветка багацела і развівалася як гандлёвы і рамесны цэнтр. Сюды прыходзілі тысячы старавераў з Расіі, каб "узмацніцца ў веры". Паступова вакол Веткі ствараюцца старaверскія слабоды. У 1722 г. іх было 23: Мільча, Касцюковічы, Буда, Гродня, Тарасаўка і інш. Агульная колькасць старавераў дасягала тут 40 тыс.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзейнасць веткаўскіх стравераў прыцягнула ўвагу рускага ўрада. Карыстаючыся бязуладдзем у Рэчы Паспалітай, у 1735 г. быў зроблены з Расіі ваенны паход на Ветку. Стараверскія манастыры і цэрквы былі спалены, а 14 тыс. жыхароў выведзена ў Расію. Аднак гораду ўдалося адрадзіцца, і ў 1764 г. робіцца другі паход на Ветку, пасля якога яна страчвае сваё значэнне як цэнтр стараверства.

У 1971 г. на Памесным саборы рускай праваслаўнай царквы ў Маскве са стравераў быў зняты праклён, і тым самым створаны кананічныя ўмовы для пераадолення расколу. Аднак аб’яднання не адбылося. Староверы і дагэтуль даволі адмоўна ставяцца да “ніканаўцаў”.

Зараз на Беларусі большасць стравераў складаюць беспапоўцы, асноўная колькасць якіх жыве ў Віцебскай вобласці. Папоўцы ў нашай краіне належаць да дзвюх арганізацыйных структур, цэнтры якіх знаходзяцца ў Расіі: Рускай праваслаўнай стараверскай царквы на чале з мітрапалітам Маскоўскім і ўсяе Русі (Масква) і Рускай Стараправаслаўнай царквы на чале з архіепіскапам Навазыбкаўскім, Маскоўскім і ўсяе Русі (г. Навазыбкаў, Бранскай вобл.). На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістраваны 32 суполкі стравераў.

### 4.3.4. Асаблівасці праваслаўнага веравучэння і культу

Асновы праваслаўнага веравучэння і культу склаліся да раздзялення царквы ў 1054 г. і маюць дзве крыніцы: Свяшчэннае Пісанне і Свяшчэннае Паданне. Вельмі важнае значэнне ў фарміраванні веравучэння і культу ў праваслаўі надаецца прынцыпу сабornасці – каб нейкі дагмат альбо абрад быў афіцыйна зацверджаны, трэба папярэдняе іх прызнанне большасцю вернікаў.

Для праваслаўя з яго падкрэсленай прыхільнасцю да традыцыі ўласціва звяртанне да Свяшчэннага Пісання ў строгіх межах царкоўнай інтэрпрэтацыі. Таму галоўная роля надаецца кананічным кнігам Бібліі, аўтарытэт якіх прызнаецца ўсімі хрысціянамі. Праваслаўе лічыць найлепшым грэчаскі пераклад Старога Запавету са старажытнаяўрэйскай і арамейскай моў, зроблены ў Александрыі на мяжы III–II стст. да н. э.[1], з якога да канона аднесена 39 кніг, бо яны ўваходзілі ў больш ранні спіс іўдзейскіх свяшчэнных тэкстаў. Ва ўспрыманні структуры Новага Запавету праваслаўе не разыходзіцца з каталікамі і пратэстантамі.

Пераклад Бібліі на старажытнаславянскую мову быў зроблены ў VIII ст. апосталамі славян святымі Кірылам і Мефодзіем. Ён з’явіўся асновай для далейшых выданняў Бібліі на Русі. З часам узнікла

[1] Гэты пераклад называецца Септуагінта (ад грэч.  – семдзесят). Лічыцца, што ён зроблены 70 (па іншай версіі – 72) перакладчыкамі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

патрэба перакладу Бібліі на рускую мову, які быў зроблены ў 1876 г. па блаславенню Сінода. Царкоўнаславянскі пераклад выкарыстоўваецца ў час набажэнстваў і ў багаслоўскіх працах, рускі – прызначаны для асабістага і дамашняга чытання.

Той тып царкоўна-дзяржаўных узаемаадносін, які існаваў у Візантыйскай імперыі, знішчаў неабходнасць у асаблівым доказе хрысціянскага веравучэння, бо праваслаўе ператвараецца ў элемент дзяржаўнай структуры і падтрымліваецца ўладамі. Таму ў царквы не было патрэбы ў развіцці веравучэння і рацыянальнай аргументацыі па яго абароне. Асноўную ўвагу праваслаўныя багасловы надаюць разважанням аб містычным баку свядомасці і паводзін вернікаў. Галоўнай тэмай робіцца пераўтварэнне чалавечай прыроды і яе далучэнне да Бога.

Вельмі вялікая ўвага ў праваслаўі надаецца абрадам як спосабам узаемадзеяння з Богам. Прызнаюцца ўсе сем таінстваў, якія выконваюцца вельмі ўрачыста і старанна. У гады Савецкай улады хрышчэнне ў Рускай праваслаўнай царкве адбывалася не праз акунанне, а праз абліванне. Тлумачылася гэта тым, што ва ўмовах праследаванняў цяжка было выканаць усе патрабаванні, і таінствы рабіліся ў скарочаным выглядзе. Зараз гэтая практыка паступова ліквідуецца, і хрышчэнне дзяцей усё часцей адбываецца праз акунанне. Мірапамазанне ў праваслаўнай царкве робіцца адразу пасля хрышчэння, фактычна зліваючыся ў адзін абрад. Алей для мірапамазання абавязкова асвячаецца епіскапам, але рабіць гэтае таінства могуць простыя святары. У гады Савецкай улады ў Рускай праваслаўнай царкве практыкавалася калектыўная споведзь, калі святар проста пералічваў магчымыя грахі, а вернікі, калі які-небудзь грэх іх тычыўся, у сваім сэрцы каяліся ў ім. Зараз у праваслаўнай царкве існуе індывідуальная споведзь. Таінству шлюбу (вянчанню) у праваслаўі надаецца вельмі вялікае значэнне. Лічыцца, што яго сіла захоўваецца і пасля смерці мужа ці жонкі, аднак дапускаецца магчымасць разводаў. Згодна з праваслаўнымі канонамі, чалавек можа ўступаць у шлюб у царкве тры разы, але толькі першы раз гэта будзе разглядацца як таінства вянчання. Прычашчаюцца праваслаўныя вернікі адначасова хлебам і віном, якія святар дае ім з лыжачкі.

Набажэнства ў праваслаўнай царкве адбываецца надзвычай урачыста. Для яго характэрна выкарыстанне залатых, альбо пафарбаваных "пад золата", рэчаў, пышныя адзенні святаслужыцеляў, асаблівая прыўзнятасць усіх дзеянняў. Тлумачыцца гэта тым, што ў Візантыі, адкуль набажэнства было запазычана на Русь, узорам для яго фарміравання з'явіліся набажэнствы, у якіх прымаў удзел імператар і яго двор. Таму візантыйская літургія мела шмат агульных рыс з прыдворным рытуалам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Праваслаўны храм, як правіла, пабудаваны ў крыжова-купальным стылі. Колькасць купалоў мае сімвалічнае значэнне: адзін купал сімвалізуе Хрыста як адзінага галаву царквы, тры – Тройцу, пяць – Хрыста і чатырох евангелістаў, сем – сем таінстваў, дзевяць – дзевяць чыноў анёлаў, трынаццаць – Хрыста і дванаццаць апосталаў. Крыж на версе купала нагадвае аб перамозе Хрыста над Д’ябалам і смерцю. Абавязковым элементам праваслаўнага храма з’яўляецца званіца, якая можа стаяць асобна альбо складае з храмам адзінае цэлае. Унутры праваслаўны храм мае шмат упрыгожванняў: яго сцены звычайна распісаны біблейскімі сцэнамі, маецца шмат ікон. Праваслаўны храм падзяляецца на тры часткі: алтар, уласна храм, дзе знаходзяцца вернікі і адбываецца набажэнства, і прытвор (уваходная частка). Храм павернуты алтаром на ўсход, ад асноўнай часткі алтар аддзяляецца асаблівай сцяной з ікон – іканастасам, у якім ёсць тры дзверы: цэнтральная (царская брама) і дзве бакавыя (дыяканскія). Уваходзіць у алтар могуць толькі святары ў час набажэнства і тыя, хто пры гэтым прыслужвае. Прычасце рыхтуецца святаром у алтары пры зачыненых дзвярах, потым яно выносіцца праз царскую браму і даецца вернікам.

Святы ў Рускай праваслаўнай царкве адзначаюцца па старому юліянскаму календару. Галоўным з іх з’яўляецца Уваскрэсенне Хрыстова (Пасха, Вялікдзень), якое называюць “святам святаў”. Яно святкуецца ў першую нядзелю пасля вясенняга раўнадзенства і поўні і не можа супадаць па часе з іўдзейскай Пасхай. Кожны год Уваскрэсенне Хрыстова прыпадае на розныя даты. У царкве існуюць спецыяльныя табліцы – пасхаліі, якія вызначаюць час гэтага свята на многа гадоў наперад.

Следам за Пасхай па значнасці ідуць так званыя двунадзесятыя святы: Нараджэнне (Раство) Хрыстова (7 студзеня); Хрышчэнне Гасподняе (19 студзеня); Стрэчанне Гасподняе (15 лютага); Дабравешчанне (Благавешчанне, Дабравесце) (7 красавіка); Ушэсце (Узнясенне) Гасподняе (40-ы дзень пасля Уваскрэсення); Святая Тройца (Пяцідзесятніца) (50-ы дзень пасля Уваскрэсення); Пераўтварэнне Гасподняе (Спас) (19 жніўня); Успенне Прасвятой Багародзіцы (Прачыстая) (28 жніўня); Нараджэнне (Раство) Прасвятой Багародзіцы (21 верасня); Уздвіжанне Крыжа Гасподняга (27 верасня); Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы (4 снежня); Уваход Гасподзень у Іерусалім (за тыдзень да Уваскрэсення Хрыстова).

За двунадзесятымі ідуць 5 святаў, якія называюцца вялікімі: Абразанне Гасподняе (1 студзеня), Нараджэнне (Раство) Іаана Прадцечы (7 ліпеня), Пакроў Прасвятой Багародзіцы (14 кастрычніка), Дзень Святых першавярхоўных Апосталаў Пятра і Паўла, Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Існуюць таксама святы, якія называюцца прастольнымі. Яны маюць мясцовую значнасць. Да іх можа быць аднесена любое свята, прысвечанае падзеі, у гонар якой названы дадзены храм.

Вялікае значэнне ў праваслаўі надаецца пастам. Яны займаюць каля 200 дзён у годзе. Ёсць аднадзённыя (якія доўжацца адзін дзень) і шматдзённыя пасты. Да апошніх адносяцца: Вялікі пост перад Уваскрэсеннем Хрыстовым (7 тыдняў), пост перад Нараджэннем Хрыстовым (28 снежня – 6 студзеня), Успенскі пост (14–27 жніўня), Пятроў пост (з 4 чэрвеня па 11 ліпеня). У час пастоў вернікі не могуць есці мясную і малочную ежу, а таксама яйкі. Трэба адзначыць, што, згодна з агульнахрысціянскім веравучэннем, сэнс посту – не ва ўстрыманні ад ежы, але ў духоўным і цялесным ачышчэнні і звяртанні да Бога.

### 4.3.5. Структура праваслаўнай царквы на Беларусі

Праваслаўная царква на Беларусі не мае статус аўтакефальнай, гэта частка Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ). Вышэйшым калектыўным органам РПЦ з’яўляецца Памесны сабор. Тэрміны яго склікання вызначаюцца Архіерэйскім саборам. У выключных выпадках Памесны сабор можа склікацца Патрыярхам і Свяшчэнным сінодам. Членамі Памеснага сабора з’яўляюцца архіерэі, а таксама прадстаўнікі ад духавенства, манаства і міран, якія выбіраюцца вернікамі. Памесны сабор тлумачыць веравучэнне праваслаўнай царквы, вырашае кананічныя, богаслужэбныя, пастырскія і іншыя пытанні ўнутранай і знешняй дзейнасці, кананізіруе святых, зацвярджае пастановы Архіерэйскіх збораў, ацэньвае дзейнасць Свяшчэннага Сінода, выбірае патрыярха, з’яўляецца апошняй інстанцыяй, якая мае паўнамоцтвы разглядаць кананічныя і дагматычныя адступленні ў дзейнасці апошняга. Разам з Памесным саборам для вырашэння найбольш важных пытанняў рэлігійнага жыцця Рускай праваслаўнай царквы не радзей аднаго разу ў 4 гады склікаюцца Архіерэйскія саборы. На іх заслухоўваецца справаздача аб дзейнасці патрыярха, і падпарадкоўваюцца яны Памеснаму сабору, на якім зацвярджаюцца іх рашэнні.

Персанальнай галавой Рускай праваслаўнай царквы з’яўляецца Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі. Ён мае першынство гонару перад іншымі епіскапамі, кіруе царквой разам са Свяшчэнным Сінодам, дае справаздачу толькі Памеснаму і Архіерэйскаму саборам. У перыяды паміж саборамі яму належыць вышэйшая ўлада ў пытаннях веравучэння, царкоўнага кіраўніцтва і суда. Ён прызначае архіерэяў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і кантралюе іх дзейнасць, узнагароджвае тытуламі і вышэйшымі царкоўнымі ўзнагародамі, ажыццяўляе сувязі з іншымі цэрквамі і арганізацыямі.

Пры патрыярху знаходзіцца дарадчы орган Свяшчэнны Сінод, які складаецца са старшыні (патрыярха), сямі пастаянных і пяці часовых членаў (архіерэяў). Ён збіраецца два разы ў год для вырашэння пытанняў унутранай і знешняй дзейнасці царквы.

Праваслаўная царква на Беларусі з 1989 г. мае статус экзархата (ад грэч. *exarchos* – галава, кіраўнік, намеснік) і валодае вызначанай самастойнасцю. Яна мае дзве афіцыйныя назвы: Беларускі экзархат Маскоўскага патрыярхату і Беларуская праваслаўная царква. Узначальвае яе Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, патрыяршы экзарх усяе Беларусі. Пры ім у якасці дарадчага органа знаходзіцца Сінод Беларускай праваслаўнай царквы, які складаецца са старшыні (мітрапаліта) і 12 членаў (архіерэяў).

На Беларусі 11 праваслаўных епархій: Мінская, Магілёўская, Брэсцкая, Гродзенская, Гомельская, Віцебская, Полацкая, Пінская, Тураўская, Навагрудская, Бабруйская. Вышэйшым кіруючым органам епархіі з’яўляецца епархіяльны сход, які збіраецца не радзей аднаго разу ў год. Складаецца ён з прадстаўнікоў духавенства і вернікаў, яго старшынёй з’яўляецца правячы архіерэй. Да ліку асноўных функцый епархіяльнага сходу належаць: абранне членаў епархіяльнага савета і дэпутатаў ад епархіі на Памесны сабор, стварэнне неабходных епархіяльных устаноў, заслухоўванне справаздач епархіяльнага кіраўніцтва аб стане епархіі і прыняцце па ім рашэнняў, назіранне за царкоўным жыццём у епархіі.

Выканаўчым органам епархіяльнага сходу з’яўляецца епархіяльны савет. Ствараецца не менш чым з 4 чалавек у сане прэсвітара, палова з якіх назначаецца правячым архіерэем, а палова выбіраецца епархіяльным сходам на адзін год. Старшынёй епархіяльнага савета з’яўляецца архіерэй. Да ліку асноўных абавязкаў епархіяльнага савета адносяцца: назіранне за дзейнасцю прыходаў, рэвізія епархіяльных устаноў, вырашэнне пытанняў будаўніцтва і рамонту, а таксама пытанні царкоўнага суда.

Для ажыццяўлення кіраўніцтва епархіяй пры архіерэі знаходзіцца епархіяльнае ўпраўленне. Назначае супрацоўнікаў епархіяльнага ўпраўлення і кантралюе іх дзейнасць архіерэй.

Ніжэйшай і пачатковай ячэйкай праваслаўнай царквы з’яўляецца прыход – суполка духавенства і вернікаў, якая аб’ядноўваецца пры храме. Прыхадская суполка ствараецца па добраахвотнай згодзе не менш чым з 20 чалавек, якія дасягнулі 18 гадоў, і рэгіструецца ва

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўстаноўленым законам парадку. Кіруючым органам прыхода з'яўляецца прыходскі сход, які склікаецца настаяцелем храма не радзей аднаго разу ў год, для разгляду і прыняцця рашэнняў па арганізацыйных, фінансава-гаспадарчых і іншых пытаннях. Членам прыходскага сходу можа быць любы прыхаджанін, які дасягнуў 18 гадоў і не знаходзіцца пад царкоўным або грамадзянскім судом.

Выканаўчым органам прыходскага сходу, які ім выбіраецца, з'яўляецца прыходскі савет. Як правіла, ён складаецца са старшыні, намесніка старшыні і скарбніка. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 1545 праваслаўных прыходаў.

Падрыхтоўку святароў ажыццяўляе Мінская духоўная семінарыя і акадэмія, якія знаходзяцца ў вёсцы Жыровічы Гродзенскай вобласці. Паступіць туды можа любы праваслаўны вернік мужчынскага полу, які мае рэкамендацыю свайго правячага архіерэя і паспяхова здасць уступныя экзамены.

Таксама ў Мінску існуе інстытут тэалогіі пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, які рыхтуе студэнтаў па дзвюх спецыяльнасцях – "багаслоў" і "выкладчык багаслоўя".

На тэрыторыі Беларусі існуе 31 праваслаўны манастыр. Узначальваюцца яны настаяцелямі, якія падпарадкоўваюцца альбо мясцовым правячым архіерэям, альбо Мітрапаліту Мінскаму і Слуцкаму.

Усё праваслаўнае духавенства падзяляецца на белае і чорнае. Белае духавенства складаецца з жанатых святароў, але жаніцца яны могуць толькі адзін раз. Нават калі жонка памерла і ёсць малыя дзеці, якіх трэба выхоўваць, ажаніцца другі раз святар не мае права. Чорнае духавенства – гэта святары, якія прынялі манаства. Толькі прадстаўнікі чорнага духавенства могуць стаць архіерэямі.

Адзначым, што праваслаўе – гэта рэлігійны кірунак, які найбольш цесна супрацоўнічае зараз з дзяржавай. Зацікаўленасць ва ўзаемадзеянні, праяўленая як з боку кіраўніцтва Беларусі, так і з боку кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы, прывялі да падпісання 12 чэрвеня 2003 г. Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай царквой. Гэтае пагадненне падпісана ў адпаведнасці з Арт. 8 закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" і Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

У заключэнні скажам, што праваслаўе – адзін з асноўных кірункаў у хрысціянстве. На нашых землях яно мае доўгую традыцыю і з'яўляецца неад'емнай часткай гістарычнай спадчыны. Зараз на Беларусі адбываецца паступовае адраджэнне праваслаўнай царквы.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.4. Каталіцтва

4.4.1. Агульная характарыстыка каталіцтва.
4.4.2. Асаблівасці веравучэння і культу каталіцтва.
4.4.3. Структура каталіцкай царквы.
4.4.4. Уніяцтва на Беларусі.

### 4.4.1. Агульная характарыстыка каталіцтва

Каталіцтва – самы шматколькасны кірунак у хрысціянстве. Зараз у свеце налічваецца звыш 1 млрд. католікаў, якія складаюць каля 16 % насельніцтва Зямлі. Яно распаўсюджана ў такіх еўрапейскіх краінах, як Іспанія, Італія, Партугалія, Бельгія, Аўстрыя, Германія, Польшча, Літва, Беларусь і Украіна. Найбольш моцны ўплыў каталіцтва мае ў Лацінскай Амерыцы, дзе яно ахоплівае амаль 90 % насельніцтва.

У якасці асноўных рыс гэтага кірунку даследчыкі называюць, папершае, высокую ступень цэнтралізацыі царквы і канцэнтрацыю ўлады ў руках Папы Рымскага. У адрозненне ад праваслаўя, якое ў арганізацыйным плане падзяляецца на 15 аўтакефальных цэркваў, каталіцтва з'яўляецца адзіным. Ёсць толькі адна каталіцкая царква ва ўсім свеце, узначальвае якую Папа Рымскі.

Адзінства каталіцкай царквы абумоўлена як чыста рэлігійнымі, так і гістарычнымі прычынамі. Як ужо адзначалася, першым епіскапам Рыма (Рымскім Папам) лічыцца сам апостал Пётр, якому, згодна з Бібліяй, Хрыстос даручыў кіраўніцтва ў хрысціянскай царкве. Кожны Рымскі Папа разглядаецца католікамі як пераемнік Пятра і галава царквы. Такім чынам, ён з'яўляецца бачным сімвалам адзінства і валодае вельмі вялікім аўтарытэтам.

З падзеннем Заходняй Рымскай Імперыі (476 г.) Папа атрымлівае новыя магчымасці для пашырэння сваёй як духоўнай, так і свецкай улады. Ён робіцца галоўным прадстаўніком хрысціянскага насельніцтва былых рымскіх тэрыторый, занятых зараз варварскімі плямёнамі.

Свецкая ўлада пап атрымала падтрымку з боку кіраўнікоў узнікшых у Еўропе новых варварскіх дзяржаў. У 756 г. франкскі кароль Піпін Кароткі падараваў Папе Стэфану ІІ землі ў Італіі, на якіх была створана Папская вобласць, якая праіснавала да 1870 г.

Свецкія ўлады ў Еўропе не змаглі падпарадкаваць сабе царкву, і яна развівалася як адзіная і цэнтралізаваная арганізацыя. Нейкі час папы нават узвышаліся над свецкімі ўладамі, яны каранавалі каралёў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

былі арбітрамі ў спрэчках паміж імі, праводзілі актыўную міжнародную палітыку. З цягам часу палітычная ўлада пап усё больш памяншалася, але і зараз папы валодаюць вялікім аўтарытэтам у свеце.

Каталіцкая царква, у адрозненне ад праваслаўнай, імкнулася быць незалежнай ад свецкіх улад і праводзіць самастойную палітыку. Гэтым абумоўлены як станоўчыя, так і адмоўныя бакі яе дзейнасці. Доўгі час яна аказвала істотны ўплыў не толькі на палітыку, але і культуру Еўропы. Праз каталіцкую царкву антычная культурная спадчына зрабілася ўласнасцю еўрапейскіх народаў. Прыкладна да XIV ст. царква была галоўным культурным інстытутам, амаль усё духоўнае жыццё, навука і адукацыя адбываліся ў яе межах. У перыяд сярэднявечча каталіцкая царква была адным з інстытутаў улады і ўжывала ў сваёй дзейнасці сродкі тых часоў, якія, па сутнасці, супярэчылі хрысціянскай маралі. У XI–XIII стст. яна з'явілася адным з ініцыятараў крыжовых паходаў за вызваленне Іерусаліма ад захапіўшых яго мусульман, гэта значыць, рэлігійных войнаў. У пачатку XIII ст. для барацьбы з ерасямі ў каталіцкай царкве была арганізавана інквізіцыя (ад лац. *inquisitio* – вышук), якая праіснавала да 1965 г. Агульная колькасць людзей, асуджаных інквізіцыяй да розных відаў пакарання, налічвае некалькі соцен тысяч. Для дзейнасці інквізіцыі былі характэрны тайнае следства, ужыванне катаванняў, выкарыстоўванне даносчыкаў і г. д. Адной з найбольш вядомых спраў інквізіцыі з'яўляецца асуджэнне ў 1633 г. італьянскага вучонага Галілеа Галілея, якога вымусілі адрачыся ад геліяцэнтрычнай тэорыі Каперніка. Зараз каталіцкая царква прызнала крыжовыя паходы, інквізіцыю, а таксама справу Галілея сваімі грахамі і пакаялася ў іх.

Другой асноўнай рысай каталіцтва з'яўляецца дынамізм яе рэлігійна-царкоўнага жыцця, які праяўляецца як у сацыяльнай, так і багаслоўскай сферах. Каталіцкая царква заўсёды займала актыўную сацыяльную пазіцыю і імкнулася аказаць уплыў на сучаснае ёй грамадства. У найбольшай ступені ёй гэта ўдавалася ў перыяд сярэднявечча, калі яна валодала вялікай уладай. У гэты ж час царква ўсё больш зрошчваецца з феадальнай дзяржавай і залежыць ад яе. Пачынаючы з перыяду Адраджэння, еўрапейская культура ва ўсё большай ступені набывае свецкі характар, і царква паступова страчвае свой уплыў на развіццё культуры, больш таго, шмат у чым яна робіцца рэакцыйнай і кансерватыўнай сілай у грамадстве. У ёй працягваюць адбывацца змены, але ідуць яны вельмі марудна і з вялікімі цяжкасцямі. Каталіцкая царква ўсё больш адстае ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў сацыяльнай і культурнай сферах еўрапейскага жыцця, і займае адносна іх абарончыя пазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рашучы паварот да змен быў узяты на Другім Ватыканскім саборы, які прайшоў у 1962–1965 гг. З яго пачаўся працэс аджарнамента (італ. *aggiornamento* – адпаведнасць сённяшняму дню) – абнаўленне сучаснай каталіцкай царквы. Было абвешчана, што яна прызвана не кіраваць грамадствам, але служыць яму. Атрымаў прызнанне прынцып свабоды веравызнання. Сабор выказаўся за калегіяльныя метады кіравання царквой, больш актыўны ўдзел міран у царкоўным жыцці і ўзаконіў нацыянальныя канферэнцыі і сіноды. Былі ўхвалены некаторыя змены ў богаслужэнні, у прыватнасці, выкарыстоўванне нацыянальных моў, а таксама прызнана магчымасць функцыянальнага стылю ў царкоўнай архітэктуры. Сабор зняў з іўдзеяў віну за распяцце Хрыста. Была зроблена рашучая спроба прымірэння з праваслаўнай царквой і пратэстанцтвам, усталявання канструктыўных сувязяў з нехрысціянскімі рэлігіямі. Сабор выказаўся па многіх сучасных сацыяльных пытаннях. У прыватнасці, былі рашуча асуджаны ўжыванне ядзернай зброі, вайна, як сродак вырашэння канфліктаў, неакаланіяльныя сродкі эксплуатацыі.

Рашэнням Другога Ватыканскага сабора ў каталіцкай царкве зараз надаецца вельмі вялікае значэнне і адбываецца праца па іх ажыццяўленню.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### 4.4.2. Асаблівасці веравучэння і культу каталіцтва

Аснова каталіцкага веравучэння і культу склалася да падзелу царквы ў 1054 г. і з'яўляецца агульнай з праваслаўем. Як і праваслаўныя, каталікі прызнаюць дзве крыніцы веравучэння: Свяшчэннае Пісанне (Біблію) і Свяшчэннае Паданне.

У якасці афіцыйнага варыянта тэкста Свяшчэннага Пісання ў каталіцкай царкве прызнана так званая Вульгата (ад лац. *vulgata* – народная, агульнадаступная) – пераклад Бібліі на гутарковую лацінскую мову, зроблены ў 384–405 гг. святым Еранімам. Яна складаецца з 72 кніг, якія ўсе прызнаюцца кананічнымі. З яе былі зроблены пераклады на нацыянальныя мовы. Каталіцкая царква заклікае сваіх прыхільнікаў чытаць Біблію і суадносіць яе палажэнні са сваім жыццём, але тлумачэнне Бібліі павінна абапірацца на агульнацаркоўнае.

У адрозненне ад праваслаўнай царквы, каталіцкая лічыць неабходным развіваць Свяшчэннае Паданне, каб, захоўваючы яго аснову, даваць адказы на пытанні часу. У Свяшчэннае Паданне каталіцтва ўваходзяць творы Святых Айцоў, Настаўнікаў царквы, рашэнні 21 Сусветнага сабора (апошні – ІІ Ватыканскі), а таксама папскія энцыклікі (ад познелац. *encyclicus* – акружны, агульны) – пасланні да

ўсіх католікаў, прысвечаныя пытанням веры, маралі, сацыяльным пытанням і г. д.

У веравучэнні каталіцтва ёсць пяць спецыфічных палажэнняў:

1. Аб сыходжанні Духа Святога не толькі ад Бога Айца але і ад Бога Сына. Па-лацінску гэты дагмат гучыць як філіоквэ (*filioque* – і ад сына). Ён быў прыняты ў 586 г. на саборы ў Таледа (Іспанія) у мэтах барацьбы з арыянствам і ўведзены ў Сімвал веры. У ім падкрэсліваецца роўнасць Бога Сына з Богам Айцом. Усходняя частка царквы не прыняла філіоквэ, настойваючы на тым, што нельга нічога дадаваць да Сімвала веры. Спрэчка наконт філіоквэ лічыцца адной з прычын расколу царквы на праваслаўную і каталіцкую.

2. Аб запасе добрых спраў. Гэтае палажэнне было абвешчана папам Кліментам і ў 1349 г. пацверджана ў 1562 г. Трыдзенцкім (1545–1563 гг.), а ў 1870 г. І Ватыканскім саборам. Згодна з ім, Ісус Хрыстос, Божая Маці, святыя і вернікі праз сваю дзейнасць стварылі запас неабходных для выратавання людзей добрых спраў, якім распараджаецца царква і размяркоўвае яго сярод тых, хто ў гэтым мае патрэбу. На падставе гэтага палажэння ў каталіцкай царкве ў сярэднія вякі атрымала распаўсюджанне практыка індульгенцый (ад лац. *indulgentia* – міласць) – папскіх грамат аб адпушчэнні чалавеку грахоў пры дапамозе запасу добрых спраў. Індульгенцыі маглі раздавацца дарма альбо за якія-небудзь подзвігі веры: падарожжы да святых месцаў (пераважна ў Рым), карысныя грамадскія пачынанні, заслугі перад царквой. Таксама можна было даць грошы на будаўніцтва храмаў альбо для раздачы бедным. У адпаведнасці з канонамі, каб атрымаць індульгенцыю, трэба было папярэдне пакаяцца, а даванне грошаў разглядалася як знак абмежавання ў тых матэрыяльных дабротах, якія за іх можна было б набыць. Паступова ўсё гэта вырадзілася і ў значнай ступені ператварылася ў звычайную камерцыю. Чалавек, зрабіўшы грэх, мог, маючы грошы, пайсці, купіць індульгенцыю і лічыць сябе чыстым перад Богам. Былі нават распрацаваны табліцы, у якіх кожны грэх меў свой грашовы эквівалент. Можна было лёгка купіць адпушчэнне любых грахоў, за выключэннем смяротных. Злоўжыванні пры гандлі індульгенцый прывялі да ўзнікнення Рэфармацыі і аддзялення ад каталіцкай царквы пратэстанцтва. Рашэннем Трыдзенцкага сабора гандаль індульгенцыямі быў забаронены.

3. Дагмат аб чысцілішчы – месцы, прамежкавым паміж пеклам і раем. Ён быў прыняты Фларэнтыйскім саборам у 1439 г. і пацверджаны Трыдзенцкім саборам у 1562 г. Згодна з каталіцкім веравучэннем, у чысцілішча трапляюць пасля смерці душы тых людзей, якія не атрымалі даравання за свае грахі ў зямным жыцці, але не абцяжараны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

смяротнымі грахамі. Там яны гараць у ачышчальным агні і толькі потым трапляюць у рай. Агонь тут мае сімвалічны сэнс, пад ім разумеюцца пакуты сумлення і пакаянне. Тэрмін знаходжання душы ў чысцілішчы можа быць скарочаны праз добрыя справы, якія робяць у памяць аб памерлым яго родзічы (малітвы, дапамога бедным, ахвяраванні на царкву і г. д.). Раней дзеля гэтай мэты можна было набыць індульгенцыю.

4. Дагмат аб бязгрэшным зачацці Дзевы Марыі быў абвешчаны ў 1854 г. Папам Піем I. Паводле яго, Марыя, хаця яна і нарадзілася ад сваіх бацькоў Іакіма і Ганны натуральным чынам, але па міласці Божай, праяўленай дзеля заслуг Ісуса, – выратавальніка роду чалавечага, яна была зачата без першароднага граху. Як працяг развіцця вучэння аб Дзеве Марыі ў 1950 г. Папа Пій XII зацвердзіў дагмат аб цялесным узнясенні Божай Маці, згодна з якім Багародзіца пасля канца яе зямнога шляху была ўзята на неба з “душой і целам для Славы Нябеснай”.

5. Дагмат аб бязгрэшнасці (беспамылковасці) Папы Рымскага ў справах веры і маралі. Ён быў прыняты на I Ватыканскім саборы ў 1870 г. Згодна з ім Папа, калі ён афіцыйна выказваецца па пытаннях веры і маралі, з дапамогай Бога валодае бязгрэшнасцю, і яго выказванні праўдзівыя. Пры гэтым трэба, каб выступленне Папы не было зроблена пад прымусам і адрасавалася ўсёй царкве. Ва ўсіх іншых выпадках выказванні і дзеянні папы не абавязкова з’яўляюцца беспамылковымі.

У каталіцкім кульце 7 таінстваў. Як і праваслаўныя, католікі хрысцяць немаўлят. Мірапамазанне, у адрозненне ад праваслаўя, адбываецца пасля 7 гадоў, калі дзіця ўжо разумее маральны сэнс сваіх учынкаў, робіцца біскупам і называецца канфірмацыяй (ад лац. *confirmatio* – умацаванне). Прычашчацца ў каталіцтве можна толькі пасля споведзі, гэтым яно адрозніваецца ад праваслаўя, дзе прычашчаюць немаўлят. Вернікі ў каталіцтве звычайна прычашчаюцца толькі хлебам, але дазволена прычашчаць іх хлебам і віном. У праваслаўі лічыцца, што вянчанне выконвае святар, у каталіцтве – самі ўступаючыя ў шлюб, разводы не прызнаюцца.

Набажэнствы ў каталіцкай царкве робяцца з улікам культурных традыцый таго ці іншага народа. Адбываюцца на нацыянальнай мове. Суправаджаюцца спевамі і звычайна ігрой на аргане. Дазволена выкарыстоўваць нацыянальныя музычныя інструменты, у Афрыцы, нават, барабаны, і нацыянальныя мелодыі.

У час набажэнства католікі сядзяць, падымаюцца і становяцца на калені ў асабліва ўрачыстыя моманты. Апроч ікон у каталіцкіх храмах ёсць скульптуры. Іканастаса няма, і таму міране ў час службы могуць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бачыць, як свяшчэннік на алтары выконвае таінства прычашчэння. Асноўны тып пабудовы каталіцкага храма – базіліка, але дазволена выкарыстоўваць іншыя тыпы і стылі пабудовы. Хрысцяцца католікі пяццю пальцамі, злева направа.

Асноўныя святы ў каталіцтве тыя ж, што і ў праваслаўі, але святкуюцца яны па новаму грыгарыянскаму календару. Сярод спецыфічных для католікаў святаў асноўнымі з’яўляюцца наступныя: Дзень урачыстасці Божай Маці Святой Марыі (1 студзеня), Свята Цела і Крыві Хрыстовай (першы чацвер пасля Троіцы), Свята Найсвяцейшага Сэрца Ісуса (на восьмы дзень пасля Свята Цела і Крыві Хрыстовай), Дзень усіх святых (1 лістапада). Таксама ёсць шмат святаў, якія прысвечаны шанаванню каталіцкіх святых.

### 4.4.3. Структура каталіцкай царквы

Каталіцкая царква ўяўляе сабой адзіную цэнтралізаваную арганізацыю. Яе кіраўніком з’яўляецца Папа Рымскі. Афіцыйна яго тытул гучыць так: Біскуп Рыма, Намеснік Ісуса Хрыста, Пераемнік Князя Апосталаў, Вярхоўны Патрыярх Усяленскай Царквы, Патрыярх Захаду, Прымас Італіі, Архібіскуп і Мітрапаліт Рымскай правінцыі, Манарх дзяржавы-горада Ватыкана, Раб Рабоў Божых. Выбіраецца Папа кардыналамі (ад лац. *cardinalis* – галоўны, асноўны) на спецыяльным сходзе – канклаве (ад лац. *cum clavi* – пад ключом) пажыццёва. Зараз гэта адбываецца наступным чынам. Калі памірае стары Папа, кардыналы, якія маюць права прымаць удзел у канклаве (тыя, узрост якіх не перавышае 80 гадоў), з’язджаюцца ў Рым, заходзяць у памяшканне Сіксцінскай капэлы Апостальскага палаца ў Ватыкане, і за імі зачыняюцца дзверы. Раней, каб пазбегнуць знешняга ўплыву на выбары Папы, уваход замуроўваўся. Кардыналы знаходзяцца ў Сіксцінскай капэле, пакуль не выберуць Папу. Ежу ім падаюць праз спецыяльнае акенца. Выбары адбываюцца шляхам тайнага галасавання пры дапамозе бюлетэняў. Кандыдат у Папы павінен набраць 2/3 галасоў плюс яшчэ адзін голас. Калі патрэбная колькасць галасоў не набрана, бюлетэні спальваюцца ў печцы разам з сырой саломай. Тады з коміна ідзе чорны дым, які з’яўляецца знакам, што Папа яшчэ не абраны. Калі кандыдат набраў патрэбную колькасць галасоў, спальваюцца толькі бюлетэні. З коміна ідзе белы дым, які паказвае, што адбыліся выбары Папы. Тады адчыняюцца дзверы, і новы Папа разам з кардыналамі выходзіць з Сіксцінскай капэлы.

Усяго ў гісторыі было 263 папы. З 2005 г. Рымскім Папам з’яўляецца Бенедыкт XVI, былы кардынал Ёзэф Рацынгер (нар. 1927). Па нацыянальнасці ён немец.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Папа з'яўляецца кіраўніком Ватыкана – карлікавай дзяржавы, якая займае некалькі кварталаў у Рыме вакол сабора Святога Пятра. Узнік Ватыкан у 1929 г. замест былой Папскай вобласці, якая існавала з 756 па 1870 гг. і ўключала ў сябе некалькі італьянскіх правінцый. Падставай для яго ўзнікнення з'явілася пагадненне, падпісанае паміж Папам Піем XI і ўрадам Мусаліні. Ватыкан займае тэрыторыю ў 44 гектары і мае ўсе дзяржаўныя атрыбуты: герб, сцяг, гімн, сімвалічнае войска са швейцарскіх гвардзейцаў. Як суверэнная дзяржава Ватыкан падтрымлівае дыпламатычныя адносіны больш як са ста краінамі. Паслы Ватыкана называюцца нунцыямі (лац. *nuntius* – веснік).

Згодна з канстытуцыяй Ватыкана, Рымскаму Папе належыць вышэйшая заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада. Кіруючы орган каталіцкай царквы мае назву Святы Прастол. Кіраўніцтва Ватыканам і царквой Папа ажыццяўляе праз цэнтральны адміністратыўны апарат – Рымскую курыю. Яна складаецца з 9 кангрэгацый, 12 саветаў, 3 трыбуналаў і 3 канцылярый, якія курыруюць розныя напрамкі і формы дзейнасці.

Папа з'яўляецца аднаасобным кіраўніком каталіцкай царквы, і яму належыць рашаючы голас ва ўсіх справах. Аднак сваю ўладу ён ажыццяўляе ў адзінстве з біскупамі і выносіць меркаванні па важных пытаннях толькі параіўшыся з імі. Пры Папе дзейнічае дарадчы орган – Сінод, які склікаецца адзін раз у тры гады. У яго склад уваходзяць патрыярхі і мітрапаліты ўсходніх каталіцкіх цэркваў, кіраўнікі нацыянальных епіскапскіх канферэнцый і манаскіх ордэнаў, а таксама асобы, персанальна прызначаныя Папам. Для вырашэння найбольш важных царкоўных пытанняў Папы збіраюць саборы. Рашэнні сінодаў і собораў набываюць абавязковую сілу пасля таго, як іх падпіша Папа.

На рэгіянальным узроўні існуюць епіскапскія канферэнцыі, якія перыядычна збіраюцца на свае паседжанне. У час паміж канферэнцыямі дзейнічаюць абраныя імі кіруючыя органы. Ёсць епіскапскія канферэнцыі краін Еўропы, Лацінскай Амерыкі, Азіі і Афрыкі. На іх вырашаюцца праблемы каталіцкай царквы дадзенага рэгіёна.

Нацыянальныя каталіцкія цэрквы зараз карыстаюцца значнай самастойнасцю, асабліва ў эканамічнай сферы. Частку свайго даходу яны адлічваюць у бюджэт Ватыкана, астатнім распараджаюцца самі. Кіруюць нацыянальнымі каталіцкімі цэрквамі кардыналы, патрыярхі, мітрапаліты, архібіскупы ці біскупы, якіх прызначае Папа. Называюцца яны прымасамі (лац. *primas* – той, хто мае першынство). Для вырашэння мясцовых праблем прымасы склікаюць нацыянальныя сіноды з прадстаўнікоў духавенства і вернікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асноўнай структурнай адзінкай каталіцкай царквы з’яўляецца епархія. Узначальваецца яна біскупамі, якіх прызначае Папа і якія непасрэдна з ім зносяцца. Пры іх існуюць епархіяльныя ўпраўленні для вырашэння штодзённых праблем.

Асаблівасцю каталіцкай царквы з’яўляецца наяўнасць манаскіх ордэнаў – арганізацый манахаў ці манашак, створаных для ажыццяўлення канкрэтнага віду дзейнасці: дабрачыннасці, адукацыі, дапамогі хворым, прапаганды веры і г. д. У каталіцкай царкве існуе звыш 150 манаскіх ордэнаў. Некаторыя з іх дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі. Таксама ёсць шматлікія арганізацыі вернікаў для выканання самых розных задач.

Зараз у каталіцкай царкве налічваецца каля 4,5 тыс. біскупаў, каля 450 тыс. святароў і каля мільёна манахаў і манашак. Усе яны выконваюць цэлібат (ад лац. *caelebs* – нежанаты) – зарок бясшлюбнасці.

На Беларусі на 1 студзеня 2011 г. існавала 475 каталіцкіх прыходаў. Ёсць чатыры епархіі: Мінска-Магілёўская, Пінская, Гродзенская і Віцебская. Кіруючым органам прыхода з’яўляецца прыходскі сход, які выбірае выканаўчы орган – прыходскі савет. Апошні складаецца са старшыні, яго намесніка, скарбніка і членаў рэвізійнай камісіі.

Для падрыхтоўкі святароў існуюць каталіцкія семінарыі ў Гродна і Пінску.

### 4.4.4. Уніяцтва на Беларусі

Уніяцтва (ад лац. *unio* – саюз, аб’яднанне) – рух у хрысціянстве, заснаваны на аб’яднанні з каталіцтвам іншых хрысціянскіх напрамкаў на ўмовах вяршынства Папы Рымскага і прыняцця каталіцкіх дагматаў пры захаванні своеасаблівасцяў культу.

Найбольш вядомай спробай аб’яднання з’яўляецца Брэсцкая унія, якая была заключана ў 1596 г. у Брэсце па ініцыятыве кіраўнікоў праваслаўнай царквы ВКЛ. Яе прычынамі з’яўляюцца:

I. Неабходнасць выхаду з таго крызіснага стану, у якім апынулася праваслаўная царква. Гэты крызіс быў абумоўлены як вонкавымі, так і ўнутранымі прычынамі. У XVI ст. на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца Рэфармацыя, якая мела тут вельмі вялікія поспехі. У сучаснікаў нават узнікала думка, што паступова яна выцісне з ВКЛ праваслаўе і каталіцтва. Каталіцкая царква хутка аправілася ад наступлення і пачала працэс Контррэфармацыі. Праваслаўная ж не магла гэтага зрабіць, бо была слабой. Кіраўнікі праваслаўнай царквы ВКЛ у сваёй барацьбе з пратэстантамі не маглі абапірацца на канстанцінопальскіх патрыярхаў, бо тыя самі з падзеннем Канстанцінопаля



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

трапілі ў залежнасць ад турэцкіх султанаў. Праваслаўныя скардзіліся, што канстанцінопальскія патрыярхі, якія лічыліся вярхоўнымі архіпастырамі іх царквы, не звяртаюць на яе ніякай увагі і не клапоцяцца аб ёй. Сярод праваслаўных святароў панавалі разбэшчанасць і невуцтва. Нават епіскапы не ведалі добра хрысціянскае веравучэнне і не маглі правільна выконваць набажэнства. Яны больш клапаціліся пра свае ўласныя справы, чым пра справы царквы, паводзілі сябе як тыповыя свецкія феадалы: лаяліся з суседзямі, палявалі, пілі. Сярод праваслаўных святароў мелася шмат такіх, якія былі жанатымі некалькі разоў, што катэгарычна забаранялася кананічнымі правіламі. Сам Мітрапаліт Кіеўскі Анісіфор Дзеванька да свайго пасвячэння ў сан быў удаўцом пасля смерці дзвюх жонак, і таму не мог з'яўляцца духоўнай асобай. Ён зусім не дбаў аб справах царквы, за што неаднаразова атрымліваў нараканні з боку вернікаў. У 1589 г. Канстанцінопальскі патрыярх пазбавіў Анісіфора Дзеваньку сану і ўзвёў у мітрапаліты настаяцеля Мінскага Узнясенскага манастыра Міхаіла Рагазу, які праз некалькі год і пайшоў на унію.

2. Небяспека трапіць пад царкоўнае кіраўніцтва Масквы, дзе ў 1589 г. быў абраны патрыярх, які адразу пачаў прэтэндаваць на ўладу над праваслаўнымі Вялікага Княства Літоўскага. Зразумела, з гэтым кіруючыя колы ВКЛ не маглі пагадзіцца. Маскву ў той час лічылі галоўным ворагам, з ёю вяліся безупынныя войны. Таму ўслед за палітычнай Люблінскай уніяй (1569 г.) з Польшчай, дзе пануючай рэлігіяй было каталіцтва, паўстала пытанне і аб рэлігійным аб'яднанні.

Падрыхтоўка яго вялася кіраўнікамі праваслаўнай царквы ВКЛ некалькі гадоў. У кастрычніку 1596 г. у Брэсце быў скліканы сабор, для вырашэння пытання аб уніі. На яго з'ехаліся як яе прыхільнікі, так і праціўнікі. Фактычна адбылося два саборы: уніяцкі і праваслаўны, якія абвясцілі адзін аднаму праклён. 8 кастрычніка 1596 г. на ўніяцкім Брэсцкім саборы была прынята грамата аб аб'яднанні з каталіцкай царквой.

Заключаная ў Брэсце унія прывяла не да рэлігійнага адзінства, а да канфрантацыі паміж яе прыхільнікамі і праціўнікамі. На баку уніі стаяла большасць царкоўнага кіраўніцтва ВКЛ і ўрад Рэчы Паспалітай. Яе праціўнікамі ў асноўным былі казакі, частка духавенства і гараджан. Найбольш вядомым вынікам канфлікту з'явілася забойства ў 1623 г. у Віцебску Полацкага архібіскупа Езафата Кунцэвіча.

Аднак вялікіх рэлігійных канфліктаў у сувязі з увядзеннем уніі на Беларусі не было. Яна была заключана па ініцыятыве епіскапаў на чале з мітрапалітам, за імі ў унію пайшлі святары, а за святарамі народ. Тым больш, што просты чалавек не бачыў асаблівай розніцы паміж

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

старым і новым станам: ён прыходзіў у тую ж царкву, бачыў таго ж святара, захоўваліся тыя ж абрады і каляндар. У тонкасцях розніцы паміж праваслаўнымі і каталіцкімі дагматамі просты чалавек не разбіраўся, яму было ўсё адно, каго памінаюць пры набажэнстве – Канстанцінопальскага патрыярха, ці Рымскага Папу. Таму уніяцтва паступова распаўсюджваецца, і ў канцы XVIII ст. да яго належала каля 80 % сельскага насельніцтва Беларусі. У большасці гэта былі сяляне, асноўная частка магнатаў і шляхты належала да каталіцтва, праваслаўных было няшмат.

Уніяцтва ў цэлым аказала даволі вялікі і станоўчы ўплыў на развіццё беларускай культуры. У ім былі сінтэзаваны ўсходнія і заходнія элементы і стварыўся свой арыгінальны тып рэлігійнага і культурнага светаўспрымання. Згодна з умовамі уніі былі захаваны праваслаўныя абрады, але ў іх адпраўленне шырока ўводзіліся каталіцкія элементы: арганная музыка, скульптуры, лаўкі. Ва ўніяцкім абрадзе былі пераапрацаваны элементы як візантыйскага, так і заходнееўрапейскага жывапісу. На падставе арыгінальнай інтэрпрэтацыі еўрапейскага барока было распрацавана віленскае альбо ўніяцкае барока, якое выкарыстоўвалася пры пабудове ўніяцкіх, каталіцкіх і праваслаўных храмаў.

Асабліва трэба адзначыць, што ўніяцкая царква выкарыстоўвала ў набажэнстве старабеларускую мову і тым самым садзейнічала яе захаванню і развіццю ва ўмовах узрастаючай польскай культурнай і палітычнай экспансіі, якая праявілася, у прыватнасці, у тым факце, што ў 1697 г. Сейм Рэчы Паспалітай забараніў ужыванне старабеларускай мовы ў справаводстве.

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай царскі ўрад устаў на шлях ліквідацыі уніі і пераводу ўніятаў у праваслаўе. Трэба адзначыць, што рабілася гэта па чыста палітычных матывах. Расійскую імператрыцу Кацярыну II, пры якой адбыліся падзелы Рэчы Паспалітай, вельмі цяжка назваць веруючым чалавекам. Яна была прыхільніцай філасофіі Асветніцтва, перапісвалася з Дзідро і Вальтэрам і адкрыта прыгнятала ў сваёй краіне праваслаўную царкву. Аднак адной з прычын далучэння нашых земляў да Расіі была названа неабходнасць вызвалення адзінаверцаў. Спачатку Кацярына II абяцала, што на ўніятаў не будзе ніякага ціску, але потым выдала некалькі ўказаў аб “искоренении унии”. У выніку, па афіцыйных звестках, каля 3 млн уніятаў перайшлі ў праваслаўе. Калі ў 1795 г. Кацярына II памерла, яе сын Павел I адмовіўся ад палітыкі прымусовага далучэння, і прыкладна 90 % былых уніятаў зноў вярнуліся да сваёй старой веры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Больш грунтоўна і паслядоўна ў гэтай справе дзейнічаў урад Мікалая І. Была праведзена неабходная падрыхтоўчая работа сярод уніяцкіх святароў і біскупаў, ім абяцаліся матэрыяльныя прывілеі, на непакорных аказваўся ціск. У выніку на Полацкім уніяцкім саборы ў 1839 г. было прынята рашэнне аб ліквідацыі уніі і далучэнні ўніятаў да праваслаўя.

Вялікіх хваляванняў пры ліквідацыі уніі на Беларусі не адбылося. Аднак гэтая падзея мела адмоўны вынік для нашай нацыянальнай культуры. Уніяты не хацелі пераходзіць у праваслаўе, а масава пераходзілі ў больш блізкае ім каталіцтва, якое ў тыя часы было моцным сродкам паланізацыі.

Пытанне аб адраджэнні ўніяцтва на Беларусі было ўзнята ў час паўстання 1863 г. Кастусём Каліноўскім. Шосты нумар яго "Мужыцкай праўды" быў цалкам прысвечаны ўніяцтву. Каліноўскі заклікаў пакінуць "схізму і пераходзіць на праўдзівую веру дзядоў і прадзедаў". Аднак гэты заклік не меў шырокай падтрымкі, і падаўленне паўстання надоўга знішчыла надзею на адраджэнне на Беларусі ўніяцтва.

Ліквідацыя ўніяцкай царквы ў Расійскай імперыі не спыніла імкнення да яе адраджэння, бо з ёю беларуская інтэлігенцыя звязвала лёс роднай культуры і лічыла асноўнай прычынай скасавання уніі тое, што яна была адной з галоўных перашкод на шляху русіфікацыі Беларусі. Характэрна, што адразу ж пасля Полацкага сабора, у тым жа 1839 г., у цэрквах забараняецца гаварыць казанні па-беларуску.

Калі на пачатку XX ст. ўзмацняецца беларускі адраджэнскі рух, адразу ж уздымаецца пытанне аб уніі. У 1908 г. браты Луцкевічы завязваюць кантакт з украінскім уніяцкім мітрапалітам Шэптыцкім, і ўзнікае праект узнаўлення ўніі на Беларусі. Знайшліся і святары, гатовыя правесці патрэбную працу, але царскі ўрад гэтага не дапусціў.

Толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, калі сярод часткі рускага праваслаўнага духавенства пачалі выяўляцца ўніяцкія настроі, часовы ўрад дазволіў склікаць у Петраградзе сінод грэка-каталіцкай царквы.

Аднак, ва ўмовах бальшавіцкага рэжыму ў Расіі спынілася нармальнае жыццё цэркваў. У такім становішчы ўніяцкая праца была магчыма толькі ў Польшчы, да якой пасля Рыжскага дагавору адышла значная частка беларускіх і ўкраінскіх абшараў з 4-мільённым насельніцтвам. У выніку гэтай працы на тэрыторыі Заходняй Беларусі перад вайной было каля трыццаці ўніяцкіх прыходаў з прыкладна 25 тыс. вернікаў.

Пасля вызвалення тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад немцаў савецкі ўрад пачаў гвалтоўную і жорсткую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ліквідацыю уніі. Уніяцкае духавенства абвінавачвалася ў тым, што яно з’яўляецца агентам Ватыкана, саюзнікам украінскіх “буржуазных” нацыяналістаў. У сакавіку 1946 г. пад непасрэдным кантролем Міністэрства дзяржаўнай бяспекі ў Львове быў праведзены сабор уніяцкіх біскупаў, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі уніі і пераходзе ўсіх уніяцкіх прыходаў у склад Рускай праваслаўнай царквы. Ватыкан гэтага рашэння не прызнаў.

Новае адраджэнне ўніяцтва на Беларусі пачалося ўжо ў пасляперабудовачны час. У 1989 г. была арганізавана ўніяцкая суполка ў Гомелі, а ў 1990 г. у Мінску. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 15 уніяцкіх суполак. Ёсць уніяцкі кляштар у Полацку. Уніяцкая царква на Беларусі і Украіне называецца грэка-каталіцкай.

Уніяцтва на нашых землях мае цікавую гісторыю. Доўгі час яно з’яўлялася рэлігіяй асноўнай масы насельніцтва і аказала істотны ўплыў на беларускую культуру. Зараз уніятаў на Беларусі няшмат, у асноўным гэта прадстаўнікі нацыянальна дасведчанай інтэлігенцыі.

## 4.5. Пратэстанцтва

4.5.1. Узнікненне пратэнстанцтва.
4.5.2. Веравучэнне і культ пратэстанцтва.
4.5.3. Неапратэстанцкія цэрквы.

### 4.5.1. Узнікненне пратэстанцтва

Пратэстанцтва з’яўляецца другім па колькасці кірункам у хрысціянстве. Зараз яно налічвае 466 млн прыхільнікаў. Для яго характэрна высокая ступень раздробленасці, існуе каля 200 самастойных пратэстанцкіх напрамкаў.

Узнікла пратэстанцтва як вынік другога вялікага расколу ў хрысціянстве, які ў XVI ст. адбыўся ў каталіцкай царкве. Да ўзнікнення пратэстанцтва прывяло развіццё шырокага рэлігійнага, грамадска-палітычнага і сацыяльна-культурнага руху, які атрымаў назву Рэфармацыя (ад лац. *reformatio* – пераўтварэнне, выпраўленне). Яна адбывалася пад лозунгам выпраўлення каталіцкай царквы, якое разумелася пераважна як пазбаўленне ад усяго залішняга і шкоднага, што было прынесена ў яе рымскім кіраўніцтвам у час сярэдневякоўя і што не толькі не адпавядала евангельскім нормам, але і прама супярэчыла ім. Такім чынам, дзеячы Рэфармацыі заклікалі вяртацца да нормаў жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

першапачатковага хрысціянства і барацьбы са злоўжываннямі ў царкве.

Узнікненне Рэфармацыі было выклікана многімі прычынамі. Еўрапейскае грамадства ў цэлым і каталіцкая царква як яго частка знаходзіліся на адным з пераломных этапаў свайго развіцця і патрабавалі змен. Палітычная рэчаіснасць таго часу характарызавалася наяўнасцю Свяшчэннай Рымскай імперыі – складанага дзяржаўнага ўтварэння, межы якога пастаянна мяняліся, а адносіны паміж імператарам і мясцовымі правіцелямі былі даволі неакрэсленымі. Адчувалася, што стары характар кіравання не адпавядае новым умовам. Дзяржавы, якія складалі імперыю, знаходзіліся ў працэсе дынамічнага развіцця. Іх правіцелі імкнуліся атрымаць як мага большую незалежнасць ад імператара, захаваўшы пры гэтым раўнавагу паміж сваёй уладай і ўладай мясцовых саслоўна-прадстаўнічых органаў.

Многія гарады ў гэты час ужо ператварыліся ў вялікія гандлёвыя і фінансавыя цэнтры, але іх палітычная вага заставалася нязначнай. Таму ўзмацняўся канфлікт паміж гарадамі і старымі феадальнымі структурамі кіраўніцтва, які, урэшце рэшт, зайшоў у тупік. Дамінуючы ў палітыцы, князі і рыцары былі ў поўнай эканамічнай залежнасці ад бюргерства. Развіццё грашовага абароту вяло не толькі да аднаснага абяднення старых пануючых слаёў грамадства, але і прымушала іх, у сваю чаргу, узмацняць ціск на сялян і гараджан, многія з якіх у выніку апынуліся ў абсалютна немагчымым стане.

У цэнтры еўрапейскага сацыяльнага жыцця таго часу знаходзілася каталіцкая царква. Яна была буйнейшым землеўладальнікам, кантралявала адукацыю, валодала ўласнай юрысдыкцыяй, зацвярджала прынцыпы, на якіх будаваліся кіраванне, арганізацыя грамадства, шлюб і сям’я. Такім чынам, яна выконвала ролю сацыяльнага інстытута, які забяспечвае ідэалагічнае абгрунтаванне і санкцыю існуючага парадку рэчаў.

Натуральна, што агульная незадаволенасць павінна была накіравацца на каталіцкую царкву. Многія з удзельнікаў грамадскіх працэсаў таго часу імкнуліся вырашыць праблемы за яе кошт. Бюргерства бачыла ў царкве апору феадальных улад і кансерватыўны інстытут наогул, які рэгламентаваў метады гаспадарання і перашкаджаў свабоднаму вырашэнню эканамічных задач. Князі і дваранства ўспрымалі яе як моцнага канкурэнта, маёмасць і правы якога яны не супраць былі б прысвоіць. Сяляне і бедныя гараджане былі незадаволены існуючым становішчам наогул і каталіцкай царквой у прыватнасці.

Былі і духоўныя прадумовы Рэфармацыі. Недахопы ў жыцці царквы, выпадкі амаральнасці і злоўжывання з боку духавенства

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выкрываліся і раней. Папярэднікамі Рэфармацыі з'яўляюцца прафесар Оксфардскага ўніверсітэта Джон Уінкліф (1320–1384 гг.) і прафесар Пражскага ўніверсітэта Ян Гус (1369–1415 гг.).

Д. Уінкліф выступаў супраць грашовых пабораў рымскіх пап з Англіі, выказваў сумненні ў праве царквы адпускаць грахі і выдаваць індульгенцыі, настойваў на безумоўным прыярытэце Свяшчэннага Пісання над Свяшчэнным Паданнем, адмаўляў ідэю, што ў працэсе таінства прычашчэння рэальна адбываецца пераўтварэнне хлеба і віна ў цела і кроў Хрыста. З падобнымі ідэямі выступаў і Ян Гус, які патрабаваў адмаўлення царквы ад яе багаццяў, куплі і продажу царкоўных пасад, забароны на гандаль індульгенцыямі, пераўтварэння дзейнасці царквы па вобразу першых хрысціянскіх суполак. За свае погляды Я. Гус быў у 1415 г. асуджаны царкоўным судом і спалены.

Трэба адзначыць, што напярэдадні Рэфармацыі знешне каталіцкая царква была даволі жыццяздольнай і карысталася лаяльнасцю насельніцтва. У гарадах пастаянна выступалі прапаведнікі, дзякуючы вынаходніцтву кнігадрукавання пашырыліся магчымасці для распаўсюджання духоўнай літаратуры. Вельмі папулярным было паломніцтва да святых месцаў, асабліва ў Рым. Аднак таксама стала відавочнай неадпаведнасць духоўнага ўзроўню царквы патрабаванням часу. Вышэйшае духавенства па сваім сацыяльным паходжанні належала да знаці і разглядала царкоўныя пасады як крыніцу багацця і ўлады. Апроч таго, у гэты час у кіраўніцтве каталіцкай царквы адбываецца маральны заняпад. Шмат у чым гэта звязана з вынікамі Адраджэння, калі сярод еўрапейскіх кіруючых колаў пачынае распаўсюджвацца антычная мараль, якая дапускала больш вольныя паводзіны, чым хрысціянская, і з пункта погляду апошняй была амаральнай. Маральная разбэшчанасць закранула і кіраўніцтва царквы. Як яскравы прыклад можна прывесці Папу Аляксандра VI (1492–1503 гг.), які адкрыта хваліўся сваімі палюбоўніцамі і меў ад іх 10 дзяцей. Асабліва дрэнную славу атрымаў яго сын Чэзарэ Бо́рджыа, якому Папа даў тытул кардынала. Ён валодаў каварным і неўтаймаваным норавам, асабіста забіваў сваіх ворагаў, рабіў у Рыме жахлівыя оргіі. Усё гэта выклікала абурэнне вернікаў.

Пачынальнікам Рэфармацыі з'явіўся нямецкі прафесар тэалогіі манах Марцін Лютэр (1483–1546 гг.). Падставай для яго выступлення паслужыў гандаль індульгенцыямі. У 1517 г. каля горада Вітэнберга, дзе жыў М. Лютэр, гандляваў індульгенцыямі манах-дамініканін Тэцэль, які актыўна рэкламаваў свой тавар і сцвярджаў, што індульгенцыя – найбольш надзейны пропуск у рай. Прыхаджане М. Лютэра, паверыўшы ў адпушчэнне грахоў праз індульгенцыі, пачалі прапускаць богаслужэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Усё гэта прымусіла М. Лютэра, які быў глыбока веруючым чалавекам, задумацца аб сутнасці апраўдання грэшніка і хрысціянскай веры ў цэлым. Вынікі гэтых разважанняў у выглядзе 95 тэзісаў М. Лютэр абнародаваў 31 кастрычніка 1517 г. Яны былі палемічна завострыны супраць гандлю індульгенцыямі. Сэнс іх зводзіўся да сцвярджэння, што выключна праз глыбокае пакаянне і дзеянне міласці Божай чалавек атрымлівае сапраўдную веру, якая толькі і можа апраўдаць чалавека перад Богам. Што тычыцца добрых спраў (знешніх праяў набожнасці), да якіх адносіцца і набыццё індульгенцый, то яны пазбаўлены ўсякай каштоўнасці, а нават і шкодныя. Значэнне ўсяго знешняга боку культу і самой царквы, прызванай яго адпраўляць, тым самым ставілася пад пытанне.

Спачатку М. Лютэр не хацеў уносіць раскол у царкву, а толькі прапаноўваў абмеркаваць некаторыя пытанні, але паступова яго выказванні рабіліся ўсё больш радыкальнымі. Выступаючы на адным з публічных дыспутаў, ён заявіў, што падтрымлівае некаторыя з ідэй Я. Гуса і лічыць, што ўлада Папы і сабораў не можа распаўсюджвацца на душы хрысціян. У адказ на гэта Папа Леў X адлучыў М. Лютэра ад царквы і пракляў яго. Аднак ідэі М. Лютэра ўжо атрымалі шырокую падтрымку ў Германіі, перш за ўсё з боку князёў, абапіраючыся на якую, 10 студзеня 1520 г. ён публічна спаліў папскую булу аб сваім адлучэнні і выпусціў серыю рэзкіх артыкулаў, накіраваных супраць каталіцкай царквы, у якіх адверг панаванне царкоўнай іерархіі над свецкай уладай і прапанаваў падпарадкаваць царкву дзяржаве. Група нямецкіх князёў правяла ў сваіх уладаннях рэформы ў духу ідэй М. Лютэра. У 1526 г. Шпеерскі рэйхстаг (сход) па патрабаванні лютэран прыняў пастанову аб праве кожнага нямецкага князя выбіраць рэлігію для сябе і сваіх падданых. Аднак другі Шпеерскі рэйхстаг у 1529 г. адмяніў пад ціскам імператара гэтую пастанову. У адказ князі-лютэране заявілі пратэст. Менавіта з гэтай падзеяй звязана ўзнікненне тэрміна “пратэстанцтва”, які сталі ўжываць для абазначэння кірункаў у хрысціянстве, звязаных па сваім паходжанні з Рэфармацыяй.

Пасля дзвюх войнаў з каталікамі, якія ўзначальваў імператар, нямецкія князі-лютэране дабіліся прызнання права ўладкоўваць рэлігійнае жыццё ў сваіх землях. Па Аўгсбургскім мірным дагаворы, заключаным ў 1555 г., каталіцтва і лютэранства абвяшчаліся аднолькава дапусцімымі. Іншыя канфесіі забараняліся.

Другі кірунак Рэфармацыі ў Германіі ўзначаліў Томас Мюнцэр (каля 1490–1525 гг.). Спачатку ён быў прыхільнікам і паслядоўнікам М. Лютэра. Аднак пазней у веравучэнні і сацыяльна-эканамічных пытаннях Т. Мюнцэр пераходзіць на больш радыкальныя пазіцыі. У яго

РЭПОЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРЫНЫ

поглядах пераважаюць містычныя матывы, ён выступае супраць царкоўнай іерархіі, рацыянальных тэалагічных сістэм “самаўпэўненых фарызееў, біскупаў і кніжнікаў” і супрацьпастаўляе ім непасрэдную “веру сэрца”. Т. Мюнцэр лічыў, што крыніцай ісціны для чалавека з’яўляецца Святы Дух, які дзейнічае ў душы. Ён прапаведаваў роўнасць паміж усімі людзьмі як дзецьмі адзінага Бога. З гэтага вынікала патрабаванне грамадзянскай роўнасці і знішчэння, прынамсі, найбольш значных кантрастаў у маёмасці. Т. Мюнцэр выступіў з ідэяй сацыяльнай справядлівасці за ўраўняльнае альбо калектыўнае карыстанне зямлёй. Яго ідэалам з’яўлялася пабудова Царства Божага на Зямлі. Пад гэтым лозунгам адбылося паўстанне і пачалася Сялянская вайна ў Германіі (1524–1525 гг.), якая скончылася паражэннем сялян і гібеллю Т. Мюнцэра. М. Лютэр рэзка выступіў супраць паўстанцаў і заклікаў князёў да бязлітаснай расправы з імі.

У першай палове XVI ст. Рэфармацыя хутка распаўсюджваецца за межы Германіі. Адным з яе цэнтраў робіцца Швейцарыя. Спачатку на чале Рэфармацыі тут стаяў прыходскі свяшчэннік Ульрых Цвінглі (1484–1531 гг.). Яго вучэнне вельмі блізкае да лютэраўскага, але мае больш рацыяналістычны і паслядоўны характар. У пытанні аб пабудове царквы У. Цвінглі заняў не пракняжацкую, як М. Лютэр, а дэмакратычную пазіцыю. Ён лічыў, што толькі Хрыстос з’яўляецца вечным першасвяшчэннікам, а Папы незаконна прысвоілі сабе гэты тытул. Хрыстос ёсць і адзіны заступнік за людзей перад Богам. Святыя і свяшчэннаслужыцелі – залішнія пасрэднікі. Манаства, знешнія прызнакі духоўнага сану, бясшлюбнасць духавенства, чысцілішча, індульгенцыі, іконы, алтары, свечкі, музыку У. Цвінглі цалкам адмаўляў. Царкву ён разумеў як суполку святых, на чале якой стаіць непасрэдна Хрыстос. Дзяржава не можа дыктаваць царкве сваю волю. Наадварот, царква павінна ацэньваць адпаведнасць дзяржаўнай улады хрысціянскім ідэалам.

Частка швейцарскіх кантонаў падтрымала ідэі У. Цвінглі, але большасць з іх засталіся каталіцкімі. Войны паміж католікамі і пратэстантамі 1529 і 1531 гг. прывялі да вырашэння пытання па нямецкім ўзоры – улады кантонаў атрымалі права на выбар рэлігіі. Сам У. Цвінглі загінуў падчас другой з гэтых войнаў.

Справу У. Цвінглі ў Швейцарыі працягваў французскі багаслоў Жан Кальвін (1509–1564 гг.), які пасля смерці М. Лютэра стаў на чале Рэфармацыі. Падзяляючы думку М. Лютэра аб апраўданні толькі верай, Ж. Кальвін з асаблівай рэзкасцю падкрэсліў, што сама вера – гэта свабодны дар Бога, атрыманне якога не залежыць ад чалавечых намаганняў. Бог па сваёй уласнай волі з самага пачатку прадвызначыў адных людзей да выратавання, а другіх – за пагібелі. Сапраўдная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і нябачная царква і ёсць саюз абраных. Аднак, паколькі шляхі Гасподнія неспазнаныя і ніхто не можа ведаць свайго лёсу, то ўсім трэба падтрымліваць гатоўнасць да высокага абрання. Бачная царква – гэта саюз для падтрымання такой гатоўнасці. Адсюль вынікае яе права і абавязак – дабівацца ад сваіх членаў правільных поглядаў і паводзін, выкарыстоўваючы адлучэнне, пакаянне і іншыя віды пакаранняў.

Пасяліўшыся ў Жэневе, Ж. Кальвін стаў не толькі на чале царквы, але і самога горада, ператварыўшы яго ў адзіную рэлігійную суполку, цэнтр пратэстанцкай адукацыі і прытулак для адзінаверцаў. Свае рэформы ён праводзіў жорстка і паслядоўна. Была ўведзена дробная рэгламентацыя жыцця гараджан: нельга было гучна смяяцца на вуліцы, насіць у буднія дні светлае адзенне і ўпрыгожванні, забараняліся п’янства і абжорства. Парушальнікі караліся штрафам і турэмным зняволеннем. За больш цяжкія злачынствы было смяротнае пакаранне. Так, у 1553 г. па абвінавачванні ў ерасі ў Жэневе быў спалены іспанскі вучоны Мігель Сервет.

Своеасаблівы характар Рэфармацыя набыла ў Англіі, дзе яе ўзначаліў сам кароль Генрых VIII (1519–1577 гг.). Спачатку ён выступаў супраць пратэстанцтва і нават атрымаў ад Папы тытул “абаронца веры”. Потым Генрых VIII вырашыў развесціся са сваёй жонкай Кацярынай Арагонскай і ажаніцца з яе фрэйлінай прыгажуняй Ганнай Боляйн, на што Папа не даў сваёй згоды. У адказ Генрых пачаў рэформу царквы. Па яго загаду ў 1533 г. англійскі парламент прыняў закон аб рэлігійнай незалежнасці Англіі ад Папы і зацвердзіў вярхоўныя правы ў царкоўных справах за каралём. У 1534 г. Генрых VIII абвясціў сябе кіраўніком англійскай царквы. У Англіі былі зачынены ўсе манастыры, а іх маёмасць канфіскавана на карысць каралеўскай улады. Пры гэтым было абвешчана аб захаванні каталіцкіх абрадаў і дагматаў.

Рэформа Генрыха VIII прывяла да крывавых сутыкненняў у Англіі паміж пратэстантамі і католікамі, якія доўжыліся да другой паловы XVI ст. Пры каралеве Елізавеце (1558–1603 гг.) канчаткова складваецца дзяржаўная англіканская царква, якая ў сваім веравучэнні і кульце заняла прамежкавае становішча паміж каталіцтвам і кантынентальным пратэстанцтвам. Католікі ў Англіі таксама атрымалі права на існаванне.

### 4.5.2. Веравучэнне і культ пратэстанцтва

Як ужо адзначалася, у пратэстанцтве ёсць вельмі шмат напрамкаў, якія даволі часта ставяцца адзін да другога вельмі непрымірыма. Нягледзячы на гэта, можна вылучыць агульныя рысы ў іх веравучэнні і кульце.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Пратэстанцкае веравучэнне грунтуецца на трох асноўных палажэннях, выпрацаваных Марцінам Лютэрам у яго палеміцы з каталіцтвам:

1. Аб апраўданні адзінай верай незалежна ад спраў. У каталіцтве і праваслаўі прызнаецца важнасць для выратавання добрых учынкаў (устрыманне ад грахоў, выконванне запаведзяў, наведванне царквы, малітвы, дапамога бедным і г. д.), якія з'яўляюцца вынікам веры. М. Лютэр адзначыў, што ўсе гэтыя ўчынкі можна рабіць чыста фармальна, не маючы веры, і адмовіў іх ролю ў выратаванні. Ён сцвярджаў, што чалавек можа верыць у Бога і рабіць усё, што хоча.

Прыняцце палажэння аб апраўданні адзінай верай з'яўляецца вынікам прызнання пратэстанцтвам фундаментальнай сапсаванасці прыроды чалавека першародным грахом. У выніку грэхападзення чалавек страціў здольнасць самастойна рабіць дабро. Усе тыя добрыя справы, якія ён робіць, з'яўляюцца вынікам дапамогі Бога і не могуць быць пастаўлены чалавеку ў заслугу. Таму праз добрыя справы атрымаць выратаванне немагчыма, яно можа разглядацца толькі як вынік выкупляльнай ахвяры Ісуса Хрыста, у якую трэба шчыра верыць.

З пункта погляду пратэстанцтва, веруючы чалавек – гэта той, хто асэнсоўвае грахоўнасць сваёй прыроды, і таму звяртаецца да Бога з малітвай аб выратаванні. Гэтая малітва павінна быць падмацавана добрасумленным выкананнем сваіх абавязкаў, бо па ступені такой добрасумленнасці Бог судзіць аб сіле веры і жаданні атрымаць выратаванне. Для пратэстанцтва любы від чалавечай дзейнасці (грамадзянскай, працоўнай, сямейнай і г. д.) набывае рэлігійны сэнс і разглядаецца як форма служэння Богу. Мірскую дзейнасць пратэстанцтва разглядае з пазіцый рэлігійнага прызвання – выкананне чалавекам сваіх абавязкаў лічыцца асноўнай задачай жыцця хрысціяніна.

Вынікам палажэння аб прынцыповай сапсаванасці прыроды чалавека грахом і апраўданні яго толькі верай у выкупляльную ахвяру Хрыста з'яўляецца вельмі важнае для пратэстанцтва вучэнне аб прадвызначэнні. Згодна з ім, кожны чалавек яшчэ да свайго нараджэння прадвызначаны Богам да выратавання альбо да асуджэння. Але ніхто не можа ведаць аб сваім лёсе, і таму трэба верыць у міласэрнасць Бога і спадзявацца на сваё выратаванне. Менавіта вера і надзея – дары Бога і паказчык таго, што чалавек, які іх мае, будзе выратаваны. Таксама аб сваёй прадвызначанасці да выратавання можна здагадацца па поспехах у практычнай дзейнасці. Калі чалавек паспяховы, значыць, Бог прыхільны да яго і дае яму ажыццявіць сваё прызванне.

2. Біблія з'яўляецца адзінай крыніцай веравучэння. Кожны вернік мае права і нават абавязаны чытаць і тлумачыць Біблію. Да гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў каталіцтве права чытаць Біблію і тлумачыць яе змест малі толькі свяшчэннікі. Яна выдавалася на лацінскай мове, і не ўсе вернікі маглі яе чытаць. М. Лютэр пераклаў Біблію на нямецкую мову. Ён прысвяціў гэтай працы 12 гадоў, набыў шмат хвароб ад сядзячага вобраза жыцця, але стварыў выдатны пераклад. Таксама і ў іншых краінах пратэстанты актыўна пачынаюць перакладаць і выдаваць Біблію на нацыянальных мовах.

Абвясціўшы Біблію адзінай крыніцай веравучэння, М. Лютэр тым самым адмовіў боскі аўтарытэт Свяшчэннага Падання, якое разглядаў як вынік чыста чалавечай дзейнасці. Такі падыход быў абумоўлены шмат у чым не столькі багаслоўскімі, колькі арганізацыйнымі аспектамі Рэфармацыі. Неабходна было абгрунтаваць існаванне новых пратэстанцкіх цэркваў, а для гэтага абвясціць існуючую хрысціянскую традыцыю створанай не Богам, а людзьмі і тым самым атрымаць права на сваю ўласную дзейнасць. Аднак цалкам адмовіцца ад традыцыі і абапірацца ў сваім веравучэнні толькі на Біблію пратэстантам не ўдалося. Ролю Свяшчэннага Падання ў пратэстанцтве сталі выконваць творы М. Лютэра, У. Цвінглі, Ж. Кальвіна і іншых дзеячаў Рэфармацыі.

3. <u>Аб усеагульным святарстве.</u> Адной з асноўных задач Рэфармацыі было пераадоленне злоўжыванняў з боку каталіцкай іерархіі і памяншэнне яе ўплыву на грамадскае жыццё. Пратэстанты ставілі сваёй мэтай стварэнне простай і таннай царквы, узорам якой з'яўлялася для іх жыццё першых хрысціянскіх суполак. Яны лічылі, што кожны чалавек праз сваю веру непасрэдна зносіцца з Богам, і таму адмаўлялі каталіцкі дагмат аб выратавальнай ролі царквы. Згодна з пратэстанцтвам, царкоўная іерархія, свяшчэннікі і манахі непатрэбны для справы выратавання. Кожны хрысціянін праз сваё хрышчэнне атрымлівае права на святарства, ён можа прапаведваць і выконваць багаслужэнні. У пратэстанцтве ёсць свяшчэннаслужыцелі, але іх статус прынцыпова іншы, чым у праваслаўі і каталіцтве. Ад іншых членаў пратэстанцкіх суполак яны адрозніваюцца толькі сваёй прафесійнай падрыхтоўкай у галіне тлумачэння Свяшчэннага Пісання, адпраўленні абрадаў і г. д. Сваю дзейнасць яны разглядаюць як службу, на якую іх упаўнаважыла суполка. Кожны дарослы пратэстант мае права і абавязак прымаць актыўны ўдзел у вырашэнні праблем сваёй рэлігійнай арганізацыі. У пратэстанцтве адменены цэлібат, бо лічыцца, што ён не прыносіць ніякай карысці і нават шкодны.

Адмаўляючы выратавальную ролю царквы, дзеячы Рэфармацыі імкнуліся зрабіць культ больш простым і танным. Багаслужэнне было зведзена галоўным чынам да чытання Бібліі, казання, спявання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

псалмоў. Была скарочана колькасць таінстваў, адмоўлены малітвы за памерлых, шанаванне святых і святы ў іх гонар. Храмы рабіліся больш простымі без пышнага ўбрання, з іх былі зняты званы.

У веравучэнні і кульце пратэстанцкіх цэркваў таксама ёсць некаторыя адрозненні[1].

Англіканства з'яўляецца найбольш кампрамісным варыянтам пратэстанцтва, у яго веравучэнні і кульце спалучаюцца каталіцкія і пратэстанцкія элементы. Так палажэнне аб выратавальнай ролі царквы дапаўняецца палажэннем аб выратаванні асабістай верай. Багаслужэнне ў англікан нагадвае каталіцкае. Прызнаюцца ўсе сем таінстваў. Дакументамі, у якіх выкладзены веравучэнне і культ англіканства, з'яўляюцца "39 артыкулаў" (зацверджаны ў 1571 г.) і "Кніга агульных малітваў" (зацверджана ў 1662 г.). Англіканская царква мае епіскапальную пабудову, яе іерархія прэтэндуе на пераемнасць улады ад апосталаў. Англіканства распаўсюджана ў Англіі і яе былых калоніях. Зараз налічваецца 25 аўтаномных англіканскіх цэркваў, кіраўнікі якіх прыкладна раз у 10 гадоў збіраюцца на Ламберцкіх канферэнцыях. У Велікабрытаніі англіканская царква з'яўляецца дзяржаўнай, кіруе ёю кароль (зараз каралева Елізавета II). Духоўным кіраўніком усіх англікан Велікабрытаніі і старшынёй Ламберцкіх канферэнцый з'яўляецца архіепіскап Кентэрберыйскі. Частка епіскапаў займае месцы ў палаце лордаў парламента краіны. Усяго ў свеце зараз налічваецца каля 70 млн англікан.

Асноўныя палажэнні веравучэння лютэранства выкладзены ў кнізе "Аўгсбургскае веравызнанне", якая складзена вучнем Лютэра Філіпам Меланхтонам у 1530 г. Прызнаецца таксама Нікеа-Канстанцінопальскі Сімвал веры. У кульце лютэран існуе тры таінствы: хрышчэнне, прычашчэнне і споведзь, але апошняя ў якасці таінства прызнаецца не ўсімі. Канфірмацыя, шлюб, сабораванне разглядаюцца як простыя абрады. Лютэранскімі суполкамі кіруе савет на чале з пастарам. У лютэран ёсць епіскапы, якія пасвячаюць пастараў. Пастары з'яўляюцца арганізатарамі рэлігійнага жыцця, тлумачальнікамі Свяшчэннага Пісання, прапаведнікамі і маральнымі настаўнікамі. Лютэранства распаўсюджана ў такіх краінах, як Германія, Швецыя, Данія, Нарвегія, Фінляндыя, ЗША. У Аўстрыі, Венгрыі, Францыі лютэранскую царкву таксама называюць евангелічнай. Зараз у свеце прыкладна 75 млн лютэран і 192 лютэранскія царквы. Каля 50 млн вернікаў аб'яднаны ў Сусветны лютэранскі саюз, які функцыянуе з 1947 г. На тэрыторыі Беларусі зараз ёсць 27 лютэранскіх суполак.

---

[1] Асаблівасці веравучэння і культу некаторых неапратэстанцкіх цэркваў будуць разгледжаны ў наступным пытанні.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Найбольш радыкальныя змены каталіцкага веравучэння і культу адбыліся ў кальвінізме. Адзінай крыніцай веравучэння лічыцца Біблія. У адрозненне ад лютэранства няма агульнаабавязковага Сімвала веры. Аўтарытэтнымі для прапаведнікаў з'яўляюцца кнігі Ж. Кальвіна: "Настаўленні ў хрысціянскай веры" (1536–1559 гг.), "Царкоўныя ўстанаўленні", "Жэнеўскі катэхізіс" (1545 г.), а таксама "Шатландскае веравызнанне" (1560 г.) і "Вестмінсцерскае вызнанне веры" (1547 г.).

Асаблівасцю веравучэння кальвінізму з'яўляецца паслядоўнае правядзенне палажэння аб прадвызначанасці Богам адных людзей да выратавання, другіх – да асуджэння. Ускосным сведчаннем богаабранасці могуць служыць прафесійныя поспехі чалавека. Гэта стымулявала развіццё капіталістычных адносін і надавала ім вышэйшую санкцыю. Заахвочванне накапляльніцтва спалучалася з пропаведдзю мірскога аскетызму ў асабістым жыцці (абавязковае наведванне царквы і выкананне жорсткіх маральных нормаў, заклікаў не ленавацца, эканоміць сродкі, але траціць іх не на сябе, а пускаць у абарот і г. д.).

У кальвінізме значна спрошчаны культавая дзейнасць і рэлігійная арганізацыя. Прызнаецца хрышчэнне і прычашчэнне, але яны страцілі значэнне таінстваў і разумеюцца як сімвалы блізкасці да Ісуса Хрыста і вернікаў адзін да аднаго. У храмах адсутнічаюць алтар, арган, іконы, свечкі і г. д. На пярэднім плане стаіць вялікі крыж, а побач на ўзвышэнні – кафедра, з якой прапаведуе пастар. У кальвінізме існуе дэмакратычнае кіраванне царквой: незалежныя адна ад другой суполкі (кангрэгацыі) узначальваюцца выбарным органам – кансісторыяй, куды ўваходзяць пастар, дыякан і прэсвітар (старэйшына). Больш высокім органам з'яўляецца правінцыяльны сінод альбо асамблея, які складаецца з дэлегатаў ад кансісторый. На нацыянальным узроўні дзейнічае нацыянальны сінод. Рашэнні сінодаў не з'яўляюцца абавязковымі для кангрэгацый.

Зараз кальвінісцкія цэрквы ў кантынентальнай Еўропе называюць рэфармацкімі, а ў Велікабрытаніі, ЗША і некаторых былых англійскіх калоніях – прэсвітарыянскімі. Існуе Сусветны альянс рэфармацкіх цэркваў, які аб'ядноўвае каля 40 млн чалавек з больш чым 81 тыс. кангрэгацый.

У сучасны момант у свеце налічваецца звыш 50 млн кальвіністаў. Найбольш моцныя кальвінісцкія цэрквы дзейнічаюць у Нідэрландах, ЗША, Германіі, Францыі, Шатландыі і Паўднёва-Афрыканскай рэспубліцы. На Беларусі ёсць рэфармацкая суполка ў Мінску і прэсвітарыянская ў Магілёве.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.5.3. Неапратэстанцкія цэрквы

Мы ўжо казалі, што для пратэстанцтва характэрна высокая ступень раздробленасці. Абумоўлена гэта тым, што з самага пачатку, каб абгрунтаваць свой разрыў з каталіцтвам, дзеячы Рэфармацыі адмовілі боскі аўтарытэт Свяшчэннага Падання і абвясцілі права і абавязак кожнага верніка самастойна тлумачыць Біблію. А паколькі пунктаў погляду можа быць шмат, то пачаўся працэс узнікнення новых пратэстанцкіх арганізацый, кожная з якіх прапанавала сваё разуменне Свяшчэннага Пісання, якое яна лічыла адзіна аўтэнтычным.

У наш час налічваецца каля 200 самастойных пратэстанцкіх напрамкаў, тры з іх – лютэранства, кальвінізм і англіканства – з’яўляюцца класічнымі пратэстанцкімі цэрквамі. У дачыненні да большасці астатніх ужываецца тэрмін “неапратэстанцкія цэрквы”, каб падкрэсліць, па-першае, тое, што яны ўзніклі пазней, і, па-другое, іх адрозненні ад класічнага пратэстанцтва.

Мы разгледзім толькі некаторыя з тых неапратэстанцкіх цэркваў, якія дзейнічаюць зараз на тэрыторыі Беларусі.

<u>Баптысты.</u> Узніклі ў пачатку XVII ст. у Англіі. Незалежна адзін ад аднаго з’явіліся два напрамкі: агульныя і партыкулярныя баптысты. Першыя лічаць, што смерць Хрыста выкупіла грахі ўсіх людзей, а не толькі прадвызначаных да выратавання, і лёс чалавека залежыць ад яго свабоднай волі. Першая суполка агульных баптыстаў была створана ў 1609 г. у Амстэрдаме англійскімі кальвіністамі, якія ў 1611 г. вярнуліся на радзіму і прынеслі туды новае вучэнне. Партыкулярныя баптысты падзяляюць вучэнне Ж. Кальвіна аб пачатковым прадвызначэнні Богам кожнага чалавека да выратавання альбо да асуджэння. Першая суполка партыкулярных баптыстаў узнікла ў Англіі ў 1638 г. У далейшым дамінуючае палажэнне атрымалі партыкулярныя баптысты, а агульныя зараз налічваюць толькі некалькі соцень тысяч прыхільнікаў. У Англіі баптысты належалі да ліку дысідэнтаў (ад лац. *dissidens* – разнагалоссе, разыходжанне ў поглядах), знаходзіліся ў апазіцыі да дзяржаўнай англіканскай царквы і праследаваліся. Гэта прымушала іх эмігрыраваць у Амерыку, якая ў тыя часы была прытулкам для ўсіх уцекачоў з Еўропы. Менавіта ў Амерыцы баптызм атрымаў развіццё, асабліва сярод неграў. Колькасць прыхільнікаў баптызму інтэнсіўна расла, і ў далейшым ён пачынае распаўсюдзіўся ў іншыя краіны свету.

Само слова “баптызм” паходзіць ад грэчаскага дзеяслова “*baptizo*” – “акунаць”, “хрысціць у вадзе”. З хрысціянскіх таінстваў баптысты прызнаюць хрышчэнне і прычашчэнне, але лічаць іх простымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абрадамі, якія сведчаць аб веры. Верыць жа можа толькі той, каго Бог прадвызначыў да выратавання. Баптысты не прызнаюць хрышчэння ў дзіцячым узросце і хрысцяць дарослых. Таму, калі ў іх суполку жадае ўступіць чалавек, які быў хрышчаны ў маленстве, яго перахрышчваюць. Баптысты лічаць, што хрышчэнне павінна быць свядомым актам, таму яму папярэднічае перыяд падрыхтоўкі, які доўжыцца не менш года. Чалавек ходзіць на малітоўныя сходы, вывучае Біблію, выконвае асобныя даручэнні. Потым з ім размаўляюць больш вопытныя члены суполкі, і калі ўпэўніваюцца, што ён канчаткова стаў на шлях веры, яго дапускаюць да хрышчэння. Папярэдне чалавек павінен яшчэ адкрыта пакаяцца на сходзе суполкі ў сваіх грахах. Хрысцяць баптысты звычайна у адкрытых вадаёмах: рэках, азёрах, сажалках. Пры вялікіх малітоўных дамах ёсць спецыяльныя памяшканні для хрышчэння – баптыстэрыі, але на Беларусі іх няма. Абрад хрышчэння часцей за ўсё робіцца над групай людзей. Яны пераапранаюцца ў спецыяльнае белае адзенне, потым разам з прэсвітарам заходзяць у ваду, і ён, кажучы малітву, тройчы акунае кожнага з іх. Толькі пасля хрышчэння чалавек робіцца паўнапраўным членам суполкі і можа ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў.

Абрад хлебапераламлення (прычашчэння) баптысты робяць у першы тыдзень кожнага месяца. Ён асэнсоўваецца як нагадванне аб Тайнай Вячэры, калі Хрыстос святкаваў Пасху са сваімі вучнямі – і “пераламаў з імі хлеб”. У баптызме таксама ёсць асаблівыя рытуалы шлюбу і пахавання і абрад пасвячэння ў прэсвітары.

З хрысціянскіх святаў баптысты адзначаюць толькі тыя, якія прысвечаны Ісусу Хрысту: Пасху, Нараджэнне Хрыстова, Узнясенне і г. д. Ёсць і спецыфічнае свята – Дзень жніва (адзначаецца ў верасні). На ім вернікі выказваюць падзяку Богу за ўсё тое, што ён даў людзям за год, а таксама падводзяць вынікі сваёй місіянерскай дзейнасці, “духоўнага жніва”. Згодна з пратэстанцкім прынцыпам усеагульнасці святарства, кожны баптыст абавязаны прапаведаваць сваю веру. Тое, колькі чалавек ён прывёў у суполку, з’яўляецца паказчыкам яго служэння Богу.

Веравучэнне баптыстаў агульнапратэстанцкае. Адзінай яго крыніцай лічыцца Біблія, але прызнаецца таксама Апостальскі Сімвал веры. Асаблівая ўвага надаецца вучэнню аб выкупляльнай ахвяры Ісуса Хрыста, які сваімі пакутамі і смерцю ўжо выкупіў грахі кожнага чалавека. Каб чалавек далучыўся да гэтай ахвяры, ад яго патрабуецца толькі вера. Праз веру адпускаюцца грахі. У веруючага чалавека ўваходзіць Святы Дух і адбываецца яго адраджэнне. Пасля гэтага вернікі атрымліваюць адзін дух з Хрыстом, робяцца братамі і сёстрамі Хрыста і адзін аднаго.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Баптысты вераць у сваю богаабранасць, знешнім паказчыкам якой лічаць выкананне маральных абавязкаў перад Богам і блізкімі. Таму ў баптызме вельмі строгая мараль. Забаронена курэнне, ужыванне спіртных напіткаў, брыдкаслоўе, шлюбная здрада. Калі чалавек парушае маральныя нормы, робіцца выснова аб няшчырасці яго веры, і ён можа быць выключаны з суполкі. Адной з асноўных нормаў баптысцкай этыкі з'яўляецца абавязак сумленна працаваць. Для баптыстаў характэрна высокая ступень працавітасці і ўзаемадапамогі. Суполка баптыстаў – гэта згуртаваны калектыў аднадумцаў, якія падтрымліваюць адзін аднаго як матэрыяльна, так і духоўна.

Знешні і ўнутраны выгляд малітоўных дамоў баптыстаў вельмі просты. Адсутнічаюць іконы, распяцці, роспісы сцен, алтар, арган. На цэнтральнай сцяне звычайна напісана цытата з Біблії "Бог ёсць любоў" (I Іаан, 4, 8). Ёсць узвышэнне (сцэна), дзе стаіць кафедра, стол, за якім сядзяць кіраўнікі суполкі і госці, раяль, месца для хору.

Багаслужэнне ў баптыстаў адбываецца два-тры разы на тыдзень. На іх вернікі чытаюць Біблію, спяваюць псалмы, прапаведуюць.

Кіруе баптысцкай суполкай выбарны савет на чале з прэсвітарам. Апошні не валодае ніякімі асаблівымі правамі, не мае спецыяльнага адзення, выбіраецца суполкай, зарплату атрымлівае з яе ахвяраванняў. Ёсць абласныя саветы, якія складаюцца з прэсвітараў суполак і ўзначальваюцца старэйшымі прэсвітарамі вобласці, а таксама рэспубліканскі савет, які складаецца са старэйшых прэсвітараў абласцей і іх намеснікаў і ўзначальваецца старэйшым прэсвітарам рэспублікі. Перыядычна адбываюцца рэспубліканскія з'езды, на якіх абмяркоўваюцца найбольш важныя пытанні. Рашэнні абласных і рэспубліканскіх саветаў, а таксама з'ездаў не з'яўляюцца абавязковымі для суполак.

На тэрыторыі Беларусі баптызм з'яўляецца ў канцы XIX ст. Афіцыйная праваслаўная царква разглядала яго як шкодную секту, і баптыстаў праследавалі. Паляпшацца іх становішча пачало пасля ўказа аб верацярпімасці 1905 г. Савецкія ўлады таксама спачатку не асабліва праследавалі гэтыя арганізацыі, бо лічылі іх пацярпелымі ад царызму. Таму ў 20-х гг. назіраецца рост і актывізацыя іх дзейнасці. У пачатку 30-х гг. колькасць неапратэстанцкіх цэркваў дасягнула 89, але ў гэты час яны ўжо знаходзяцца на нелегальным становішчы. У 1937 г. у БССР усе цэрквы баптыстаў былі забаронены, а многія вернікі апынуліся ў лагерах. У 1942 г. з мэтай устанаўлення кантролю за дзейнасцю баптысцкіх суполак улады дазволілі ім легалізаваць сваю дзейнасць, і баптысты ў 1944 г. аб'ядналіся з блізкімі ім па веравучэнні евангельскімі хрысціянамі. Быў створаны Саюз евангельскіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хрысціян-баптыстаў на чале з Усесаюзным Саветам евангельскіх хрысціян-баптыстаў. У 1945 г. да яго далучылася частка хрысціян веры евангельскай (пяцідзесятнікаў), а ў 1963 г. – брацкія менаніты. У 1960 г. у гэтай арганізацыі адбыўся раскол. Непасрэднай падставай для яго паслужылі разасланыя Ўсесаюзным Саветам у мясцовыя суполкі "Інструктыўны ліст старэйшым прэсвітарам" і новае "Палажэнне аб суполках ЕХБ", згодна з якімі рэлігійная дзейнасць суполак рэзка абмяжоўвалася і яны падпарадкоўваліся жорсткаму кантролю ўлад. Частка вернікаў, у асноўным гэта былі евангельскія хрысціяне, асудзіла такую палітыку кіраўніцтва і выступіла з ініцыятывай склікання Ўсесаюзнага з'езда, каб абмеркаваць становішча. Тыя суполкі, якія іх падтрымалі, сталі называцца "ініцыятыўнікамі", або "незарэгістраванымі "баптыстамі", і жорстка праследаваліся ўладамі. Яны стварылі Саюз цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Такім чынам, з пачатку 60-х гг. на тэрыторыі Савецкага Саюза існавалі дзве паралельныя структуры: Саюз евангельскіх хрысціян-баптыстаў і Савет цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Гэтае ж становішча захоўваецца і зараз. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі дзейнічала 275 суполак евангельскіх хрысціян-баптыстаў.

Царква пяцідзесятнікаў узнікла ў пачатку XX ст. у ЗША. Яе назва паходзіць ад апісанай у Новым Запавеце падзеі, калі на пяцідзесяты дзень пасля Пасхі на апосталаў сышоў Святы Дух і яны атрымалі здольнасць размаўляць на іншых мовах, лячыць хворых і рабіць прароцтва. Сучаснае пяцідзесятніцтва, хаця ў яго і былі папярэднікі ў XIX ст., датуе сваё паходжанне з 7 гадзін вечара 31 снежня 1900 г. Перад гэтым пастар г. Тапека, штат Канзас, Чарльз Пархэм старанна вывучаў з групай сваіх студэнтаў Новы Запавет з мэтай разгадаць тайну сілы хрысціянства апостальскіх часоў. Студэнты нарэшце вырашылі, што гэта тайна змяшчаецца ў размаўленні на розных мовах, якое, як яны лічылі, заўсёды суправаджае прыняцце Святога Духа. Натхнёныя гэтай ідэяй, яны вырашылі маліцца, пакуль не атрымаюць хрышчэння Святым Духам і як знак яго – размаўлення на іншых мовах. 31 снежня 1900 г. яны маліліся ўвесь дзень без усякага выніку, пакуль адна маладая дзяўчына не сказала, што не хапае "ўскладання рук", Пархэм усклаў ёй на галаву рукі, і яна адразу ж пачала размаўляць на "невядомай мове". Гэта атрымала назву "хрышчэння Святым Духам". За наступныя дні было некалькі такіх хрышчэнняў, у тым ліку і самога Пархэма, і ўсе яны суправаджаліся гаварэннем на іншых мовах (гласалаліяй). Вельмі хутка рух пяцідзесятніцтва распаўсюдзіўся ў Амерыцы і выйшаў за яе межы. Зараз у свеце налічваецца больш за 50 млн пяцідзесятнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пяцідзесятнікі – тыпова неапратэстанцкая царква. Усе тыя рысы, якія мы назвалі, кажучы аб баптыстах, ёсць і ў пяцідзесятнікаў. Яны прызнаюць хрышчэнне і хлебапераламленне ў якасці абрадаў, якія сведчаць аб веры. Хрысцяць дарослых у адкрытых вадаёмах альбо басейнах. Хрышчэнне разглядаецца як свядомы акт, і таму яму папярэднічае перыяд падрыхтоўкі не менш года. Перад хрышчэннем чалавек каецца ў грахах. Абрад хлебапераламлення адбываецца ў пяцідзесятнікаў у першую нядзелю кожнага месяца як успамін аб Тайнай Вячэры. Раней хлебапераламленне суправаджалася абрадам мыцця ног, бо паводле Бібліі, Хрыстос на Тайнай Вячэры мыў ногі сваім вучням, каб паказаць любоў да іх. Пяцідзесятнікі мылі ногі адзін аднаму: мужчыны – мужчынам, жанчыны – жанчынам. Зараз гэты абрад сустракаецца толькі ў некаторых суполках.

Спецыфічным абрадам пяцідзесятнікаў з'яўляецца хрышчэнне Святым Духам, асноўным знакам якога лічыцца размаўленне на іншых мовах. Адбываецца яно па-рознаму. Звычайна чалавек, якога збіраюцца хрысціць Святым Духам, некалькі дзён посціцца, потым у час набажэнства ён разам з суполкай моліцца, просячы аб сыходжанні Святога Духа. Атмасфера пры гэтым эмацыянальна напружаная, што наогул характэрна для богаслужэнняў пяцідзесятнікаў, чалавек хоча пачаць размаўляць на іншых мовах, і даволі хутка ён пачынае выкрыкваць незразумелыя гукаслучэнні. Гэта з'яўляецца для іншых членаў суполкі знакам, што адбылося хрышчэнне Святым Духам. Загаварыць на іншых мовах можа і той чалавек, якога ў дадзены момант не хрысцяць, альбо гэта можа адбыцца дома, у працэсе індывідуальнай малітвы.

Самі пяцідзесятнікі згаджаюцца з тым, што іх "іншыя мовы" не зразумелыя нікому: ні таму, хто размаўляе, ні тым, хто слухае. Але яны сцвярджаюць, што размова адбываецца не з людзьмі, а з Богам, які гэтыя мовы разумее.

Лічыцца, што хрышчэнне Святым Духам адбываецца аднойчы, але дар размаўляць на іншых мовах застаецца, і чалавек можа ў далейшым ім карыстацца. Спасылаючыся на Біблію, пяцідзесятнікі называюць 9 дароў Святога Духа: слова мудрасці, слова ведаў, веру, дар лячэння, стварэнне цудаў, прароцтва, адрозненне духаў, розных моў, тлумачэння моў. У некаторых пяцідзесятніцкіх цэрквах ёсць людзі, якія тлумачаць мовы. Распаўсюджана практыка лячэння хворых пры дапамозе Святога Духа. Зрэдку гэта дае станоўчы эфект, як вынік псіхатэрапеўтычнага ўздзеяння. Распаўсюджаны сярод пяцідзесятнікаў і дар прароцтваў. Прарокі і прарочыцы ёсць у многіх суполках. Займаюцца яны не прадказаннем будучага, а паведамленнем пра волю Бога.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

У малітоўных дамах пяцідзесятнікаў няма ікон, крыжоў алтара, аргана і іншых прадметаў хрысціянскага культу.

Пяцідзесятнікі не з’яўляюцца адзінымі ў арганізацыйным плане і падзяляюцца на шэраг напрамкаў, найбольш шматлікімі з якіх з’яўляюцца хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ), хрысціяне евангельскай веры (ХЕВ) і евангельскія хрысціяне ў духу апостальскім.

На тэрыторыі Беларусі пераважна распаўсюджаны хрысціяне веры евангельскай. З’явіліся яны тут у 20-я гг. Асноўная колькасць іх суполак існавала ў Заходняй Беларусі. У 1945 г. у СССР частка хрысціян веры евангельскай з мэтай легалізацыі сваёй дзейнасці ўвайшла ў склад Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў, бо ўлады суполкі пяцідзесятнікаў не рэгістравалі. Пры гэтым яны павінны былі адмовіцца ад гласалаліі, абраду амавення ног, прароцтваў і экстатычнай культавай практыкі. Такія ўмовы не задавальнялі пяцідзесятнікаў, і ўжо з 1947 г. яны пачынаюць выходзіць з Саюза ЕХБ і існаваць у нелегальным становішчы.

Легалізацыя дзейнасці пяцідзесятнікаў у СССР адбылася ў 1989 г. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 505 суполак хрысціян веры евангельскай. Кіруе імі выбарны савет на чале з прэсвітарам. Суполкі аб’ядноўваюцца ў акругі, якімі кіруюць епіскапы. Існуе Саюз хрысціян веры евангельскай Беларусі, які ўваходзіць у Сусветны Саюз Асамблей Бога.

Рух адвентыстаў узнік у сярэдзіне XIX ст. у ЗША. Яго назва паходзіць ад лац. *adventus* – прыход, прышэсце. Адвентысты чакаюць хуткага Другога прыходу Ісуса Хрыста. Заснавальнікам гэтага руху з’яўляецца былы баптыст Уільям Мілер (1782–1849 гг.). Не маючы тэалагічнай адукацыі, ён старанна вывучаў Біблію і на падставе яе адвольнага тлумачэння прыйшоў да высновы, што 21 сакавіка 1843 г. адбудзецца Другое прышэсце Ісуса Хрыста. Уражаны гэтым сваім адкрыццём, У. Мілер у 1831 г. пачаў прапаведаваць, і ў яго назбіралася прыкладна 150–200 тыс. прыхільнікаў. Вясной 1843 г. яны кідалі працу, прадавалі маёмасць і ў белых адзеннях чакалі Другога прышэсця Ісуса Хрыста. Калі чаканай падзеі не адбылося, У. Мілер сказаў, што ён памыліўся ў сваіх падліках і Другое прышэсце Хрыста будзе паміж 21 сакавіка 1843 г. і 21 сакавіка 1844 г. Калі ж і гэтае прадказанне не спраўдзілася, давер да У. Мілера з боку яго паслядоўнікаў быў страчаны, і ён памёр забыты і адзінокі. Але рух адвентыстаў не знік, ён толькі распаўся прыкладна на 20 напрамкаў, самым вялікім сярод якіх з’яўляюцца адвентысты сёмага дня. Называюцца яны так таму, што святкуюць не нядзелю, а суботу, якая, паводле Біблії, з’яўляецца сёмым днём тыдня. У гэты дзень ім нельга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рабіць ніякую працу. Узнікла царква ў 1863 г. і зараз налічвае каля 5 млн прыхільнікаў. Яе заснавальніцай з’яўляецца Алена Уайт (1827–1915 гг.), прароцтвы якой былі пакладзены ў аснову веравучэння адвентыстаў сёмага дня.

Апроч шанавання суботы, другой спецыфічнай рысай адвентыстаў сёмага дня з’яўляецца так званая “Санітарная рэформа”, падставай для якой паслужыла адно з прароцтваў Алены Уайт. Лічыцца, што аднойчы ёй з’явіўся анёл і перадаў загад Бога “сваім верным дзецям” весці здаровы лад жыцця. Не рэкамендуецца ўжываць у ежу свініну, тлушч, заячыну, некаторыя віды рыб, піць моцны чай, каву, какаву. Катэгарычна забаронены алкаголь, тытунь, наркотыкі. Кожны адвентыст павінен захаваць сваё цела і душу “ва ўсёй цэласнасці без заганы” да Другога прышэсця Ісуса Хрыста. Вельмі вялікую ўвагу адвентысты сёмага дня надаюць прапагандзе здаровага ладу жыцця і дабрачыннай дзейнасці. На свае сродкі яны адчыняюць бальніцы, санаторыі, прадпрыемствы па вытворчасці здаровай ежы.

Адвентысты сёмага дня не адмовіліся ад ідэі аб хуткім Другім прышэсці Ісуса Хрыста, але не называюць яго канкрэтных тэрмінаў. Яны лічаць, што ў 1844 г. Хрыстос прыйшоў у “Нябесную святыню” і пачаў суд над праведнікамі, які завершыцца Яго Другім прышэсцем на зямлю. Адвентысты адмаўляюць пекла і рай, а таксама неўміручасць душы. Пасля смерці, па іх меркаванні, душа чалавека знаходзіцца ў асаблівым сне. У час Другога прышэсця Хрыста ўваскрэснуць праведнікі і разам з Хрыстом узнясуцца на неба, дзе будуць царстваваць тысячу гадоў. Пасля гэтага Хрыстос з праведнікамі спусціцца на Зямлю, і для Апошняга суда ўваскрэснуць грэшнікі. Яны разам з дэманамі будуць знішчаны агнём, а на ачышчанай і абноўленай Зямлі застануцца вечна жыць праведнікі. У якасці асноўных абрадаў адвентысты сёмага дня прызнаюць хрышчэнне дарослых і хлебапераламленне. Апошняе робіцца ў адну з субот кожнага квартала, яму папярэднічае абрад мыцця ног. Прызнаюцца таксама і іншыя абрады: пасвячэння ў прэсвітары, вянчання, алеяпамазання, пахавання, асвячэння памяшканняў і інш. У адвентыстаў сёмага дня ёсць дзесяціна – кожны вернік павінен даваць дзесятую частку ад сваіх прыбыткаў, а ў каго ёсць жаданне – і больш. Справа гэта цалкам добраахвотная, і прымусіць чалавека ніхто не можа.

У малітоўных дамах адвентыстаў сёмага дня няма ікон, крыжоў, алтара, аргана і іншых атрыбутаў хрысціянскага культу. Суполкі кіруюцца выбарным саветам на чале з прэсвітэрам. Ёсць таксама пасвечаныя прапаведнікі, дыяканы, дыяканісы, місіянеры, настаўнікі, евангелісты.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На тэрыторыі Беларусі адвентысты сёмага дня з’явіліся ў пачатку XX ст. У 30-я гг. існавалі ў БССР падпольна, пасля Вялікай Айчыннай вайны – у легальных умовах. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 72 суполкі адвентыстаў сёмага дня. Каардынуючым органам з’яўляецца Савет Беларускай канферэнцыі, які выбіраецца з’ездам прадстаўнікоў суполак на 3 гады. Кіруе саветам прэзідэнт Беларускай канферэнцыі.

Вышэйшай інстанцыяй адвентыстаў сёмага дня з’яўляецца Генеральная канферэнцыя, якая выбіраецца на 4 гады і знаходзіцца ў Вашынгтоне. Увесь свет падзелены на 6 частак (дывізіёнаў). Суполкі адвентыстаў сёмага дня Беларусі ўваходзяць у Еўрапейска-Азіяцкі дывізіён Генеральнай канферэнцыі.

Сведкі Іеговы. Гэта арганізацыя ўзнікла ў 70-я гг. XIX ст. у ЗША. Заснавальнікам яе з’яўляецца Чарльз Тэйз Расэл (1852–1916 гг.). Спачатку прыхільнікі Ч. Т. Расэла называлі сябе Таварыствам даследчыкаў Бібліі, а з 1931 г. прынялі назву “сведкі Іеговы”, абапіраючыся на наступны фрагмент з кнігі прарока Ісаі: “Няхай усе народы збяруцца разам... Няхай прадставяць сведак ад сябе і апраўдаюцца... А Мае сведкі, кажа Гасподзь, вы... Я прадрок, і выратаваў, і абвясціў; а іншага няма ў вас, і вы – сведкі Мае, кажа Гасподзь, што Я Бог” (Іс., 43, 9–12). Згодна з веравучэннем сведак Іеговы, Д’ябал заявіў, што Бог не можа засяліць зямлю людзьмі, якія застануцца Яму вернымі ў выпрабаваннях. Сведкі Іеговы сваім жыццём як бы абвяргаюць Д’ябла і сведчаць аб усемагутнасці Бога.

Сваё веравучэнне сведкі Іеговы імкнуцца пабудаваць на рацыянальных прынцыпах. Так, яны адмаўляюць Тройцу. Хрыста лічаць не Богам, а былым архангелам Міхаілам, які ўвасобіўся ў выглядзе дасканалага чалавека. Святы Дух – гэта “ўлада і сіла Іеговы”, якой Ён надзяліў Хрыста і тым самым упаўнаважыў прадстаўляць Яго. Сведкі Іеговы адмаўляюць пекла, рай, неўміручасць душы, лічаць, што Хрыстос загінуў не на крыжы, а на слупе. У іх ёсць свой пераклад Бібліі, дзе знайшлі адлюстраванне гэтыя палажэнні.

Усю гісторыю Сведкі Іеговы разглядаюць як барацьбу паміж іегавістамі і сатаністамі. Лічаць, што з 1914 г. пачаўся пераходны перыяд ад царства людзей да царства Іеговы, які завершыцца вялікай бітвай – Армагедонам. На Зямлі застануцца толькі тыя, хто прызнае Іегову, яны будуць жыць у шчасці і багацці. Астатнія памруць. Зямлёй будзе кіраваць нябесны ўрад са 144 тыс. праведнікаў на чале з Хрыстом. Сведкі Іеговы лічаць, што да лічбы 144 тыс. зараз не хапае толькі 9 тыс., і таму Армагедон будзе хутка.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вялікае значэнне сведкі Іеговы надаюць місіянерскай дзейнасці. Яны прапаведуюць на вуліцах і ходзяць па кватэрах, прапануючы пазнаёміцца з іх літаратурай – у асноўным гэта часопісы “Сторожевая башня” і “Пробудись”.

У сведак Іеговы забаронена курэнне, брыдкаслоўе, неўпарадкаваны секс. Алкаголь ужываць можна, але абмежавана. Яны не могуць служыць у войску, не прымаюць удзел у палітычным і грамадскім жыцці, спартыўных спаборніцтвах, не шануюць дзяржаўную сімволіку.

У якасці асноўных абрадаў сведкі Іеговы прызнаюць хрышчэнне і хлебапераламленне. У іх малітоўных дамах няма ніякай хрысціянскай культавай атрыбутыкі.

Сведкі Іеговы – гэта цэнтралізаваная арганізацыя. На чале яе стаіць Кіруючая карпарацыя, якая знаходзіцца ў Брукліне (прыгарад Нью-Ёрка). Увесь свет падзелены на зоны, зоны – на філіялы, філіялы – на вобласці, вобласці – на раёны. У раён уваходзіць да 20 суполак, якія называюцца сходамі. Суполкай кіруе савет на чале са старэйшынай, якога прызначае больш высокі орган.

Усяго ў свеце зараз налічваецца больш чатырох млн сведак Іеговы.

У нас сведкі Іеговы з’явіліся ў пачатку 30-х гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Пасля далучэння гэтых земляў да СССР яны атрымалі магчымасць распаўсюджваць сваё веравучэнне далей на ўсход. Савецкая ўлада лічыла сведак Іеговы рэакцыйнай сектай, іх жорстка праследавалі, таму яны дзейнічалі ў падполлі. Афіцыйна сведкі Іеговы былі легалізаваны ў СССР толькі ў пачатку 1991 г. На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі існавала 27 суполак сведак Іеговы.

Пратэстанцтва – кірунак, які развіваецца у хрысціянстве найбольш інтэнсіўна. Яно ўзнікла як пратэст супраць злоўжыванняў у каталіцкай царкве. Характэрнай рысай пратэстанцтва з’яўляецца наяўнасць шматлікіх напрамкаў, кожны з якіх прэтэндуе на выключную правільнасць свайго веравучэння. На Беларусі на 1 студзеня 2011 г. было зарэгістравана 14 пратэстанцкіх напрамкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 4.6. Іслам

4.6.1. Узнікненне ісламу.
4.6.2. Веравывучэнне і культ ісламу.
4.6.3. Кірункі ў ісламе.

### 4.6.1. Узнікненне ісламу

Іслам з'яўляецца самай маладой сусветнай рэлігіяй. Ён узнік у VII ст. н. э., амаль на 600 гадоў пазней за хрысціянства і больш чым на 1000 – за будызм.

Зараз іслам – другая па колькасці сусветная рэлігія. Яго вызнае 1 млрд. чалавек, больш чым у 120 краінах свету, прычым колькасць прыхільнікаў ісламу інтэнсіўна павялічваецца, дзякуючы, у асноўным, традыцыйна высокай сярод іх нараджальнасці. Асноўная колькасць мусульман жыве ў Заходняй, Паўднёвай, Паўднёва-Усходняй Азіі і Паўночнай Афрыцы. У 28 краінах іслам з'яўляецца дзяржаўнай альбо афіцыйнай рэлігіяй (Ірак, Іран, Афганістан, Пакістан, Саудаўская Аравія, Егіпет, Марока і інш.).

Іслам узнік сярод арабаў на захадзе Аравійскага паўвострава, калі там ужо былі вядомы іўдзейскія і хрысціянскія погляды. Таму, разглядаючы абставіны яго фарміравання, трэба ўлічваць як сацыяльна-эканамічную сітуацыю, у якой знаходзіліся арабскія плямёны ў пачатку VII ст., так і ўплыў іншых рэлігій.

Даісламскія арабы – адзін са шматлікіх семіцкіх народаў, якія жылі ў гэтым раёне Бліжняга Ўсходу з даўніх часоў. Падзяляліся яны на качавыя плямёны, якія пераважна займаліся жывёлагадоўляй, а таксама гарадскіх арабаў, якія жылі за кошт гандлю, часткова рамяства і земляробства. Праз Меку, Ятрыб, Йемен, якія ў першыя стагоддзі н. э. уяўлялі сабой невялікія гарады-протадзяржавы, ішлі гандлёвыя шляхі з Індыі і Кітая ў Еўропу. Гэта давала прыбытак як гараджанам, так і качавым плямёнам, якія бралі плату за бесперашкодны праход караванаў праз свае тэрыторыі.

Аднак у другой палове VI ст. гандлёвыя шляхі перамясціліся на поўнач Аравійскага паўвострава, што прывяло да крызісу ў былых цэнтрах гандлю, які закранаў таксама і качавыя арабскія плямёны. Таксама ў гэты перыяд узмацняецца небяспека захопу арабскіх гарадоў суседнімі моцнымі дзяржавамі, перш за ўсё Візантыяй і Іранам. З'явілася патрэба ў моцнай дзяржаве, якая б аб'яднала плямёны і забяспечыла жыццядзейнасць арабскага грамадства. Напружанасць крытычнай сітуацыі знайшла сваё выяўленне ў духоўных браджэннях, што паслужыла штуршком для ўзнікнення новай рэлігіі.

Большасць арабаў з даўніх часоў былі язычнікамі. Яны шанавалі Сонца, Луну, шматлікіх духаў пустыні, памерлых продкаў. На поўдні Аравіі быў распадсюджаны фетышызм, які знайшоў сваё адлюстраванне ў кульце вялікіх, пастаўленых на рабро камянёў. Найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знакамітым з іх быў Чорны камень у свяцілішчы Кааба[1] ў Мецы. Ён меў кубічную форму; быў акружаны шматлікімі іншымі каменнымі фетышамі, якія сімвалізавалі розных племянных багоў і духаў і ўспрымаліся ўсімі арабамі як вышэйшы боскі сімвал. Мека з’яўлялася рэлігійным цэнтрам. Некалькі разоў у год, на святы, прадстаўнікі арабскіх плямёнаў наведвалі яе, каб ушанаваць сваіх багоў. Пры гэтым яны прадавалі свае тавары і куплялі тавары ў меканцаў, ад чаго апошнія мелі прыбытак. Даследчыкі лічаць, што шанаванне Чорнага каменя ў нейкай ступені адлюстравала ўзнікаючыя ў арабаў уяўленні аб вышэйшым боствe. Адной з крыніц гэтых уяўленняў былі монатэістычныя рэлігіі іўдаізм і хрысціянства. Іўдаізм існаваў у Аравіі ўжо амаль тысячагоддзе, асабліва ў гарадах, дзе жылі буйныя суполкі яўрэйскіх гандляроў. У Сірыі, Палесціне, Месапатаміі было шырока распаўсюджана хрысціянства. Апроч таго, побач былі такія хрысціянскія краіны, як Візантыя і Егіпет. На рэлігійныя пошукі арабаў аказвалі таксама ўплыў ідэі зораастрызма, якія пранікалі з Ірана.

У VI ст. сярод арабаў атрымаў распаўсюджванне рух ханіфаў – пракокаў-прапаведнікаў, якія заклікалі да адмаўлення ад язычніцкага політэізму і шанавання адзінага Бога. Падрабязных звестак аб дзейнасці ханіфаў і змесце іх пропаведзяў не захавалася, аднак вядома, што Бог, якога яны прапаведавалі, адрозніваўся ад багоў іўдзеяў і хрысціян. Дзейнасць ханіфаў паступова падрыхтоўвала пераход арабаў да монатэізму.

Заснавальнікам новай рэлігіі з’явіўся прарок Мухамед (каля 570–632 гг.). Аб яго жыцці вядома даволі шмат. Мухамед паходзіў з магутнага меканскага племені курэйшн. Ён рана асірацеў і спачатку пасвіў скаціну ў свайго дзядзькі Абу Таліба. Ёсць некалькі легенд аб дзіцячых гадах Мухамеда. Напрыклад, паводле адной з іх, аднойчы з’явіліся анёлы і ачысцілі яго сэрца ад грахоўных помыслаў. У 25 гадоў ён ажаніўся на багатай удаве Хадзіджы, у якой да гэтага служыў. Нягледзячы на даволі вялікую розніцу ва ўзросце (Хадзіджа была на 15 гадоў старэйшай), шлюб быў шчаслівы. У іх нарадзілася 6 дзяцей, але толькі любімая дачка Мухамеда Фаціма пераeжыла бацьку і пакінула нашчадкаў.

Пасля жаніцьбы на Хадзіджы Мухамед перастаў займацца гандлем і прысвяціў сябе рэлігійным пошукам. На працягу некалькіх гадоў ён праводзіў доўгія гадзіны на адной з гор каля Мекі. Хадзіджа з разуменнем ставілася да паводзін свайго мужа і не перашкаджала яму. Калі Мухамеду было каля 40 гадоў, яму сталі з’яўляцца нейкія

[1] З арабскай мовы "кааба" перакладаецца як "куб".



РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

духоўныя істоты і ён стаў чуць галасы, якія абвясцілі яго прарокам і загадалі пачаць прапаведаваць арабам адзінага Алаха (араб. "Боства"). Гэтыя прывіды наведвалі Мухамеда да канца яго жыцця, на падставе іх была створана свяшчэнная кніга ісламу "Каран".

Спачатку, на працягу трох гадоў, Мухамед прапаведаваў толькі абмежаванаму колу блізкіх яму людзей. Першымі, хто падтрымаў Мухамеда ў якасці пасланніка Алаха, былі Хадзіджа, яго стрыечны брат Алі, які ажаніўся на Фаціме, і прыёмны сын Зейд. Потым да іх далучыліся паважаныя меканцы Абу Бакр, Амар, Асман, Хамза і інш. Аднак, калі Мухамед пачаў выступаць з адкрытымі пропаведзямі, большасць меканцаў сустрэла іх вельмі насцярожана. Абумоўлена гэта было тым, што ён адмаўляў усіх старых багоў апроч Алаха і сцвярджаў, што продкі курэйшытаў за сваё нявер'е гарэць у пекле. Акрамя таго, меканцы баяліся за свае эканамічныя інтарэсы: калі адмаўляюцца старыя багі, дык арабскія плямёны не будуць прыходзіць у Меку, каб іх шанаваць, а, значыць, не будзе гандлю і прыбытку. Узнікла пагроза жыццю Мухамеда і яго прыхільнікаў. Стала немагчыма далей займацца рэлігійнай дзейнасцю ў Мецы, і Мухамед прымае запрашэнне жыхароў суседняга горада Ятрыб, адкуль была родам яго маці, перасяліцца да іх. Запрашэнне было абумоўлена тым, што ў Ятрыбе існавалі доўгія і заблытаныя канфлікты і жыхары спадзяваліся вырашыць іх па арабскім звычаі пры дапамозе аўтарытэтнага і непрадузятага трацейскага суддзі. У якасці такога суддзі і запрасілі Мухамеда, прызнаўшы тым самым аўтарытэтнасць яго як прарока.

Спачатку ў Ятрыб невялічкімі групамі ўпотай ад меканцаў перасяліліся прыкладна семдзесят сем'яў паслядоўнікаў Мухамеда, а потым, у 622 г., і ён сам са сваімі блізкімі. Меканцы праследавалі прарока, але ён паспеў схавацца ў пячоры. І ў адпаведнасці з легендай, уваход у яе павук адразу ж заткаў павуцінай, чым падмануў пагоню.

Пераезд Мухамеда ў 622 г. з Мекі ў Ятрыб, якая ў хуткім часе стала называцца Медынай (Горад Прарока), з'яўляецца пачаткам мусульманскага летазлічэння.

Жыхары Медыны, у якіх былі варожыя адносіны з Мекай, ахвотна прынялі Мухамеда, а наяўнасць у Медыне вялікай яўрэйскай суполкі зрабіла іх больш падрыхтаванымі да прыняцця новага вучэння. Хутка амаль усе медынцы зрабіліся паслядоўнікамі Мухамеда.

Менавіта ў Медыне адбылося канчатковае афармленне ісламу як рэлігіі. Адкрыцці, якія былі дасланы Мухамеду ў Медыне, змяшчалі заканадаўчыя нормы, вельмі патрэбныя для арабскага грамадства. Таксама тут адбываецца аддзяленне новай рэлігіі ад іўдаізму і хрысціянства.

РЭПОЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРЫНЫ

Спачатку Мухамед наогул не настойваў на тым, што ён стварыў новае вучэнне. Ён выступаў за прызнанне адзінага Бога, які ў чымсьці быў падобны на іўдзейскага і хрысціянскага, хаця яўна нагадваў вышэйшае боства Каабы. Усіх іўдзеяў і хрысціян Мухамед ахвотна запрашаў далучыцца да яго і лічыў сваімі духоўнымі братамі. Паказальна, што спачатку Мухамед і яго прыхільнікі маліліся ў бок Іерусаліма. Аднак іўдзеі адмовіліся прызнаваць яго як прарока. Яны сталі адкрыта высмейваць тэалагічныя памылкі малапісьменнага Мухамеда і часта актыўна супрацьстаялі яму. У адказ Мухамед выгнаў два яўрэйскія кланы з Медыны, а мужчын трэцяга казніў. Маліцца было загадана ў бок Мекі.

Прыхільнікі Мухамеда стварылі ў Медыне сваю суполку, якая ў адрозненне ад традыцыйных для Аравіі рода-племянных аб’яднанняў будавалася на падставе не кроўнай роднасці, а рэлігійнага адзінства. Яна ўяўляла сабой тэакратычную арганізацыю, у якой Мухамед быў адначасова духоўным і свецкім кіраўніком.

У хуткім часе пад уплывам ісламскай суполкі Медыны аказалася амаль уся Паўднёвая і Заходняя Аравія. Большасць арабскіх плямёнаў прызналі ўладу Мухамеда добраахвотна, але ў некаторых выпадках ужывалася сіла. Восем гадоў цягнулася вайна Медыны з Мекай, поспех у якой пастулова схіляўся на бок Мухамеда, тым больш што ў самой Мецы частка насельніцтва была тайнай прыхільніцай новай рэлігіі. У 630 г. Мухамед, не сустракаючы амаль ніякага супраціўлення, авалодаў Мекай і абвясціў яе свяшчэнным горадам мусульман, а храм Каабу – галоўным мусульманскім свяцілішчам. З Каабы былі выкінуты ўсе ідалы і пакінуты толькі Чорны камень. Калі да гэтага прыняцце ісламу лічылася асабістай справай кожнага, то пасля авалодання Мекай арабы былі пастаўлены перад выбарам – альбо іслам, альбо меч (смерць). Па сутнасці, была абвешчана вайна язычнікам. Паміраўшыся з меканцамі, якія пачалі масава прымаць іслам, Мухамед працягнуў пашырэнне новай веры. У 632 г., калі ўсе аравійскія плямёны, якія раней шанавалі меканскую Каабу, прынялі іслам, Мухамед памёр і быў пахаваны ў Медыне.

Пасля яго смерці ўзнікла пытанне аб тым, хто узначаліць мусульман. Пры гэтым гаворка ішла не столькі аб духоўным лідары, колькі аб кіраўніку вялікай дзяржавы, якая пастулова ўтваралася. Мухамед не пакінуў распараджэнняў аб сваім пераемніку. Перадача ўлады ў спадчыну выключалася, паколькі ў Мухамеда не засталося дзяцей мужчынскага полу, таму быў абраны прынцып выбарнасці намеснікаў прарока (халіфаў). Першым халіфам быў абраны Абу Бакр, які працягнуў распаўсюджванне ісламу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Менавіта пры Абу Бакры быў пакладзены пачатак арабскім заваяванням іншых народаў, мэтай якіх было абвешчана распаўсюджанне ісламу. Набегі на суседзяў з'яўляліся звычайным заняткам арабскіх плямёнаў, і першыя халіфы выкарысталі ваенную энергію арабаў у рэлігійных мэтах. Гэты шлях адпавядаў і ісламскім уяўленням аб джыхадзе – свяшчэннай вайне за веру і імкненням да ваеннай здабычы, якая ўжо пры Мухамедзе зрабілася галоўнай крыніцай даходу мусульманскай суполкі.

Першыя ж набегі былі вельмі паспяховымі. Дзве вялікія імперыі, якія існавалі ў тыя часы – Візантыйская і Персідская, знаходзіліся ўжо 50 гадоў у стане вайны і былі вельмі аслабленымі. Апроч таго, народы, якія іх засялялі, ненавідзелі цэнтральныя ўлады і сустракалі арабаў як вызваліцеляў. За кароткі час мусульмане заваявалі велізарную тэрыторыю – ад Індыі да Іспаніі. На заваяванай тэрыторыі была створана дзяржава – Арабскі халіфат, свецкая і дзяржаўная ўлада ў якой належала халіфам.

Трэба адзначыць, што альтэрнатыва "альбо іслам, альбо меч" ставілася мусульманамі толькі перад язычнікамі. Хрысціяне ж і іўдзеі, якіх яшчэ Мухамед называў "людзьмі Пісання", бо яны верылі ў адзінага Бога і мелі свяшчэнныя кнігі, атрымалі статус "ахоўваемых меншасцей" і маглі вызнаваць свае рэлігіі. Аднак для немусульман былі ўстаноўлены значна большыя падаткі, чым для мусульман, і таму паступова адбываецца ісламізацыя заваяваных народаў. Зараз іслам распаўсюджаны ў асноўным у краінах, тэрыторыі якіх раней уваходзілі ў склад Арабскага халіфата.

### 4.6.2. Веравучэнне і культ ісламу

Іслам, як і хрысціянства, – гэта рэлігія адкрыцця. Лічыцца, што асноўныя палажэнні яго веравучэння не з'яўляюцца вынікам чалавечых разважанняў, але былі адкрыты Мухамеду самім Алахам праз пасрэдніцтва архангела Джабраіла. Сукупнасць гэтых адкрыццяў складае галоўную свяшчэнную кнігу ісламу – <u>Каран</u> (араб. *куран* – дэкламаванне, чытанне ўголас). Гэта зборнік пропаведзяў, якія былі сказаны Мухамедам галоўным чынам у Мецы і Медыне паміж 610 і 632 гг. Бліжэйшыя паплечнікі Мухамеда, які быў сам непісьменным, запісвалі для сябе асобныя ўрыўкі пропаведзяў, але ў цэлым, згодна з існуючай на Ўсходзе традыцыяй, Каран перадаваўся вусна. Запісаны ён быў пасля смерці Мухамеда паміж 650 і 656 гг. былым сакратаром Мухамеда Зейдам  па даручэнні халіфаў Абу Бекра і Амара. Паралельна з ім гэтай працай займаліся і іншыя, таму з'явілася 4 варыянты



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Карана. Амар даручыў Зейду звесці іх да адзінай рэдакцыі, і калі гэта было зроблена, першапачатковыя версіі спалілі, а зводны тэкст быў афіцыйна кананізаваны. Таму зараз усе кірункі ў ісламе карыстаюцца адным варыянтам Карана.

Змест Карана складаюць матэрыялы старажытнаарабскага фальклору, а таксама запазычанні з Бібліі. Самі мусульмане супадзенні многіх сюжэтаў Карана і Бібліі тлумачаць тым, што Алах адкрываўся людзям некалькі разоў. Спачатку ён часткова адкрыўся яўрэям, так узнік Стары Запавет. Потым, больш поўна, – хрысціянам у Новым Запавеце. І, нарэшце, арабам ён адкрыўся цалкам праз Каран. Такім чынам, апошні – гэта праўдзівае і канчатковае адкрыццё Алаха.

Каран падзяляецца на 114 глаў (сур), якія, за выключэннем першай, размешчаны без усякай лагічнай альбо храналагічнай сувязі, па меры памяншэння аб’ёму тэкста. Першая сура ўяўляе сабой малітву, якую кожны мусульманін павінен казаць, прынамсі, пяць разоў у дзень, далей ідзе самая вялікая, другая, сура і ў канцы ідуць самыя маленькія суры. Суры падзяляюцца на вершы (аяты). Слова “аят” мае таксама значэнне “знаменне”, “цуд”. Паводле падання, калі Мухамеда папрасілі аб цудзе для доказу яго прароцкай ролі, ён проста спаслаўся на вершы Карана: яны і з’яўляліся яго цудам. У самай вялікай, другой, главе 286 аятаў, у самай кароткай 114 – 3. Спецыялісты падзяляюць суры Карана на дзве групы: меканскую, калі яшчэ мала хто прызнаваў Мухамеда прарокам, і медынскую, калі ён быў ужо аўтарытэтным заснавальнікам новай рэлігіі. Каран напісаны рытмічнай прозай, тэкст яго абрывісты і нярэдка супярэчлівы, што тлумачыцца экстатычным альбо блізкім да яго станам, у якім Мухамед казаў свае пропаведзі. Гэтыя супярэчнасці адчуваў і сам прарок, тлумачыў жа ён іх тым, што Алах змяніў свае першапачатковыя меркаванні, каб зрабіць іх лепшымі.

Другой свяшчэннай кнігай ісламу, яго, так бы мовіць, “Свяшчэнным Паданнем”, з’яўляецца Суна (араб. “*звычай*”, “*прыклад*”) – зборнік апавяданняў (хадзісаў) аб жыцці і выказваннях Мухамеда. Гэтыя апавяданні пасля смерці прарока ў выглядзе ўспамінаў былі шырока распаўсюджаны сярод яго прыхільнікаў і сталі рупліва збірацца і запісвацца. У IX ст. яны былі зведзены ў шэсць зборнікаў і склалі Суну. Асноўнае яе прызначэнне – паказваць прыклад Мухамеда як узор для вырашэння тых праблем, якія паўстаюць перад мусульманамі.

Суна стала для мусульманскіх багасловаў каштоўнай кнігай, якая дапамагала тлумачыць і дапаўняць Каран.

На падставе Карана і Суны склаўся зборнік прадпісанняў – шарыят (спачатку слова “шарыят” азначала “дарога да вадапою”, а потым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

было пераасэнсавана як “прамы, правільны шлях запаведзяў Алаха”). У яго ўваходзяць не толькі прававыя, але і маральныя нормы і культавыя прадпісанні, якія ахопліваюць усё жыццё мусульманіна. Трэба адзначыць, што правілам шарыяту мусульмане надаюць значна большую ўвагу, чым чыста дагматычным палажэнням, бо іслам значна больш дэталёва распрацоўвае праблемы штодзённага жыцця, чым пытанні аб сутнасці Алаха. Шарыят можа характарызавацца як увасабленне спецыфікі стылю ісламскага мыслення і жыцця і аснова самога ісламу.

Аднак сістэматызаваным зводам законаў шарыят не з’яўляецца. У ім закранаюцца пытанні дагматыкі і этыкі, якія вызначаюць перакананні і рэлігійнае сумленне мусульманіна. Канкрэтную сацыяльна-нарматыўную рэгламентацыю агульным палажэнням шарыята дае фікх – мусульманскае права ў шырокім сэнсе слова.

Асноўныя палажэнні веравучэння ісламу.

1. Вера ў Алаха. Згодна з перакананнем мусульман, Алах – гэта адзіны Бог, які стварыў увесь свет і вызначае яго існаванне. Ёсць 99 імён Алаха і яшчэ адно імя, вядомае толькі прарокам. Калі ў хрысціянстве Бог – Айцец, то ў ісламе ён – вышэйшы, усемагутны, мудры і ўсяміласцівы суддзя. Побач з ім няма ні багоў, ні якіх-небудзь самастойных звышнатуральных істот. Таму ў Каране адмаўляецца хрысціянскае вучэнне аб Тройцы, сутнасць якога, дарэчы, Мухамед разумеў няправільна, аб чым сведчаць наступныя месцы: “Не веравалі тыя, якія казалі: “Бо Алах – трэці з трох” (5, 73) і далей: “О Іса, сын Майрамі! Ці ты сказаў людзям: “Прыміце мяне і маю маці, двума багамі апроч Алаха?” (5, 116)[1]. Мухамед лічыў, што хрысціяне шануюць Тройцу як святую сям’ю, якае складаецца з Бога Айца, Марыі Маці і Сына іх Ісуса.

Мусульмане вераць у існаванне мноства анёлаў і дэманаў, але падобна хрысціянам, разглядаюць іх не як самастойных звышнатуральных істот, а як стварэнняў адзінага і ўсемагутнага Алаха. Яны бясполыя і бясплотныя, могуць тварыць дабро і зло. Анёлы, галоўнымі сярод якіх з’яўляюцца Джабраіл, Мікаіл, Ісрафіл, Азрыл – гэта носьбіты добрага пачатку. Сярод іх існуе раздзяленне працы: ёсць анёлы-захавальнікі (па два ў кожнага чалавека, прычым яны як быццам бы нясуць кругласутачную вахту, змяняючы адзін аднаго раніцай і ўвечары), анёлы, якія ахоўваюць могілкі, анёлы – пасланцы Алаха, анёлы, якія ўзначальваюць рай (Рыдван) і пекла (Малік).

Свету анёлаў супрацьстаіць свет дэманаў і джынаў на чале з Іблісам. Апошні выконвае тую ж ролю, што і Люцыфер у хрысціянстве.

[1] Першая лічба абазначае нумар суры, другая – аята.



РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

Ібліс – па паходжанні анёл, які быў створаны Алахам з агню і адмовіўся пакланіцца створанаму з праха чалавеку, за што Алах яго пракляў і паабяцаў, што на Апошнім Судзе ён будзе скінуты разам з усімі дэманамі. Пакуль жа Ібліс – кіраўнік усіх дэманаў і джынаў, якіх ён здольны сам параджаць. Асноўны яго занятак – прымушаць людзей забыць аб прадпісаных Алахам нормах паводзін.

2. Вера ў прарокаў і пасланніцтва Мухамеда. Мусульмане вераць, што да Мухамеда існавала не менш за сто тысяч прарокаў (па некаторых звестках, 124 тыс.), хаця ў Каране ўзгаданы толькі 28, першым з якіх Мухамед лічыў Адама. Дзевяць прарокаў названы ў Каране "стойкімі": Нух (Ной), Ібрахім (Аўраам), Дауд (Давід), Йакуб (Якаў), Йусуф (Восіп), Айуб (Іоў), Муса (Маісей), Іса (Ісус) і, нарэшце, Мухамед.

У ісламе падкрэсліваецца, што прарокі – гэта не звышнатуральныя істоты, а людзі, праз якіх гаворыць Алах. Яны больш годныя, чым усе анёлы нябесныя. Вышэйшыя з прарокаў – пасланнікі (усяго іх 313), якім Алах даў пісанне, а вышэйшы з пасланнікаў – Мухамед, Пасланнік Алаха, Пячатка прарокаў. Пасля яго прарокаў не было і не будзе.

Мусульмане шануюць Ісуса Хрыста як прарока, адмаўляючы яго боскую сутнасць. Аднак Каран вучыць, што Ісус быў народжаны дзевай, рабіў цуды, жыў праведным жыццём, узнёсся жывым у рай і будзе яго прышэсце ў канцы свету.

3. Вера ў святасць Карана. Згодна з мусульманскім веравучэннем, Каран нікім не створаны, ён вечны (у гэтым, дарэчы, супярэчнасць з палажэннем аб тым, што ўсё створана Алахам). Арыгінал Карана знаходзіцца пад прастолам у Алаха. Той тэкст, якім карыстаюцца мусульмане, быў прадыктаваны з арыгінала Мухамеду архангелам Джабраілам. Шануецца кожны асобнік Карана, і мусульманін дакранаецца да яго толькі пасля абраду ачышчэння. Кнігі, як правіла, абгортваюць тканінай і ставяць у доме на ганаровае месца. Многія мусульмане ведаюць Каран на памяць.

4. Вера ў прадвызначэнне Алахам лёсу кожнага чалавека. Мусульмане вераць, што ўсё падпарадкавана волі Алаха, якая нічым не звязана, і людзі не могуць яе спасцігнуць. Чалавек не здольны змяніць свой лёс і павінен падпарадкавацца волі Алаха. Аднак гэта не вядзе да пасіўнасці прыхільнікаў ісламу. Якраз наадварот: мусульмане вераць, што чалавек павінен перш за ўсё выконваць волю Алаха, а ўзнагарода – гэта Яго справа.

З верай аб прадвызначэнні цесна звязана ў ісламе вера ў пекла і рай. Апісваюцца яны даволі натуралістычна. Пекла – гэта месца, дзе вельмі горача і пастаянна адбываецца пясчаная бура. Няверныя

грэшнікі і дэманы гарацьтам у вечным агні: “Сапраўды, тых, якія не верылі ў Нашыя знаменні, Мы спалім у агні! Усякі раз, як засмажыцца іх скура, Мы заменім іх іншай скурай, каб яны адчулі пакаранне. Сапраўды, Алах – вялікі, мудры!” (4, 59).

Мусульманскі рай – гэта месца, якое нагадвае аазіс. Там шмат вады, цяністыя гаі, вытанчаная ежа. У прыгожых адзеннях на шаўковых падушках ляжаць праверанiя мусульмане і вакол кожнага з іх шмат гурый. Гурыі – гэта вечна маладыя і нявінныя прыгажуні мусульманскага раю, іх каханне – адна з галоўных узнагарод прававерНаму мусульманіну. Па іншых версіях, мусульманін трапляе ў рай разам са сваімі жонкамі, якія таксама робяцца вечна маладымі і нявіннымі.

Што прыгатавана чалавеку – пекла альбо рай – вырашыць Алах на Апошнім судзе. Ён будзе дапытваць кожнага з жывых і памерлых, а яны, голыя, з адной толькі кнігай у руках, дзе запісаны іх учынкі, будуць з жахам чакаць Яго рашэння. Заступніцтва Мухамеда перад Алахам можа не толькі змякчыць лёс грэшніка, але і дапамагчы яму атрымаць месца ў раі. Дарога ў рай праходзіць праз мост, тонкі, як волас, і востры, як меч. Сам чалавек прайсці праз яго не ў стане – яго павінен перавезці баран, альбо асёл, вярблюд, бык, конь, якога ў свой час чалавек ахвяраваў бедным у імя Алаха.

Асноўныя культавыя прадпісанні ісламу сфармуляваны ў выглядзе пяці “стаўпоў веры”. Следаванне ім з’яўляецца найважнейшым абавязкам мусульманіна.

Першы са “стаўпоў” – шчырае вызнанне веры (па-арабску *шахада* – сведчанне). Яно зводзіцца да ўпэўненага вымаўлення ўголас асноўнага палажэння веравучэння: “Няма ніякага боства, апроч Алаха, і Мухамед – пасланнік Алаха”.

Вымаўленне шахады абавязкова для кожнага мусульманіна. Актам далучэння да ісламу з’яўляецца вымаўленне шахады ў прысутнасці сведак.

Другі “стоўп” – малітва (па араб. – салат, па перс. – намаз). Мухамед прызначыў пяць абавязковых штодзённых малітваў: (на золку, апоўдні, у другой палове дня, на захадзе сонца, з надыходам ночы). Перад малітвай мусульманін абавязаны зрабіць амавенне: памыць твар і рукі да локцяў. Калі малітва адбываецца ў пустыні, дзе няма вады, можна сімвалічна пацерці рукі і твар пяском. Пасля амавення мусульманін без абутку становіцца на малітоўны дыванок тварам да Мекі і моліцца. Маліцца можна ў любым рытуальна чыстым месцы. Па пятніцах існуе калектыўная малітва ў мячэці, пры гэтым жанчыны моляцца асобна ад мужчын.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Трэці “стоўп” – пост (араб. – саум) у месяц рамадан[1]. На працягу 30 сутак гэтага месяца дарослыя мусульмане ў светлы час (“калі чорную нітку можна адрозніць ад белай”), абавязаны ўстрымлівацца ад ежы, пітва, курэння, ужывання духоў, сексуальных адносін. З надыходам цемры забароны здымаюцца, але і ў гэты час трэба аддавацца набожным думкам і справам. Калі нехта не змог пасціцца з-за неспрыяльных абставін (хвароба, падарожжа, вайна, палон і г. д.), ён абавязаны потым папасціцца столькі дзён, колькі прапусціў. Тыя, каму пост можа зрабіць фізічную шкоду (дзеці, старыя, цяжарныя жанчыны і г. д.), вызваляюцца ад яго.

Глыбінны сэнс посту ў ісламе – удзячнасць. Чалавек асэнсоўвае сваю паслухмянасць і цярплівае служэнне Алаху, які яго накіроўвае і аб ім клапоціцца. Мухамед казаў, што з усіх абрадаў Алах найбольш любіць пост, бо ў гэты час людзі звяртаюцца да Яго.

Чацвёрты “стоўп” – абавязковая міласціна (араб. *закят* – ачышчэнне). Лічыцца, што міласціна ачышчае душу ад грахоў, якія адбываюцца па прычыне чалавечага эгаізму альбо пагоні за матэрыяльнымі дабротамі. Таксама міласціна “ачышчае” маёмасць, робіць яе праведнай. Мусульманін абавязаны дзяліцца сваім багаццем з беднымі, даўжнікамі, вязнямі, падарожнікамі і ўсімі, каму не пашанцавала, але хто таксама з’яўляецца членам суполкі вернікаў. У Каране няма асаблівай заклапочанасці колькасцю міласціны. Галоўнае – шчырасць дапамогі. Паказны жэст цалкам абясцэньвае міласціну ў вачах Алаха. У шарыяце ж падрабязна абгаворваюцца сумы, якія мусульмане павінны адлічыць ад розных відаў сваёй уласнасці, аднак сучасная практыка зводзіць іх да 2 % у год ад асабістага грашовага бюджэту.

Пяты “стоўп” – паломніцтва ў Меку (хадж), якое хаця б раз у жыцці павінен зрабіць кожны мусульманін. Адбываецца яно ў дванаццаты месяц мусульманскага календара. Паломнікі робяць амавенне, стрыгуць валасы (мужчыны) і ногці, апранаюцца ў спецыяльнае белае адзенне. Ім забаронена гандляваць, праліваць кроў, стрыгчыся, галіцца, выкарыстоўваць пахучыя рэчывы, уступаць у сексуальныя адносіны. Потым яны сем разоў абыходзяць вакол Каабы, робяць іншыя рытуальныя дзеянні. Паломнік, які зрабіў хадж, атрымлівае тытул хаджы і мае права насіць зялёную чалму.

Да іншых культавых устанаўленняў ісламу адносяцца:

– абразанне хлопчыкаў, якое звычайна робіцца на сёмы год жыцця. У некаторых мусульманскіх краінах (Егіпет, Судан, Емен і

[1] Прыняты ў нас каляндар не супадае з мусульманскім, таму час іх посту перамяшчаецца.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

інш.) абразаюць таксама і дзяўчынак, прыкладна ў чатырнаццаць год, але гэта хутчэй звычай, чым рэлігійны абрад;

– шлюб – мужчына можа мець да чатырох жонак, але абавязаны ўтрымліваць іх і ставіцца аднолькава да кожнай;

– пахаванне, якое адбываецца ў дзень смерці альбо на наступны дзень. Труп загортваюць у саван і звычайна без гроба кладуць альбо садзяць у магілу тварам да Мекі;

– ежавыя забароны (нельга ўжываць спіртное, есці мяса свінні, драпежных птушак, удушанае).

Абавязкам мусульманіна з'яўляецца джыхад (араб. намаганне, барацьба за веру). Ён падзяляецца на некалькі відаў: джыхад сэрца – барацьба са сваімі ўласнымі недахопамі; джыхад языка – дазвол добрага і забарона благога; джыхад мяча альбо газават (множны лік ад араб. *газва* – набег) – узброеная барацьба з "няверным"і". Пры вядзенні газавату забаронена забіваць старых, жанчын, дзяцей, няўзброеных свяшчэннаслужыцеляў любой рэлігіі. Воінам праціўніка можна аказаць літасць без якіх-небудзь абавязкаў з іх боку, насельніцтва і ўласнасць варожай краіны могуць быць атрыманы пераможцамі як здабыча.

Асноўнымі святамі ў ісламе з'яўляюцца:

– Ураза-байрам – свята заканчэння посту. Святкуецца ў першыя тры дні наступнага пасля рамадана месяца. У гэтае свята мусульманін абавязаны зрабіць духавенству паднашэнне ў грашовым альбо натуральным выглядзе, асноўная частка якога прызначаецца для бедных;

– Курбан-байрам – дзень ахвярапрынашэнняў. Адзначаецца на сямідзясяты дзень пасля заканчэння посту. У гэты дзень мусульманін абавязаны зарэзаць для бедных тую хатнюю жывёлу, на спіне якой ён потым уедзе ў рай;

– Мірадж – свята ў гонар цудоўнага начнога падарожжа Мухамеда з Мекі ў Іерусалім, а таксама ўзнясенне на неба да прастолу Алаха, якое адбылося так хутка, што ложак Мухамеда быў яшчэ цёплым, а з выпадкова перакуленага сасуда для амавення не паспела праліцца вада;

– Маўлюд – дзень нараджэння Мухамеда. Гэтае свята суправаджаецца чытаннем малітваў у мячэцях і дамах вернікаў, частаваннем і паднашэннем духавенству.

Святочным днём у мусульман з'яўляецца пятніца. Гэта дзень адпачынку, вернікі апранаюць святочнае адзенне, ходзяць у мячэць. Аднак працаваць не забаронена.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### 4.6.3. Кірункі ў ісламе

У ісламе існуюць два асноўныя кірункі: сунізм і шыізм. Узніклі яны ў другой палове VII ст. з-за разыходжанняў у вырашэнні пытання аб прынцыпах перадачы ўлады ад Мухамеда халіфам. Шыіты лічылі, што халіфам павінен быць толькі прамы нашчадак Мухамеда, суніты, што ім можа быць любы прававерны, якога выбірае мусульманская суполка (ума).

Узнікнуўшы ў выніку барацьбы за ўладу, сунізм і шыізм у далейшым для абгрунтавання сваіх пазіцый сфармулявалі некалькі палажэнняў рэлігійнага характару. Так, для сунітаў Мухамед – вялікі і ўнікальны прарок, праз якога ажыццявілася непасрэдная сувязь прававерных з Алахам. Няма нікога, хто хаця б у нейкай ступені мог замяніць Мухамеда, бо Каран з'яўляецца вышэйшай і завершанай праявай адкрыцця. Любы пераемнік Прарока можа быць толькі захавальнікам яго спадчыны. Ён робіцца халіфам па асаблівай дамове, якая заключаецца паміж ім і прадстаўнікамі мусульманскай суполкі. Згодна з ёй халіф з'яўляецца кіраўніком мусульман і нясе адказнасць за тое, як яны выконваюць нормы шарыяту. Кожны з халіфаў павінен задавальняць наступным патрабаванням: мець рэпутацыю і званне знаўцы законаў ісламу вышэйшага рангу, паходзіць з племені курэйшытаў, да якога належаў Мухамед, быць справядлівым, мудрым, фізічна здаровым і клапаціцца аб сваіх падданых. Асабліва ў сунізме шануюцца першыя чатыры халіфы: Абу Бакр (632–634 гг.), Амар (634–644 гг.), Асман (644–656 гг.) і Алі (656–661 гг.).

У 1924 г. халіфат як наднацыянальны інстытут быў скасаваны. У сучасным суніцкім ісламе лічыцца, што калі шарыят выконваецца нацыянальнымі ўрадамі мусульманскіх дзяржаў, патрэбы ў халіфаце няма.

Само слова "сунізм" паходзіць ад назвы другой свяшчэннай кнігі ісламу – Суны. Паколькі лічыцца, што Мухамед непасрэдна зносіўся з Алахам, то і яго ўласныя выказванні прызнаюцца боганатхнёнымі. Таму Суна ў гэтым напрамку ісламу разглядаецца як вынік звышнатуральнага адкрыцця, зборнік правілаў жыцця і паводзін. Зараз суніты складаюць прыкладна 90 % ад колькасці ўсіх мусульман.

Шыіты (ад араб. *шыа* – групоўка, прыхільнікі) лічаць, што Мухамед з'яўляецца асобай, якая адзначана Алахам і надзелена асаблівым звышнатуральным дарам. Ён быў прызначаны не толькі кіраваць мусульманамі, але і перадаваць гэты дар сваім нашчадкам. Мухамед завяршыў цыкл прароцтваў, і ўжо немагчымы далейшыя боганатхнёныя адкрыцці. Шыіты лічаць, што Мухамед прызначыў сваімі

пераемнікамі імамаў, якія надзелены асаблівай духоўнасцю і бязгрэшнасцю і маюць права тлумачыць Каран. Першым імамам лічыцца Алі. Як стрыечны брат і зяць Мухамеда, ён быў не проста членам плямені курэйшытаў, але “адным з людзей дома Прарока”. Такія блізкія сямейныя адносіны азначаюць для шыітаў вельмі шмат. Напрыклад, яны вераць, што Алі атрымаў у спадчыну ад Мухамеда асаблівыя духоўныя здольнасці, дзякуючы якім ён не памыляўся пры тлумачэнні Карана і кіраўніцтве мусульманскай суполкай. Алі ў вучэнні шыітаў быў з цягам часу надзелены не меншай, чым Мухамед святасцю, а ў некаторых школах нават і большай. Лічыцца, што Алі перадаў гэтыя якасці сваім сынам Хасану і Хусейну, а яны – сваім нашчадкам. У барацьбе за ўладу шыіты арганізавалі загавор, у выніку якога халіф Асман быў забіты, а яго месца заняў Алі. Аднак праз некалькі гадоў Алі сам быў забіты прама ў мячэці, а яго сына Хусейна натуральна разадралі на часткі, бо ніхто не хацеў браць на сябе асабістую адказнасць за смерць унука Прарока. Шыіты абвясцілі Хусейна святым пакутнікам і кожны год адзначаюць дзень яго гібелі – Шахсей-вахсей. У гэты дзень адбываюцца ўрачыстыя працэсіі, удзельнікі якіх падвяргаюць сябе самабічаванню з мэтай узгадаць пакуты Хусейна і тым самым атрымаць у яго асобе свайго абаронцу. Пры гэтым яны выкрыкваюць: “Шах Хусейн! Вах, Хусейн!”, што і дало назву гэтаму дню.

Пасля смерці Хусейна шыіты ператварыліся ў мусульманскую меншасць, якая праследавалася з боку сунітаў.

Асаблівае месца ў веравучэнні шыітаў займае вобраз дванаццатага імама па імені Мухамед, які жыў у IX ст. Лічыцца, што ён знік у падлеткавым узросце, але калі-небудзь з’явіцца людзям як Махдзі (Месія) і ўстановіць царства праўды і справядлівасці. Згодна з веравучэннем шыітаў імам Мухамед і пасля знікнення аказвае ўплыў на развіццё ісламу праз сваіх прадстаўнікоў, якія называюцца “аятала́” (“божыя знаменні”). Менавіта яны маюць права тлумачыць шарыят і распрацоўваць рэлігійныя нормы.

У шыізме перыядычна ўзнікаюць чуткі аб тым, што “схаваны імам” ужо прыйшоў і ўвасобіўся ў канкрэтнага чалавека. Распаўсюджванню такіх чутак у 60–80-я гг. XX ст. садзейнічалі падзеі ісламскай рэвалюцыі ў Іране, якую ўзначаліў аятала́ Хамейні. Ён быў абвешчаны сваімі прыхільнікамі імамам.

Шыіты, як і суніты, лічаць Суну свяшчэннай кнігай, але прызнаюць толькі тыя хадзісы, у якіх альбо гаворыцца пра Алі, альбо іх аўтарства прыпісваецца Алі і яго прыхільнікам. Шыіты прымаюць агульнамусульманскі тэкст Карана (бо іншага проста няма), але не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

задаволены ім, бо лічаць, што ён недастаткова адлюстроўвае ролю Алі. Існуе шыіцкая версія Карана з дабаўленнем суры “Два свяцілы”, у якой Мухамед і Алі пастаўлены побач. Шыіты вераць, што сапраўдны тэкст Карана, вядомы святым імамам, з’явіцца разам з Махдзі, пасля чаго праўда і справядлівасць перамогуць.

Шыіты зараз складаюць прыкладна 10 % ад агульнай колькасці мусульман. Жывуць яны пераважна ў Іране, Іраку, Емене, некаторых раёнах Дагестана, Туркменістана і Таджыкістана.

У ісламе ёсць рух, які называецца суфізм. Ён не з’яўляецца асобным кірункам, яго прыхільнікамі могуць быць як суніты, так і шыіты, якія імкнуцца наблізіцца да Алаха пры дапамозе метадаў духоўнага ачышчэння.

Суфізм узнік прыкладна ў сярэдзіне VIII – пачатку IX стст., як вынік аскетычна-містычных тэндэнцый у ісламе. Сярод прычын яго ўзнікнення даследчыкі называюць агульнае ўскладненне рэлігійнага жыцця ў ісламе, якое суправаджалася паглыбленымі духоўнымі пошукамі, а таксама ўплыў іншых рэлігій, у першую чаргу – хрысціянства. Само слова “суфізм” паходзіць ад арабскага “тасавуф” – “самаачышчэнне”. “Суфі” (жаночы род – “суфія”) абазначае чалавека, чыё сэрца ачышчана ад мірскога бруду.

Прарок Мухамед шануецца як суфі. Лічыцца, што яшчэ ў маленстве яго сэрца было ачышчана анёламі. Сярод першых мусульман вылучаліся так званыя “людзі на лаўцы” (ал аль суфа). Яны вельмі рэдка пакідалі мячэць у Медыне, таму што бесперапынна маліліся. Насілі яны простае адзенне з шэрсці (суф), чым сімвалічна прытрымліваліся прыкладу пракаў, асабліва Ісуса.

Сутнасць суфізму складае вера ў любоў Алаха, якая грунтуецца на словах Карана аб тым, што “сапраўды, Алах любіць богабаязненых!” (3, 76). Прыхільнікі суфізму разважаюць над тэкстамі Карана і Суны і імкнуцца трымацца іх прадпісанняў. Яны адмаўляюцца ад усяго мірскога, шануюць беднасць, аддаюць сябе волі Алаха і лічаць неабходным праяўляць стойкасць у перанясенні няшчасцяў і пакут.

У суфізме лічыцца, што ёсць вельмі шмат спосабаў ачышчэння. Прыводзяцца словы Мухамеда аб тым, што колькасць шляхоў да Алаха роўная колькасці сапраўдных вернікаў. Чалавек у сваёй духоўнай практыцы павінен прытрымлівацца ўказання настаўніка, каб не пайсці за Сатаной. З мэтай арганізацыі сумеснай духоўнай дзейнасці ў сярэдзіне XII – пачатку XIII стст. у суфізме ўзніклі ордэны. Шлях ачышчэння ў іх уяўляўся ў выглядзе лесвіцы і складаўся звычайна з наступных ступеняў: пакаянне, звяртанне да Алаха, самаадрачэнне, давер, удзячнасць, беднасць, цярпенне, любоў. Дасягненне кожнай

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

ступені патрабуе асаблівага духоўнага стану, які дае Алах. Звычайна гэта задаволенасць, упэўненасць, блізкасць, любоў, аб’яднанне, веды.

У суфісцкіх ордэнах былі распрацаваны спецыяльныя методыкі для дасягнення асаблівага містычнага стану: вымаўленне сам сабе імёнаў Алаха, спяванне гімнаў, музыка, танцы.

Канчатковай кропкай шляху ачышчэння ў суфізме лічылася дасягненне блізкасці да Бога. Той, хто гэта зрабіў, называўся “валі” (жаночы род “валія”) – “той, які каля Бога”. Суфізм адмаўляе дыстанцыю паміж Алахам і ачышчаным чалавекам, за што ён крытыкаваўся прадстаўнікамі артадаксальнага ісламу.

Зараз суфісцкія ордэны ёсць у большасці мусульманскіх краін, хаця яны і не маюць такога ўплыву, як раней.

На Беларусі мусульмане жывуць ужо больш шасці стагоддзяў. Заўсёды паміж імі і прадстаўнікамі іншых веравання ў існавала ўзаемапавага.

На 1 студзеня 2011 г. на Беларусі зарэгістравана 25 мусульманскіх суполак. Большасць іх дзейнічае ў заходніх абласцях. Ёсць два рэлігійныя аб’яднанні: Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне Рэспублікі Беларусь і Духоўнае ўпраўленне мусульман Рэспублікі Беларусь. На рускай мове выдаецца часопіс, які выходзіў пад рознымі назвамі: “Аль-Джыхад”, “Аль-Іслам”, “Рамазан”, “Жыццё”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 5
# НЕТРАДЫЦЫЙНЫЯ РЭЛІГІІ

1. Азначэнне, прычыны ўзнікнення і тыпы нетрадыцыйных рэлігій.
2. Нетрадыцыйныя рэлігійныя арганізацыі на Беларусі.

## 5.1. Азначэнне, прычыны ўзнікнення і тыпы нетрадыцыйных рэлігій

Сучасная рэлігійная сітуацыя ў свеце характарызуецца наяўнасцю шматлікіх рознанакіраваных працэсаў. Мяняецца роля рэлігіі ў грамадстве, яна набывае новае аблічча. Многія даследчыкі лічаць, што ў XX ст. пачаўся новы этап у развіцці рэлігій, які характарызуецца паслабленнем у Еўропе і Амерыцы ўплыву і аўтарытэту традыцыйных рэлігій і з'яўленнем значнай колькасці новых рэлігійных рухаў і арганізацый, якія часта называюць нетрадыцыйнымі рэлігіямі.

Трэба адзначыць, што самі прыхільнікі гэтых рэлігійных напрамкаў не лічаць іх нетрадыцыйнымі і, як правіла, прэтэндуюць на прыналежнасць да традыцыі, якая можа, па іх словах, налічваць некалькі тысячагоддзяў. Нетрадыцыйнасць гэтых рэлігій праяўляецца не ў тым, што яны ўзніклі параўнальна нядаўна, а ў тым, што прэтэндуюць на "новае слова" альбо "пераадоленне" існуючай рэлігійнай традыцыі, іх палажэнні з'яўляюцца для нас нязвыклымі, не маюць каранёў у еўрапейскай культуры і, звычайна запазычаны з Усходу.

Такім чынам, пад ***нетрадыцыйнымі рэлігіямі*** мы будзем разумець рэлігійныя напрамкі, якія ўзніклі ў Паўночнай Амерыцы ці Еўропе пераважна ў другой палове XX ст., альбо былі сюды прынесены, і асноўныя палажэнні якіх прама супярэчаць традыцыйнаму для гэтых рэгіёнаў хрысціянству.

Называюць наступныя прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання нетрадыцыйных рэлігій:

1. <u>Пераломны характар еўрапейскай культуры XX ст.</u> Старыя каштоўнасці, якімі раней карысталіся еўрапейцы, шмат у чым страцілі сваё жыццёвае значэнне. Гэта праявілася ў многіх галінах культуры. Напрыклад, мы гаворым аб некласічным мастацтве, некласічнай навуцы, некласічнай філасофіі. Па аналогіі прапагандысты нетрадыцыйных рэлігій таксама падкрэсліваюць сваю сучаснасць і прагрэсіўнасць, сцвярджаючы, што іх рух – гэта новы этап у рэлігійным развіцці чалавецтва. Асабліва часта яны абвяшчаюць аб сваёй сувязі з сучаснай навукай і выкарыстоўваюць яе дасягненні. Веравучэнні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

большасці нетрадыцыйных рэлігій уяўляюць сабой даволі прыцягальныя для недасведчанага чалавека светапоглядныя сістэмы, у якіх рэлігійныя палажэнні спалучаюцца з псеўданавуковымі ўяўленнямі аб свеце, грамадстве і чалавеку.

2. Рэзкі рост сацыяльных праблем абумоўлены зменамі ў грамадскім жыцці і паскарэннем тэмпаў яго развіцця. Нетрадыцыйныя рэлігіі прэтэндуюць на вырашэнне гэтых праблем. Для іх характэрна актыўная місіянерская дзейнасць. Калі да іх прыходзіць новы чалавек, да яго ставяцца з падкрэсленай увагай і любоўю. Гэта дае адчуванне абароненасці і душэўнага камфорту.

3. Узмацненне канфлікту паміж рознымі пакаленнямі. Частка сучаснай моладзі на Захадзе нязгодна з рэлігійнымі поглядамі сваіх бацькоў і шукае чагосьці іншага. Звычайна нетрадыцыйныя рэлігіі арыентаваны на “светапоглядна незадаволеных” маладых людзей. Гэта ў першую чаргу маладзёжныя рэлігіі. У ЗША асноўную колькасць іх прыхільнікаў складаюць юнакі і дзяўчаты ад 18 да 24 гадоў з адносна забяспечаных сем’яў, якія маюць добрую адукацыю і не сустракаліся з сур’ёзнымі матэрыяльнымі цяжкасцямі.

4. Экзатычны характар новых рэлігій. Яны грунтуюцца на нязвыклых для прадстаўнікоў еўрапейскай культуры прынцыпах і ўяўляюцца нечым новым і незвычайным. Вельмі часта далучэнне да нетрадыцыйных рэлігій з’яўляецца вынікам імкнення чалавека змяніць сваё звыклае асяроддзе.

5. Страта даверу да традыцыйных рэлігій. Абумоўлена гэта перш за ўсё няўменнем апошніх працаваць у сучасных умовах.

Вылучаюцца наступныя тыпы нетрадыцыйных рэлігій:

1. Псеўдарэлігійныя аб’яднанні (тэасофія, вучэнне Агні Ёгі, Царква саенталогіі, Новы век (New Age) і г. д.) – групы па пошуку новай духоўнасці. Псеўдарэлігійнымі называюцца таму, што асноўны націск робяць не на веру, а на інтэлект, пры дапамозе якога імкнуцца дасягнуць нейкіх звышнатуральных ведаў.

Культу ў гэтых арганізацыях надаецца вельмі малое значэнне. Для поглядаў іх прыхільнікаў характэрны надзвычайны эклектызм.

2. Неаарыенталісцкія суполкі і рухі (Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны, дзэн-будызм, Трансцэндэнтальная Медытацыя і інш.). Веравучэнне і культавая практыка гэтых арганізацый грунтуецца на палажэннях, запазычаных з усходніх рэлігій, як правіла, будызму і індуізму. Супрацьпастаўляюць “інтэлектуальнай” і “тэхнагеннай” культуры Захаду, развіццё якой прывяло да войнаў, экалагічнай катастрофы, разбурэння духоўнасці, “арганічную” культуру Усходу, накіраваную на ўстанаўленне гармоніі чалавека з Сусветам.

РЭПАЗІТАРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

3. Неахрысціянскія культы (Вялікае Белае Брацтва, Царква Апошняга Запавету, Царква Аб’яднання і інш.). Гэтыя арганізацыі прэтэндуюць на развіццё хрысціянства на падставе “новай духоўнасці”, імкнуцца дапоўніць хрысціянскае веравучэнне палажэннямі ўсходніх рэлігій. Для прыхільнікаў неахрысціянскіх культаў характэрны ўжыванне псеўданавуковай тэрміналогіі, чаканне блізкага канца свету, вера ў Месію. У якасці апошняга яны разглядаюць свайго кіраўніка. Ён абвяшчаецца пасланнікам Бога альбо самім Богам, які прынёс людзям новае адкрыццё і вышэйшую духоўнасць.

Неахрысціянскія культы вельмі небяспечны для грамадства. Чалавек, паверыўшы ў “жывога Бога”, перакрэслівае сваё папярэдняе жыццё, адмаўляецца ад родных, кідае працу альбо вучобу і прысвячае сябе служэнню культу. Вельмі часта неахрысціянскія арганізацыі ўступаюць у канфлікт з законам, і іх лідары прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

3. Сатанізм лічыцца нетрадыцыйным рэлігійным напрамкам, бо свядома супрацьпастаўляе сябе існуючай рэлігійнай і культурнай традыцыі. Сатаністы адкрыта абвяшчаюць, што яны з’яўляюцца носьбітамі зла і адмаўляюць агульнапрынятыя маральныя нормы.

Сярод нетрадыцыйных рэлігій у якасці асобнай групы вылучаюць дэструктыўныя культы. Гэта такія рэлігійныя арганізацыі, якія грунтуюць сваю дзейнасць на змене свядомасці сваіх прыхільнікаў з мэтай іх поўнага падпарадкавання. У дэструктыўных культах шырока ўжываюцца метады ўнушэння і самаўнушэння: шматразовае паўтарэнне адных і тых жа палажэнняў, устрыманне ад ежы, музыка, танцы, у асобных выпадках – псіхатропныя і наркатычныя рэчывы. Гэта прыводзіць да трансфармацыі свядомасці чалавека, страты здольнасці крытычна мысліць, канфліктаў з блізкімі людзьмі. Дзейнасць дэструктыўных культаў звязана з нанясеннем шкоды грамадству і асобным людзям.

## 5.2. Нетрадыцыйныя рэлігійныя арганізацыі на Беларусі

Мы разгледзім толькі некаторыя нетрадыцыйныя рэлігійныя арганізацыі і рухі, якія зараз існуюць на Беларусі.

Новы Век (New Age) з’яўляецца зараз адным з найбольш папулярных псеўдарэлігійных рухаў у краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Акрэсліць яго сутнасць вельмі цяжка, бо Новы Век складаецца з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вялікай колькасці разнастайных арганізацый і напрамкаў. Аб'ядноўваюць іх пошукі "новай духоўнасці".

Заснавальнік Новага Веку невядомы. Сама назва гэтага руху з'явілася ў 70-я гг. у ЗША. Яго прыхільнікі лічаць, што наш час з'яўляецца пераломным у гісторыі чалавецтва. У выніку змен становішча Зямлі адносна зорак адбываецца пераход ад веку Рыб да веку Вадалея. Новы Век павінен надысці да 2062 г. Адбудуцца істотныя змены ў культуры: калі ўплыў сузор'я Рыб абумовіў антрапацэнтрычны, аналітычны, рацыянальны, патрыярхальны і еўрапацэнтрычны характар сусветнай культуры, дык пад уплывам сузор'я Вадалея культура зробіцца касмацэнтрычнай, сінтэтычнай, містычнай, феміністычнай і поліцэнтрычнай.

Адбудуцца таксама змены ў рэлігійнай сферы. Кожная са старых рэлігій веку Рыб (індуізм, будызм, хрысціянства, іслам і інш.) валодала толькі часткай ісціны. Яны выканалі сваё прызначэнне, і на змену ім у век Вадалея прыходзіць сінтэтычная духоўнасць, якая ўвасабляецца ў руху Новага Веку.

Для поглядаў яго прыхільнікаў характэрны наступныя рысы:

1) акультызм. Лічаць, што развіццё чалавецтва адбываецца дзякуючы Духоўным Настаўнікам, якія валодаюць патаемнымі ведамі і складаюць Вялікае Белае Брацтва. Духоўнымі Настаўнікамі лічацца заснавальнікі рэлігій: Буда, Хрыстос, Маісей, Заратустра, Мухамед і інш;

2) вера ў астралогію. Лічаць, што развіццё культуры чалавецтва залежыць ад становішча Зямлі адносна зорак. Уплыў кожнага сузор'я абумоўлівае спецыфічны тып культуры;

3) пантэізм. Звышнатуральныя якасці прыпісваюцца як Сусвету ў цэлым, так і асобным яго часткам: Сонцу, вадзе, раслінам, камяням і г. д. Лічыцца, што ўсе яны насычаны духоўнасцю і аказваюць уплыў на чалавека;

4) вера ў рэінкарнацыю. Лічаць, што чалавек перараджаецца, каб з кожным разам дасягнуць большай ступені духоўнасці;

5) сінкрэтызм. Погляды прыхільнікаў Новага Веку ўяўляюць сабой мешаніну з палажэнняў многіх рэлігій. Да хрысціянства прыхільнікі Новага Веку ставяцца з падкрэсленай павагай, але лічаць, што яно не адпавядае сучасным умовам і патрабуе мадэрнізацыі.

Да руху Новага Веку на Беларусі належаць часцей маладыя людзі, якія шукаюць "нечага духоўнага" ў жыцці. Яны ўтвараюць невялікія групы сяброў, сустракаюцца, ходзяць у паходы, слухаюць музыку, абмяркоўваюць "духоўную" літаратуру.

Найбольш вялікай з сучасных неаарыенталісцкіх рэлігійных арганізацый з'яўляецца Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны. Яно налічвае прыкладна 700 тыс. прыхільнікаў. Цэнтр гэтай арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знаходзіцца ў г. Маяпур (Індыя), але распаўсюджана яна пераважна ў краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Па сваім характары крышнаізм з’яўляецца неаіндуісцкім кірункам.

Узнікла Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны ў 1966 г. у ЗША. Яго заснавальнікам з’яўляецца індыйскі прапаведнік Абхай Шыран Дэ (1896–1977 гг.), больш вядомы пад рытуальным імем Бхакціведанта Свамі Прабхупада. Нарадзіўся ён у Калькуце (Індыя), скончыў тут універсітэт, займаўся бізнесам. У 1950 г. пакінуў жонку і пецярых дзяцей і зрабіўся манахам. У верасні 1965 г. ён прыязджае ў Нью-Ёрк і пачынае прапаведаваць новае вучэнне, а праз год засноўвае Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны.

Крышнаіты сцвярджаюць, што іх веравучэнне мае доўгую традыцыю, заснавальнікам якой з’яўляецца сам бог Крышна. Свяшчэнныя веды перадаваліся ад настаўнікаў іх вучням і, нарэшце, дайшлі да Свамі Прабхупады, які выклаў іх на зразумелай для людзей XX ст. мове ў сваёй кнізе “Бхагават-Гіта як яна ёсць”.

Імя “Крышна” перакладаецца як “Чорны”, “Цёмны”, “Цёмна-сіні”, хаця самі крышнаіты перакладаюць яго як “Усёпрыцягваючы”. У традыцыйным індуізме Крышна лічыцца адной з дзесяці праяў (аватар) бога Вішну, але крышнаіты сцвярджаюць, што, наадварот, гэта Вішну – аватара Крышны, як, дарэчы, і ўсе астатнія багі.

Асноўная якасць Крышны, якая падкрэсліваецца крышнаітамі, – гэта яго шчодралюбства. Сцвярджаецца, што ён меў 16 тыс. жонак, прычым кожную ноч быў адначасова з кожнай з іх. Схільнасць жанчын да Крышны тлумачыцца сімвалічна, як накіраванасць чалавечых душ да зліцця з Богам. Асноўны націск у крышнаізме робіцца на любоўным служэнні чалавека Крышне. Мэтай культавай дзейнасці лічыцца зліццё са свядомасцю Крышны.

Згодна з веравучэннем крышнаізму, асновай чалавека з’яўляецца душа. Яна жыве вечна, цела – толькі яе абалонка, і душа можа мяняць гэтую абалонку. Крышнаіты прызнаюць рэінкарнацыю: у адпаведнасці з добрай альбо дрэннай кармай душа пасля смерці пасяляецца ў чалавеку, жывёле альбо расліне. Такія перараджэнні могуць адбывацца бясконца, але чалавек здольны разарваць гэты ланцуг, праз асэнсаванне сваёй духоўнай сутнасці і далучэнне да адзінства з Крышнай.

Асноўным шляхам да гэтага з’яўляецца медытацыя. Лічыцца, што ў працэсе яе чалавек цалкам выключаецца з гэтага свету і канцэнтруецца на любові да Бога. Стан выключанасці дасягаецца праз спяванне мантры “Харэ Крышна, Харэ Крышна; Крышна, Крышна, Харэ Харэ; Харэ Рама, Харэ Рама; Рама Рама, Харэ Харэ”. Тут “Харэ” – звяртанне да вышэйшай энергіі, “Крышна” і “Рама” – імёны Бога.

Крышнаіт абавязаны паўтараць гэтую форму 1728 разоў у дзень, а каб не збіцца з падліку, выкарыстоўваюцца пацеркі.

Вялікае значэнне ў крышнаізме надаецца самаабмежаванню чалавекам сваіх матэрыяльных патрэб. Забаронена есці мяса, рыбу, яйкі, насіць адзенне са скуры і шэрсці, бо ўсё гэта звязана з забойствам жывёл. Крышнаіты прапагандуюць вегетарыянскую ежу, адкрываюць вегетарыянскія сталовыя і кафэ. Забараняецца ўжыванне адурманьваючых і ўзбуджаючых рэчываў, у тым ліку тытуню, кавы, чаю. Асуджаюцца неўпарадкаваныя палавыя адносіны. Мужу і жонцы дазваляецца ўступаць у палавую сувязь толькі тады, калі гэта можа прывесці да зачацця дзяцей. Разводы забаронены. Мужчыны-крышнаіты голяць галаву, пакідаючы толькі касічку, за якую Крышна “прыцягне іх да сябе”. У час сваіх рытуалаў крышнаіты апранаюць традыцыйнае індыйскае адзенне, звычайна аранжавага колеру.

Лічыцца, што лепшым месцам для выканання ўсіх патрабаванняў крышнаізму з’яўляецца рэлігійная камуна (ашрам). Як правіла, у нашых умовах гэта кватэра, дзе пад кіраўніцтвам духоўнага настаўніка (гуру) вывучаецца “Бхагават-Гіта” і адпраўляецца культ. У асноўным ашрамы складаюцца з маладых людзей, прыкладна ад 18 да 30 гадоў.

Любая дзейнасць успрымаецца ў крышнаізме як служэнне Крышне: прыбіранне ашрама, гатаванне культавай ежы, дабрачыннасць. Вялікая ўвага надаецца місіянерскай дзейнасці: перакладу, выданню і продажу рэлігійнай літаратуры, прапагандзе веравучэння.

Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны з’яўляецца багатай рэлігійнай арганізацыяй. Прыкладна 70 % свайго даходу яно атрымлівае ад продажу рэлігійнай літаратуры, у асноўным – твораў Свамі Прабхупады. Таварыству належаць фабрыкі па вытворчасці касметычных і духмяных рэчываў, крамы і рэстараны дыетычнай ежы, сельскагаспадарчыя фермы. Выдаюцца часопісы "На шляху да Бога", “Свет Чайтаны”, “Харэ Крышна” і інш.

Пасля смерці Свамі Прабхупады Міжнароднае Таварыства Свядомасці Крышны ўзначальвае адміністратыўны савет з 11 яго паслядоўнікаў. Увесь свет падзелены на 11 рэгіёнаў, за кожным з якіх замацаваны гуру.

На тэрыторыі былога СССР рух крышнаітаў з’явіўся пасля таго, як у 1971 г. краіну наведаў Свамі Прабхупада і пасвяціў у крышнаіты некалькі чалавек. У 80-я гады супраць крышнаітаў у СССР былі ўзбуджаны крымінальныя справы па абвінавачванні ў “стварэнні і кіраўніцтве не зарэгістраванымі ў дзяржаўных органах з-за іх рэакцыйнай сутнасці рэлігійнымі групамі”. У далейшым прыгаворы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў адносінах крышнаітаў былі адменены. Зараз суполкі крышнаітаў дзейнічаюць амаль у ста гарадах былога СССР. У Беларусі на 1 студзеня 2011 г. існавала 6 зарэгістраваных суполак крышнаітаў.

Самым вядомым неахрысціянскім напрамкам у нашай краіне з'яўляецца Вялікае Белае Брацтва ЮСМАЛОС. Яно было заснавана ў Кіеве Юрыем Крываногавым і Марыяй Цвігун 1 чэрвеня 1990 г. Да гэтага Ю. Крываногаў з'яўляўся супрацоўнікам Інстытута кібернетыкі, меў навуковую ступень кандыдата тэхнічных навук. Цікавіўся праблемамі псіхаэнергетыкі, быў блізкі да крышнаітаў, выступаў з лекцыямі па лініі таварыства "Веды". У 1990 г. заснаваў і ўзначаліў Міжнародны Інстытут душы "Атма". Інстытут выдаваў творы Крываногава аб ёзе, біяэнергетыцы, перасяленні душ, выпускаў газету "Атма". Марыя Цвігун да пачатку сваёй рэлігійнай дзейнасці змяніла некалькі прафесій: папрацавала інструктарам райкама камсамола, вартаўніком, афіцыянткай, журналісткай. Яна была замужам і мела сына.

Безумоўна, што ідэолагам новага вучэння з'яўляўся Ю. Крываногаў, але асноўная роля ў ім адводзілася М. Цвігун. Яна была абвешчана адначасова Дзевай Марыяй і Ісусам Хрыстом і стала называцца Маці Міра Гасподзь Марыя Дэві Хрыстос. Ю. Крываногаў жа стаў "толькі" Адамам, Іаанам Хрысціцелем, Зямным Айцом, прарокам Іллёй, архангелам Міхаілам і атрымаў тытул Юоана Свамі. "Адбыліся" ўсе гэтыя падзеі наступным чынам. У Данецку ("Віфліеме") 11 красавіка 1990 г., калі Марыі Цвігун споўнілася 30 гадоў і "адчыніліся ўсе яе жыццёва важныя цэнтры", яна памерла, яе душа была ўзята на неба, там аб'ядналася ў адзіную сутнасць з Дзевай Марыяй і Ісусам Хрыстом, і праз 3,5 гадзіны адбылася поўная "эксплантацыя" Бога на зямлю ў вобразе Марыі Дэві Хрыстос. Некалькі гадзін пасля гэтага яе цела было светлавым і "выпраменьвала вібрацыю больш, чым у 100 рэнтген", пасля чаго ўплатнілася ў выглядзе першапачатковага фізічнага цела. Адначасова была ўключана праграма ЮСМАЛОС (ЮС – Юоан Свамі, МА – Марыя Дэві, ЛОС – планетарны Логас Ісус Хрыстос), накіраваная на выратаванне Сусвету шляхам насычэння яго фохатам (святлом). Фохат ідзе ад Марыі Дэві Хрыстос, якая ўвасабляе ў сабе мужчынскі і жаночы пачатак. Праграма павінна была дзейнічаць 3,5 гады. За гэты час прадугледжвалася стварыць на Зямлі Вялікае Белае Брацтва ЮСМАЛОС. Завершыцца праграма стварэннем зямной царквы са 144 тыс. насычаных фохатам праведнікаў. Пасля гэтага час прышэсця Марыі Дэві Хрыстос скончыцца, і яе фізічнае цела 21 лістапада 1993 г. будзе забіта. Але праз 3,5 дні яна ўваскрэсне. На 24 лістапада 1993 г. быў прызначаны Апошні Суд, пасля якога застануцца 144 святых, яны разам з Марыяй Дэві Хрыстос і Юоанам

Свамі трапяць на неба, яшчэ 600 млн юсмаліян заселяць ачышчаную і пераўтвораную зямлю. Астатнія пойдуць у пекла.

Ю. Крываногаў і М. Цвігун пачалі актыўна прапаведаваць сваё вучэнне, заяўляючы, што яны прыйшлі на зямлю, каб выратаваць яе ад грахоў, бо з-за іх мноства стан планеты зрабіўся крытычным, “асабліва ў зоне славянскага рэгіёна – Русі”. Як гэта ні дзіўна, у іх з’явіліся прыхільнікі, колькасць якіх па розных ацэнках складала ад 15 да 20 тыс. Было выдадзена да 100 тыс. лістовак са здымкамі “Марыі Дэві Хрыстос” і “Юоана Свамі”, выдавалася газета “Юсмалос”, прыхільнікі Белага Брацтва прапаведавалі на вуліцах і нават выступалі па тэлебачанні. Яны казалі аб канцы свету, прыходзе Хрыста, “Апошнім судзе”.

У пачатку лістапада 1993 г. юсмаліяне сталі з’язджацца ў Кіеў і рыхтавацца да “Апошняга суда”. 24 лістапада былі справакаваны масавыя хваляванні, у ходзе якіх пашкоджаны фрэскі і іканастас Сафійскага сабора, захопленага юсмаліянамі. Міліцыяй было затрымана звыш 800 чалавек.

Следства па справе Белага Брацтва цягнулася амаль два з паловай гады. 9 лютага 1996 г. Кіеўскі гарадскі суд прыгаварыў Марыю Цвігун да 4 гадоў турэмнага зняволення ў калоніі агульнага рэжыму (адпушчана ў канцы 1998 г. па амністыі), Ю. Крываногава – да 7 год зняволення ў калоніі строгага рэжыму.

За час следства ў Белым Брацтве адбыўся раскол. Усю віну за падзеі лістапада 1996 г. М. Цвігун усклала на Ю. Крываногава. Ён быў абвешчаны здраднікам, Каінам, Іудай, Люцыферам. Як высветлілася, ён насаджаў у Белым Брацтве прынцыпы крышнаіцтва, у прыватнасці ежавыя забароны, а таксама аказваў на М. Цвігун псіхічны і фізічны націск. У выніку, нават імя Юоана Свамі было старанна выкрэслена з усёй літаратуры Белага Брацтва.

Знаходзячыся пад следствам, М. Цвігун выпусціла зборнік вершаў і пасланняў да сваіх прыхільнікаў пад назвай “У закланні”. Адным з яго палажэнняў з’яўляецца тое, што праграма фохацізацыі не скончана, яна толькі запаволілася з-за здрадніцтва Ю. Крываногава, і трэба далей прапаведаваць ідэі Белага Брацтва, асабліва ў славянскім рэгіёне: Украіне, Расіі і Беларусі. Аднак ад вызначэння канкрэтнай даты Апошняга суда адмовіліся. Колькасць прыхільнікаў Белага Брацтва на Беларусі зараз невядома. Мы разглядаем гэтую арганізацыю як прыклад рэлігійнага фанатызму.

<u>Царква Аб’яднання (Асацыяцыя Святога Духа за аб’яднанне сусветнага хрысціянства</u>) была заснавана 1 мая 1954 г. у Паўднёвай Карэі прапаведнікам Сэн Мён Мунам. З 1972 г. цэнтр арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знаходзіцца ў ЗША. Зараз налічваецца прыкладна 1,5–2 млн яе прыхільнікаў больш чым у 160 краінах свету. З 1997 г. як царква афіцыйна ліквідавана, існуе ў выглядзе асацыяцыі шматлікіх арганізацый, створаных Мунам і прызначаных для распаўсюджвання яго поглядаў. Вось назвы некаторых з іх: “Праект адзінства”, “Міжнародны фонд Дапамогі і Адзінства”, “Міжнародны Фонд Культуры”, “Міжнародны Фонд Адукацыі”, “Міжуніверсітэцкая Асацыяцыя па Вывучэнні Прынцыпа” (CARP), “Акадэмія прафесароў за мір ва ўсім свеце”.

Веравучэнне Асацыяцыі Святога Духа выкладзена ў кнізе “Боскі Прынцып”, якая была напісана са слоў Муна яго прыхільнікамі і выдадзена ў 1957 г. у Сеуле. У далейшым яна была перакладзена на многія мовы, у тым ліку і на рускую, і некалькі разоў перавыдавалася. Хаця ў гэтай кнізе абвешчана прэтэнзія на дасягненне вяршыні рэлігійнага і філасофскага развіцця чалавецтва, асноўныя яе ідэі даволі простыя. Існуе Адзіны Бог, Айцец усіх народаў, які абвясціў сябе ў розных рэлігіях: іўдаізме, хрысціянстве, ісламе, будызме і інш. Усе яны служаць мэце набліжэння чалавека да Бога і распаўсюджанню дабра. Аднак форма іх існавання розная і вызначаецца іх місіяй, культурай, у якой яны зарадзіліся, і часам іх узнікнення. Людзі прызначаны для таго, каб жыць у Царстве Божым. Для гэтага Бог стварыў Сапраўдных Бацькоў чалавецтва Адама і Еву і даў ім запаведзі. Аднак Ева ўступіла ў сувязь з Д’яблам і ўпала ў грэх, а потым перадала яго Адаму. Такім чынам, Адам з Евай не выканалі сваю функцыю Сапраўдных Бацькоў, і іх патомства было ўжо дзецьмі не Бога, а Сатаны. Таму  зло пачало панаваць у свеце. Каб выправіць сітуацыю, Бог пасылаў людзям пракаў: Ноя, Аўраама, Маісея і, нарэшце, свайго сына Ісуса Хрыста. Аднак усе яго намаганні аказаліся марнымі. Гэтыя пасланцы не выканалі сваёй місіі. У прыватнасці, Ісус Хрыстос змог выратаваць людзей толькі духоўна, але не стаў Сапраўдным Бацькам чалавецтва, бо быў выдадзены сваім вучнем Іудай і не паспеў стварыць сям’ю. Але ў XX ст. ў Карэі нарадзіўся новы Месія Сэн Мун, якому прызначана аб’яднаць усе рэлігіі, стварыць Сапраўдную Сям’ю, выратаваць людзей як духоўна, так і цялесна і пакласці пачатак новаму чалавецтву. Прыхільнікі Муна адмаўляюць, што яны лічаць яго богам, аднак яму прыпісваюцца звышнатуральныя якасці. Ён “Пераможца ўніверсума і Гаспадзін стварэння”, “Бязмежны пераможца нябес і зямлі”, “Сын Бога і пакарыцель Сатаны” і г. д.

Асноўным дасягненнем Муна ў духоўнай сферы лічыцца тое, што ён аб’яднаў усе рэлігіі ў адну, якую пабудаваў на грунце апошніх філасофскіх і навуковых дасягненняў чалавецтва. Усю гісторыю

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

муніты падзяляюць на тры перыяды: век Старога Запавету, век Новага Запавету і век Завершанага Запавету. Першыя два перыяды знайшлі сваё адлюстраванне ў Бібліі. Трэці перыяд пачаўся ў 1960 г., і яго месіяй з’яўляецца Мун. Ён павінен пабудаваць Царства Божае на Зямлі. Галоўнымі перашкодамі для дасягнення гэтай высакароднай мэты Мун лічыць расізм, войны, беднасць і іншыя сацыяльныя заганы. Таму асноўнае значэнне ў Асацыяцыі Святога Духа надаецца не індывідуальнаму маральнаму самаўдасканальванню, а актыўнаму сацыяльнаму дзеянню. Зараз Асацыяцыя Святога Духа з’яўляецца адной з самых багатых рэлігійных арганізацый свету. Яна валодае прадпрыемствамі ў харчовай прамысловасці, рыбалоўстве, вытворчасці камп’ютараў, медыцынскай тэхнікі, станкабудаванні, выпускае некалькі газет і часопісаў.

Як такога культу ў Царкве Аб’яднання няма. Галоўнае ў ёй, згодна з веравучэннем Муна – не фармальныя каноны і абрады, а людзі, якія клапоцяцца аб іншых. Таму вялікае значэнне надаецца дабрачыннай, а таксама палітычнай дзейнасці. Сацыяльная дактрына Царквы Аб’яднання свядома і паслядоўна антыкамуністычная. Камунізм разглядаецца Мунам як праява Сатаны.

Царква Аб’яднання арганізавана па прынцыпу адзінай сям’і. Усе яе члены лічацца дзецьмі Сэн Мён Муна і яго жонкі Хак-Джа Хан-Мун. Яны абвешчаны Сапраўднымі Бацькамі чалавецтва. Калі рэальныя бацькі супраць уступлення сваіх дзяцей у Царкву Аб’яднання, дык яны служаць Сатане, і, безумоўна, слухацца іх не трэба. Мун рэгулярна падбірае супругаў сярод сваіх паслядоўнікаў. Тыя маладыя людзі, якія не менш 3 гадоў займаліся місіянерскай дзейнасцю і прывялі ў новую веру трох чалавек, могуць падаць свае дадзеныя Муну, які іх вывучае і падбірае шлюбныя пары. Потым будучыя муж і жонка на працягу года вывучаюць адзін аднаго і калі прыходзяць да высновы, што падыходзяць адзін аднаму, уступаюць у шлюб. Блаславляе іх Мун. У Царкве Аб’яднання практыкуюцца масавыя вянчанні на стадыёнах. Колькасць уступаючых у шлюб пар пры гэтым дасягае некалькі дзесяткаў тысяч чалавек.

На тэрыторыі СССР Царква Аб’яднання пачала неафіцыйна дзейнічаць у пачатку 70-х гг. Яе членамі ў асноўным былі замежныя спецыялісты, якія тут працавалі. Савецкія ўлады справядліва лічылі Царкву Аб’яднання антыкамуністычнай арганізацыяй, і таму тых іншаземцаў, якіх падазравалі ў прыналежнасці да яе, пад рознымі зачэпкамі высылалі з краіны. У пачатку 80-х гадоў у некаторых буйных гарадах з’явіліся першыя муніты з савецкіх грамадзян. У асноўным гэта былі перакананыя антыкамуністы. Легалізацыя дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Царквы Аб'яднання адбывалася пасля таго, як у красавіку 1990 г. Мун наведаў СССР і сустрэўся з прэзідэнтам М. С. Гарбачовым. У Расіі Царква Аб'яднання зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі, колькасць мунітаў тут па розных ацэнках складае 1,5–2 тыс. чалавек.

На Беларусі муніты з'явіліся ў 1992 г. Яны дзейнічалі праз свае дачыныя арганізацыі: Студэнцкую Асацыяцыю "CARP" і "Міжнародную федэрацыю жанчын за мір ва ўсім свеце". Колькасць членаў гэтых арганізацый была невялікай, але яны вялі актыўную місіянерскую дзейнасць у асноўным праз розныя курсы і семінары, на якіх прапагандавалі ідэі Муна. Зараз гэтыя арганізацыі ў нашай краіне пазбаўлены рэгістрацыі, і іх афіцыйная дзейнасць спынілася.

Сатанізм з'яўляецца паслядоўна антыхрысціянскім рэлігійным напрамкам. Яго прыхільнікі шануюць Сатану як антыпода хрысціянскага Бога. Згодна з хрысціянскім веравучэннем, Сатана (ад старажытнаяўрэйск. *satan* – праціўнік) – гэта крыніца ўсяго зла на зямлі, вораг чалавека, валадар пекла, кіраўнік усёй нячыстай сілы. Па сваім паходжанні – гэта анёл, які паўстаў супраць Бога і быў скінуты ў пекла. Адно з яго шматлікіх імёнаў – Люцыфер – "Анёл ранішняй зоркі". Шанаванне Сатаны пачалося яшчэ ў першыя стагоддзі нашай эры. Да яго звярталіся за дапамогай у благіх справах: знішчэнне ворага, насыланне зла, падман і г. д. Лічылася, што Сатана можа выканаць любую просьбу чалавека, але ўзамен забірае сабе яго душу. У сярэднія стагоддзі ў Заходняй Еўропе былі шырока распаўсюджаны так званыя "чорныя месы", у якіх шанаваўся Сатана. Гэта была пародыя на хрысціянскую месу, правілася яна ноччу, у разбуранай царкве, на алтары змяшчалася распранутая жанчына, на жывот ёй клалася распяцце дагары нагамі, паміж кален ставілася чаша, куды лілася сапраўдная кроў – у час чорнай месы рэзалі нехрышчонае немаўля. Хрысціянская царква рашуча змагалася з сатанізмам. Пры гэтым вельмі часта ў зносінах з Сатаной абвінавачваліся нявінныя людзі: жанчыны-знахаркі, ерэтыкі, псіхічна хворыя, якіх у выніку спальвалі на вогнішчы. Асабліва пацярпелі жанчыны, бо лічылася, што яны па сваёй прыродзе схільныя да сувязяў з Сатаной. Так званая "працэсы над ведзьмамі" – адна з ганебных старонак у гісторыі хрысціянскай царквы.

Сатаніскі рух XX ст. уяўляе сабой шэраг напрамкаў, кожны са сваёй праграмай і заснавальнікам. Найбольш вядомым з апошніх з'яўляецца англійскі акультыст Алістэр Кроўлі (1875–1947 гг.). Сваім паслядоўнікам ён абяцаў дасягненне сатанінскай моцы шляхам напаўнення сексуальна-аргіястычнай энергіяй, якая "пранізвае ўвесь космас". Для гэтага ім была распрацавана складаная сістэма магічных рытуалаў, куды ўваходзілі крывавыя ахвярапрынашэнні, ужыванне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

наркотыкаў і сексуальныя ненармальнасці. А. Кроўлі прапаведаваў маральную ўседазволенасць і любыя пачуццёвыя асалоды па прынцыпе: “рабі тое, што табе падабаецца”. Сам ён памёр ад перадазіроўкі наркотыкаў.

Адной з самых вядомых сатанінскіх арганізацый ХХ ст. з’яўляецца “Царква сатаны”, заснаваная ў 1966 г. у ЗША былым дрэсіроўшчыкам львоў Энтані Шандарам Лавэем, які ў Вальпургіеву ноч, 30 красавіка, гучна абвясціў аб пачатку сатанінскай эры на Зямлі. Яшчэ да гэтай “гістарычнай падзеі”, у 1959 г. тыражом 125 тыс. асобнікаў выйшла напісаная Э. Лавэем “Біблія Сатаны”, якая атрымала шырокае распаўсюджванне ў Амерыцы і Еўропе і вытрымала некалькі перавыданняў, у тым ліку і на рускай мове. Уся гэтая кніга пабудавана на перакручванні евангельскіх палажэнняў. Асноўным абавязкам чалавека абвешчана дасягненне самазацвярджэння любымі сродкамі. “Князь цемры” для яго наваяўленых прыхільнікаў – гэта ўвасабленне самаўзвялічанага Я. Адвяргаюцца “слабыя”, “лібералы” і “вырадкі”‘. Д’ябал уяўляецца ў аўры гэткага супермэна, імітаваць якога павінны яго прыхільнікі. Вось некалькі палажэнняў з “Бібліі Сатаны”: “Той, хто падстаўляе другую шчаку, – труслівы сабака”, “Ты павінен кіравацца сваімі прыроджанымі інстынктамі”, “Няхай будуць праклятыя лагодныя, бо яны наследуюць прыгнёт”, “Няхай будуць блаславеныя моцныя, бо яны будуць валадарыць зямлёй”, “Ці не з’яўляемся мы, кіруючыся інстынктамі, драпежнымі звярамі? Калі чалавечыя істоты цалкам перастануць рабіць адзін аднаго сваёй здабычай, ці змогуць яны працягваць сваё існаванне?”. У той жа час у “Бібліі Сатаны” адмаўляюцца крывавыя ахвярапрынашэнні, асабліва чалавечыя, – мэтай сатаніста абвяшчаецца самарэалізацыя шляхам паслядоўнага адмаўлення хрысціянскіх нормаў, а не прычыненне шкоды іншаму чалавеку.

Э. Лавэй разглядаў Сатану як выратавальніка, які клапоціцца аб плоцкіх патрэбах чалавека. Ён лічыў, што чалавек па сваёй сутнасці з’яўляецца жорсткай і эгаістычнай істотай, часам больш нізкай, чым жывёла, таму трэба аддаваць Д’яблу д’яблава.

На тэрыторыю былога Савецкага Саюза сатанізм пранік у пачатку 70-х гг. праз Адэсу. Потым сатанінскія арганізацыі былі створаны ў Маскве і Ленінградзе і далей у многіх іншых, як правіла, буйных гарадах СССР.

Існуюць сатаністы ва ўмовах строгай канспірацыі, часта іх дзейнасць мае крымінальны характар, і звестак аб гэтай секце вельмі мала. Вядома, што на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі зараз існуе ад 80 да 100 сатанінскіх арганізацый у больш чым 40 гарадах, пры гэтым каля 40 – толькі ў Маскве, і каля 10 – у Санкт-Пецярбурзе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дакладная колькасць сатанінскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі невядома. Мяркуецца, што яны ёсць амаль ва ўсіх буйных гарадах краіны. Праўда, тэрмін існавання гэтых арганізацый звычайна невялікі. У асноўным складаюцца яны з моладзі, для якой сатанізм – адна з экзатычных забаў, якая нярэдка спалучаецца з алкаголем, сексам і наркотыкамі. Распаўсюджанню сатанізму ў маладзёжным асяроддзі спрыяе зацікаўленасць так званым "цяжкім рокам", у якім музыка, прызначаная выклікаць у слухачоў агрэсіўную энергію, спалучаецца з тэкстамі, у якіх адмаўляюцца хрысціянскія і гуманістычныя каштоўнасці і, часам, адкрыта прапаведуецца культ Сатаны.

У пачатку 90-х гадоў сатаністы ў краінах былога Савецкага Саюза заявілі аб сабе шэрагам гучных крымінальных спраў, у асноўным з нагоды апаганення хрысціянскіх храмаў і рытуальных забойстваў. На тэрыторыі Беларусі адбылося адно такое забойства. У кастрычніку 1995 г. у Брэсце двое сатаністаў сякерай забілі маладога чалавека, таксама члена сатанінскай групоўкі. У асноўным сатаністы на сваіх службах па-садысцку забіваюць катоў і сабак, а потым выкарыстоўваюць іх кроў з рытуальнымі мэтамі.

Хрысціянства сатаністы лічаць "ілжывай жыдоўскай рэлігіяй", яны выварочваюць крыжы на могілках, робяць на цэрквах надпісы тыпу "Сатана жывы", "Смерць хрысціянскім сабакам", малююць перавернутую зорку і лічбу 666. Нярэдка гэта робіцца з хуліганскіх меркаванняў юнакамі, якія не маюць да сатанізму ніякіх адносін.

Сацыялагічныя і псіхалагічныя даследаванні сведчаць, што часцей да сатаністаў трапляюць тыя маладыя людзі, у сем'ях якіх няма ўзаемапаразумення і пачуцця адзінства, таму яны гвалтоўным чынам імкнуцца задаволіць гэтыя патрэбы, пры адначасовым вострым адчуванні жаху і бессэнсоўнасці жыцця. Такім чынам, сатанізм для іх з'яўляецца спосабам агрэсіўнай кампенсацыі атрыманых псіхічных траўм, самазацвярджэння сябе шляхам адмаўлення прынятых маральных нормаў. Звычайна гэта спалучаецца з пошукам задавальнення ў наркотыках, алкаголі альбо сексе пры агульнай незадаволенасці самім сабой і адчуванні сваёй духоўнай убогасці. Вельмі часта гаворка павінна весціся не аб свядомым прыняцці чалавекам сатанінскіх поглядаў, а аб яго псіхічнай траўміраванасці і маральнай дэзарыентацыі.

Трэба адзначыць, што паняцце "нетрадыцыйная рэлігія" даволі ўмоўнае, і пад яго падпадаюць вельмі непадобныя паміж сабой вераванні і культы, таму да іх патрэбны дыферэнцыраваны падыход. Зараз у свеце налічваецца 121 млн прыхільнікаў нетрадыцыйных рэлігій.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЭМА 6
# РЭЛІГІЯ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

6.1. Сучасная рэлігійная сітуацыя ў свеце.
6.2. Рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі.
6.3. Беларускае заканадаўства аб свабодзе сумлення.

## 6.1. Сучасная рэлігійная сітуацыя ў свеце

Сучасная рэлігійная сітуацыя ў свеце характарызуецца шэрагам рознанакіраваных і складаных працэсаў.

Перш за ўсё не пацвердзілася ўяўленне папярэдніх мысліцеляў аб знікненні рэлігіі па меры развіцця культуры і распаўсюджвання вальнадумства і атэізму.

**Вальнадумства** – гэта адмаўленне асобных палажэнняў і абрадаў пануючай рэлігіі. Можа быць як рэлігійным, калі дагматы пануючай рэлігіі адмаўляюцца з пазіцый іншай рэлігіі, так і свецкім, калі адмаўленне ідзе з нерэлігійных пазіцый. У сучаснай Еўропе вальнадумства ў вышэйвызначаным сэнсе ў прынцыпе не можа быць, бо адсутнічае пануючая рэлігія, канстытуцыйна гарантавана свабода сумлення, і ва ўмовах ідэалагічнага плюралізму чалавек можа выказваць любыя рэлігійныя альбо антырэлігійныя погляды. У заканадаўстве некаторых мусульманскіх краін (Іран, Сірыя, Саудаўская Аравія і інш.) за крытыку веравучэння ісламу прадугледжана смяротнае пакаранне.

**Атэізм** (а – адмаўляльная часціца і *theos* – бог; дакладна перакладаецца як "бязбожжа") – сістэма філасофскіх поглядаў, якія накіраваны на адмаўленне рэлігіі і сцвярджэнне альтэрнатыўнага ёй тыпу светаўспрымання. Атэізм у сучасным значэнні гэтага слова ўзнік у XVIII ст. Найбольш вядомымі атэістамі былі: Казімір Лышчынскі (1634–1683 гг.), Вальтэр (1694–1778 гг.), Жан Жак Русо (1712–1778 гг.), Жан Мелье (1664–1729 гг.), Дэні Дзідро (1713–1784 гг.), Поль Анры Гольбах (1723–1783 гг.), Людвіг Феербах (1804–1872 гг.), Карл Маркс (1818–1883 гг.), Фрыдрых Энгельс (1820–1895 гг.), У. Ленін (1870–1924 гг.).

У XVIII–XIX стст. атэізм меў наступальны характар і пашыраў свой уплыў. Існавала меркаванне, што па меры развіцця навукі і ведаў, паляпшэння ўмоў жыцця людзей, павышэння іх інтэлектуальнага ўзроўню адпадзе неабходнасць у рэлігіі, і яна паступова знікне.

Атэізм XX ст. развіваўся ў іншых умовах, адрозных ад тых, якія існавалі ў Новы час. У развітых краінах рэлігія перастала быць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пануючай сілай у грамадстве і не прэтэндуе на тое, каб яе веравучэнне было абавязкова прынята ўсімі. Па гэтай прычыне шмат у чым знікла патрэба барацьбы з ёй. На першы план выходзіць даследаванне рэлігіі, якое вядзецца з самых розных светапоглядных пазіцый.

На Захадзе ёсць дзве вялікія арганізацыі прыхільнікаў сучаснага атэізму: “Сусветны саюз вальнадумцаў”, які існуе з 1886 г. і аб’ядноўвае настаўнікаў, служачых, урачоў, студэнтаў і “Міжнародны гуманістычны і этычны саюз”, які быў створаны ў 1952 г., і куды ў асноўным уваходзяць вучоныя, пісьменнікі, выкладчыкі вну.

Сучасныя крытыкі рэлігіі на Захазе называюць сябе па-рознаму: вальнадумцамі , рацыяналістамі, гуманістамі, агностыкамі, радзей – атэістамі. Асноўную ўвагу яны канцэнтруюць на асобных праблемах крытыкі рэлігіі, а таксама на выкрыцці саюза рэлігійных інстытутаў з рэакцыйнымі палітычнымі сіламі.

У цэлым жа для сучаснага атэізму характэрна адсутнасць ваяўнічага характару. Як і рэлігія, атэізм – частка плюралістычнага грамадства. Як правіла, зараз атэісты выступаюць супраць празмернага ўмяшальніцтва рэлігіі ў грамадскае жыццё, асабліва ў сферу адукацыі.

Пачынаючы з XV ст. у Еўропе адбываецца працэс ***секулярызацыі*** (ад познелац. *saecularis* – мірскі, свецкі) – вызваленне са сферы рэлігійнага санкцыянавання чалавечай свядомасці, паводзін і дзейнасці людзей, сацыяльных адносін і інстытутаў. Еўрапейская культура набывае ўсё больш свецкі характар, і тыя яе галіны, якія раней знаходзіліся пад уплывам рэлігіі, зараз робяцца самастойнымі і развіваюцца, абапіраючыся перш за ўсё на свае ўласныя прынцыпы.

Секулярызацыя ахапіла палітычную сферу. Па меры росту і ўзмацнення нацыянальных еўрапейскіх дзяржаў яны робяцца ўсё больш незалежнымі ад царквы. Гэта адбывалася ў форме замены духавенства на свецкіх служачых у дзяржаўных установах, перадачы ўлады ад царкоўных судоў свецкім, устанаўлення кантролю над адукацыяй з боку дзяржаўных органаў. Зараз у еўрапейскіх краінах улада мае цалкам свецкі характар, хаця ў некаторых з іх рэлігійныя арганізацыі адыгрываюць значную ролю ў палітычным жыцці.

Найбольш яскрава працэс секулярызацыі назіраецца ў сферы духоўнай культуры. Яшчэ ў перыяд Адраджэння фарміруецца вопытная навука, якая ажыццяўляе свае даследаванні незалежна ад рэлігійных палажэнняў. Менавіта праз намаганні навукі была створана сучасная карціна свету.

Працэс секулярызацыі адбываўся таксама ў галіне мастацтва. Калі ў сярэднявечны царква была галоўным заказчыкам мастацкіх твораў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якія ствараліся пераважна на рэлігійныя сюжэты, дык пачынаючы з XIV ст., мастацтва робіцца ўсё больш свецкім.

Як паказваюць даследаванні, у культуры XII–XIII стст. рэлігійныя і свецкія карціны і скульптуры складалі адпаведна 97 % і 3 %. У пачатку XX ст. становішча памянялася на адваротнае: ужо свецкія карціны складаюць 96,1 %, а рэлігійныя – 3,9 %. Такія ж працэсы адбываюцца ў музыцы, літаратуры і архітэктуры.

Адным з асноўных лозунгаў працэсу секулярызацыі было патрабаванне свабоды сумлення: дзяржава павінна прадставіць людзям права рэлігійнага самавызначэння і не можа пазбаўляць сваіх падданых грамадзянскіх і палітычных правоў у залежнасці ад іх прыналежнасці да той ці іншай рэлігіі, царкву неабходна аддзяліць ад дзяржавы. Гэтыя ідэі былі заканадаўча замацаваны ў “Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна” (1789 г.), прынятай Вялікай Французскай буржуазнай рэвалюцыяй, Канстытуцыі ЗША (1787 г.) з яе, так званым, “Білем аб правах” (1791 г.) і ў далейшым у канстытуцыях іншых краін.

У выніку працэсу секулярызацыі ў еўрапейскіх краінах змянілася становішча царквы ў грамадстве. Яна страціла свае пануючыя пазіцыі і ператварылася ў адзін з грамадзянскіх інстытутаў. Нават у тых краінах, дзе ёсць дзяржаўныя рэлігіі, існуе свабода сумлення, і кожны чалавек мае права самастойна выбіраць свае погляды. У цэлым еўрапейская культура мае зараз свецкі характар.

Такім чынам, працэс секулярызацыі прывёў да змены ролі рэлігіі ў грамадстве. Ва ўмовах светапогляднага плюралізму яна зрабілася справай свабоднага выбару чалавека, які, адпаведна, нясе асабістую адказнасць за свае рэлігійныя погляды, і яны робяцца для яго больш значнымі. Частка хрысціянскіх тэолагаў даволі станоўча ацэньвае вынікі секулярызацыі.

Секулярызацыя еўрапейскай культуры прывяла да ўзнікнення новых праблем. Перад вызваленым ад рэлігійных аўтарытэтаў чалавекам паўстае пытанне, як распарадзіцца атрыманай светапогляднай свабодай. Узнікла рэальная небяспека, што створаны цэнасны вакуум прывядзе да этычнага анархізму і нігілізму. Як рэакцыя на маральную дэзарыентацыю секулярнага грамадства ўзнікае ***фундаменталізм*** – рух за вяртанне грамадства да рэлігійных асноў жыцця. Вельмі актыўныя зараз пратэстанцкія фундаменталісты ў ЗША. Яны выступаюць за заканадаўчую забарону перарывання цяжарнасці, у абарону традыцыйных нормаў паводзін, супраць сужыцельства без асвечанага царквою шлюбу, супраць лёгкіх разводаў. Фундаменталісты прыкладаюць шмат намаганняў, каб даказаць шкоднасць не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

толькі секулярызацыі, але і таго хрысціянства, якое прыстасоўваецца да ўмоў сучаснага жыцця.

Супрацьлеглым у адносінах да фундаменталізму рухам у хрысціянстве з'яўляецца **мадэрнізм** (ад фр. *moderne* – сучасны), які настойвае на неабходнасці зменаў з улікам тых тэндэнцый, якія адбываюцца ў сучасным свеце. Для мадэрнізму характэрна адмаўленне ад аўтарытарызму і дагматызму ў веравучэнні і сацыяльнай дзейнасці царквы і імкненне надаць ёй імпульс для развіцця. Мадэрнізм узнікае ў пераломныя моманты гісторыі царквы і грамадства ў цэлым. Яго ўстаноўкі праяўляюцца ў зменах усіх кампанентаў рэлігійнай структуры: новых спосабах абгрунтавання веры і маралі, развіцці веравучэння, культавай практыкі а таксама арганізацыйнай пабудовы царквы. У найбольшай ступені працэсы змен адбываюцца ў шэрагу пратэстанцкіх арганізацый. Што тычыцца праваслаўя і каталіцтва, то ў цэлым яны зараз вядуць дыялог з сучасным светам і ўносяць у сваю дзейнасць неабходныя змены, але не акрэсліваюць гэта як "мадэрнізм".

Вельмі моцнымі з'яўляюцца фундаменталісцкія тэндэнцыі ў сучасным ісламе. Яны, як правіла, цесна звязаны з рухам за нацыянальнае адраджэнне. Сцвярджаецца, што секулярызацыя – вынік каланіяльнай культурнай экспансіі Еўропы, якая разбурае асновы традыцыйнага жыцця мусульманскіх краін. Ісламскія фундаменталісты патрабуюць вяртання да нормаў шарыяту.

Безумоўна, у сучасных умовах рэлігія не можа выконваць тую ж ролю, якую яна выконвала ў Сярэднявеччы, таму, марнымі з'яўляюцца намаганні слепа следаваць традыцыі. Аднак, як паказаў вопыт, яшчэ больш небяспечнымі і марнымі з'яўляюцца спробы пабудаваць цалкам атэістычнае грамадства. Асабліва актуальна гэта для былых сацыялістычных краін. Нельга ставіць знак роўнасці паміж секулярызацыяй як аб'ектыўна дэтэрмінаваным працэсам і прымусовым знішчэннем рэлігіі.

Уплыў рэлігіі ў еўрапейскай культуры, якая з'яўляецца найбольш секулярызаванай, і зараз застаецца даволі вялікім. Захоўваецца высокі ўзровень рэлігійнай самаідэнтыфікацыі – 72 %[1] жыхароў Заходняй Еўропы лічаць сябе хрысціянамі. Яшчэ большы гэты працэнт у ЗША – каля 83. Вельмі высокі ўзровень рэлігійнасці ў тых еўрапейскіх краінах, дзе рэлігія звязана з захаваннем нацыянальнай ідэнтычнасці, напрыклад, у Ірландыі і Польшчы. У гэтых краінах царква была адным з інстытутаў супраціўлення адпаведна брытанскаму імперыялізму і савецкаму таталітарызму. Таму зараз у Ірландыі

[1] Безумоўна, дадзеная лічба, як і прыведзеныя далей, мае прыблізны характар.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

84,4 % насельніцтва вернікі, і 95,6 % сярод іх – каталікі, у Польшчы 88 % насельніцтва вернікі, сярод іх 96,7 % – каталікі.

Самай вялікай рэлігіяй у свеце зараз з'яўляецца хрысціянства, яго прыхільнікі складаюць 33 % ад агульнай колькасці насельніцтва Зямлі. Далей ідуць іслам (19, 6 %) і індуізм (13, 4 %). 12,7 % насельніцтва Зямлі не адносяць сябе ні да адной з існуючых рэлігій, і 2,5 % называюць сябе атэістамі. Такім чынам, пазарэлігійныя людзі і атэісты складаюць зараз 15,2 % насельніцтва Зямлі.

Абсалютная колькасць прыхільнікаў рэлігіі ў свеце працягвае павялічвацца. Кожная з існуючых зараз рэлігій дэманструе свае тэмпы росту. Штогод колькасць хрысціян у свеце павялічваецца на 1,04 %, што складае 0,34 % ад насельніцтва Зямлі. Хутчэй за ўсё павялічваецца колькасць мусульман: на 2,1 % , альбо на 0,4 % ад насельніцтва Зямлі. Колькасць прыхільнікаў індуізму штогод павялічваецца на 1,7 %, будызму – на 1,1 %. У той жа час трэба адзначыць, што рост колькасці прыхільнікаў рэлігіі адстае ад росту колькасці насельніцтва Зямлі, які складае прыкладна 1,18 % штогод.

Таксама паступова зніжаецца колькасць людзей, якія прымаюць удзел у рэлігійным жыцці. Асабліва гэта тычыцца хрысціянства. Рэлігійнасць часта мае асабісты характар і звязана з культурнай самаідэнтыфікацыяй. Пераважная частка насельніцтва большасці еўрапейскіх краін атаясамлівае сябе з каталіцтвам, пратэстанцтвам ці праваслаўем, але гэтая рэлігійнасць з'яўляецца пазацаркоўнай: чалавек лічыць сябе вернікам, хоць яго жыццё не звязана з якой-небудзь рэлігійнай арганізацыяй. Узровень пазацаркоўнай рэлігійнасці ў Еўропе – у сярэднім складае 74 %, у Расіі – 82 %. Таксама ва ўмовах плюралістычнага грамадства ствараецца рынак рэлігійных паслуг, і чалавек сам выбірае тое, што яму найбольш падабаецца. Гэта абумовіла распаўсюджванне ў Заходняй Еўропе і ЗША нетрадыцыйных рэлігій, якія прывабліваюць сваёй навізной.

У той жа час узмацняецца рэлігійнасць, якая звязана з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй. Па-ранейшаму моцным застаецца ўплыў нацыянальных рэлігій, якія ўспрымаюцца проста як частка культурнага асяроддзя, у межах якога чалавек жыве. Узмацненне фундаменталізму ў мусульманскіх краінах шмат у чым звязана з жаданнем захаваць традыцыйныя формы культуры і супраціўленнем іх разбурэнню праз глабалізацыю. Таксама ў Еўропе ўплыў ісламу сярод імігрантаў абумоўлены іх жаданнем захаваць сваю культурную ідэнтычнасць у іншародным асяроддзі. У сваю чаргу, рэлігійнае жыццё заходнееўрапейскіх краін робіцца ўсё больш разнастайным пад уплывам рэлігійнай культуры імігрантаў, перш за ўсё з мусульманскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

краін. Узмацняецца асэнсаванне еўрапейцамі спецыфікі сваёй культуры, адным з асноўных кампанентаў якой з’яўляецца хрысціянства.

Усё больш моцнымі ў свеце робяцца экуменічныя працэсы. Экуменізм (ад. грэч. – *οἰκουμένη* – населены свет) – вучэнне аб усеагульным хрысціянскім адзінстве а таксама заснаваны на ім рух за лепшае разуменне і супрацоўніцтва паміж хрысціянскімі цэрквамі. Узнік у пачатку XX ст. з мэтамі паляпшэння ўзаемаадносін паміж рознымі хрысціянскімі канфесіямі і супрацьстаяння секулярызацыі.

Арганізацыйны пачатак экуменічнаму руху паклала пратэстанцкая Сусветная місіянерская канферэнцыя 1910 г. у Эдзінбургу. У 1948 г. ў Амстэрдаме быў створаны Сусветны савет цэркваў, які зараз з’яўляецца цэнтрам экуменічнага руху. Ён аб’ядноўвае больш за 300 цэркваў са 100 краін свету (каля 440 млн вернікаў). У склад Сусветнага савету цэркваў разам з пратэстанцкімі ўваходзяць шэраг праваслаўных цэркваў, у тым ліку з 1961 г. Руская праваслаўная царква. Рымска-каталіцкая царква не з’яўляецца членам Сусветнага савета цэркваў і прымае ўдзел у яго працы ў якасці назіральніка. Цэнтр гэтай арганізацыі знаходзіцца ў Жэневе. Рэгулярна адбываюцца канферэнцыі, дзе ўзгадняюцца пазіцыі па пытаннях веравучэння і грамадскай дзейнасці цэркваў.

Розныя хрысціянскія кірункі па-рознаму ставяцца да экуменізму ў залежнасці ад таго, які сэнс у яго ўкладваюць:

1. Разуменне экуменізму як узаемадзеянне і дыялог паміж хрысціянскімі канфесіямі пры захаванні дагматычных, культавых і арганізацыйных адрозненняў паміж імі. Падтрымліваецца большасцю хрысціянскіх канфесій.

2. Разуменне экуменізму як руху за аб’яднанне хрысціянскіх канфесій у межах адной арганізацыі на падставе прывядзення іх дагматаў да адзінага кампраміснага варыянта, які будзе для ўсіх іх агульным. Падтрымліваецца часткай пратэстантаў, але катэгарычна адмаўляецца праваслаўнай і каталіцкай царквой.

3. Пад экуменізмам таксама могуць разумець рух за аб’яднанне ўсіх рэлігій у адно цэлае на падставе агульначалавечых каштоўнасцей. Гэтае разуменне характэрна для часткі нетрадыцыйных рэлігій. Пераважная большасць хрысціянскіх канфесій, пры тым, што яны прызнаюць магчымасць дыялогу і супрацоўніцтва з іншымі рэлігіямі, асабліва ў сацыяльнай і міратворчай дзейнасці, такі экуменізм лічаць антыхрысціянскім.

Найбольш моцнымі экуменічныя тэндэнцыі з’яўляюцца сярод пратэстантаў. Самыя вядомыя пратэстанцкія міжнародныя экуменічныя аб’яднанні: Сусветная лютэранская федэрацыя, Сусветны

метадысцкі савет, Сусветны альянс рэфармацкіх цэркваў, Сусветны саюз баптыстаў, Сусветная федэрацыя студэнтаў-хрысціян. Шмат якія з гэтых арганізацый на рэгіянальным узроўні супрацоўнічаюць з арганізацыямі праваслаўных і католікаў.

Тэндэнцыі, накіраваныя на ўзаемадзеянне і дыялог, існуюць таксама ў іншых сусветных рэлігіях. У 1950 г. у Каломба (Шры-Ланка) было створана Сусветнае брацтва будыстаў. Зараз яно налічвае каля 100 рэгіянальных цэнтраў у 40 краінах свету. Згодна са статутам, мэтамі гэтай арганізацыі з’яўляюцца: захоўванне у чысціні будысцкага вучэння, садзейнічанне адзінству, салідарнасці і брацтву будыстаў, заахвочванне дзейнасці ў сацыяльнай, асветніцкай і культурнай сферах, праца дзеля забеспячэння міру і ўзаемапавагі паміж людзьмі і шчасця для ўсіх жывых істот, супрацоўніцтва з арганізацыямі, якія ставяць перад сабой такія ж мэты.

Найбольш вядомай міжнароднай арганізацыяй мусульман з’яўляецца Сусветны ісламскі кангрэс, які быў заснаваны ў 1926 г. ў Мецы (Саудаўская Аравія). Зараз яго штаб-кватэра знаходзіцца ў г. Карачы (Пакістан). Мае 40 аддзяленняў у шмат якіх краінах свету. Асноўныя мэты арганізацыі – адукацыя і сацыяльная дапамога бедным. Лічыцца, што гэта вядзе да стварэння сусветнай суполкі мусульман. Кангрэс адмаўляе гвалтоўныя метады, націск робіцца на дасягненні згоды паміж мусульманамі і прыхільнікамі іншых веравызнанняў.

## 6.2. Рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі

Пры вывучэнні рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі трэба ўлічваць:

1 <u>Спецыфіку таго мінулага, ад якога мы паступова адыходзім.</u> Адбываецца выхад з сямідзесяцігадовага перыяду камуністычнага панавання, калі рэлігійныя арганізацыі знаходзіліся ў надзвычай неспрыяльных умовах. У СССР праводзілася паслядоўна атэістычная палітыка. Фармальна абвяшчалася свабода сумлення, але, як і іншыя свабоды (слова, асацыяцый, палітычнай дзейнасці, нацыянальнага самавызначэння), яна мела чыста дэкларатыўны характар і на самой справе жорстка падаўлялася. У артыкуле 52 Канстытуцыі СССР было запісана: “Грамадзянам СССР гарантуецца свабода сумлення, гэта значыць, права вызнаваць любую або не вызнаваць ніякай, адпраўляць рэлігійныя культы альбо весці атэістычную прапаганду. Узбуджанне варожасці і ненавісці ў сувязі з рэлігійнымі вераваннямі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

забараняецца. Царква ў СССР аддзелена ад дзяржавы, а школа – ад царквы". Заўважым, што ўжо ў фармулёўцы гэтага артыкула парушаўся прынцып роўнасці правоў вернікаў і атэістаў: першыя мелі права толькі вызнаваць рэлігію і выконваць рэлігійныя культы, а другія – весці прапаганду, накіраваную супраць рэлігіі. Атэізм у Савецкім Саюзе з'яўляўся часткай афіцыйнай камуністычнай ідэалогіі, яго нельга было крытыкаваць. У СССР існавала супярэчнасць паміж заканадаўствам, якое абвяшчала свабоду сумлення і ўстанаўлівала крымінальную адказнасць за дыскрымінацыю грамадзян па рэлігійнай прыкмеце, і рознымі пастановамі кіруючай камуністычнай партыі, у якіх адкрыта абвяшчалася палітыка, накіраваная на знішчэнне рэлігіі. Таму нават такое афіцыйна абвешчанае права на свабоду сумлення, як права проста прытрымлівацца сваіх рэлігійных перакананняў і ажыццяўляць культавыя прадпісанні, не выконвалася. Улады разглядалі рэлігію не проста як "перажытак мінулага" і "опіум народа", але і як "адзіную легальна існуючую ў СССР антыкамуністычную ідэалогію", з якой неабходна было змагацца. Вернік не мог заняць кіруючую пасаду, таму што на іх, як правіла, прызначаліся толькі камуністы, а членства ў КПСС было несумяшчальным з рэлігійнай верай, атрымаць вышэйшую адукацыю, фактычна для вернікаў існавала забарона на прафесіі, напрыклад, яны не маглі быць настаўнікамі ў школе. Небяспечна было заключаць царкоўныя шлюбы, таму што аб гэтым паведамлялася па месцы працы, і да тых, хто ўступіў у такі шлюб, ужываліся меры ўздзеяння, бацькі баяліся хрысціць дзяцей, нельга было праводзіць адпяванне памёрлых. У апошні час у нашым грамадстве сітуацыя паступова мяняецца. Адбыліся не толькі змены ў заканадаўстве, але і ў рэальным стаўленні ўладаў да вернікаў. Зараз людзі могуць адкрыта заявіць аб сваіх рэлігійных поглядах і пры гэтым не баяцца рэпрэсій з боку ўлад. Паступова мяняецца і стаўленне ў грамадстве да вернікаў, на іх ужо не глядзяць як на людзей "несучасных", "адсталых" і тым больш "фанатыкаў".

2 Змены, якія паступова адбываюцца ў рэлігійным жыцці на Беларусі. Гэтыя змены былі абумоўленыя пачатай у СССР у сярэдзіне 80-х гг. мінулага стагоддзя па ініцыятыве кіраўніцтва КПСС так званай перабудовай, абвяшчэннем у 1991 г. дзяржаўнай незалежнасці Беларусі і далейшым развіццём нашай краіны. Адбыліся істотныя змены ў стаўленні да рэлігіі: адмаўленне ад палітыкі дзяржаўнага атэізму і наладжванне дыялогу з рэлігійнымі арганізацыямі.

Прыкладна з 1989 г. ў Беларусі назіраецца паступовае адраджэнне рэлігіі. Галоўным аб'ектыўным паказчыкам гэтага з'яўляецца рост колькасці рэлігійных арганізацый. Так, за перыяд з 1988 па 2011 г.

колькасць рэлігійных суполак павялічылася больш чым у 4 (з 768 да 3162), а рэлігійных кірункаў – у 3 разы. Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі напярэдадні распаду Савецкага Саюзу да ліку няверуючых адносіла сябе каля 65 % насельніцтва рэспублікі, а ў 1998 г. – 25,4 %, гэта значыць, амаль у 2,5 разы менш. За гэты ж час амаль удвая вырасла катэгорыя тых, хто лічыць сябе вернікам – з 22 до 37,5 %. Аднак гэтыя лічбы не павінны ўводзіць у зман – як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, рэлігійнасць жыхароў Беларусі мае пераважна дэкларатыўны характар: вернікамі называюць сябе прыкладна 50 % насельніцтва, у той час, калі рэгулярна наведваюць храмы і выконваюць прадпісанні сваёй рэлігіі не больш 7 % насельніцтва. Аднак модным зрабілася дэманстраваць сваю рэлігійнасць. Асабліва распаўсюджанай гэтая мода была ў 90-я гг. мінулага стагоддзя, калі на хвалі перабудовы імкнуліся адмовіцца ад усяго савецкага і звярнуцца да іншых каштоўнасцей. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі. За гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100 % насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху), і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. Вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гг., якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, было звяртанне да рэлігіі.

3. Поліканфесійнасць і талерантнасць беларускай культуры. Зараз на Беларусі дзейнічаюць 25 рэлігійных кірункаў. Найбольш буйнымі сярод іх з’яўляюцца: праваслаўе, у якім на 1 студзеня 2011 г. налічвалася 1545 суполак; хрысціяне веры евангельскай (пяцідзесятнікі) – 505 суполак; рыма-каталіцтва – 475 суполак; евангельскія хрысціяне-баптысты – 275 суполак. Трэба падкрэсліць, што Беларусь – гэта традыцыйна поліканфесійная дзяржава, на яе тэрыторыі мірна жылі прадстаўнікі самых розных рэлігій. У нас не было сур’ёзных сутыкненняў а таксама праследаванняў на рэлігійнай глебе. Для беларусаў была характэрная верацярпімасць. У Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. было запісана: “А таксама прывілеем, прысягаю нашай вырашана мір паміж рознымі рэлігіямі бярэгчы... А ў сувязі з тым, што ў Рэчы Паспалітай існуе не малая розніца ў адносінах веры хрысціянскай. Папярэджваючы тое, каб па гэтай прычыне паміж людзьмі сутыкненні якія-небудзь шкодныя не пачаліся, якія ў іншых каралеўствах ясна бачым, абяцаем тое сабе сумесна за нас і за

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нашчадкаў нашых на вечныя часы пад абавязкам прысягі, пад вераю, гонарам і сумленнем нашым, што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры. Мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з рознасцю ў веры і з адрозненнем у цэрквах крыві не праліваць" (Разд. 3, Арт. 3). (Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. – Мн. 1989, С. 112–113).

Відавочным прыкладам традыцыйнай для нашай краіны верацярпімасці з'яўляецца тое, што ў цэнтрах шмат якіх беларускіх гарадоў побач стаялі праваслаўная царква, каталіцкі касцёл і сінагога. Таксама трэба падкрэсліць, што ў адрозненне ад нашых суседзяў Расіі і Польшчы, на тэрыторыі Беларусі ніводная з рэлігій не была безумоўна пануючай і заўсёды існаваў баланс паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Гэта неабходна ўлічваць як пры аналізе сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі, так і перспектыў яе развіцця.

## 6.3. Беларускае заканадаўства аб свабодзе сумлення

Пры разглядзе рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі неабходна ўлічваць прынцып свабоды сумлення. Права на свабоду сумлення – гэта адно з асноўных правоў чалавека. Яно з'яўляецца: 1) усеагульным – ім валодаюць усе людзі, незалежна ад іх расавай, нацыянальнай альбо сацыяльнай прыналежнасці; 2) натуральным – гэта значыць, яно не ствараецца дзяржавай альбо якімі-небудзь іншымі надасабовымі структурамі, а ўласціва чалавеку з самога пачатку; 3) неад'емным – ніхто не можа пазбавіць чалавека гэтага права.

Права на свабоду сумлення звычайна азначаецца як *права на свабоду выбару атэістычных або рэлігійных перакананняў, а менавіта: права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, яно азначае, што чалавек можа сам вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі: быць прыхільнікам той ці іншай рэлігіі, быць абыякавым да рэлігіі, быць атэістам.* Свабода сумлення прадугледжвае, што чалавек не толькі *мае* тыя ці іншыя рэлігійныя або антырэлігійныя перакананні, але і *можа* гэтыя перакананні *рэалізаваць* у сваім жыцці. Менавіта пытанне аб рэалізацыі перакананняў з'яўляецца асноўным у праве на свабоду сумлення: тыя ці іншыя погляды чалавека з'яўляюцца яго асабістай справай, і ніхто не можа забараніць мець любыя перакананні, нават самыя неверагодныя, гэта не паддаецца прававому рэгуляванню, аднак чалавек павінен мець магчымасць будаваць свае паводзіны ў адпаведнасці са сваімі поглядамі, і толькі так можа быць рэалізавана свабода сумлення. Права

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на свабоду сумлення афіцыйна замацавана ў міжнародных дакументах і заканадаўстве большасці краін.

Трэба падкрэсліць, што гэтае права з’яўляецца дасягненнем менавіта еўрапейскай культуры і неабходным яе кампанентам. Існуе доўгая гісторыя таго, як гэтае права было асэнсавана і ажыццяўлялася у грамадскім жыцці Еўропы. Аднак зараз права на свабоду сумлення разглядаецца як агульначалавечае і павінна быць рэалізавана таксама і ў тых краінах, якія не адносяцца да еўрапейскай культуры, хаця яго рэалізацыя прадугледжвае ўлік гістарычнай і культурнай спецыфікі той ці іншай дзяржавы.

У беларускім заканадаўстве праблеме неабходнасці выканання правоў чалавека надаецца вельмі шмат увагі. Так, у ***Прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.*** гаворыцца, што адным з матываў яе прыняцця з’яўляецца імкненне зацвердзіць правы і свабоды кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. У ***Канстытуцыі*** знаходзяцца наступныя прынцыповыя палажэнні, якія тычацца правоў чалавека: “Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы” (Арт. 2), “У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршынства права” (Арт. 7), “Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з’яўляецца вышэйшай мэтай дзяржавы” (Арт. 21).

Гэтыя прынцыповыя палажэнні канкрэтызаваныя ў ***Канстутыцыі*** ў дачыненні права на свабоду сумлення:

**Артыкул 16.** Рэлігіі і веравызнані роўныя перад законам.

“Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якая накіравана супраць суверынітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды, або звязана з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў, або наносіць шкоду іх здароўю і маралі …

**Артыкул 31.** Кожны мае права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, якія звязаныя са стаўленнем да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам”.

Аб праве на свабоду сумлення грамадзян Беларусі гаворыцца таксама ў ***Законе Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях”.*** У яго Прэамбуле сказана: “Гэты Закон...

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, зыходзячы з:

права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад стаўлення да рэлігіі;

роўнасці рэлігій перад законам;

прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;

духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі;

неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангелісцкалютэранскай царквы, іўдаізму і ісламу;

неабходнасці садзейнічання дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання".

Такім чынам, у дадзенай Прэамбуле разам з абвяшчэннем права кожнага грамадзяніна на свабоду сумлення і роўнасці рэлігій перад законам таксама вылучаюцца пяць рэлігій: праваслаўе, каталіцтва, лютэранства, іўдаізм і іслам, якія звязаныя з гістарычнай традыцыяй народа Беларусі. Асаблівая роля адводзіцца Праваслаўнай царкве, абвяшчаецца, што яна аказала вызначальны ўплыў на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларусаў.

Прывядзем тыя артыкулы ***Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях"***, у якіх непасрэдна гаворыцца аб праве на свабоду сумлення грамадзян Беларусі:

**"Артыкул 4. Права на свабоду сумлення**

Кожны мае права на свабоду выбару атэістычных або рэлігійных перакананняў, а менавіта: самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна ці сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію ці не вызнаваць ніякай.

**Артыкул 5. Права на свабоду веравызнання**

Кожны мае права свабодна выбіраць, мяняць, выказваць і распаўсюджваць рэлігійныя перакананні і дзейнічаць у адпаведнасці з імі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

Ніхто не абавязаны паведамляць аб сваім стаўленні да рэлігіі і не можа падвяргацца якому-небудзь прымусу пры вызначэнні свайго стаўлення да рэлігіі, да вызнання той ці іншай рэлігіі, да ўдзелу або неўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый.

Бацькі ці асобы, якія іх замяняюць, па ўзаемнай згодзе маюць права выхоўваць сваіх дзяцей у адпаведнасці са сваім уласным



РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

стаўленнем да рэлігіі. Дзяржава не можа ўмешвацца ў выхаванне дзіцяці, якое заснавана на акрэсленым рэлігійным светапоглядзе бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, за выключэннем выпадкаў, калі пабуджэнне да рэлігійных дзеянняў пагражае непасрэдна жыццю або здароўю дзіцяці, парушае яго законныя правы.

**Артыкул 6. Раўнапраўе рэлігій**

Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам.

Ідэалогія рэлігійных арганізацый не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян.

**Артыкул 7. Раўнапраўе грамадзян**

Грамадзяне роўныя перад законам незалежна ад іх стаўлення да рэлігіі.

У афіцыйных дакументах стаўленне грамадзяніна да рэлігіі не ўказваецца, апроч выпадкаў, калі гэтага жадае сам грамадзянін.

Перашкаджэнне ажыццяўленню праў на свабоду сумлення і веравызнання, а таксама ўстанаўленне якіх-небудзь пераваг ці абмежаванняў правоў грамадзян у залежнасці ад іх стаўлення да рэлігіі не дапускаецца і праследуецца па закону.

Ніхто не можа па матывах сваіх рэлігійных перакананняў ухіляцца ад выканання ўстаноўленых законам абавязкаў.

**Артыкул 8. Дзяржава і рэлігія**

Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Дзяржава не ўскладвае на рэлігійныя арганізацыі выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый, калі яна не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі маюць права ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, а таксама выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ў парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі не ўдзельнічаюць у дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія праследуюць палітычныя мэты і не аказваюць ім фінансавай і іншай падтрымкі.

У месцах богаслужэнняў не дапускаецца выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі, правядзенне сходаў, мітынгаў, перадвыбарнай агітацыі, і другіх мерапрыемстваў палітычнага характару, а таксама выступленні, заклікі, якія абражаюць прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады, службовых асоб і асобных грамадзян.

Дзяржава садзейнічае ўстанаўленню адносін цярпімасці і павагі паміж грамадзянамі, якія вызнаюць і не вызнаюць рэлігію, рэлігійнымі арганізацыямі розных веравызнанняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзяржава можа будаваць свае ўзаемаадносіны з рэлігійнымі аб'яднаннямі шляхам заключэння з імі пагадненняў у адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь".

Звернем асаблівую ўвагу на тыя артыкулы ***Закона "Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях"***, якія тычацца ўзаемаадносін рэлігіі і сістэмы адукацыі ў нашай краіне.

**"Артыкул 9. Адукацыя і рэлігія**

Нацыянальная сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь мае свецкі характар і не ставіць мэту фарміравання таго ці іншага стаўлення да рэлігіі.

Грамадзяне маюць права на роўныя магчымасці доступу да нацыянальнай сістэмы адукацыі незалежна ад іх стаўлення да рэлігіі.

Ва ўстановах адукацыі не дапускаецца стварэнне і ананімная або іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, што супярэчыць заканадаўству.

Установы адукацыі ў пытаннях выхаваўчай дзейнасці на падставе пісьмовых заяў бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць (самых паўналетніх навучэнцаў), у пазавучэбны час могуць узаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі, якія зарэгістраваныя згодна з парадкам, устаноўленым гэтым Законам, маюць права ў адпаведнасці са сваімі статутамі ствараць для рэлігійнага асветніцтва дзяцей і дарослых вучэбныя групы і нядзельныя рэлігійныя школы, выкарыстоўваючы пры гэтым памяшканні, якія ім належаць і (ці) прадастаўляюцца ў карыстанне, за выключэннем памяшканняў, якія належаць дзяржаўным установам адукацыі …

**Артыкул 28. Духоўныя навучальныя ўстановы**

Рэлігійныя аб'яднанні ў адпаведнасці са сваімі статутамі маюць права ствараць духоўныя навучальныя ўстановы для прафесійнай падрыхтоўкі свяшчэннаслужыцеляў, тэолагаў і царкоўнага персаналу.

Грамадзяне, якія вучацца ў вышэйшых і сярэдніх духоўных навучальных установах, карыстаюцца правамі і льготамі, якія ўстаноўлены для студэнтаў дзяржаўных навучальных устаноў."

Гэтыя ж прынцыпы абвешчаныя і ў **Артыкуле 2** ***Кодэкса Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі" (2011)***, дзе гаворыцца аб асновах дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“1. Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі асноўваецца на наступных прынцыпах: ... свецкага характару адукацыі.

2. Ва ўстановах сістэмы адукацыі ... не дапускаецца ... стварэнне і ананімная ці іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая супярэчыць заканадаўству.

3. Установы адукацыі ў пытаннях выхавання на падставе пісьмовых заяў навучэнцаў (законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў) у пазавучэбны час могуць узаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.”

Таксама гэта канстатуецца ў **Артыкуле 10** ***Закона “Аб правах дзіцяці”:***

“Кожнае дзіця мае права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай.

Дзяржава не можа ўмешвацца ў выхаванне дзіцяці, якое заснавана на акрэсленым рэлігійным светапоглядзе бацькоў або асоб, якія іх замяняюць, і звязаныя з гэтым пры ўдзеле дзіцяці адпраўленні за межамі навучальных устаноў рэлігійных абрадаў, выканання традыцый, за выключэннем выпадкаў, калі пабуджэнне да рэлігійных дзеянняў пагражае непасрэдна жыццю ці здароўю дзіцяці, парушае яго законныя правы.

У адносінах да дзіцяці, якое не дасягнула пятнаццаці гадоў, рэлігійныя абрады адпраўляюцца са згоды бацькоў, або асоб, якія іх замяняюць.”

Таксама ўстанаўліваецца адказанасць за парушэнне заканадаўства аб рэлігіях. Аб гэтым запісана ў ніжэй прыведзенных артыкулах ***Закона Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях.”***

**“Артыкул 39. Адказнасць за парушэнне заканадаўства**

…Парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб свабодзе сумлення, веравызнання і рэлігійных арганізацыях, якое праявілася, у прыватнасці, у:

стварэнні і дзейнасці рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, накіраванай супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды або звязаных з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджаючай выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадзянскіх і сямейных абавязкаў або наносячых шкоду іх здароўю і маральнасці;

стварэнні рэлігійных арганізацый у дзяржаўных органах і ўстановах, воінскіх частках, а таксама ў адукацыйных установах;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уцягванні непаўналетніх у рэлігійныя арганізацыі, навучанне непаўналетніх рэлігіі насуперак іх волі без згоды іх бацькоў або асоб, якія іх замяняюць;

апаганьванне тых прадметаў, якія шануюцца ў рэлігіі, культавых пабудоў, месцаў паломніцтва і пахаванняў;

парушэнне тайны споведзі;

узбуджэнне рэлігійнай варожасці ці розні, або абраза грамадзян у сувязі з іх рэлігійнымі перакананнямі, цягне адказнасць, якая ўстаноўлена законам.

Службовыя асобы і грамадзяне, вінаватыя ў парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб свабодзе сумлення веравызнання і рэлігійных арганізацыях, нясуць адказнасць, якая ўстаноўлена заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.”

Таксама адказнасць за парушэнне заканадаўства аб рэлігіях устаноўлена ў ***Крымінальнам кодэксе Рэспублікі Беларусь.***

**“Артыкул 130 Распальванне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці ці розні**

1 Наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці, караюцца штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, ці пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2 Тыя ж дзеянні, злучаныя з гвалтам або зробленыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў,

– караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

3 Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай і другой гэтага артыкула, зробленыя групай асоб або пацягнуўшыя па неасцярожнасці смерць чалавека, ці іншыя цяжкія вынікі,

– караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў …

**Артыкул 190 Парушэнне раўнапраўя грамадзян**

Наўмыснае прамое ці ўскоснае парушэнне або абмежаванне правоў і свабод, або ўстанаўленне прамых ці ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы, паходжання, маёмаснага ці пасадавага становішча, месца жыхарства, стаўлення да рэлігіі, перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб’яднаняў, якое нанесла істотную шкоду правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, – караецца штрафам або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць вызначаныя пасады ці займацца вызначанай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 193 Арганізацыя або кіраванне аб'яднаннем, якое пасягае на асобу і правы грамадзян**

Арганізацыя або кіраванне рэлігійным ці грамадскім аб'яднаннем, дзейнасць якога звязана з гвалтам над грамадзянамі, нанясеннем ім цялесных пашкоджанняў, або з іншымі пасягальніцтвамі на правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, – караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць вызначаныя пасады ці займацца вызначанай дзейнасцю, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў.

**Артыкул 195 Перашкаджэнне законнай дзейнасці рэлігійных арганізацый**

Перашкаджэнне законнай дзейнасці рэлігійных арганізацый або адпраўленню рэлігійных абрадаў, калі яны не парушаюць грамадскі парадак і не суправаджаюцца пасягальніцтвам на правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, – караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або пазбаўленнем права займаць вызначаныя пасады ці займацца вызначанай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў. …

**Артыкул 341 Апаганьванне пабудоў і псаванне маёмасці**

Апаганьванне будынкаў ці іншых пабудоў цынічнымі надпісамі або выявамі, псаванне маёмасці на грамадскім транспарце ці ў іншых грамадскіх месцах пры адсутнасці прызнакаў больш цяжкага злачынства – караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам на тэрмін да двух месяцаў."

Таксама аб адказнасці за парушэнні заканадаўства аб рэлігіях гаворыцца ў **Артыкуле 193 "Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях":** "Стварэнне рэлігійнай арганізацыі і кіраўніцтва ёю без рэгістрацыі яе статута (палажэння) ва ўстаноўленым парадку або арганізацыя і правядзенне кіраўнікамі і членамі гэтай арганізацыі спецыяльных дзіцячых і юнацкіх сходаў, а таксама працоўных, літаратурных і іншых гурткоў і груп, не маючых адносін да адпраўлення культа,

– цягнуць накладанне штрафа ў памеры да пяці мінімальных заробкаў."

Такім чынам, у Беларусі ў прынцыпе сфармавалася прававая база для забеспячэння права на свабоду сумлення. У Законе ***"Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях"*** сказана, што яго задачамі з'яўляюцца "забеспячэнне і гарантаванне права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, на сацыяльную справядлівасць, роўнасць, абарону правоў і інтарэсаў, незалежна ад стаўлення да рэлігіі і рэлігійнай прыналежнасці, на свабоду аб'яднання ў рэлігійныя арганізацыі" (Арт. 1). І ў цэлым гэтыя задачы заканадаўствам Рэспублікі Беларусь выконваюцца.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

# ЛІТАРАТУРА


1 Адзіночанка, В. А. Рэлігіязнаўства : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / В. А. Адзіночанка. – Мінск : Універсітэцкае, 2001. – 240 с.

2 Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

3 Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. – М. : Московская Патриархия, 1992. – 1346 с.

4 Буддизм: словарь / Л. Л. Абаева [и др.]; под общ. ред. Л. Н. Жуковской [и др.]. – М. : Республика, 1992. – 287 с.

5 Васильев, Л. С. История религий Востока : учебное пособие для вузов / Л. С. Васильев. – М. : Книжный дом “Университет”, 2000. – 432 с.

6 Верашчагіна, А. У. Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць: дапам. для настаўнікаў / А. У. Верашчагіна, А. В. Гурко. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 157 с.

7 Вопросы свободы совести и религиозных организаций в Республике Беларусь: сборник документов и материалов / авт.-сост. М. В. Цвилик; под ред. В. И. Новицкого. – Минск : Четыре четверти, 2005. – 336 с.

8 Всемирная энциклопедия: религия / глав. науч. ред. : В. В. Адамчик, М. А. Можейко. – Минск : Совр. Литератор, 2003. – 832 с.

9 Всемирное писание: сравнительная антология священных текстов / под общ. ред. П. С. Гуревича; пер. с англ. – М. : Республика, 1995. – 591 с.

10 Гараджа, В. И. Религиеведение / В. И. Гараджа. – М. : Аспект Пресс, 1995. – 351 с.

11 Горбацкий, А. А. Введение в историю религии: учеб. пособие / А. А. Горбацкий. – Минск : Четыре четверти, 2005. – 152 с.

12 Гурко, А. В. Новые религии в Республике Беларусь: генезис, эволюция, последователи / А. В. Гурко. – Минск : МИУ, 2006. – 276 с.

13 Дьяченко, О. В. Новые религиозные объединения / О. В. Дьяченко. – Мозырь : Белый Ветер, 1998. – 152с.

14 Закон Республики Беларусь «О свободе совести и религиозных организациях» от 6 ноября 2002 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 123. – С. 4–15.

15 Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад. А. І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

16 Ислам: краткий справочник – М. : Наука, 1983. – 160 с.

17 Индуизм. Джайнизм. Сикхизм. – М. : Республика, 1996. – 576 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

18 История религии: учебник: в 2 т. / под общ. ред. И. Н. Яблокова. – М. : Высш. шк., 2002. – Т. 2.

19 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі). – Мінск : Беларусь, 2004. – 95 с.

20 Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX стст.) / В. Грыгор’ева [і інш.]; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

21 Коваль, У. І. Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянская міфалогіі. / У. І. Коваль. – Гомель : Беларускае агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 179 с.

22 Коран / пер. И. Ю. Крачковского. – Минск; Ростов н/Д. : Фобос, 1990. – 446 с.

23 Корзун, М. С. История Русской православной церкви (X век – 2000 год): учеб.-метод. комплекс / М. С. Корзун. – Минск : БГУ, 2009. – 259 с.

24 Кислюк, К. В. Религиоведение: учебник / К. В. Кислюк, О. Н. Кучер. – Ростов н/Д. : Феникс; Х. : Торгсин, 2004. – 512 с.

25 Ковальский Я. В. Папы и папство / Я. В. Ковальский. – М. : Политиздат, 1991. – 236 с.

26 Религия и церковь / А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : АРТИФЕКС, 1998 – 112 с.

27 Короткая, Т. П. Религиоведение: религии в Беларуси: учеб. пособие / Т. П. Короткая. – Минск : БГЭУ, 2004. – 98 с.

28 Костюкович, П. И. Религиоведение: учеб. пособие / П. И. Костюкович. – Минск : Новое знание, 2001 – 192 с.

29 Круглов, А. А. Религиоведение: пособие для студентов вузов / А. А. Круглов. – Минск : Тесей, 2008. – 648 с.

30 Міфы Бацькаўшчыны / уклад. У. А. Васілевіч. – Мінск. : БелЭн, 1994. – 109 с.

31 Митрохин, Н. Русская православная церковь: современное состояние и актуальные проблемы / Н. Митрохин. – М. : Новое лит. обозрение, 2006. – 656 с.

32 Мифы и сакральные тексты религий мира: хрестоматия по религиоведению / авт.-сост. В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2007. – 400 с.

33 Мифы народов мира: энциклопедия: в 2 т. / глав. ред С. А. Токарев. – М. : Большая Рос. энцикл., 2000. – Т. 2.

34 Можейко, М. А. Религиоведение: учеб.-метод. комплекс / М. А. Можейко. – Минск : БГУ, 2002. – 115 с.

35 Наглядно о религиях / сост. Р. Грей, Д. Хелтон. – Минск : Попурри, 2000. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

36 Никольский, Н. М. История русской церкви / Н. М. Никольский. – Минск : Беларусь, 1990. – 541 с.

37 Новикова, Л. Г. Религиозность в Беларуси на рубеже веков: тенденции и особенности проявления: социологический аспект / Л. Г. Новикова. – Минск : БТН-информ, 2001. – 132 с.

38 Одиноченко, В. А. Право на свободу совести в Беларуси / В. А. Одиноченко. – Минск : Тесей, 2006. – 20 с. – (Знай свои права).

39 Основы религиоведения: учебник / под ред. И. Н. Яблокова. – М. : Высш. шк., 2001. – 480 с.

40 Радугин, А. А. Введение в религоведение: теория, история и современные религии: курс лекций / А. А. Радугин. – М. : Центр, 2004. – 304 с.

41 Ревуненкова, Н. В. Протестантизм / Н. В. Ревуненкова. – СПб. : Питер, 2007. – 224 с.

42 Религии мира: справочник / Д. Алан [и др.]; пер с англ. – Минск : Белфакс, 1994. – 463 с.

43 Религиоведение: учеб. пособие / М. Я. Ленсу [и др.]; под ред. М. Я. Ленсу [и др.]. – Минск : Новое знание, 2003 – 446 с. – (Серия “Социально-гуманитарное образование”).

44 Религиоведение: хрестоматия / сост. П. И. Костюкович. – Минск : Новое знание, 2000. – 480 с.

45 Религия и общество: хрестоматия по социологии религии / сост. В. И. Гараджа, Е. Д. Руткевич. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 775 с.

46 Религия: Энциклопедия / сост. и общ. ред.: А. А. Грицанов, Г. В. Синило. – Минск : Книжный Дом, 2007. – 960 с.

47 Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / гал. рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск : БелЭн, 2001. – 368 с.

48 Самыгин, С. И. Религиоведение: социология и психология религии / С. И. Самыгин, В. Н. Ничипуренко, И. Н. Полонская. – Ростов-н/Д., 1996. – 672 с.

49 Старостенко, В. В. Религиоведение: учебник / В. В. Старостенко. – Минск : ИВЦ Минфина, 2008. – 288 с.

50 Токарев, С. А. Религия в истории народов мира / С. А. Токарев. – М. : Республика, 2005. – 543 с.

51 Толерантность / общ. ред. М. П. Мчедлова. – М. : Республика, 2004. – 416 с.

52 Торгашев, Г. А. Основы религиоведения / Г. А. Торгашев. – СПб. : Питер, 2004. – 364 с.

53 Торчинов, Е. А. Религии мира: опыт запредельного. Психотехника и трансперсональные состояния / Е. А. Торчинов. – СПб. : Азбука-классика. Петерб. Востоковедение, 2007. – 544 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

54 Традиционные вероисповедания и новые религиозные движения в Беларуси : пособие для рук. учреждений образования, педагогов, воспитателей / сост. А. И. Осипов; под ред. А. И. Осипова. – Минск : Беларусь, 2000. – 255 с.

55 Христианство: энцикл. словарь: в 3 т. – М. : Большая Рос. энцикл., Т. 1 – 1993. – 863 с.; Т. 2 – 1995. – 671 с.; Т. 3. – 1995. – 783 с.

56 Чекалов, Д. А. История религий. Конспект лекций / Д. А. Чекалов, В. А. Кондрашев. – Ростов н/Д. : Феникс, 2004. – 320 с.

57 Энциклопедия религий / под ред. А. П. Забияко, А. Н. Красникова, Е. С. Элбакян. – М. : Аккад. Проект; Гаудеамус, 2008. – 1520 с.

58 Языкович, В. Р. Религиоведение: учебное пособие / В. Р. Языкович. – Минск : ТетраСистемс, 2008. – 272 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ДАДАТАК А
# (абавязковы)

## СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ[1]

**Акультызм** (ад лац. *occultus* – патаемны, скрыты) – вучэнні, якія сцвярджаюць наяўнасць у чалавека і космаса патаемных якасцей, спасцігнуць якія можа толькі той, хто валодае асаблівымі здольнасцямі.

**Анафема** (грэч. *anathema* – праклён) – царкоўны праклён у хрысціянстве, які азначае адлучэнне ад царквы.

**Анёлы** (грэч. *angelos* – вястун) – у монатэістычных рэлігіях – бесцялесныя звышнатуральныя істоты, духі, створаныя Богам.

**Антыпапа** – кіраўнік каталіцкай царквы, абранне якога на гэтую пасаду лічыцца несапраўдным. Усяго было 42 антыпапы.

**Антыхрыст** – праціўнік Хрыста, які, згодна з Бібліяй, з'явіцца перад Другім прышэсцем Хрыста для барацьбы з хрысціянскай царквой і на некаторы час установіць сваё панаванне на зямлі, але ў рэшце рэшт будзе пераможаны і скінуты ў пекла.

**Апокрыфы** (грэч. *apokryphos* – тайны, сакрэтны) – рэлігійныя творы, якія прэтэндуюць на звышнатуральнае паходжанне, але афіцыйна такімі не прызнаны.

**Апалагетыка** (грэч. *apologeomai* – абараняю) – галіна хрысціянскага багаслоўя, якая займаецца абаронай і апраўданнем свайго веравучэння пры дапамозе рацыянальных доказаў.

**Архіерэй** (грэч. *arhiereus* – старэйшы святар) – у праваслаўі – агульная назва для святарнаслужыцеляў вышэйшай ступені хрысціянскай іерархіі: епіскапаў, архіепіскапаў, мітрапалітаў, экзархаў, патрыярхаў.

**Аскетызм** (ад грэч. *askesis* – практыкаванне, подзвіг) – адмаўленне чалавека ад пачуццёвых даброт і асалод дзеля мэтаў, якія ён лічыць вышэйшымі.

**Астралогія** (ад грэч. *astron* – зорка і logos – вучэнне) – вучэнне, якое сцвярджае, што планеты і зоркі аказваюць уплыў на жыццё асобнага чалавека і развіццё гісторыі.

**Бодхі** (санскр. – абуджэнне, прасвятленне) – у будызме – вышэйшы стан свядомасці, духоўнае прасвятленне.

**Була** (лац. *bulla* – шарык) – найбольш важны папскі дакумент, у якім змяшчаецца зварот, пастанова альбо распараджэнне. Змацоўваецца круглай металічнай пячаткай – булай.

[1] Прыводзяцца толькі тыя тэрміны, якія не тлумачыліся ў тэкстах лекцый.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Бхакці** – у індуізме – адданае служэнне аднаму богу.

**Вахабізм** – рэлігійна-палітычны рух у ісламе, які ўзнік у канцы XVIII ст. у Аравіі. Заснавальнік – арабскі багаслоў Мухамед ібн Абд аль-Вахаб выступіў за адраджэнне чысціні ісламу, сапраўдны монатэізм, які выключае любых пасрэднікаў паміж чалавекам і Алахам. Вахабізм адмаўляе культ святых (у тым ліку і самога прарока Мухамеда), асуджае раскошу, курэнне, спевы, танцы.

**Духавенства** – у хрысціянстве – паняцце для абазначэння людзей, якія пасвечаны ў адну з трох ступеняў святарства (дыякан, прэсвітар, епіскап).

**Дэкалог** (грэч. – дзесяціслоўе) – дзесяць запаведзяў, якія, згодна з Бібліяй, былі дадзены Маісею Богам на гары Сінай.

**Ёга** (ад кораня "юд" – запрагаць) – сукупнасць метадаў інтэграцыі духоўных, псіхічных і фізічных патэнцый індывіда, якія маюць мэту завяршыць і ўдасканаліць асобу знутры, а таксама ажыццявіць яе еднасць з вышэйшым пачаткам.

**Жрэц** (ад старажытнаслав. "жръці" – прыносіць у ахвяру) – служыцель культу, пераважна ў політэістычных рэлігіях. Лічыўся пасрэднікам паміж людзьмі і звышнатуральнымі сіламі.

**Ігумен** (ігуменння) (грэч. *hegumenos* – вядучы) – духоўны тытул у праваслаўі, які звычайна даецца настаяцелю мужчынскага альбо жаночага манастыра.

**Іерэй** (грэч. *hiereus* – жрэц) – афіцыйная назва праваслаўнага святара.

**Ініцыяцыя** (лац. *initiāre* – пасвячаць, уводзіць у культавыя таінствы) – абрад пасвячэння чалавека ў новы духоўны стан.

**Канфесія** (ад лац. *confessio* – прызнанне, вызнанне) – рэлігійнае аб'яднанне, якое мае распрацаванае веравучэнне, культ і арганізацыйную структуру.

**Катэхізіс** (грэч. *katehesis* – вуснае настаўленне) – кніга, у якой змешчаны кароткі выклад асноўных палажэнняў хрысціянскага веравучэння, звычайна ў форме пытанняў і адказаў.

**Клір** (ад грэч. *kleros* – жэрабя) – у каталіцтве і пратэстанцтве – духавенства, у праваслаўі – духавенства, за выключэннем архіерэяў.

**Контррэфармацыя** (лац. *contra* – супраць) – рэформы ў каталіцкай царкве, якія праводзіліся ў XVI–XVII стст. і былі накіраваны супраць Рэфармацыі.

**Ксёндз** (*ksiądz*) – польская назва святара рымска-каталіцкай царквы.

**Лаўра** (грэч. *laura* – гарадская вуліца, квартал) – вялікі і асабліва значны мужчынскі манастыр у праваслаўнай царкве.

РЭПОЗІТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літургія** (грэч. *leiturgia* – грамадскі абавязак) – галоўнае хрысціянскае набажэнства, на якім адбываецца таінства прычашчэння. У праваслаўі яшчэ называецца абедняй, у каталіцтве – месай.

**Медытацыя** (лац. *meditatio* – разважанне) – сканцэнтраванасць свядомасці чалавека на акрэсленай ідэі альбо вобразе.

**Манаства** (ад грэч. *monachos* – адзінокі) – форма аскетычнай практыкі, якая грунтуецца на выхадзе з міру і абмежаванні ў пачуццёвых дабротах.

**Місіянерства** (лац. *missio* – пасылка, даручэнне) – дзейнасць рэлігійнай арганізацыі па распаўсюджванні свайго веравучэння праз спецыяльных пасланцаў – місіянераў.

**Містыка** (ад грэч. *mystikos* – таямнічы) – рэлігійная практыка, якая мае сваёй мэтай дасягненне непасрэднага кантакту з абсалютам, а таксама сукупнасць філасофскіх і багаслоўскіх дактрын, якія абгрунтоўваюць і рэгулююць гэтую практыку.

**Мула** (ад араб. "*маула*" – уладар, гаспадзін) – служыцель культу ў ісламе, звычайна выбіраецца мусульманамі са свайго асяроддзя.

**Мячэць** (араб. "*масджыд*" – месца шанавання) – культавы будынак у ісламе, дзе адбываюцца набажэнствы.

**Німб** (ад лац. *nimbus* – воблака, хмара) – умоўнае абазначэнне ззяння, звычайна вакол галавы, на выявах багоў, у хрысціянстве – таксама Багародзіцы, святых, анёлаў, прарокаў, а ў Старажытнай Грэцыі – і герояў.

**Паломніцтва** (ад лац. *palma* – пальма) – падарожжа вернікаў да месцаў альбо аб'ектаў, якія лічацца святымі, з мэтай ачысціцца ад грахоў і атрымаць звышнатуральную дапамогу.

**Рэінкарнацыя** (франц. *reincarnation* – пераўвасабленне) – у шырокім сэнсе – перасяленне душ.

**Свабода сумлення** – права чалавека вызнаваць любую рэлігію, не вызнаваць ніякай альбо знаходзіцца на пазіцыях ваяўнічага атэізму.

**Схаластыка** (ад лац. *shola* – школа) – тып рэлігійнай філасофіі, для якога характэрна прынцыповая падпарадкаванасць прымату тэалогіі, аб'яднанне дагматычных прадумоў з рацыянальнай методыкай, асаблівы інтарэс да фармальна-лагічнай праблематыкі. Была распаўсюджана ў сярэднявеччы.

**Тэакратыя** (ад грэч. *theos* – Бог і *kratos* – улада) – форма кіравання, пры якой улада знаходзіцца ў руках царквы і духавенства.

**Экуменізм** (ад грэч. *oikoumene* – Сусвет, населены свет) – рух за аб'яднанне хрысціянскіх канфесій.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ДАДАТАК Б
# (абавязковы)

## Колькасць прыхільнікаў рэлігій у свеце.

| | |
|---|---|
| Хрысціяне | 2,15 млрд |
| католікі | 1,18 млрд |
| праваслаўныя | 224 млн |
| пратэстанты | 514 млн |
| іншыя | 246 млн |
| Мусульмане | 1,35 млрд |
| Індуісты | 1,1 млрд |
| Будысты | 376 млн |
| Сікхі | 23 млн |
| Прыхільнікі кітайскіх народных рэлігій | 398 млн |
| Канфуцыянцы | 5 млн |
| Джайністы | 5 млн |
| Сінтаісты | 4 млн |
| Іўдзеі | 14 млн |
| Бахаі | 7 млн |
| Прыхільнікі рода-племянных рэлігій | 111 млн |
| Прыхільнікі нетрадыцыйных рэлігій | 121 млн |
| Спірыты | 15 млн |
| Няверуючыя | 641 млн |
| Атэісты | 220 млн |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ДАДАТАК В
## (абавязковы)

## Колькасць рэлігійных суполак у Рэспубліцы Беларусь на 1 студзеня 2012 г.

| Рэлігійныя суполкі | 1.01.2011 | 1.01.2012 | рост за 2011 г. |
|---|---|---|---|
| 1. Праваслаўная царква | 1545 | 1567 | 22 |
| 2. Стараверская царква | 32 | 33 | 1 |
| 3. Рымска-каталіцкая царква | 475 | 479 | 4 |
| 4. Каталікі лацінскага абраду | 1 | 1 | 0 |
| 5. Грэка-каталіцкая царква | 15 | 15 | 0 |
| 6. Рэфармацкая царква | 1 | 1 | 0 |
| 7. Лютэранская царква | 27 | 27 | 0 |
| 8. Евангельскія хрысціяне баптысты | 275 | 286 | 11 |
| 9. Армянская апостальская царква | 1 | 1 | 0 |
| 10. Іаганская царква | 1 | 1 | 0 |
| 11. Новаапостальская царква | 21 | 21 | 0 |
| 12. Прэсвітарыянская царква | 1 | 1 | 0 |
| 13. Хрысціяне веры евангельскай | 505 | 512 | 7 |
| 14. Хрысціяне поўнага Евангелля | 55 | 55 | 0 |
| 15. Хрысціяне веры апостальскай | 9 | 10 | 1 |
| 16. Царква Хрыстова | 5 | 5 | 0 |
| 17. Месіянскія суполкі | 2 | 2 | 0 |
| 18. Адвентысты сёмага дня | 72 | 73 | 1 |
| 19. Сведкі Іеговы | 27 | 27 | 0 |
| 20. Мармоны | 4 | 4 | 0 |
| 21. Іўдзейская рэлігія | 35 | 36 | 1 |
| 22. Прагрэсіўны іўдаізм | 17 | 17 | 0 |
| 23. Мусульманская рэлігія | 25 | 25 | 0 |
| 24. Бахаі | 5 | 5 | 0 |
| 25. Крышнаіты | 6 | 6 | 0 |
| **Усяго** | **3162** | **3210** | **48** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Вучэбнае выданне**

**АДЗІНОЧАНКА** Віктар Аляксандравіч

# РЭЛІГІЯЗНАЎСТВА

## ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК

**2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае**

Рэдактар *В. І. Шкрэдава*
Карэктар *В. У. Калугіна*

Падпісана ў друк 04.05.2012. Фармат 60×84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. др. арк. 11,8.
Улік.-выд. арк. 12,9. Тыраж 200 экз. Заказ № 277.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
ЛВ № 02330/0549481 ад 14.05.2009.
Вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ